# Грамадазнаўства




11 клас

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара філасофскіх навук,
прафесара М. І. Вішнеўскага

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2010

Правообладатель Народная асвета

УДК 3(075.3=161.3)
ББК 60я721
Г76

Аўтары:
М. І. Вішнеўскі, В. В. Гінчук, В. М. Гірына, А. І. Шалашкевіч, Л. А. Мурашка, Л. М. Рабцаў, Т. В. Целяціцкая, А. Ф. Грэчнева, У. В. Падкапаеў, Н. В. Ляховіч-Петракова, І. А. Кузняцова, Н. А. Антановіч, Л. У. Старавойтава, Н. П. Дзенісюк

Рэцэнзенты:
кафедра паліталогіі і права Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка (дацэнт кафедры, кандыдат гістарычных навук *А. В. Ефімовіч*); кандыдат педагагічных навук, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 95 г. Мінска *А. А. Карзюк*; дацэнт кафедры паліталогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, кандыдат палітычных навук, дацэнт *Д. У. Бляўцава*; настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі, дырэктар Жодзінскага гісторыка-краязнаўчага музея *І. Ю. Супрановіч*

Пераклад з рускай мовы *М. Л. Страхі*

**Умоўныя абазначэнні:**

 — пытанні і заданні

 — практыкум

 — дакументы і матэрыялы

 — урок абагульнення

Г76 **Грамадазнаўства** : вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / М. І. Вішнеўскі [і інш.] ; пад рэд. М. І. Вішнеўскага; пер. з рус. мовы М. Л. Страхі. — Мінск : Нар. асвета, 2010. — 262 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1415-4.

**УДК 3(075.3=161.3)**
**ББК 60я721**

**ISBN 978-985-03-1415-4**

© Страха М. Л., пераклад на беларускую мову, 2010
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2010

Правообладатель Народная асвета

## Уводзіны

Канстытуцыя нашай дзяржавы пачынаецца ўрачыстымі словамі прэамбулы:

«Мы, народ Рэспублікі Беларусь (Беларусі),

зыходзячы з адказнасці за цяперашні стан і будучыню Беларусі,

усведамляючы сябе паўнапраўным суб'ектам сусветнага супольніцтва і пацвярджаючы сваю прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцей,

грунтуючыся на сваім неад'емным праве на самавызначэнне,

абапіраючыся на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці,

імкнучыся зацвердзіць правы і свабоды кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь,

жадаючы забяспечыць грамадзянскую згоду, непахісныя ўстоі народаўладдзя і прававой дзяржавы,

прымаем гэтую Канстытуцыю — Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь».

Кожны з нас, з'яўляючыся грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, усведамляе адказнасць за сваю дзяржаву перад сваім сумленнем, перад Гісторыяй.

Набліжаецца да завяршэння час вашай вучобы ў школе. Наперадзе самастойнае жыццё, адказны выбар будучай прафесіі. Вам давядзецца працаваць у новым калектыве, мець зносіны з новымі людзьмі, засвойваць новыя сацыяльныя ролі ў грамадстве. На кожным з этапаў жыцця вы нанава будзеце асэнсоўваць непарушную сувязь са сваёй краінай, сваім народам.

Трэцяя, завяршальная частка курса «Грамадазнаўства», якую вы будзеце вывучаць у 11-м класе, прысвечана беларускай дзяржаве. Дадзеная частка мае пэўную ўнутраную логіку пабудовы. Перш за ўсё вам трэба будзе вывучыць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Гэта найважнейшы дзяржаўны дакумент, аб значнасці якога можна меркаваць

Правообладатель Народная асвета

ужо па назвах яго раздзелаў. Раздзел I называецца «Асновы канстытуцыйнага ладу». Раздзел II — «Асоба, грамадства, дзяржава». Раздзел III — «Выбарчая сістэма. Рэферэндум». Раздзел IV — «Прэзідэнт, Парламент, Урад, Суд». Раздзел V — «Мясцовае кіраванне і самакіраванне». Раздзел VI — «Пракуратура. Камітэт дзяржаўнага кантролю». Раздзел VII — «Фінансава-крэдытная сістэма Рэспублікі Беларусь». Раздзел VIII — «Дзеянне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і парадак яе змянення». Раздзел IX — «Заключныя і пераходныя палажэнні». Раздзелы і главы Канстытуцыі дзеляцца на артыкулы — усяго 146 артыкулаў. Тэкст Канстытуцыі складае аснову канстытуцыйнага права ў Рэспубліцы Беларусь.

Вам давядзецца таксама разгледзець асноўныя галіны права: грамадзянскае, працоўнае, сямейнае, адміністрацыйнае, крымінальнае; азнаёміцца з дзейнасцю праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь, іх асноўнымі задачамі. Веданне гэтых пытанняў, як і веданне асноў канстытуцыйнага ладу краіны, правоў і абавязкаў грамадзян, выбарчай сістэмы і структуры органаў дзяржаўнай улады, з’яўляецца неад’емнай умовай фарміравання палітычнай і прававой культуры асобы.

Пры вывучэнні дадзеных пытанняў важна ўлічваць, што юрыдычная навука адрозніваецца асаблівай строгасцю фармуліровак. Іншы раз яны ўспрымаюцца як сухаватыя ці груваздкія, цяжкія. Таму ўважліва аднясіцеся да іх і паспрабуйце ўнікнуць у іх сэнс. Дадатковыя звесткі вы можаце атрымаць з кніг, прысвечаных прававой сістэме Рэспублікі Беларусь. Некаторыя з іх названы ў спісе літаратуры, які змешчаны ў канцы вучэбнага дапаможніка.

Асаблівую цікавасць і вялікае значэнне для жыцця кожнага з нас уяўляе эканамічная і сацыяльная палітыка беларускай дзяржавы. У дадзенай тэме канкрэтызуецца і дапаўняецца матэрыял, які вы вывучалі на ўроках грамадазнаўства ў 9-м і 10-м класах, — аб сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай і духоўнай сферах грамадскага жыцця, аб культуры чалавека і грамадства і г. д. Асноўная думка гэтай тэмы заключаецца ў тым, што дабрабыт кожнага асобнага чалавека грунтуецца не толькі на яго асабістай актыўнасці і прадпрымальнасці, але і на ўзважанай, навукова абгрунтаванай і гуманістычна арыентаванай палітыцы дзяржавы, якая ад-


Правообладатель Народная асвета

люстроўвае і абараняе агульныя інтарэсы людзей. Пры разглядзе гэтых пытанняў рэкамендуем выкарыстоўваць факты, статыстычныя даныя, матэрыялы, якія адносяцца і да рэспублікі ў цэлым, і да вашага рэгіёна (вобласці, раёна). Вы можаце таксама падрыхтаваць паведамленні або зрабіць падборку матэрыялаў аб выніках эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця канкрэтна таго населенага пункта, дзе вы жывяце, дзе працуюць вашы бацькі.

Далей вам трэба будзе разабрацца ва ўзаемасувязях унутраных праблем нашай краіны і глабальных праблем усяго сучаснага сусветнага супольніцтва. Для гэтага вы можаце выкарыстаць ужо вядомыя вам звесткі з геаграфіі, гісторыі; прыцягваць матэрыялы, узятыя з іншых навук, са сродкаў масавай інфармацыі (СМІ).

Вам давядзецца засвоіць шмат новых паняццяў (асноўныя з іх вылучаны ў тэксце паўтлустым курсівам і дадзены ў слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка), навучыцца выкарыстоўваць іх пры характарыстыцы канкрэтных падзей, працэсаў грамадскага жыцця, асаблівасцей палітычнага курса беларускай дзяржавы, яе дзеянняў, накіраваных на абарону нашых нацыянальных інтарэсаў, умацаванне дружбы і добрасуседства не толькі з сумежнымі краінамі, але і цесных эканамічных і культурных сувязей з усімі рэгіёнамі планеты. Кожнаму з нас важна глыбока ўсведамляць узаемасувязь усіх частак сучаснага свету, улічваць імклівасць змяненняў, якія ў ім адбываюцца, і неадназначнасць іх вынікаў.

Працэсы глабалізацыі, якім надаецца вялікая ўвага ў гэтым вучэбным дапаможніку, рэзка абвастраюць няўстойлівасць становішча многіх краін. У сусветнай эканоміцы, у сацыяльна-палітычнай і духоўнай сферах жыцця сучаснага сусветнага супольніцтва назіраюцца небяспечныя крызісныя з’явы. Разам з тым пастулова вырысоўваецца новы сусветны парадак, у якім не будзе месца дыктату адных краін і іх груповак у адносінах да іншых, а шчасце чалавека будзе прызнана вышэйшай каштоўнасцю не толькі на словах, але і на справе.

Дзеля таго каб гэты новы сусветны парадак стаў рэальнасцю, неабходны намаганні не толькі прафесійных палітыкаў, але і мільёнаў радавых грамадзян, якія ўсведамляюць агульную адказнасць за гістарычны лёс чалавецтва, за бу-

Правообладатель Народная асвета

дучыню сваіх краін, народаў, іх самабытных культур. Дзейнічаючы паасобку, гэтыя складаныя задачы не вырашыць. Таму так важна ўмацоўваць грамадскую згоду, удасканальваць дэмакратычныя механізмы кіравання грамадскім жыццём, фарміраваць у людзей па-сапраўднаму дзяржаўнае мысленне.

Моц беларускай дзяржавы — у падтрымцы яе грамадзян, у свядомасці іх дзеянняў, якія абапіраюцца на глыбокія веды сучаснага грамадскага жыцця.

Засвоеныя пры вывучэнні курса грамадазнаўства веды і ўменні дазволяць вам паспяхова вызначыць шляхі самарэалізацыі, актыўна ўключыцца ў грамадскае жыццё, адказна выконваць абавязкі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

?!

1. Пракаменціруйце змест прэамбулы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, раскрыйце сэнс кожнага з яе палажэнняў.
2. Назавіце раздзелы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Паспрабуйце растлумачыць парадак іх размяшчэння, іх узаемасувязь.
3. Ці згодны вы з тым, што кожны грамадзянін абавязаны ведаць і выконваць законы сваёй краіны? Ці не азначае гэта, што ўсе мы павінны быць юрыстамі?
4. Якія напрамкі палітыкі нашай дзяржавы выклікаюць у вас найбольшую цікавасць? Чаму?
5. Якія змяненні, што адбываюцца ў сучасным свеце, на ваш погляд, з'яўляюцца самымі значнымі? Свой адказ аргументуйце.

Правообладатель Народная асвета

# Тэма 1
# Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

## § 1. Асноўны Закон дзяржавы

*Успомніце.* **1.** Назавіце гады прыняцця канстытуцый у БССР. **2.** Чым было абумоўлена прыняцце новых канстытуцый у БССР?

**Канстытуцыя і яе месца ў нацыянальнай прававой сістэме.** Тэрмін «канстытуцыя» (ад лац. constitutio — устанаўленне, упарадкаванне) вядомы з антычных часоў. Акты пад такой назвай выдавалі яшчэ імператары Старажытнага Рыма. У сучасным свеце ***канстытуцыя*** — Асноўны Закон дзяржавы, «закон законаў».

Канстытуцыі могуць быць прыняты рознымі спосабамі. Вядомыя такія спосабы, як:

«дараванне» канстытуцыі манархам народу (гэта гістарычна першы спосаб прыняцця канстытуцый);

прыняцце канстытуцыі парламентам;

прыняцце канстытуцыі спецыяльна створаным для гэтай мэты органам — Установчым сходам, Парламенцкай Асамблеяй;

прыняцце канстытуцыі на рэферэндуме. Гэта найбольш распаўсюджаны ў сучаснай практыцы дзяржаў і найбольш дэмакратычны спосаб прыняцця канстытуцыі.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь замацоўвае асновы дзяржаўнага ладу, вызначае асноўныя каштоўнасці дзяржавы і грамадства, а таксама гарантуе іх абарону.

Як юрыдычны дакумент Канстытуцыя валодае *вяршэнствам* у сістэме права, г. зн. мае вышэйшую юрыдычную сілу ў адносінах да ўсіх іншых актаў дзяржавы.

Канстытуцыя аказвае *рэгулюючае* ўздзеянне на грамадскія адносіны. Дзеянне канстытуцыйных норм ажыццяўляецца як непасрэдна, так і шляхам іх канкрэтызацыі ў іншых заканадаўчых актах. У сучасных дзяржавах актыўна замацоўваецца ідэя прамога дзеяння норм Канстытуцыі. Прамое дзеянне Канстытуцыі азначае, што ў выпадку, калі яшчэ няма заканадаўчых актаў, якія канкрэтызуюць пэўную яе норму, гэта норма можа быць рэалізавана непасрэд-

Правообладатель Народная асвета

на. Грамадзянін, правы якога парушаны, можа прама звярнуцца ў суд на падставе канстытуцыйнай нормы, што замацоўвае тое права, якое было парушана. Прамое дзеянне канстытуцыйных норм мае важнае значэнне і пры вырашэнні супярэчнасцей паміж Канстытуцыяй і нейкім канкрэтным законам. У гэтым выпадку дзейнічаюць нормы Канстытуцыі як дакумента вышэйшай юрыдычнай сілы.

Важна, каб Канстытуцыі была ўласціва *стабільнасць*. Устойлівасць асноў канстытуцыйнага ладу з'яўляецца залогам паспяховага развіцця грамадства. Стабільнасць Канстытуцыі забяспечваецца асобым парадкам унясення ў яе змяненняў і дапаўненняў. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь адносіцца да так званых «жорсткіх» канстытуцый. Чатыры ключавыя яе раздзелы — «Асновы канстытуцыйнага ладу», «Асоба, грамадства, дзяржава», «Прэзідэнт, Парламент, Урад, Суд», «Дзеянне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і парадак яе змянення» — могуць быць зменены толькі шляхам *рэферэндуму*.

Канстытуцыя падлягае асобай ахове. Усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы павінны строга выконваць Канстытуцыю. Гарантам Канстытуцыі нашай краіны з'яўляецца *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*.

З мэтай асобай аховы Канстытуцыі функцыянуе *Канстытуцыйны Суд*. Гэта орган, які сочыць за тым, каб нарматыўныя прававыя акты адпавядалі Канстытуцыі краіны.

**Канстытуцыйнае развіццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.** Да снежня 1991 г. Беларусь уваходзіла ў склад СССР. У той час дзейнічала Канстытуцыя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР), прынятая ў 1978 г. Вярхоўным Саветам БССР.

З пачатку 1990-х гг. у краіне адбываюцца кардынальныя пераўтварэнні, накіраваныя на станаўленне дэмакратыі, ажыццяўленне правоў чалавека, правядзенне рынachных рэформ. Гэты гістарычны перыяд насычаны разнастайнымі і вельмі важнымі падзеямі ў жыцці беларускай дзяржавы.

Галоўным дакументам, які азнаменаваў пачатак новага перыяду ў гісторыі Беларусі, стала *Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі*, прынятая **27 ліпеня 1990 г.** Дэкларацыя замацоўвала ўсе прыметы суверэннай дзяржавы: грамадзянства, уласныя Узброеныя Сілы, права ўласнасці народа на пры-


Правообладатель Народная асвета

родныя рэсурсы, уласную крэдытна-фінансавую і грашовую сістэму, падатковую і мытную службы.

У 1990 г. не толькі Беларусь, але і іншыя рэспублікі СССР абвясцілі аб сваёй незалежнасці. Разам з тым існавалі магутныя палітычныя сілы, якія жадалі захаваць СССР. 17 сакавіка 1991 г. адбыўся рэферэндум па пытанні захавання СССР як абноўленай федэрацыі суверэнных рэспублік. У рэферэндуме прынялі ўдзел 83 % грамадзян, з іх за захаванне СССР прагаласавала 82 %. Аднак вынікі рэферэндуму не змаглі прадухіліць распад Савецкага Саюза. 8 снежня 1991 г. кіраўнікі Расіі, Беларусі і Украіны заключылі Пагадненне аб стварэнні *Садружнасці Незалежных Дзяржаў* (*СНД*).

Перад Рэспублікай Беларусь, якая стала самастойнай дзяржавай, паўстала пытанне аб распрацоўцы новай Канстытуцыі, якая адлюстравала б тыя перамены, што адбыліся, вызначыла мэты і прыярытэты далейшага развіцця. Была ўтворана канстытуцыйная камісія, у якую ўвайшлі больш як 70 чалавек (дэпутаты, вучоныя, спецыялісты ў галіне права). У парламенце таго часу — Вярхоўным Савеце — ішло бурнае абмеркаванне кожнага артыкула Канстытуцыі. **15 сакавіка 1994 г.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята. У ёй упершыню ў гісторыі Беларусі быў уведзены інстытут прэзідэнтства, рэалізавана сучасная мадэль правоў чалавека, якая адпавядае міжнародным стандартам.

24 лістапада 1996 г. адбыўся рэспубліканскі рэферэндум. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка і дэпутаты Вярхоўнага Савета прапанавалі для народнага галасавання свае праекты па ўнясенні некаторых змяненняў у Канстытуцыю, прынятую ў 1994 г. За праект, прапанаваны Прэзідэнтам, прагаласавала 70 % грамадзян. Гэтымі змяненнямі ўдакладняліся паўнамоцтвы органаў трох галін дзяржаўнай улады.

Наступнае змяненне Канстытуцыі адбылося на рэферэндуме 17 кастрычніка 2004 г. З Канстытуцыі было выключана палажэнне, якое забараняла адной асобе выбірацца Прэзідэнтам краіны больш чым на два тэрміны. У рэферэндуме прынялі ўдзел каля 90 % грамадзян, 79 % падтрымалі прапанову аб гэтым змяненні ў Канстытуцыі.

Канстытуцыйнае развіццё ў перыяд станаўлення Беларусі як суверэннай дзяржавы было няпростым. Тым не менш сёння Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай, якая мае

Правообладатель Народная асвета




не толькі высокі прамысловы, сельскагаспадарчы, навуковы, кадравы патэнцыял, але і ўстойлівую, даволі эфектыўную палітычную сістэму. Знойдзены канструктыўны баланс заканадаўчай, выканаўчай і судовай улад. Пасляхова рэалізуюцца шматлікія дзяржаўныя сацыяльна-эканамічныя праграмы, накіраваныя на аказанне падтрымкі шматдзетным сем'ям, пажылым людзям і іншым маламаёмным катэгорыям насельніцтва. Стабільнае развіццё грамадства і дзяржавы забяспечваецца паўсядзённай працай грамадзян Беларусі, укладам кожнага ў росквіт роднай краіны. Пад гэта развіццё падведзена трывалая прававая база.

**Канстытуцыя — прававая аснова беларускай дзяржавы, яе ідэалогіі.** Канстытуцыя займае асобае становішча ў прававой сістэме нашай дзяржавы. Яна выступае *сістэмаўтваральным дакументам для ўсяго заканадаўства краіны.* Гэта ўласцівасць Канстытуцыі адрознівае яе ад іншых законаў. Яна выяўляецца ў тым, што Канстытуцыя ўтрымлівае нормы-прынцыпы, якія з'яўляюцца зыходнымі для асноўных галін і інстытутаў права. Адначасова Канстытуцыя з'яўляецца юрыдычным фундаментам для нарматворчай дзейнасці органаў дзяржаўнай улады. Яна размяжоўвае іх нарматворчую кампетэнцыю, рэгламентуе нарматворчыя працэдуры, вызначае віды нарматыўных актаў і іх суадносіны па юрыдычнай сіле.

У Канстытуцыі замацаваны агульныя асновы жыцця грамадства і дзяржавы, статус асобы, механізм ажыццяўлення дзяржаўнай улады. Тым самым Канстытуцыя вызначае пабудову прававой сістэмы дзяржавы. Нормы Канстытуцыі развіваюцца і канкрэтызуюцца ў розных галінах права, кожная з якіх ахоплівае пэўную сферу грамадскіх адносін, дзейнасці людзей. Напрыклад, вызначаючы формы ўласнасці (дзяржаўная і прыватная), канстытуцыйныя нор-


Правообладатель Народная асвета



Урачыстая цырымонія заступлення на пасаду
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі

мы тым самым устанаўліваюць прынцыпы грамадзянскага права, фінансава-крэдытнай сістэмы; замацоўваючы сістэму органаў дзяржаўнай улады, Канстытуцыя накіроўвае развіццё адміністрацыйнага права. Канстытуцыйнае права на працу канкрэтызуецца ў разнастайных нормах працоўнага права; прынцыпы ажыццяўлення правасуддзя атрымалі сваё адлюстраванне ў крымінальным і крымінальна-працэсуальным праве; асновы жыллёвай палітыкі і права на жыллё — у жыллёвым праве.

Канстытуцыя — не проста юрыдычны дакумент. Для кожнай краіны прыняць Канстытуцыю азначае выбраць прававую мадэль грамадства, вызначыць палітычныя і ідэалагічныя асновы яе жыцця. *Ідэалогія беларускай дзяржавы* — гэта сукупнасць ідэй, поглядаў, уяўленняў аб мэтах развіцця беларускага грамадства і шляхах дасягнення гэтых мэт. Ідэалогія беларускай дзяржавы накіравана на аб'яднанне ўсіх сіл і рухаў дзеля пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі. Важнейшыя палажэнні дзяржаўнай ідэалогіі замацаваны ў Канстытуцыі.

Канстытуцыя адлюстроўвае пэўны вынік папярэдняга развіцця грамадства і вызначае перспектывы яго далейшага

Правообладатель Народная асвета

развіцця. З гэтым звязана дваістасць задач Канстытуцыі як прававой мадэлі грамадства.

З аднаго боку, Канстытуцыя павінна быць рэальнай, адлюстроўваць агульнапрынятыя каштоўнасці (суверэнітэт, народаўладдзе, правы чалавека і інш.) і тыя адносіны ў грамадстве і дзяржаве, якія ўжо склаліся, забяспечваць пераемнасць іх гістарычнага развіцця. З другога боку, Канстытуцыя павінна прапанаваць грамадству мэты і ідэалы, праграмныя палажэнні, абрысаваць арыенціры развіцця грамадства і дзяржавы на перспектыву. У сувязі з гэтым некаторыя людзі лічаць нормы Канстытуцыі дэкларатыўнымі, мяркуючы, што ў ёй запісана тое, што павінна быць, а не тое, што ёсць на самай справе. Жыццё не стаіць на месцы, і ў Асноўным Законе краіны прадугледжваецца тое, што яшчэ павінна быць зроблена ў плане ўдасканальвання арганізацыі нашага жыцця. Рэалізуючы нормы Канстытуцыі і дасягаючы паўсядзённай працай тых мэт, якія ў ёй сфармуляваны, грамадства стабільна развіваецца па шляху прагрэсу, справядлівасці, гуманізму.

?!

1. Што такое Канстытуцыя? Якія яе юрыдычныя ўласцівасці? *(Выкарыстайце матэрыял 1 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 43—44.)*
2. Назавіце спосабы прыняцця Канстытуцыі. Якія, на вашу думку, перавагі і недахопы кожнага з іх?
3. Калі была прынята Канстытуцыя нашай краіны, якая дзейнічае сёння? Ахарактарызуйце асноўныя этапы канстытуцыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь у перыяд яе станаўлення як суверэннай дзяржавы.
4. Ахарактарызуйце месца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у нацыянальнай прававой сістэме. Растлумачце, што такое прамое дзеянне Канстытуцыі.
5. Якім чынам у Рэспубліцы Беларусь забяспечваецца ахова Канстытуцыі? *(Выкарыстайце матэрыял 2 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 44—46.)*
6. Як вы разумееце сцверджанне аб тым, што Канстытуцыя — гэта прававая аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы? *(Выкарыстайце матэрыял 8 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 54.)*


Правообладатель Народная асвета

# § 2. Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь

*Успомніце.* **1.** Якія вылучаюць формы дзяржавы? **2.** Што такое рэспубліка, унітарная дзяржава, дэмакратыя, прававая дзяржава?

**Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.** Асновы *канстытуцыйнага ладу* Рэспублікі Беларусь раскрывае раздзел I Канстытуцыі нашай краіны. Згодна з артыкулам 1 Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай.

Разгледзім кожную з гэтых характарыстык беларускай дзяржавы.

Вы ўжо ведаеце аб тым, што ў залежнасці ад дзяржаўнага ўпарадкавання адрозніваюць унітарныя (адзіныя) і федэратыўныя (саюзныя) дзяржавы. Ва ўнітарнай дзяржаве дзейнічае адна Канстытуцыя, існуе адна (агульная для ўсёй




Рэспубліка Беларусь — унітарная дзяржава

Правообладатель Народная асвета

тэрыторыі) заканадаўчая, судовая сістэма, адзіная сістэма выканаўчай улады.

Рэспубліка Беларусь — *унітарная дзяржава*, якая складаецца з 7 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (6 абласцей і сталіца — горад Мінск). У абласцях і ў горадзе Мінску ёсць як выбарныя органы (Саветы дэпутатаў), так і выканаўчыя органы ўлады (выканаўчыя камітэты). Старшыні абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў прызначаюцца Прэзідэнтам і зацвярджаюцца адпаведнымі Саветамі дэпутатаў.

*Дэмакратыю* вызначаюць як палітычны рэжым, заснаваны на магчымасці большасці насельніцтва шляхам прамога ці апасродкаванага волевыяўлення кіраваць справамі дзяржавы і грамадства з улікам думкі меншасці. Адна з асноўных умоў дэмакратыі — раўнапраўе грамадзян у сферы палітыкі. Пры гэтым асноўныя нарматворчыя паўнамоцтвы належаць прадстаўнічым органам дзяржаўнай улады.

Згодна з артыкулам 4 Канстытуцыі дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і поглядаў. Тым самым замацоўваецца *прынцып **плюралізму***, які ўстанаўлівае свабоднае суіснаванне ў грамадстве розных палітычных поглядаў, школ, ідэалогій, палітычных партый і арганізацый са сваімі мэтамі і праграмамі, калі яны не супярэчаць Канстытуцыі краіны. Ідэалагічныя канцэпцыі палітычных партый, рэлігійных і іншых грамадскіх аб’яднанняў, сацыяльных груп не могуць устанаўлівацца ў якасці абавязковых для грамадзян нашай краіны. Палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнічаючы ў рамках Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, садзейнічаюць выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян, удзельнічаюць у выбарах (артыкул 5 Канстытуцыі). Розныя палітычныя сілы канструктыўнай накіраванасці нацэлены на пошук балансу, кампрамісу, згоды паміж сацыяльнымі групамі, а таксама паміж індывідам і грамадствам, грамадствам і дзяржавай.

Асновай *прававой дзяржавы* з’яўляецца *прынцып вяршэнства права*, які азначае, што дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства (артыкул 7


Правообладатель Народная асвета

Канстытуцыі). Права выяўляецца ў *законе*, які прыняты згодна з дэмакратычнымі працэдурамі і забяспечвае баланс грамадскіх інтарэсаў і ў канчатковым выніку — грамадскі прагрэс. Вяршэнства права прадугледжвае таксама роўнасць усіх грамадзян перад законам і судом, рэальнасць правоў і свабод, дзейсны судовы механізм абароны гэтых правоў (незалежнасць суда, заснаванага на праве і няўхільным выкананні судовых рашэнняў).

Другім важнейшым элементам прававой дзяржавы выступае *падзел улад*. Падзел адзінай дзяржаўнай улады на тры галіны — заканадаўчую, выканаўчую і судовую — азначае, што, будучы самастойнай, у межах сваіх паўнамоцтваў, кожная галіна ўлады ўздзейнічае на іншую, абмяжоўвае і ўраўнаважвае яе. Падзел улад прадугледжвае:

пэўны тэрмін дзеяння паўнамоцтваў службовых асоб;

немагчымасць сумяшчэння дэпутацкага мандата (заканадаўчая галіна) з пасадай у апараце дзяржаўнага кіравання (выканаўчая ўлада);

права вета Прэзідэнта (Кіраўніка дзяржавы) на законы, прынятыя Парламентам;

права роспуску Прэзідэнтам у дакладна агавораных выпадках Парламента;

кантроль за заканадаўчай уладай, які ажыццяўляецца народам у ходзе выбараў, выяўляецца ў магчымасці адклікання дэпутата;

незалежнасць суддзяў.

Сацыяльнай асновай прававой дзяржавы з’яўляецца ***грамадзянскае грамадства***. Яно ўяўляе сабой сістэму эканамічных, палітычных, прававых, культурных сувязей паміж людзьмі, якія ўстанаўліваюцца імі без умяшання з боку дзяржавы. Грамадзянскае грамадства складаюць самакіравальныя групы людзей, якія сфарміраваліся добраахвотна (клубы, розныя асацыяцыі, гаспадарчыя карпарацыі, партыі, грамадскія аб’яднанні, масавыя рухі, іншыя «ячэйкі» грамадства). Людзей тут аб’ядноўвае агульны інтарэс; дзейнічаючы сумесна, яны лепш усведамляюць свае правы і абавязкі, павышаюць узровень палітычнай і прававой культуры, рэалізуюць свае патрэбы.

Рэспубліка Беларусь абвешчана Канстытуцыяй ***сацыяльнай дзяржавай***. Гэта азначае, што беларуская дзяржава імкнецца забяспечыць належныя ўмовы жыцця для ўсіх сла-

Правообладатель Народная асвета

ёў насельніцтва і асабліва клапоціцца аб грамадзянах у тых выпадках, калі яны не ў стане паклапаціцца пра сябе самі. Вылучаючы сацыяльна ўразлівыя катэгорыі грамадзян (пажылыя людзі, беспрацоўныя, хворыя, калекі, ветэраны войнаў, шматдзетныя сем'і і г. д.), дзяржава распрацоўвае механізм «выраўноўвання» становішча такіх слаёў насельніцтва. Гэты механізм прызваны забяспечыць для іх прымальны ўзровень жыцця. Для гэтага прадастаўляюцца бясплатныя даброты альбо льготы ў якой-небудзь сферы, аказваецца матэрыяльная дапамога.

Дзяржава забяспечвае гарантаваны ўзровень пенсійнага забеспячэння, сацыяльнага і медыцынскага абслугоўвання, сярэдняй адукацыі. Для гэтых мэт выкарыстоўваюцца сродкі, якія атрымліваюцца за кошт падаткаў, прыцягваюцца і прыватныя капіталы, асабліва ў сферы медыцынскага абслугоўвання, сацыяльнага страхавання і інш. Адной з галоўных задач сацыяльнай дзяржавы з'яўляецца рэалізацыя права на працу. Заканадаўча вызначаецца памер мінімальнай заработнай платы, ствараюцца ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва, у тым ліку праз перападрыхтоўку і пераабучэнне.

У залежнасці ад адносін да царквы адрозніваюць свецкія і тэакратычныя дзяржавы. У тэакратычнай дзяржаве існуе «дзяржаўная рэлігія» як крыніца заканадаўства. У свецкай дзяржаве гэтага няма; статус грамадзян не залежыць ад іх рэлігійнай арыентацыі; прызнаецца права прапагандаваць як рэлігійныя, так і атэістычныя погляды. Змест Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дазваляе зрабіць вывад аб тым, што наша краіна адносіцца да свецкіх дзяржаў. Так, у Канстытуцыі абвешчана свабода сумлення і веравызнання. Гэта азначае, што кожны грамадзянін можа спавядаць любую рэлігію або не спавядаць ніякай. Устаноўлена, што рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам (артыкул 16 Канстытуцыі); ніякая рэлігія не можа лічыцца абавязковай. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

**Народаўладдзе.** Адной з асноўных прымет дэмакратычнай дзяржавы з'яўляецца *народаўладдзе*. Гэта азначае, што ўся паўната ўлады належыць народу. Згодна з арты-


Правообладатель Народная асвета

кулам 3 Канстытуцыі адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца народ.

Улада народам ажыццяўляецца або непасрэдна праз прамое волевыяўленне — *рэферэндум* (прамая форма народаўладдзя), або праз выбранне ім сваіх прадстаўнікоў — Прэзідэнта, дэпутатаў Парламента, дэпутатаў мясцовых органаў улады (прадстаўнічая форма).

Улада народа прадугледжвае падпарадкаванне дзейнасці асобных людзей агульным інтарэсам. Народ у канстытуцыйна-прававым яго разуменні ўяўляе сабой сукупнасць усіх грамадзян Рэспублікі Беларусь. Паняцце «народ» у дэмакратычным сэнсе — гэта сукупнасць тых грамадзян дзяржавы, якія праяўляюць грамадзянскую актыўнасць. Для таго каб дэмакратычная сістэма кіравання дзейнічала эфектыўна, кожны чалавек павінен актыўна ўдзельнічаць у выбарах, у рабоце органаў мясцовага самакіравання, рэалізоўваць свае інтарэсы праз розныя грамадскія арганізацыі, партыі, заўсёды цікавіцца грамадска-палітычным жыццём, г. зн. быць сапраўды грамадзянінам сваёй краіны.

**Суверэнітэт.** ***Суверэнітэт*** дзяржавы азначае вяршэнства ўлады дзяржавы ў межах яе тэрыторыі і незалежнасць дзяржавы ў міжнародных адносінах.

Кожная дзяржава павінна валодаць *тэрыторыяй*. Згодна з артыкулам 9 Канстытуцыі тэрыторыя Рэспублікі Бела-




Правообладатель Народная асвета

русь з'яўляецца натуральнай умовай існавання і прасторавай мяжой самавызначэння народа, асновай яго дабрабыту і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная.

Неад'емным элементам дзяржавы з'яўляецца таксама *насельніцтва* — сукупнасць грамадзян, іншаземцаў і асоб без грамадзянства, на якіх распаўсюджваецца юрысдыкцыя дзяржавы.

Яшчэ адна істотная прымета дзяржавы — *дзяржаўная ўлада*, у ажыццяўленні якой выяўляецца суверэнітэт. Незалежнасць дзяржавы праяўляецца ў яе самастойнасці пры вырашэнні ўнутраных праблем, рэгуляванні грамадскіх адносін (унутраная незалежнасць); у знешніх адносінах (знешняя незалежнасць).

Згодна з артыкулам 1 Канстытуцыі Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку. На III Усебеларускім народным сходзе (2006 г.) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліў: «Упершыню за шматвяковую гісторыю наш народ стварыў суверэнную дзяржаву — Рэспубліку Беларусь. Сёння наш суверэнітэт — рэальны фактар сусветнай палітыкі. Фактар, які ўжо ніхто не можа ігнараваць. Беларусы даказалі сабе і свету: мы адбыліся як нацыя, незалежная палітычна і эканамічна».

З суверэнітэтам дзяржавы непарыўна звязаны яе *сімвалы*. Сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з'яўляюцца яе Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн (артыкул 19 Канстытуцыі). Сімвалы дзяржавы адлюстроўваюць яе поўную самастойнасць і незалежнасць, гісторыю станаўлення і развіцця.

У 1995 г. на рэспубліканскім рэферэндуме больш як 75 % ад ліку галасаваўшых выказаліся за адабрэнне ранейшага герба БССР з некаторымі змяненнямі і чырвона-зялёнага з арнаментам сцяга, якія ў цяперашні час з'яўляюцца дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь. У якасці Дзяржаўнага гімна зацверджаны тэкст Міхася Клімковіча і Уладзіміра Карызны з пачатковымі словамі «Мы беларусы...» на музыку Нестара Сакалоўскага, якую кампазітар напісаў для Дзяржаўнага гімна БССР у 1955 г.


Правообладатель Народная асвета



Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг
Рэспублікі Беларусь

Згодна з артыкулам 17 Канстытуцыі дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

?!

1. Адпаведна Канстытуцыі Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай. Раскрыйце сутнасць гэтых характарыстык беларускай дзяржавы.
2. У чым заключаюцца прынцыпы плюралізму, вяршэнства права, падзелу ўлад? Абапіраючыся на тэкст Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прааналізуйце, як яны рэалізаваны ў Асноўным Законе нашай дзяржавы.
3. Што такое грамадзянскае грамадства? Якая яго роля ў прававой дзяржаве? На падставе матэрыялаў СМІ прывядзіце прыклады дзейнасці грамадзянскага грамадства ў Рэспубліцы Беларусь.
4. Французскі філосаф XVIII ст. Ж. Ж. Русо пісаў: «На самай справе… хіба шчасце аднаго грамадзяніна — гэта ў меншай ступені агульная справа, чым дабрабыт усёй Дзяржавы?» З якой з характарыстык беларускай дзяржавы, на ваш погляд, сугучна гэта ідэя? Якім чынам дадзеная ідэя адлюстравана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?
5. Ці згодны вы са сцверджаннем, што важнай умовай эфектыўнасці дэмакратычнай сістэмы кіравання з'яўляецца грамадзянская актыўнасць кожнага чалавека? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
6. Якія прыметы суверэннай дзяржавы? *(Выкарыстайце матэрыялы 3, 4 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 46—50.)*
7. Канкрэтызуйце прыкладамі сцверджанне аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь як рэальным фактары сусветнай палітыкі.

Правообладатель Народная асвета

# § 3. Выбары і рэферэндумы

***Успомніце.*** **1.** Назавіце формы прамой і прадстаўнічай дэмакратыі ў Рэспубліцы Беларусь. **2.** Прывядзіце прыклады прадстаўнічых органаў улады з курса гісторыі. Якая іх асноўная функцыя?

**Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь.** ***Выбарчая сістэма*** — гэта сукупнасць норм, правіл і прыёмаў, якія вызначаюць парадак правядзення выбараў і выбрання прадстаўнічых органаў улады. Вылучаюць наступныя віды выбарчых сістэм: мажарытарная, прапарцыянальная, змешаная, прадстаўнічай меншасці.

Пры *мажарытарнай сістэме* перамогшым лічыцца кандыдат, які атрымаў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў у дадзенай выбарчай акрузе. У залежнасці ад таго, як разумеецца большасць, мажарытарныя сістэмы бываюць трох разнавіднасцей. *Мажарытарная сістэма адноснай большасці* прызнае перамогшым таго кандыдата, які сабраў па дадзенай выбарчай акрузе найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, хаця гэта можа быць і менш чым 50 %. Пры *мажарытарнай сістэме абсалютнай большасці* перамагае кандыдат, які набраў на выбарах больш за 50 % галасоў выбаршчыкаў (напрыклад, 50 % + 1 голас). *Мажарытарная сістэма кваліфікаванай большасці* азначае патрабаванне набраць колькасць галасоў, якая значна перавышае палову — напрыклад, 2/3 галасоў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў у адпаведнай акрузе.

Пры *прапарцыянальнай сістэме* выбаршчык галасуе не за канкрэтнага кандыдата, а за палітычную партыю (выбарчае аб'яднанне, выбарчы блок), і колькасць месцаў у парламенце вызначаецца прапарцыянальна колькасці галасоў выбаршчыкаў за тую ці іншую партыю, атрыманых па краіне ў цэлым. Такая сістэма прымяняецца толькі ва ўмовах шматпартыйнасці і мае свае асаблівасці ў кожнай дзяржаве.

Пры *змешанай сістэме* частка дэпутатаў выбіраецца па мажарытарнай сістэме, а частка — па прапарцыянальнай (Германія і інш.).

Пры *сістэме прадстаўнічай меншасці* за меншасцю (група насельніцтва, якая пражывае ў пэўнай мясцовасці ці


Правообладатель Народная асвета

мае нацыянальныя, этнічныя, рэлігійныя і іншыя асаблівасці) замацоўваецца фіксаваная колькасць месцаў у парламенце.




У Рэспубліцы Беларусь установлена мажарытарная выбарчая сістэма.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь вызначыла дзве ўмовы наяўнасці выбарчага права: грамадзянства Рэспублікі Беларусь і ўзрост (не менш чым 18 гадоў). ***Грамадзянства Рэспублікі Беларусь*** — гэта ўстойлівая прававая сувязь чалавека з Рэспублікай Беларусь, якая выяўляецца ў сукупнасці іх узаемных правоў, абавязкаў і адказнасці, заснаваная на прызнанні і павазе годнасці, асноўных правоў і свабод чалавека.

*Права выбіраць* у нашай краіне не залежыць ад такіх абставін, як паходжанне, сацыяльны і маёмасны стан, нацыянальнасць, пол, адукацыя, адносіны да рэлігіі.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць *права выбірацца*:

у дэпутаты мясцовых Саветаў — з 18 гадоў;

у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — з 21 года;

у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — з 30 гадоў, пры ўмове пражывання на тэрыторыі сваёй вобласці, горада Мінска не менш за 5 гадоў.

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь па нараджэнні, не маладзейшы за 35 гадоў, які пастаянна пражывае ў Рэс-

Правообладатель Народная асвета

публіцы Беларусь не менш чым 10 гадоў непасрэдна перад выбарамі.

У сусветнай практыцы прэзідэнт, як правіла, выбіраецца шляхам усенароднага галасавання (Беларусь, Францыя, Расія і інш.). Але часам, напрыклад у ЗША, выбары прэзідэнта ажыццяўляюцца ўскосна, з выкарыстаннем інстытута выбаршчыкаў, якіх выбіраюць выбаршчыкі. У парламенцкіх рэспубліках прэзідэнт, як правіла, выбіраецца парламентам (Германія, Італія, Венгрыя і інш.).

У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, а таксама асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгаворы суда ў месцах пазбаўлення волі, і асобы, у адносінах да якіх выбрана мера стрымання — утрыманне пад вартай.

**Выбарчы працэс, яго асноўныя стадыі.** Выбарчы працэс складаецца з шэрагу паслядоўных стадый, якія падрабязна рэгламентаваны ў *Выбарчым кодэксе Рэспублікі Беларусь*. Асноўныя стадыі выбарчага працэсу наступныя:

1. *Назначэнне даты выбараў.* Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь назначае выбары ў Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, мясцовыя Саветы дэпутатаў. Палата прадстаўнікоў назначае выбары Прэзідэнта.

2. *Складанне спісаў выбаршчыкаў.*

3. *Утварэнне выбарчых акруг і ўчасткаў; фарміраванне выбарчых камісій.* Для правядзення выбараў утвараюцца выбарчыя акругі. Напрыклад, для выбараў дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ўся тэрыторыя дзяржавы падзелена на 110 акруг. Ад кожнай акругі выбіраецца адзін дэпутат. Пры выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь уся тэрыторыя дзяржавы ўяўляе сабой адну акругу.

У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам ствараюцца камісіі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэферэндумаў. Гэта — тэрытарыяльныя камісіі, участковыя камісіі, акруговыя камісіі. Галоўная камісія ў краіне, якая працуе на пастаяннай аснове, — Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

4. *Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў.* Згодна з артыкулам 69 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты належыць грамадскім аб’яднанням, працоўным калектывам і грамадзянам у адпаведнасці з законам.


Правообладатель Народная асвета

5. *Перадвыбарная агітацыя.* Выбарчы кодэкс прадугледжвае правілы выступленняў кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў, Палаты прадстаўнікоў, у Савет Рэспублікі, у Прэзідэнты краіны. Кандыдаты маюць права выступаць на сходах, у сродках масавай інфармацыі, у тым ліку на тэлебачанні і радыё.

6. *Галасаванне.* У Рэспубліцы Беларусь выбары з'яўляюцца свабоднымі: выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць. Падрыхтоўка і правядзенне выбараў ажыццяўляюцца адкрыта і галосна. Выбары з'яўляюцца роўнымі. Гэта азначае, што адзін выбаршчык мае адзін голас. Выбары дэпутатаў з'яўляюцца прамымі: дэпутаты выбіраюцца грамадзянамі непасрэдна. Галасаванне на выбарах з'яўляецца тайным: кантроль за волевыяўленнем выбаршчыкаў у ходзе галасавання забараняецца (артыкулы 65—68 Канстытуцыі).

7. *Устанаўленне вынікаў выбараў.* У адпаведнасці з мажарытарнай выбарчай сістэмай, прынятай у нашай краіне, перамагае той кандыдат, які набраў большую колькасць галасоў, чым астатнія кандыдаты. Члены выбарчай камісіі падлічваюць галасы ў бюлетэнях; аб колькасці пададзеных галасоў складаюцца пратаколы, якія падпісваюць усе члены камісіі. Цэнтральная камісія падсумоўвае галасы па пратаколах з усёй краіны і абвяшчае вынікі галасавання.

8. *Апублікаванне вынікаў выбараў у афіцыйных выданнях* — гэта завяршальная стадыя выбараў.




Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў

Правообладатель Народная асвета

**Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.** Нароўні з выбарамі існуе такая форма народнага волевыяўлення, як рэферэндум. ***Рэферэндум*** (ад лац. referendum — тое, што павінна быць абвешчана) — гэта асобая форма галасавання выбаршчыкаў, у ходзе якога яны выбіраюць той ці іншы варыянт адказу на пастаўленае пытанне дзяржаўнага або грамадскага жыцця. Рэферэндум з'яўляецца адной з форм «прамой» дэмакратыі. У адрозненне ад выбараў галасаванне на рэферэндуме прыдае юрыдычную сілу не мандату нейкай асобы, напрыклад дэпутата, а рашэнню якога-небудзь важнага для грамадства пытання.

Вылучаюць наступныя віды рэферэндумаў:

а) у залежнасці ад таго, што выносіцца на галасаванне, — канстытуцыйныя і заканадаўчыя;

б) па юрыдычнай сіле — кансультатыўныя і абавязковыя;

в) у залежнасці ад тэрытарыяльных меж — рэспубліканскія і мясцовыя.

Згодна з артыкулам 76 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь рэферэндумы праводзяцца шляхам усеагульнага, свабоднага, роўнага і тайнага галасавання. Пры гэтым рашэнні, прынятыя рэферэндумам, могуць быць адменены або зменены толькі шляхам рэферэндуму, калі іншае не будзе вызначана рэферэндумам (артыкул 77 Канстытуцыі).

Свядомы і адказны ўдзел у выбарах, у рэферэндумах — гэта праяўленне грамадзянскай сталасці чалавека, яго грамадзянскі абавязак.

?!

**1.** Што такое выбарчая сістэма? Назавіце віды выбарчых сістэм; дайце іх характарыстыку. Якая выбарчая сістэма ўстаноўлена ў Рэспубліцы Беларусь?

**2.** Якія ўмовы рэалізацыі правоў выбіраць і быць выбранымі ў Рэспубліцы Беларусь? Якія катэгорыі грамадзян нашай краіны пазбаўлены права ўдзельнічаць у выбарах?

**3.** Ахарактарызуйце асноўныя прынцыпы і стадыі выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь. *(Выкарыстайце матэрыял 5 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 50—51.)*

**4.** Чым прамыя выбары адрозніваюцца ад ускосных? Ці праводзяцца ў нашай краіне ўскосныя выбары? Пры адказе выкарыстайце артыкул 91 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**5.** Што такое рэферэндум? Якія вылучаюць віды рэферэндумаў? Чым рэферэндум адрозніваецца ад выбараў? *(Выка-*


Правообладатель Народная асвета

*рыстайце матэрыял 6 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 51—52.)*

**6.** Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, знайдзіце адказы на пытанні: калі ў Рэспубліцы Беларусь праводзіліся рэферэндумы? Якія пытанні на іх вырашаліся? У чым заключаецца значнасць вынесеных на гэтыя рэферэндумы пытанняў для беларускага грамадства і кожнага грамадзяніна? Сваё меркаванне аргументуйце.

## § 4. Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь

***Успомніце.*** **1.** У чым заключаецца прынцып падзелу ўлад? **2.** Хто ў Рэспубліцы Беларусь мае права выбірацца ў дэпутаты мясцовых Саветаў, Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь?

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.** З прыняццем Канстытуцыі 15 сакавіка 1994 г. у Рэспубліцы Беларусь была зацверджана пасада Прэзідэнта. Гэта было абумоўлена набыццём Беларуссю незалежнасці і карэннымі пераўтварэннямі ў краіне, што патрабавала аператыўнасці прыняцця рашэнняў, мабільнасці іх выканання.

***Прэзідэнт*** — гэта кіраўнік дзяржавы, якая мае рэспубліканскую форму кіравання. У ліпені 1994 г. першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў выбраны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка (перавыбраны ў 2001 і 2006 гг.).

Артыкул 79 Канстытуцыі нашай краіны абвяшчае: «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

Прэзідэнт увасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. Прэзідэнт прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, ажыццяўляе пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады.

Прэзідэнт валодае недатыкальнасцю, яго гонар і годнасць ахоўваюцца законам».

Правообладатель Народная асвета

Вылучаецца некалькі груп паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

*1. Паўнамоцтвы па фарміраванні органаў дзяржаўнай улады.*

Прэзідэнт са згоды Палаты прадстаўнікоў назначае на пасаду Прэм’ер-міністра, вызначае структуру Урада Рэспублікі Беларусь, назначае на пасаду і вызваляе ад пасады намеснікаў Прэм’ер-міністра, міністраў і іншых членаў Урада, прымае рашэнне аб адстаўцы Урада, можа адмяняць яго акты. Прэзідэнт са згоды Савета Рэспублікі назначае на пасаду старшынь Канстытуцыйнага, Вярхоўнага, Вышэйшага Гаспадарчага судоў. Таксама Прэзідэнт назначае 6 суддзяў Канстытуцыйнага Суда. Прэзідэнт са згоды Савета Рэспублікі назначае Старшыню Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, 6 членаў гэтай камісіі, а таксама шэраг іншых вышэйшых службовых асоб.

*2. Паўнамоцтвы ў галіне заканадаўства.*

Прэзідэнт валодае правам заканадаўчай ініцыятывы, падпісвае законы, выдае дэкрэты, указы і распараджэнні. Прэзідэнт таксама валодае *правам вета* (правам адхілення прынятых Парламентам законаў). Такое права прадугледжана і заканадаўствам многіх іншых краін.

*3. Паўнамоцтвы ў галіне міжнародных адносін.*

Прэзідэнт вядзе перагаворы і падпісвае міжнародныя дагаворы, назначае і адклікае дыпламатычных прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах і пры міжнародных арганізацыях, прымае даверчыя і адзыўныя граматы дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў.



Зборнікі нарматыўных прававых актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь


Правообладатель Народная асвета

*4. Паўнамоцтвы ў галіне абароны дзяржавы.*

Прэзідэнт фарміруе і ўзначальвае Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь. Ён з'яўляецца Галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь, назначае на пасады і вызваляе ад пасад вышэйшае камандаванне Узброеных Сіл. У паўнамоцтвы Прэзідэнта ўваходзіць увядзенне ваеннага становішча, аб'яўленне поўнай або частковай мабілізацыі.

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь належыць і шэраг іншых паўнамоцтваў, напрыклад права вырашаць пытанні аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь і прадастаўленні прытулку, прымаць рашэнні аб памілаванні, узнагароджанні, прысваенні класных чыноў і званняў. Прэзідэнт таксама ўстанаўлівае дзяржаўныя святы і святочныя дні.

**Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь.** ***Парламент*** — гэта прадстаўнічы і заканадаўчы орган дзяржавы. Парламент нашай краіны — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь — складаецца з дзвюх палат: Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Палата прадстаўнікоў уключае ў свой склад 110 дэпутатаў, якія выбіраюцца насельніцтвам на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва і складаецца з 64 членаў: ад кожнай вобласці і горада Мінска выбіраецца па восем членаў Савета Рэспублікі; яшчэ восем назначаюцца Прэзідэнтам. Тэрмін паўнамоцтваў Парламента Рэспублікі Беларусь — 4 гады.

Асноўная функцыя Парламента — ажыццяўленне заканадаўчай улады. Заканадаўчы працэс пачынаецца з *заканадаўчай ініцыятывы* — прапановы прыняць закон. Правам заканадаўчай ініцыятывы валодаюць Прэзідэнт, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, Урад, а таксама грамадзяне ў колькасці не менш чым 50 тыс. чалавек.

Законапраект разглядаецца ў Палаце прадстаўнікоў, абмяркоўваецца ў двух чытаннях (*чытанне* — стадыя абмеркавання законапраекта на пасяджэннях Парламента), прымаецца большасцю галасоў, адабраецца Саветам Рэспублікі (таксама большасцю галасоў). Далей закон падпісваецца Прэзідэнтам. Пасля падпісання закон падлягае неадкладнаму апублікаванню ў афіцыйных выданнях і праз 10 дзён пасля апублікавання ўступае ў сілу. Такі тэрмін для ўступлення ў сілу — 10 дзён — устаноўлены для таго, каб гра-

Правообладатель Народная асвета

мадзяне за гэты час маглі азнаёміцца з тэкстам новага закона, даведаліся аб сваіх новых правах і абавязках. На Нацыянальным прававым Інтэрнэт-партале «Права.by» (адрас у Інтэрнэце http://www.pravo.by) кожны грамадзянін можа азнаёміцца з апошнімі нарматыўнымі прававымі актамі, якія прыняты ў дзяржаве, у тым ліку і з законамі.

Парламент таксама выконвае шэраг кантрольных функцый, у прыватнасці праводзіць *парламенцкія слуханні*. На іх заслухоўваюцца меркаванні членаў Парламента, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, экспертаў па канкрэтным законапраекце або іншым важным пытанні і прымаецца заключэнне (рэкамендацыя). Парламент таксама ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю выканаўчай улады — Урада.

У галіне *знешняй палітыкі* Парламент ратыфікуе (зацвярджае) міжнародныя дагаворы, актыўна супрацоўнічае з міжнароднымі арганізацыямі.

**Урад — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.** ***Урад*** — гэта орган выканаўчай улады ў дзяржаве. Асноўная задача выканаўчай улады — выкананне законаў. Выканаўчая ўлада — *вертыкаль* улады з падпарадкаваннем ніжэйстаячых органаў вышэйстаячым, прызваная забяспечыць эфектыўнае



У зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь



Правообладатель Народная асвета

кіраванне ў дзяржаве. Выкананне законаў патрабуе ажыццяўлення вялікай распарадчай дзейнасці, у ходзе якой прымаюцца падзаконныя акты — рашэнні, пастановы, загады, распараджэнні.

Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе Урад — *Савет Міністраў*. У склад Савета Міністраў уваходзяць Прэм'ер-міністр, яго намеснікі, міністры, старшыні дзяржаўных камітэтаў, а таксама некаторыя іншыя службовыя асобы. Савет Міністраў кіруе сістэмай падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Работай Урада кіруе Прэм'ер-міністр, які назначаецца Прэзідэнтам са згоды Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Структуру Урада таксама вызначае Прэзідэнт. Ён мае права адправіць міністраў у адстаўку і назначыць новых членаў Урада. Канстытуцыя прадугледжвае, што Урад складае свае паўнамоцтвы перад нававыбраным Прэзідэнтам.

У сучасных дзяржавах роля выканаўчай улады даволі вялікая і мае тэндэнцыю да ўзмацнення. Гэта абумоўлена ростам насельніцтва, ускладненнем грамадскіх адносін, узнікненнем новых сфер дзейнасці. Напрыклад, сфера інфармацыі ў апошні час набыла такое важнае значэнне, што ў многіх дзяржавах заснаваны міністэрствы інфармацыі. Аварыі і катастрофы, якія адбываюцца ў розных краінах свету, запатрабавалі стварэння міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях. Свае сферы дзейнасці маюць міністэрствы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, эканомікі, фінансаў, абароны, унутраных спраў, адукацыі, культуры, працы і сацыяльнай абароны і інш.

**Судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь.** *Судовая ўлада* — гэта самастойная і незалежная галіна ўлады, якая ажыццяўляе *правасуддзе*, г. зн. разглядае і вырашае крымінальныя, грамадзянскія, адміністрацыйныя, гаспадарчыя і канстытуцыйныя справы ў парадку, устаноўленым законам. У Рэспубліцы Беларусь *судовая сістэма* складаецца з Канстытуцыйнага Суда, агульных судоў, гаспадарчых судоў.

*Канстытуцыйны Суд* прызваны забяспечыць вяршэнства Канстытуцыі і яе прамое дзеянне на тэрыторыі краіны. Ажыццяўляючы кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных актаў у дзяржаве, Канстытуцыйны Суд тым самым аба-

Правообладатель Народная асвета

раняе правы грамадзян. Грамадзянін не можа звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд непасрэдна, але ён мае права накіроўваць свой зварот Прэзідэнту, у палаты Нацыянальнага сходу, Савет Міністраў, Вярхоўны Суд, Вышэйшы Гаспадарчы Суд з просьбай звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд. Калі Канстытуцыйны Суд пры разглядзе справы выявіць, што закон ці іншы нарматыўны акт парушае Канстытуцыю, ён адмяняе іх.

*Агульныя суды* ажыццяўляюць правасуддзе па грамадзянскіх, крымінальных і адміністрацыйных справах. Паводле Канстытуцыі суддзі пры ажыццяўленні правасуддзя незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону. Судовыя пастановы з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх грамадзян і службовых асоб. Узначальвае сістэму агульных судоў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Сістэма *гаспадарчых судоў* ажыццяўляе эканамічнае правасуддзе. Узначальвае яе Вышэйшы Гаспадарчы Суд Рэспублікі Беларусь. У гаспадарчых судах чалавек можа абараніць свае інтарэсы ў якасці суб'екта гаспадарання.

**Мясцовае кіраванне і самакіраванне.** Мясцовае кіраванне і самакіраванне ўваходзіць у агульную сістэму дзяржаўнага кіравання грамадствам. Разам з тым агульнадзяржаўная ўлада — улада вярхоўная; улада ж мясцовых органаў кіравання і самакіравання дзейнічае ў парадку і межах, адведзеных ёй вярхоўнай уладай. Перадача ўладных паўнамоцтваў ад цэнтра на мясцовы ўзровень вызваляе вярхоўную ўладу ад мноства прыватных праблем, якія павінны вырашаць мясцовыя органы.

Асноўнымі органамі *мясцовага самакіравання* ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца *Саветы дэпутатаў*. Мясцовыя Саветы дэпутатаў выбіраюцца жыхарамі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (сёлы, гарады, раёны, вобласці) на 4 гады. Дзейнасць Саветаў дэпутатаў забяспечваецца за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту. На сесіях дэпутаты мясцовых Саветаў зацвярджаюць праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця свайго горада або раёна, вобласці, распараджаюцца даходамі мясцовых бюджэтаў, камунальнай уласнасцю, устанаўліваюць мясцовыя падаткі і зборы, абмяркоўваюць іншыя пытанні, звязаныя з развіццём сваёй тэрыторыі. У Рэспубліцы Беларусь мясцовае самакіраванне з'яўляецца «важнейшым элементам гра-


Правообладатель Народная асвета

мадзянскага грамадства і базісам дэмакратычнай дзяржаўнасці, які аб'ядноўвае народ і ўладу» (А. Р. Лукашэнка).

Да мясцовага самакіравання адносяцца таксама органы тэрытарыяльнага *грамадскага самакіравання* — саветы і камітэты мікрараёнаў, жыллёвых комплексаў, дамавыя, вулічныя, квартальныя, пасялковыя, сельскія камітэты і інш.

Мясцовае самакіраванне можа ажыццяўляцца і шляхам правядзення *мясцовых рэферэндумаў* і *сходаў грамадзян*, якія ўяўляюць сабой форму прамога ўдзелу грамадзян у дзяржаўных і грамадскіх справах. Права грамадзян на мясцовае самакіраванне — адзін з фундаментальных элементаў дэмакратычнай дзяржавы.

*Мясцовае кіраванне* ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляюць выканаўчыя і распарадчыя органы адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. На тэрыторыях абласцей, раёнаў, гарадоў, пасёлкаў, сельсаветаў выканаўчым і распарадчым органам з'яўляецца *выканаўчы камітэт*. На тэрыторыі раёнаў у гарадах выканаўчым і распарадчым органам з'яўляецца *мясцовая адміністрацыя*.

?!

1. Складзіце табліцу «Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь», адлюструйце ў ёй органы заканадаўчай, выканаўчай, судовай улады і парадак іх фарміравання.
2. Ахарактарызуйце паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў, судоў.
3. Хто ў Рэспубліцы Беларусь валодае правам заканадаўчай ініцыятывы? Назавіце стадыі заканадаўчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь.
4. Назавіце органы мясцовага кіравання і самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь. Ахарактарызуйце іх паўнамоцтвы.
5. Як вы разумееце сцверджанне: «У Рэспубліцы Беларусь мясцовае самакіраванне з'яўляецца важнейшым элементам грамадзянскага грамадства і базісам дэмакратычнай дзяржаўнасці, які аб'ядноўвае народ і ўладу»?
6. Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці мясцовых органаў кіравання і самакіравання ў вашым рэгіёне (вобласці, раёне, горадзе).

Правообладатель Народная асвета

## § 5. Канстытуцыйныя правы і абавязкі грамадзян

*Успомніце.* **1.** Якія асноўныя палажэнні тэорыі натуральнага права? **2.** Што такое прававы статус асобы?

**Асноўныя міжнародныя акты ў галіне правоў і свабод чалавека.** Сёння, як і паўстагоддзя назад, галоўным дакументам у галіне правоў чалавека з'яўляецца *Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека*, прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН 10 снежня 1948 г. З гэтага часу ўсе міжнародныя дагаворы распрацоўваюцца і заключаюцца на аснове Дэкларацыі, яе палажэнні ўвайшлі ў канстытуцыі розных краін свету.

З набыццём незалежнасці Рэспубліка Беларусь стала на шлях строгага і няўхільнага выканання міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека, іх рэалізацыі і абароны. Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, прынятых у 1966 г. Практычна ўсе абвешчаныя ў гэтых пактах правы і свабоды знайшлі замацаванне ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і актах беларускага заканадаўства.

Да асноўных дакументаў ААН у галіне абароны правоў чалавека можна таксама аднесці Канвенцыю супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання (1987 г.), Звод прынцыпаў абароны ўсіх асоб, якія падвяргаюцца затрыманню або заключэнню ў якой бы то ні было форме (1988 г.), Канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1979 г.), Канвенцыю аб правах дзіцяці (1989 г.). Першыя два з гэтых дакументаў накіраваны на тое, каб урэгуляваць адносіны да злачынцаў і правапарушальнікаў, якіх дзяржава падвяргае затрыманню, пакаранню, прымяняючы прымусовыя меры.





Правообладатель Народная асвета

Традыцыйна адносіны да такіх людзей з боку грамадства адмоўныя, і многія лічаць, што выкананне правоў чалавека тут неабавязковае. Аднак прынцыпы гуманізму і справядлівасці, як абвяшчаюць указаныя дакументы, неабходна распаўсюджваць і на крымінальнае судаводства. У ім павінны выконвацца сучасныя міжнародныя падыходы, згодна з якімі пакаранне з'яўляецца толькі пакараннем і не дапускае катаванняў і бесчалавечнага, жорсткага абыходжання з падазронымі або асуджанымі. Дзве з названых вышэй канвенцый абараняюць правы жанчын і дзяцей, якія больш за іншых маюць патрэбу ў сацыяльнай і прававой абароне.

**Канстытуцыя і нацыянальнае заканадаўства ў галіне абароны правоў чалавека.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвясціла, што чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы (артыкул 2 Канстытуцыі). У сучасным свеце дзяржава можа лічыцца прававой і дэмакратычнай толькі пры захаванні правоў і свабод чалавека.

У раздзеле II Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваны асабістыя і палітычныя правы і свабоды, сацыяльна-эканамічныя і культурныя правы грамадзян рэспублікі. У развіццё канстытуцыйных палажэнняў прыняты шэраг кодэксаў, законаў, іншых нарматыўных прававых актаў, у якіх канкрэтызуюцца канстытуцыйныя правы грамадзян, прадугледжаны гарантыі іх рэалізацыі і абароны. Так, абарона асобы ад злачынных замахаў, у тым ліку і на жыццё, пакаранні за злачынствы і іншыя правапарушэнні рэгулююцца Крымінальным кодэксам. Права на працу рэгламентавана ў Працоўным кодэксе; права на жыллё і звязаныя з ім праваадносіны — у Жыллёвым кодэксе; права ўласнасці і цэлы комплекс іншых маёмасных правоў грамадзян — у Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь. Адпаведнымі законамі рэгулюецца дзейнасць палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, правядзенне масавых мерапрыемстваў і г. д. Нацыянальнае заканадаўства ў галіне абароны правоў чалавека даволі вялікае і пастаянна ўдасканальваецца.

**Правы і свабоды чалавека ў Рэспубліцы Беларусь.** Канстытуцыя, іншыя акты нацыянальнага заканадаўства зыходзяць з таго, што асноўныя правы чалавека належаць яму ад нараджэння, а не прадастаўлены дзяржавай. Правы чалавека грунтуюцца на роўнасці ўсіх людзей, з'яўляюцца

Правообладатель Народная асвета

неад’емнымі і гарантаваны кожнаму, хто знаходзіцца пад юрысдыкцыяй (г. зн. у сферы дзеяння нацыянальных законаў, іншых нарматыўных прававых актаў) беларускай дзяржавы. Пры гэтым ажыццяўленне правоў і свабод аднаго чалавека не павінна парушаць правоў і свабод іншых людзей. У асабліва складаных сітуацыях дзяржава можа часова абмежаваць правы чалавека. Па нашай Канстытуцыі гэта магчыма ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб (артыкул 23 Канстытуцыі).

***Асабістыя правы.*** Права на жыццё выступае зыходным правам любога чалавека. Абавязак дзяржавы — абараняць жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў (артыкул 24 Канстытуцыі). Права на жыццё забяспечваецца мерамі, накіраванымі на барацьбу са злачыннасцю, на папярэджанне аварый на вытворчасці, прафілактыкай дарожна-транспартных здарэнняў і інш.

З правам на жыццё цесна звязана *праблема смяротнай кары* як выключнай меры пакарання. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь дапускае прымяненне гэтай меры адказнасці за асабліва цяжкія злачынствы і толькі згодна з прыгаворам суда. Рух за адмену смяротнай кары, які пачаўся ў краінах Захаду пасля Другой сусветнай вайны, прывёў да ўключэння адпаведных палажэнняў у шэраг важных міжнародна-прававых дакументаў. Напрыклад, у дакументах, прынятых у рамках Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, падкрэсліваецца неабходнасць абмежавання пераліку злачынстваў, караемых смерцю, і дакладнага выканання гарантый законнасці ў адносінах да асоб, якім выносіцца смяротны прыгавор.

З правам на жыццё цесна звязаны шэраг іншых правоў і свабод чалавека. У іх ліку *права на ахову здароўя*, *на спрыяльнае навакольнае асяроддзе* (артыкулы 45, 46 Канстытуцыі).

Да асабістых правоў грамадзян Беларусі адносіцца таксама *права на свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы* (артыкул 25 Канстытуцыі). Яно прадугледжвае, што чалавек можа ажыццяўляць свае жаданні, мэты, мары, не парушаючы пры гэтым правоў іншых людзей. Свабода і недатыкальнасць асобы знаходзяцца пад аховай дзяржавы.

У нашай Канстытуцыі замацавана і *права на тайну асабістага жыцця*: кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на


Правообладатель Народная асвета

тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў (артыкул 28). Да асабістых правоў яшчэ адносяць *недатыкальнасць жылля, свабоду перамяшчэння і выбару месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь, свабоду выбару нацыянальнасці і мовы зносін, а таксама права на судовую абарону* (артыкулы 29, 30, 50, 60). Дэмакратычнасць судовага разбору ў беларускай дзяржаве дасягаецца выкананнем такіх прынцыпаў правасуддзя, як незалежнасць суда, галоснасць, законнасць, спаборнасць і роўнасць бакоў, справядлівасць.

***Палітычныя правы і свабоды*** па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даюць чалавеку магчымасць удзельнічаць у жыцці грамадства і дзяржавы. Іх рэалізацыя забяспечвае дэмакратычнасць фарміравання і дзейнасці дзяржаўных органаў улады. Неабходна адзначыць, што ў адрозненне ад асабістых правоў многія палітычныя правы і свабоды належаць толькі грамадзянам Рэспублікі Беларусь. Гэта *права выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы, права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах, права на ўдзел у вырашэнні дзяржаўных спраў* (артыкулы 38, 39, 37).

Рэалізуючы права выбіраць і быць выбранымі, грамадзяне Беларусі могуць удзельнічаць у дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання. На выбарчых правах грамадзян, на свабодным волевыяўленні грамадзяніна ў час выбараў у многім грунтуюцца і суверэнітэт, і прынцып народаўладдзя. Да палітычных правоў і свабод таксама адносяцца права на *свабоду аб'яднанняў; свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый; свабоду поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне* (свабода слова і свабода друку); *права на інфармацыю, права на звароты ў дзяржаўныя органы* і інш. (артыкулы 36, 35, 33, 34, 40). У любой дэмакратычнай краіне рэалізацыя гэтых правоў і свабод, якія закранаюць інтарэсы многіх людзей, рэгламен-




Правообладатель Народная асвета

тавана законам. У прыватнасці, пры правядзенні мітынгаў, шэсцяў, пікетавання агульнапрынятым у міжнароднай практыцы з’яўляецца папярэдняе ўзгадненне гэтых мерапрыемстваў з мясцовымі органамі ўлады, улік патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства.

***Сацыяльна-эканамічныя правы*** ахопліваюць сферу працы, занятасці, дабрабыту людзей. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвясціла, што кожны мае права на годны ўзровень жыцця, уключаючы дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў (артыкул 21 Канстытуцыі). Міжнародныя прававыя акты не ўстанаўліваюць якіх-небудзь строгіх норм даходаў грамадзян, пэўных умоў іх жыцця. Рэалізацыя сацыяльна-эканамічных правоў у кожнай дзяржаве залежыць ад стану яе эканомікі.

Асаблівую ролю іграе *права на працу* — права чалавека на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэбнасцей, а таксама права на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы (артыкул 41 Канстытуцыі). Праца абвешчана як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека. У Рэспубліцы Беларусь праводзіцца актыўная палітыка па забеспячэнні занятасці працаздольнага насельніцтва. Моладзі гарантавана першае працоўнае месца; існуюць праграмы пераабучэння і перакваліфікацыі, калі чалавек атрымаў спецыяльнасць, а яна аказалася не запатрабаванай. Дапаўняюць права на працу *права на справядлівую долю ўзнагароджання ў эканамічных выніках працы і права на адпачынак* (артыкулы 42, 43).

Неабходна, аднак, помніць, што пры рэалізацыі сацыяльна-эканамічных правоў ключавая роля належыць самому чалавеку. Не толькі права на працу, але і іншыя найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя правы — *права ўласнасці, права на жыллё* (артыкулы 44, 48) і інш., рэгламентаваны ў многіх кодэксах і законах, але на практыцы іх ажыццяўленне залежыць перш за ўсё ад самога чалавека, яго выхавання, мэтанакіраванасці, працаздольнасці, ад тых намаганняў, якія ён прыкладвае для забеспячэння свайго дабрабыту.

***Культурныя правы*** забяспечваюць духоўнае развіццё чалавека. Да іх адносяцца *права на адукацыю, права на ўдзел у культурным жыцці, свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці* (артыкулы 49, 51). У Рэспубліцы Бе-


Правообладатель Народная асвета

ларусь гарантуюцца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Кожны можа на конкурснай аснове бясплатна атрымаць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах. Акрамя бясплатнай, існуе магчымасць атрымаць адукацыю платна, асабліва ў выпадку асваення дадатковай ці новай спецыяльнасці.

Права на ўдзел у культурным жыцці забяспечваецца агульнадаступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія належаць дзяржаве і грамадству. Гэтаму служыць шырокая сетка культурна-асветніцкіх устаноў. У краіне дзейнічае мноства музеяў, у тым ліку краязнаўчых, якія маюць унікальныя экспанаты, яскравыя прыклады прафесійнай і народнай творчасці.

**Абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь.** Правы чалавека нельга аддзяліць ад абавязкаў грамадзян перад дзяржавай. Кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязаны выконваць яе Канстытуцыю, законы і паважаць нацыянальныя традыцыі. Усе мы павінны паважаць годнасць, правы, свабоды, законныя інтарэсы іншых асоб, берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну нацыі і ў цэлым набытак краіны, ахоўваць прыроднае асяроддзе (артыкулы 52—55 Канстытуцыі). Будучы грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, мы абавязаны прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты дзяржаўных падаткаў, пошлін і іншых плацяжоў (артыкул 56). Абавязак і свяшчэнны доўг кожнага грамадзяніна — абараняць сваю Радзіму (артыкул 57).



Жылы мікраэраён «Паўночны» ў г. Оршы

Правообладатель Народная асвета

Пералік абавязкаў параўнальна невялікі, але ад таго, як мы іх выконваем у сваёй паўсядзённай дзейнасці, залежыць якасць нашага жыцця, стан і перспектывы нашага грамадства. Дзякуючы выкананню намі сваіх абавязкаў рэалізуюцца і нашы правы.

?!
**1.** Назавіце асноўныя міжнародныя акты ў галіне правоў і свабод чалавека. Якія ідэі гэтых дакументаў рэалізаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? Назавіце асноўныя акты нацыянальнага заканадаўства ў галіне абароны правоў чалавека.
**2.** Ахарактарызуйце асабістыя, палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, культурныя правы грамадзян Рэспублікі Беларусь. У чым адрозненне палітычных правоў грамадзян ад асабістых? *(Выкарыстайце матэрыял 7 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 52—53.)* Ці можна лічыць палітычныя і эканамічныя правы чалавека асноўнымі, а культурныя правы другаснымі? Свой адказ аргументуйце.
**3.** Якім чынам забяспечваецца рэалізацыя асабістых, палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь? У якіх выпадках Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прадугледжвае абмежаванне правоў і свабод чалавека?
**4.** Назавіце асноўныя абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь. Растлумачце, чаму выкананне грамадзянамі сваіх абавязкаў — гэта важнейшая ўмова рэалізацыі іх правоў.
**5.** Ці згодны вы са сцверджаннем, што смяротная кара — гэта парушэнне права чалавека на жыццё? Сваё меркаванне аргументуйце.
**6.** Напішыце эсэ на тэму: «Свабода і адказнасць грамадзяніна».

## Практыкум
## «...Грамадзянінам быць абавязаны»

**1.** Старажытнагрэчаскі філосаф Арыстоцель (384—322 да н. э.) у сваім творы «Палітыка» пісаў, што «дзяржава ёсць сукупнасць грамадзян»; лепш за ўсё «паняцце грамадзяніна можа быць вызначана праз удзел у судзе і ўладзе».

?!
1. Пракаменціруйце сцверджанні Арыстоцеля аб грамадзяніне і грамадзянстве.
2. Які сэнс асабіста вы ўкладваеце ў выраз «быць грамадзянінам»?


Правообладатель Народная асвета

3. Як вы разумееце словы рускага паэта М. А. Някрасава: «Паэтам можаш ты не быць, а грамадзянінам быць абавязаны»?

**2.** Многія вялікія мысліцелі і палітыкі выказвалі сваё меркаванне аб дэмакратыі. Напрыклад, старажытнагрэчаскі філосаф Арыстоцель вызначаў дэмакратыю як кіраванне немаёмнай большасці дзеля ўласнага дабрабыту. Паводле англійскай прымаўкі дэмакратыя — гэта перш за ўсё працэдура. Карл Попер, англійскі філосаф і сацыёлаг (1902—1994), сцвярджаў: «Дэмакратычныя інстытуты не могуць паляпшацца самі — іх паляпшэнне залежыць ад нас. Праблема паляпшэння дэмакратычных інстытутаў — гэта заўсёды праблема, якая стаіць перад асобай, а не перад інстытутамі».

?! 1. Пракаменціруйце гэтыя выказванні. Ці ўсё ў іх бясспрэчна?
2. Ці згодны вы з тым, што найважнейшай умовай дэмакратыі з’яўляецца высокі ўзровень палітычнай культуры грамадзян? Сваю думку аргументуйце.

**3.** У дэмакратычным сэнсе «народ» — гэта супольнасць людзей, якія з’яўляюцца грамадзянамі дзяржавы і праяўляюць грамадзянскую актыўнасць. У навуковай літаратуры выказваецца часам пункт погляду, што прынцып непасрэднага ажыццяўлення ўлады народам — юрыдычная фікцыя, рэальна ж дзяржаўную ўладу ажыццяўляе пэўная палітычная эліта, якую перыядычна змяняе іншая.

?! 1. Ці згодны вы з такім пунктам погляду? Сваё меркаванне аргументуйце.
2. У чым, на ваш погляд, праяўляецца актыўная грамадзянская пазіцыя чалавека? Прывядзіце прыклады праяўлення грамадзянскай актыўнасці чалавека (з літаратуры, гісторыі, паўсядзённага жыцця).

**4.** Згодна з канстытуцыйным прынцыпам усе людзі свабодныя ад нараджэння, ніхто не мае права абмяжоўваць свабоду. Аднак існуе канстытуцыйна-прававы, філасофскі, гуманістычны прынцып меж «абсалютнай» свабоды: свабода аднаго чалавека абмежавана свабодай усіх.

?! 1. Як вы разумееце гэты прынцып?
2. Прадоўжыце разважанні: «Чалавек павінен быць свабодны ад ...», «Чалавек павінен быць свабодны для ...». Свае думкі растлумачце.

Правообладатель Народная асвета

**5.** Праблема роўнасці людзей узнікла яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Філосафы па-рознаму тлумачаць гэту праблему і шляхі яе вырашэння. Нярэдка лічаць, што роўнасць людзей складаецца з роўнасці іх правоў. Старажытнарымскі філосаф Сенека (I ст. да н. э.) гаварыў: «Роўнасць правоў не ў тым, што ўсе імі карыстаюцца, а ў тым, што яны ўсім прадастаўлены».

**?**
1. Як вы разумееце гэта выказванне? У чым, на ваш погляд, павінна заключацца роўнасць людзей? Сваю думку растлумачце.
2. Як прынцып роўнасці людзей замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?

**6.** Дакументам, які сведчыць асобу чалавека, з'яўляецца яго пашпарт. Замест пашпарта дазваляецца ў пэўных абставінах прад'яўляць іншыя дакументы, якія сведчаць асобу: пенсійнае пасведчанне (пры наяўнасці ў ім фатаграфіі), студэнцкі білет, пасведчанне супрацоўніка дзяржаўнага органа, ваенны білет (для ваеннаслужачых тэрміновай службы), даведкі органаў унутраных спраў (для грамадзян, якія страцілі пашпарт або здалі яго на абмен).

Ва ўсіх названых дакументах не ўказваецца нацыянальнасць чалавека. Згодна з артыкулам 50 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, таксама як ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання нацыянальнай прыналежнасці.

**?**
1. Чым, на ваш погляд, абумоўлена з'яўленне артыкула 50 у Асноўным Законе нашай краіны?
2. Якая сувязь існуе паміж паняццямі «нацыянальная самасвядомасць», «нацыянальнае самавызначэнне», «нацыянальнасць»? Выкарыстайце пры неабходнасці дадатковую літаратуру.

**7.** Артыкул 46 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устанаўлівае, што кожны мае права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе і на пакрыццё шкоды, прычыненай парушэннем гэтага права. Дадзенаму праву адпавядае абавязак, устаноўлены артыкулам 55 Канстытуцыі: «Ахова прыроднага асяроддзя — абавязак кожнага».

**?!**
1. Якія напрамкі дзейнасці беларускай дзяржавы абумоўлівае артыкул 46 Канстытуцыі? Як вы думаеце, што можа зрабіць кожны з нас для захавання прыроды?


Правообладатель Народная асвета

2. Прааналізуйце артыкулы раздзела II Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прывядзіце прыклады іншых правоў і абавязкаў грамадзян, якія пацвярджаюць вывад аб іх узаемазвязанасці і ўзаемаабумоўленасці.

**8.** Згодна з артыкулам 47 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь грамадзянам гарантуецца права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам. Дзяржава праяўляе асаблівы клопат аб ветэранах вайны і працы, а таксама аб асобах, якія страцілі здароўе пры абароне дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў.

**?**
1. Чым абумоўлена вылучэнне названых катэгорый асоб, якія падлягаюць асаблівай абароне з боку дзяржавы? Свой адказ аргументуйце.
2. У чым заключаюцца абавязкі дзяржавы ў адносінах да астатніх катэгорый грамадзян?

**9.** У шэрагу замежных краін — Аўстрыі, Бельгіі, Нідэрландах, Італіі, Іспаніі, многіх дзяржавах Лацінскай Амерыкі — выбары з'яўляюцца абавязковымі. За няўдзел у выбарах прадугледжаны штраф, а ў Грэцыі і Турцыі — пазбаўленне волі.

**?!**
1. Чым, на вашу думку, тлумачацца строгія меры пакарання за няўдзел у выбарах у асобных краінах?
2. Падбярыце аргумент у пацверджанне тэзіса: «Удзел у выбарах — абавязак кожнага грамадзяніна».

**10.** Артыкул 40 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устанаўлівае права кожнага накіроўваць асабістыя або калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы і абавязак дзяржаўных органаў разгледзець зварот і даць адказ па сутнасці ў вызначаны законам тэрмін.

У адпаведнасці з Законам «Аб зваротах грамадзян» пісьмовы зварот павінен утрымліваць: 1) назву і (або) адрас дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі (пасаду, прозвішча, імя, імя па бацьку службовай асобы), у якія накіроўваецца зварот; 2) прозвішча, імя, імя па бацьку грамадзяніна, даныя аб яго месцы жыхарства і (або) працы (вучобы); 3) выкладанне сутнасці звароту (прапановы, заявы, скаргі); 4) асабісты подпіс грамадзяніна. Звароты павінны быць разгледжаны не па-

Правообладатель Народная асвета

зней чым за адзін месяц з дня іх рэгістрацыі ў дзяржаўных органах. Ананімныя звароты не разглядаюцца.

?! 1. Пракаменціруйце ўмовы рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян Рэспублікі Беларусь на зварот у дзяржаўныя органы.
2. Чым, на ваш погляд, абумоўлены дадзеныя патрабаванні?

**11.** Французскі філосаф XVIII ст. Ш. Мантэск'ё ў трактаце «Аб духу законаў» пісаў: «Для грамадзяніна палітычная свабода ёсць духоўны спакой, заснаваны на перакананні ў сваёй бяспецы. Каб валодаць гэтай свабодай, неабходна такое кіраванне, пры якім адзін грамадзянін можа не баяцца другога грамадзяніна. Калі ўлада заканадаўчая і выканаўчая будуць злучаны ў адной асобе ці ўстанове, то свабоды не будзе... Не будзе свабоды і ў тым выпадку, калі судовая ўлада не аддзелена ад улады заканадаўчай і выканаўчай».

? 1. Аб якім прынцыпе кіравання дзяржавай ідзе гаворка ў гэтым выказванні?
2. Як дадзены прынцып кіравання дзяржавай адлюстраваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?

**12.** Важным элементам грамадзянскай культуры чалавека з'яўляюцца яго перакананні; яны ў многім вызначаюць яго паводзіны. У літаратуры сустракаюцца розныя меркаванні аб ролі перакананняў у жыцці чалавека. Напрыклад:

а) «Калі ў чалавека ёсць сапраўды якія-небудзь перакананні, то ні спачуванне, ні павага, ні сяброўства, ні каханне, нішто, акрамя абавязковых доказаў, не ў стане змяніць у гэтых перакананнях ні адной найдрабнейшай падрабязнасці» (Д. І. Пісараў).

б) «Недастаткова вызначаць мараль адданасцю сваім перакананням. Неабходна яшчэ бесперапынна ўзбуджаць у сабе пытанне: «Ці дакладныя мае перакананні?» (Ф. М. Дастаеўскі).

? 1. Якому з двух вышэйпрыведзеных меркаванняў аб месцы перакананняў у жыцці чалавека вы аддаяце перавагу? Чаму?
2. Як і калі фарміруюцца перакананні чалавека? Што ўплывае на іх станаўленне?


Правообладатель Народная асвета

## Дакументы і матэрыялы

**1. З кнігі Р. А. Васілевіча «Права ў нашым жыцці»**

Канстытуцыя — гэта Асноўны Закон дзяржавы, які замацоўвае арганізацыю дзяржаўнай улады і вызначае яе ўзаемаадносіны з грамадствам і грамадзянамі. Канстытуцыя валодае вышэйшай юрыдычнай сілай, вяршэнствам у адносінах да ўсіх іншых прававых актаў.

Важнай юрыдычнай уласцівасцю Канстытуцыі з'яўляецца яе стабільнасць, устойлівасць. Прыкладам стабільнасці з'яўляецца Канстытуцыя ЗША, якая была прынята ў 1787 годзе і дзейнічае ўжо больш за дзвесце гадоў, у яе ўнесена ўсяго 27 папраўак. У сваю чаргу, у Францыі было прынята паўтара дзясятка канстытуцый. У Беларусі дзейнічае пятая па ліку Канстытуцыя.

Паводле парадку змянення канстытуцыі падзяляюцца на гібкія, жорсткія, а таксама змешанага тыпу. Канстытуцыю можна характарызаваць як гібкую, калі яна можа змяняцца (дапаўняцца) у тым жа парадку, што і звычайныя законы, і для гэтага якіх-небудзь спецыяльных працэдур не прадугледжваецца. Тыповымі прыкладамі гібкіх канстытуцый з'яўляюцца канстытуцыі Вялікабрытаніі і Новай Зеландыі.

Жорсткімі канстытуцыямі з'яўляюцца тыя, якія змяняюцца (дапаўняюцца) у асобым, больш складаным парадку, чым гэта адбываецца пры звычайнай заканадаўчай працэдуры. Найбольш важныя палажэнні абвяшчаюцца не падлягаючымі змяненню. Да іх часта адносяць асновы канстытуцыйнага ладу, правы і свабоды чалавека. У Італіі, напрыклад, не можа быць зменена рэспубліканская форма кіравання. У адпаведнасці з Расійскай Канстытуцыяй Федэральны Сход не можа пераглядаць главы, прысвечаныя асновам канстытуцыйнага ладу, прававому статусу асобы, парадку змянення Канстытуцыі. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадугледжана, што асновы канстытуцыйнага ладу, правы і свабоды грамадзян, парадак змянення Канстытуцыі і раздзел IV «Прэзідэнт, Парламент, Урад, Суд» могуць быць зменены толькі шляхам рэферэндуму.

Нярэдка ўводзяцца абмежаванні на змяненні Канстытуцыі па часе і абставінах. Напрыклад, у Канстытуцыі Бразіліі (1988 г.) замацоўвалася, што яна не падлягае змяненню

Правообладатель Народная асвета

на працягу пяці гадоў. У Беларусі не дапускаецца змяненне і дапаўненне Канстытуцыі ў апошнія шэсць месяцаў тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў.

Больш распаўсюджанымі з'яўляюцца абмежаванні па абставінах. У Рэспубліцы Беларусь не дапускаецца змяненне і дапаўненне Канстытуцыі ў перыяд надзвычайнага становішча. Аналагічныя правілы дзейнічаюць у Румыніі, Іспаніі, Эстоніі.

Стабільнасці Канстытуцыі садзейнічае больш складаная працэдура ўнясення ў яе змяненняў і дапаўненняў. Устанаўліваецца больш вузкае кола суб'ектаў, у параўнанні з правам заканадаўчай ініцыятывы, на ўнясенне канстытуцыйных законапраектаў у Парламент. Так, згодна з артыкулам 138 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пытанне аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі разглядаецца палатамі Парламента па ініцыятыве Прэзідэнта або не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам. Больш вузкае кола суб'ектаў, якія валодаюць правам на ўнясенне прапаноў аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі, прадугледжана таксама ў канстытуцыях Партугаліі, Расіі.

Адпаведна Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь закон аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі можа быць прыняты пасля двух абмеркаванняў і адабрэнняў Парламентам з прамежкам не меншым за тры месяцы. Гэта правіла можна лічыць выкананым, калі праект як пры першым чытанні, так і пры другім абмеркаванні будзе ідэнтычным.

У іншых дзяржавах устанаўліваюцца яшчэ больш жорсткія ўмовы для прыняцця закона аб змяненні (дапаўненні) Канстытуцыі. Напрыклад, у Швецыі прадугледжана неабходнасць прыняцця такога канстытуцыйнага закона двума складамі Парламента, г. зн. пасля яго прыняцця адным складам Парламента абвяшчаюцца выбары ў Парламент, новы склад якога павінен таксама прыняць гэты закон.

?

1. Як вы думаеце, ад чаго залежыць стабільнасць Канстытуцыі?
2. Якім чынам забяспечваецца стабільнасць і ўстойлівасць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?

**2. З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.)**


Правообладатель Народная асвета

*Артыкул 116.* Кантроль за канстытуцыйнасцю нарматыўных актаў у дзяржаве ажыццяўляецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь фарміруецца ў колькасці 12 суддзяў з высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне права, якія маюць, як правіла, вучоную ступень.

Шэсць суддзяў Канстытуцыйнага Суда назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, шэсць суддзяў выбіраюцца Саветам Рэспублікі. Старшыня Канстытуцыйнага Суда назначаецца Прэзідэнтам са згоды Савета Рэспублікі. Тэрмін паўнамоцтваў членаў Канстытуцыйнага Суда — 11 гадоў. Гранічны ўзрост членаў Канстытуцыйнага Суда — 70 гадоў.

Канстытуцыйны Суд па прапановах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь дае заключэнні:

аб адпаведнасці законаў, дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта, міжнародных дагаворных і іншых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь;

аб адпаведнасці актаў міждзяржаўных утварэнняў, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь, указаў Прэзідэнта, выдадзеных у мэтах выканання закона, Канстытуцыі, міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь, законам і дэкрэтам;

аб адпаведнасці пастаноў Савета Міністраў, актаў Вярхоўнага Суда, Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Генеральнага пракурора Канстытуцыі, міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь, законам, дэкрэтам і ўказам;

аб адпаведнасці актаў любога другога дзяржаўнага органа Канстытуцыі, міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь, законам, дэкрэтам і ўказам.

Нарматыўныя акты або іх асобныя палажэнні, прызнаныя неканстытуцыйнымі, страчваюць сілу ў парадку, што вызначаецца законам.

У выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй, Канстытуцыйны Суд па прапанове Прэзідэнта дае заключэнне аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння палатамі Парламента Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Кампетэнцыя, арганізацыя і парадак дзейнасці Канстытуцыйнага Суда вызначаюцца законам.

Правообладатель Народная асвета

?

1. Як фарміруецца Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь?
2. Якія паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь?

**3. З Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» (27 ліпеня 1990 г.)**

*Артыкул 1.* Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — суверэнная дзяржава, якая ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу.

Неад'емныя правы Беларускай ССР як суверэннай дзяржавы рэалізуюцца ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права. Беларуская ССР ахоўвае і абараняе нацыянальную дзяржаўнасць беларускага народа.

Беларуская ССР мае свой герб, сцяг і гімн.

Любыя насільныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў або асоб праследуюцца па закону.

*Артыкул 2.* Грамадзяне Беларускай ССР усіх нацыянальнасцей складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы. Яго поўнаўладдзе рэалізуецца непасрэдна і праз прадстаўнічыя органы дзяржаўнай улады [...].

*Артыкул 4.* Грамадзянства Беларускай ССР з'яўляецца неад'емнай часткай яе суверэнітэту. Рэспубліка ахоўвае гонар, здароўе, правы і законныя інтарэсы сваіх грамадзян, забяспечвае іх сацыяльную абароненасць. Яны знаходзяцца пад яе абаронай, будучы за межамі Беларускай ССР. Рэспубліка прымае ў грамадзянства і вырашае пытанне аб выхадзе з грамадзянства.

*Артыкул 6.* Тэрыторыя Беларускай ССР з'яўляецца непадзельнай і недатыкальнай і не можа быць зменена або выкарыстана без згоды Беларускай ССР [...].

**З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.)**

*Артыкул 1.* Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.


Правообладатель Народная асвета

Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.

Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак.

*Артыкул 2.* Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.

Дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы. Грамадзянін адказны перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, якія ўскладзены на яго Канстытуцыяй.

*Артыкул 3.* Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ. Народ ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй.

Любыя дзеянні па змяненню канстытуцыйнага ладу і дасягненню дзяржаўнай улады гвалтоўнымі метадамі, а таксама шляхам іншага парушэння законаў Рэспублікі Беларусь караюцца згодна з законам.

*Артыкул 9.* Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь з'яўляецца натуральнай умовай існавання і прасторавай мяжой самавызначэння народа, асновай яго дабрабыту і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная.

Тэрыторыя падзяляецца на вобласці, раёны, гарады і іншыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел дзяржавы вызначаецца заканадаўствам.

*Артыкул 19.* Сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з'яўляюцца яе Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн.

?

1. Як вы разумееце сэнс выказванняў: «права народа на самавызначэнне», «вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу», «народ — носьбіт суверэнітэту», «народ — крыніца дзяржаўнай ўлады»?
2. Як палажэнні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце рэалізаваны ў Асноўным Законе нашай краіны?

Правообладатель Народная асвета

3. У чым, на ваш погляд, праяўляецца эканамічная і палітычная незалежнасць Рэспублікі Беларусь? Якія фактары забяспечваюць суверэнітэт беларускай дзяржавы?

**4. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь**

*Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь* быў прыняты 7 чэрвеня 1995 г. Ён замяніў бела-чырвона-белы сцяг, які выкарыстоўваўся ў якасці дзяржаўнага сімвала з 1991 г.

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных каляровых палос: верхняй — чырвонага колеру шырынёй у 2/3 і ніжняй — зялёнага колеру ў 1/3 шырыні сцяга. Каля дрэўка вертыкальна размешчаны беларускі нацыянальны арнамент чырвонага колеру на белым полі, якое складае 1/9 даўжыні сцяга. Адносіны шырыні сцяга да яго даўжыні — 1:2.

Чырвоны колер на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь сімвалізуе штандары пераможнай Грунвальдскай бітвы паміж Польшчай, Вялікім Княствам Літоўскім, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам — з другога, а таксама колер сцягоў Чырвонай Арміі і беларускіх партызанскіх брыгад. Зялёны колер — надзею, вясну і адраджэнне, лясы і палі. Беларускі арнамент — старажытную культуру народа, духоўнае багацце, адзінства.

*Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь* уяўляе сабой зялёны контур нашай краіны, налажаны на залатыя прамяні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. Вышэй контуру размешчана пяціканцовая чырвоная зорка. Герб абрамлены вянком з залатых жытніх каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, злева — лёну. Каласы абвіты чырвона-зялёнай стужкай, на якой змешчаны надпіс золатам: «Рэспубліка Беларусь».

Контур Беларусі ў цэнтры сімвалізуе тэрытарыяльную цэласнасць краіны ў яе міжнародна прызнаных межах. Зялёны контур асвечаны ззяннем залатых сонечных прамянёў. Гэта — Сонца, якое дае жыццё, узыходзіць над Зямлёй — блакітнай і зялёнай.

Выявы Зямлі і Сонца адлюстроўваюць спадзяванні на росквіт Беларусі на аснове трывалай сувязі з роднай зямлёй-карміцелькай і з мудрасцю энергічнага народа, які працуе на гэтай зямлі.


Правообладатель Народная асвета

Пяціканцовая зорка — пентаграма — старажытны сімвал чалавека як касмічнай істоты. Разам з тым гэта знак аховы і бяспекі, сімвал правільнага шляху і высокіх памкненняў. Прысутнасць зоркі ў верхняй частцы герба сімвалізуе гуманізм і адначасова ахову, абарону нашай Айчыны, да якой гатовы кожны грамадзянін Беларусі.

Ідэя невычэрпнай урадлівасці і шчодрага дастатку знайшла сваё ўвасабленне ў абрамленні герба — вянку са спелых жытніх каласоў, упрыгожаным кветкамі канюшыны і лёну, перавітым стужкай колераў Дзяржаўнага сцяга. Усё сімвалізуе працу і багацце.

*Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь* (словы М. Клімковіча, У. Карызны, музыка Н. Сакалоўскага):

Мы, беларусы, — мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Дружба народаў — сіла народаў —
Наш запаветны, сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў ясныя высі,
Сцяг пераможны — радасці сцяг!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Правообладатель Народная асвета

? 1. Якія памкненні, каштоўнасці беларускага народа сімвалізуюць Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб, Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь?
2. Якія асаблівасці гістарычнага развіцця беларускага народа знайшлі адлюстраванне ў дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь?
3. Якое свята адзначаецца штогод у нашай краіне ў другую нядзелю мая? У чым, на ваш погляд, заключаецца сэнс гэтага дзяржаўнага свята?

**5. З Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі ад 4 студзеня 2010 г.)**

*Артыкул 60.* Права і тэрміны вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь вылучаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці не менш чым 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў.

Права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты належыць палітычным партыям, зарэгістраваным Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь не пазней чым за шэсць месяцаў да назначэння выбараў, працоўным калектывам, а таксама грамадзянам шляхам збору подпісаў.

Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў могуць быць вылучаны грамадзяне, якія пражываюць або працуюць на тэрыторыі адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, а таксама працуюць у арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі іншага мясцовага Савета дэпутатаў, але звязаных з задавальненнем патрэбнасцей насельніцтва і сацыяльным развіццём тэрыторыі дадзенага мясцовага Савета дэпутатаў.

*Артыкул 79.* Устанаўленне і апублікаванне вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Лічыцца, што выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, уключаных у спіс выбаршчыкаў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь лічыцца выбраным, калі за яго прагаласавала больш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

*Артыкул 80.* Другі тур галасавання

Калі ні адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь не набраў неабходнай колькасці галасоў, то не пазней чым у двухтыднёвы тэрмін па рашэнні Цэнтральнай камісіі


Правообладатель Народная асвета

праводзіцца другі тур галасавання па двух кандыдатах, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў.

Выбары ў другім туры галасавання лічацца адбыўшыміся, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову выбаршчыкаў, уключаных у спіс грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах. Выбраным лічыцца кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, які атрымаў у другім туры галасавання больш за палову галасоў выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у галасаванні.

У выпадку, калі адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, уключаны ў бюлетэнь для балаціравання ў другім туры галасавання, зняў сваю кандыдатуру, другі тур галасавання праводзіцца па адной кандыдатуры. Пры гэтым кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь таксама лічыцца выбраным, калі ён атрымаў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

?

1. Чым, на ваш погляд, абумоўлены адрозненні ў вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і дэпутаты?
2. Ці апраўданы, на ваш погляд, устаноўленыя Выбарчым кодэксам абмежаванні на права грамадзян вылучацца кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў па месцы пражывання ці працы? Сваю думку аргументуйце.
3. Якая выбарчая сістэма ўстаноўлена Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь пры выбарах Прэзідэнта?

**6. Пытанні, якія выносяцца на рэферэндум (з Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь (са зменамі і дапаўненнямі ад 4 студзеня 2010 г.)**

*Артыкул 112.* На рэспубліканскі рэферэндум могуць выносіцца важнейшыя пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця Рэспублікі Беларусь.

На мясцовы рэферэндум могуць выносіцца пытанні, якія маюць важнейшае значэнне для насельніцтва адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і аднесены да кампетэнцыі адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў.

На рэспубліканскі рэферэндум не могуць выносіцца пытанні:

якія могуць выклікаць парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь;

Правообладатель Народная асвета

звязаныя з выбраннем і вызваленнем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, назначэннем (выбраннем, вызваленнем) службовых асоб, назначэнне (выбранне, вызваленне) якіх адносіцца да кампетэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

аб прыняцці і змяненні бюджэту, устанаўленні, змяненні і адмене падаткаў;

аб амністыі, памілаванні.

?!

1. Чым абумоўлена абмежаванне пытанняў, якія могуць быць вынесены на рэспубліканскі рэферэндум?
2. Сфармулюйце пералік патрабаванняў да ўдзельніка рэферэндуму. Якімі ведамі, асобаснымі якасцямі павінен валодаць чалавек для таго, каб пісьменна выконваць гэту палітычную ролю?

**7. З Закона «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь»**

*Артыкул 1.* Грамадзянства Рэспублікі Беларусь

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь — гэта ўстойлівая прававая сувязь чалавека з Рэспублікай Беларусь, якая выяўляецца ў сукупнасці іх узаемных правоў, абавязкаў і адказнасці, заснаваная на прызнанні і павазе годнасці, асноўных правоў і свабод чалавека.

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь з'яўляецца неад'емным атрыбутам дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 13.* Набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь па нараджэнні

Дзіця набывае грамадзянства Рэспублікі Беларусь па нараджэнні, калі на дзень нараджэння дзіцяці:

бацькі (адзіны з бацькоў) дзіцяці з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, незалежна ад месца нараджэння дзіцяці;

адзін з бацькоў дзіцяці з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а другі — асобай без грамадзянства, ці прызнаны адсутным без вестак, альбо месца яго знаходжання невядома, незалежна ад месца нараджэння дзіцяці;

адзін з бацькоў дзіцяці з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а другі — замежным грамадзянінам, — па сумеснай заяве бацькоў незалежна ад месца нараджэння дзіцяці. Пры адсутнасці такой заявы дзіця набывае грамадзянства Рэспублікі Беларусь, калі інакш яно стала б асобай без грамадзянства;


Правообладатель Народная асвета

бацькі (адзіны з бацькоў) дзіцяці, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца асобамі без грамадзянства, пры ўмове, што дзіця нарадзілася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

бацькі (адзіны з бацькоў) дзіцяці, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца замежнымі грамадзянамі, пры ўмове, што дзіця нарадзілася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а дзяржавы, грамадзянамі якіх з'яўляюцца яго бацькі, не прадастаўляюць яму свайго грамадзянства.

Дзіця, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, бацькі якога невядомы, становіцца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 14.* Прыём у грамадзянства Рэспублікі Беларусь

У грамадзянства Рэспублікі Беларусь на падставе пісьмовай заявы можа быць прынята любая асоба, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту, калі яна:

бярэ на сябе абавязацельства выконваць і паважаць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і іншыя акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

ведае адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь у межах, неабходных для зносін;

пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на працягу апошніх сямі гадоў;

мае законную крыніцу сродкаў існавання;

не мае грамадзянства, альбо страчвае грамадзянства замежнай дзяржавы ў выпадку набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь, альбо звярнулася ў паўнамоцны орган замежнай дзяржавы з заявай аб выхадзе з грамадзянства (адмове ад грамадзянства) гэтай дзяржавы, за выключэннем выпадкаў, калі выхад (адмова) немагчымы альбо яго нельга абгрунтавана патрабаваць.

?

1. Як вы разумееце палажэнне: «Грамадзянства Рэспублікі Беларусь — гэта ўстойлівая прававая сувязь чалавека з Рэспублікай Беларусь»? У чым, на ваш погляд, выяўляецца ўзаемнасць правоў, абавязкаў і адказнасці чалавека і дзяржавы?
2. Якія ўмовы набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь па нараджэнні?
3. Якія з умоў прыёму ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь можна разглядаць як элементы грамадзянскай культуры чалавека? Што яшчэ, на вашу думку, уключае ў сябе грамадзянская культура чалавека?

Правообладатель Народная асвета

**8. З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі на семінары «Аб стане ідэалагічнай работы і мерах па яе ўдасканальванні (2003 г.)**

...Калі мы хочам бачыць Беларусь моцнай, квітнеючай дзяржавай, то павінны перш за ўсё думаць аб ідэалагічным фундаменце беларускага грамадства. Ідэалогія — гэта сістэма ідэй, поглядаў, уяўленняў, пачуццяў і вераванняў аб мэтах развіцця грамадства і чалавека, а таксама сродках і шляхах дасягнення гэтых мэт, увасобленых у каштоўнасных арыентацыях, перакананнях, валявых актах, якія схіляюць людзей у сваіх дзеяннях імкнуцца да пастаўленых мэт.

...Ідэалогію дзяржавы трэба будаваць на сваім, родным фундаменце. Да запазычання ідэалаў, каштоўнасцей і мэт неабходна падыходзіць асцярожна. Беларускае грамадства павінна развівацца ў рамках уласнай культурнай традыцыі. Ідэалогія беларускай дзяржавы павінна мець арыентацыю на традыцыйныя для нашай цывілізацыі каштоўнасці: здольнасць працаваць не толькі дзеля нажывы, але і на карысць грамадства, калектыву, іншых людзей. Іншыя нашы каштоўнасці: патрэбнасць у ідэалах і высокіх мэтах, узаемадапамога, калектывізм у процівагу заходняму індывідуалізму, сацыяльная апека і паважлівыя адносіны дзяржавы і народа.

...«А хто там ідзе?» — у гэтых словах нашага вялікага класіка жаданне зразумець: хто мы, беларусы, у чым наша прызначэнне, наш лёс? Дзе наша беларускае месца ў агульнасусветным развіцці? Ці павінны мы ісці сваім асобым шляхам або браць з кагосьці прыклад? Калі так — то з каго і чаму? Адказ на гэтыя пытанні складае светапоглядную, магчыма, самую важную і цяжкую частку дзяржаўнай ідэалогіі.

?!

1. Растлумачце, чаму ідэалогія — гэта важная ўмова пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі.
2. Што з'яўляецца фундаментам ідэалогіі беларускай дзяржавы? Назавіце каштоўнасці беларускага народа. Прывядзіце прыклады з гісторыі, якія іх ілюструюць.
3. Як вы адносіцеся да запазычання чужога спосабу жыцця (прывычак, традыцый, каштоўнасцей, культуры іншага народа)? Сваё меркаванне аргументуйце.
4. Як вы адказалі б на пытанні, сфармуляваныя ў трэцім абзацы прыведзенага вышэй тэксту?


Правообладатель Народная асвета

## Урок абагульнення

1. Дайце азначэнні паняццяў: *выбары, грамадзянства, суверэнітэт, выбарчая сістэма, мясцовае самакіраванне, Нацыянальны сход, Прэзідэнт, рэферэндум, судовая сістэма, Савет Міністраў.*

2. Дайце характарыстыку Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь па плане: спосаб прыняцця; юрыдычныя ўласцівасці; месца ў нацыянальнай прававой сістэме; ахова Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; змяненні, унесеныя на рэферэндумах 1996 і 2004 гг.

3. Ахарактарызуйце асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, выкарыстоўваючы наступныя паняцці: *унітарная дзяржава, дэмакратычная дзяржава, прававая дзяржава, сацыяльная дзяржава, свецкая дзяржава, суверэнітэт, народаўладдзе, прынцып вяршэнства права, прынцып падзелу ўлад, прынцып плюралізму, грамадзянскае грамадства, прамая і прадстаўнічая формы народаўладдзя.*

4. Якая выбарчая сістэма ўстаноўлена ў Рэспубліцы Беларусь? Назавіце яе прыметы.

5. Выбары ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца ўсеагульнымі, свабоднымі, роўнымі, прамымі; галасаванне на выбарах з'яўляецца тайным. Раскрыйце сутнасць гэтых характарыстык.

6. Ахарактарызуйце асноўныя стадыі выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь.

7. Назавіце органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь. Ахарактарызуйце іх функцыі.

8. Запоўніце табліцу «Правы грамадзян Рэспублікі Беларусь» і адкажыце на пытанне.

| Асабістыя правы | Палітычныя правы | Сацыяльна-эканамічныя правы | Культурныя правы |
|---|---|---|---|
| | | | |

Якія канстытуцыйныя гарантыі правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь?

9. Раскрыйце сутнасць абавязкаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, устаноўленых Канстытуцыяй. Растлумачце, чаму правы і абавязкі грамадзян узаемазвязаны.

Правообладатель Народная асвета

# Тэма 2
# Асноўныя галіны права

## § 6. Асновы грамадзянскага права

***Успомніце.*** **1.** Што такое права? **2.** Якія асноўныя функцыі права?

***Грамадзянскае права*** — гэта галіна права, якая рэгулюе маёмасныя і асабістыя немаёмасныя адносіны, што ўзнікаюць паміж рознымі арганізацыямі (юрыдычнымі асобамі) і грамадзянамі, а таксама паміж асобнымі грамадзянамі.

**Сфера прымянення грамадзянскага права.** Пералік грамадскіх адносін, якія рэгулююцца грамадзянскім правам, разнастайны. Умоўна іх можна падзяліць на наступныя групы.

Перш за ўсё грамадзянскае права мае справу з *маёмаснымі адносінамі*. Гэтыя адносіны ўзнікаюць паміж грамадзянамі або арганізацыямі (юрыдычнымі асобамі) з прычыны рознага роду матэрыяльных даброт і каштоўнасцей, г. зн. рэчаў, работ, паслуг і іншай маёмасці. Напрыклад, нормы грамадзянскага права рэгулююць адносіны, якія ўзнікаюць паміж людзьмі ў працэсе набыцця тавараў у магазінах, паездкі ў грамадскім транспарце, пры заключэнні дагавораў пазыкі, маёмаснага найму, дарэння і іншых, не забароненых законам, дагавораў. Яны рэгулююць таксама адносіны паміж арганізацыямі ў працэсе перавозкі, страхавання, рэалізацыі выробленай прадукцыі, ажыццяўлення разлікаў за пастаўленую прадукцыю і г. д. Грамадзянскім правам рэгулююцца адносіны з удзелам Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (абласцей, гарадоў, раёнаў і г. д.) у выпадку завяшчання грамадзянінам сваёй маёмасці дзяржаве.

Грамадзянскае права рэгулюе таксама *асабістыя немаёмасныя адносіны, не звязаныя з маёмаснымі*. Гэта, напрыклад, адносіны па абароне гонару, годнасці, дзелавой рэпутацыі, права на імя і г. д. Акрамя таго, грамадзянскім правам рэгулююцца *асабістыя немаёмасныя адносіны, звязаныя з маёмаснымі*. Да іх адносяцца, напрыклад, адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі са стварэннем твораў літаратуры або мастацтва.


Правообладатель Народная асвета

Так, калі чалавек стварыў мастацкі твор, то паміж ім і іншымі людзьмі ўзнікаюць асабістыя немаёмасныя адносіны з прычыны створанага. Гэтыя асабістыя немаёмасныя адносіны рэгулююцца нормамі грамадзянскага права, у адпаведнасці з якімі, напрыклад, пісьменнік надзяляецца правам аўтарства на створаны ім літаратурны твор. Ён таксама атрымлівае права выкарыстоўваць гэты твор пад сваім сапраўдным імем, псеўданімам або без абазначэння імені, г. зн. ананімна (права на імя). Аўтар мае права абнародаваць твор у любой форме (права на абнародаванне). Ён мае таксама права на абарону твора, уключаючы яго назву, ад усялякага скажэння ці іншага замаху, здольнага нанесці шкоду яго гонару і годнасці (права на абарону рэпутацыі аўтара).

**Суб'екты грамадзянска-прававых адносін.** *Суб'ектамі* грамадзянска-прававых адносін, г. зн. адносін, якія рэгулююцца грамадзянскім правам, могуць быць фізічныя асобы (грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства), юрыдычныя асобы (арганізацыі) і, у асобных выпадках, — дзяржава (Рэспубліка Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі).

У сучасным грамадстве вельмі часта ўзнікае неабходнасць аб'ядноўваць людзей у розныя саюзы, злучаць іх асабістыя намаганні, капіталы для дасягнення пэўных мэт. У грамадзянскім праве асноўнай формай калектыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства прызнаецца юрыдычная асоба. ***Юрыдычная асоба*** — гэта прызнаная дзяржавай у якасці суб'екта права арганізацыя, якая валодае адасобленай маёмасцю, самастойна адказвае гэтай маёмасцю па сваіх аба-



Атрыманне пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь

Правообладатель Народная асвета

вязацельствах, ад свайго імя выступае ў судзе, набывае і ажыццяўляе правы, выконвае абавязкі.

Рэспубліка Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі ўдзельнічаюць у адносінах, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, на роўных з іншымі ўдзельнікамі гэтых адносін — фізічнымі і юрыдычнымі асобамі. Напрыклад, дзяржаўныя органы могуць ад імя Рэспублікі Беларусь набываць пэўную маёмасць, распараджацца ёю і г. д.

**Асаблівасці Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.** Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь быў прыняты ў 1999 г. У ім знайшлі адлюстраванне найноўшыя дасягненні прававой навукі, палажэнні міжнародных канвенцый, дагавораў і пагадненняў, удзельнікам якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Гэты кодэкс забяспечыў стварэнне ў Беларусі адзінай збалансаванай сістэмы грамадзянскага заканадаўства.

Асноўныя прынцыпы, якія вызначаюць і рэгламентуюць грамадзянскія адносіны, выкладзены ў артыкуле 2 Грамадзянскага кодэкса. Да іх адносяцца перш за ўсё: вяршэнства права, сацыяльная накіраванасць рэгулявання эканамічнай дзейнасці, прыярытэт грамадскіх інтарэсаў, роўнасць удзельнікаў грамадзянскіх адносін, недатыкальнасць уласнасці, свабода дагавора, добрасумленнасць і разумнасць удзельнікаў грамадзянскіх праваадносін, недапушчальнасць самавольнага ўмяшання ў прыватныя справы, бесперашкоднае ажыццяўленне грамадзянскіх правоў, іх судовая абарона.

Грамадзянскі кодэкс не выключае ўмяшання дзяржавы ў прыватныя справы таго ці іншага чалавека. Але яно дапускаецца толькі ў тых выпадках, калі гэта прадугледжана прававымі нормамі ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб.

**Грамадзянская праваздольнасць і дзеяздольнасць.** Для таго каб быць суб'ектам грамадзянска-прававых адносін, чалавек павінен валодаць праваздольнасцю і дзеяздольнасцю. ***Грамадзянская праваздольнасць*** — гэта здольнасць чалавека быць носьбітам дазволеных законам суб'ектыўных правоў і абавязкаў. Праваздольнасць прызнаецца за ўсімі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Яна ўзнікае з моманту нараджэння і спыняецца са смерцю чалавека. Гэта азначае, што чалавек праваздольны на працягу ўсяго свайго жыцця. За грамадзянамі прызнаецца роўная па аб'ёме грамадзянская пра-


Правообладатель Народная асвета

вaздольнасць незалежна ад полу, нацыянальнасці, мовы, месца жыхарства, адносін да рэлігіі і іншых абставін.

У адрозненне ад грамадзяніна юрыдычная асоба, напрыклад вытворчы кааператыў, валодае не агульнай, а спецыяльнай праваздольнасцю. Гэта азначае наяўнасць у яе толькі такіх правоў і абавязкаў, якія адпавядаюць мэтам яе дзейнасці і прама зафіксаваны ў яе ўстаноўчых дакументах (Статуце). Праваздольнасць юрыдычнай асобы ўзнікае з моманту яе стварэння (г. зн. дзяржаўнай рэгістрацыі) і спыняецца ў момант выключэння яе з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб. Для ажыццяўлення юрыдычнай асобай некаторых відаў дзейнасці патрабуецца спецыяльны дазвол дзяржавы (ліцэнзія). Законам могуць быць таксама ўстаноўлены спецыяльныя абмежаванні правоў для асобных відаў юрыдычных асоб.

***Грамадзянская дзеяздольнасць*** — гэта здольнасць чалавека сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць грамадзянскія правы, а таксама выконваць грамадзянскія абавязкі. Валодаць дзеяздольнасцю — значыць быць здольным асабіста ўчыняць розныя юрыдычныя дзеянні: заключаць дагаворы, выдаваць даверанасці і да т. п. У адрозненне ад праваздольнасці дзеяздольнасць звязана з учыненнем грамадзянінам усвядомленых мэтанакіраваных дзеянняў. Гэта прадугледжвае дасягненне ім пэўнага ўзроўню псіхічнай сталасці. У поўным аб'ёме дзеяздольнасць узнікае ў гра-




У офісе па абслугоўванні юрыдычных і фізічных асоб

Правообладатель Народная асвета

мадзяніна з наступленнем паўналецця, г. зн. па дасягненні 18-гадовага ўзросту.

У адрозненне ад асобных грамадзян у юрыдычных асоб прававдольнасць і дзеяздольнасць узнікаюць і спыняюцца адначасова. Юрыдычная асоба можа надзяляць грамадзянскімі правамі і абавязкамі сваіх прадстаўнікоў. У такім выпадку яны дзейнічаюць на аснове даверанасці, якая выдаецца органам кіравання юрыдычнай асобы. Гэта можа быць, напрыклад, дырэктар прадпрыемства або праўленне кааператыва.

**Грамадзянская дзеяздольнасць непаўналетніх.** Аб'ём дзеяздольнасці непаўналетніх залежыць ад іх узросту. Непаўналетнія ва ўзросце да 14 гадоў (малалетнія) маюць права самастойна ўчыняць, напрыклад, дробныя бытавыя здзелкі, калі такія здзелкі не патрабуюць натарыяльнага засведчання або афармлення ці дзяржаўнай рэгістрацыі. Значыць, калі малалетняму перадаецца ў дар жылы дом, кватэра, іншая нерухомая маёмасць, а гэта здзелкі, якія патрабуюць дзяржаўнай рэгістрацыі, то прыняць такі дар маюць права толькі законныя прадстаўнікі малалетняга — яго бацькі, усынавіцелі або апекуны. Малалетнія могуць таксама ўчыняць здзелкі па распараджэнні сродкамі, прадастаўленымі ім законнымі прадстаўнікамі.

Заканадаўства не ўтрымлівае вызначэння дробнай бытавой здзелкі, якую мае права самастойна ўчыніць малалетні. Па агульным правіле да такога роду здзелак адносяцца здзелкі на нязначныя сумы, накіраваныя на задавальненне звычайных патрэб малалетніх (напрыклад, купля цацкі, школьных прыналежнасцей, дзіцячых кніг, прадуктаў харчавання, білетаў у кіно і да т. п.).

Усе астатнія здзелкі за непаўналетніх ва ўзросце да 14 гадоў могуць учыняць ад іх імя толькі іх законныя прадстаўнікі. Здзелка, учыненая малалетнім за межамі прадастаўленай яму законам дзеяздольнасці, з'яўляецца неправамернай. Кожны з удзельнікаў такой здзелкі абавязаны вярнуць другому ўсё атрыманае ў зыходным выглядзе, а калі гэта немагчыма, то кампенсаваць яго кошт грашыма.

Аб'ём дзеяздольнасці непаўналетніх ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў значна большы, чым у малалетніх. Яны маюць права самастойна, без згоды бацькоў, усынавіцеляў або апекуноў:


Правообладатель Народная асвета

распараджацца сваім заработкам, стыпендыяй і іншымі ўласнымі даходамі;

ажыццяўляць правы аўтара твора навукі, літаратуры або мастацтва, вынаходніцтва або іншага выніку сваёй інтэлектуальнай дзейнасці, які ахоўваецца заканадаўствам.

уносіць уклады ў крэдытныя ўстановы і распараджацца імі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

учыняць дробныя бытавыя здзелкі, а таксама здзелкі, якія не патрабуюць натарыяльнага засведчання або афармлення ці дзяржаўнай рэгістрацыі; яны маюць права распараджацца сродкамі, прадастаўленымі ім законным прадстаўніком або якой-небудзь іншай асобай у свабоднае карыстанне.

Усе іншыя здзелкі, за выключэннем пералічаных вышэй, непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў маюць права ўчыняць толькі са згоды сваіх законных прадстаўнікоў — бацькоў, усынавіцелей або апекуноў, прычым згода законных прадстаўнікоў павінна быць выказана ў пісьмовай форме.

?!

1. Што такое грамадзянскае права? Ахарактарызуйце групы адносін, якія рэгулююцца нормамі грамадзянскага права. Канкрэтызуйце іх прыкладамі.
2. Назавіце суб'ектаў грамадзянска-прававых адносін. Дайце вызначэнне паняццю «юрыдычная асоба». Прывядзіце прыклады юрыдычных асоб.
3. Якія прынцыпы грамадзянска-прававых адносін замацаваны ў Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь? Растлумачце іх сэнс. У якіх выпадках Кодэкс дапускае ўмяшанне дзяржавы ў прыватныя справы грамадзян?
4. Што такое грамадзянская правадольнасць і грамадзянская дзеяздольнасць? Калі яны ўзнікаюць і спыняюцца? У чым асаблівасці правадольнасці і дзеяздольнасці юрыдычных асоб?
5. Якія асаблівасці грамадзянскай дзеяздольнасці непаўналетніх ва ўзросце да 14 гадоў і ад 14 да 18 гадоў. *(Выкарыстайце матэрыял 1 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 99—100.)*
6. «Мая сапраўдная слава заключаецца не ў тым, што я выйграў дзясятак бітваў, а ў тым, што будзе жыць вечна — мой Грамадзянскі кодэкс», — гаварыў французскі імператар Напалеон Банапарт, маючы на ўвазе кодэкс гра-

Правообладатель Народная асвета

мадзянскага права Францыі 1804 г., распрацаваны ў час яго праўлення. Як вы думаеце, чаму Напалеон вышэй за ўсе свае перамогі ацэньваў гэты кодэкс? Якая роля Грамадзянскага кодэкса ў жыцці грамадства?

**7.** 10-гадоваму Максіму падарылі на дзень нараджэння камп'ютар. Было вырашана, што гэтай рэччу ён будзе карыстацца самастойна. Ці можа Максім прадаць свой падарунак?

**8.** 15-гадовы Сяргей атрымаў ганарар за выкарыстанне свайго твора і вырашыў пакласці грошы ў банк. Але супрацоўнік банка заявіў, што непаўналетнія ў гэтым узросце не маюць права ўносіць уклады ў крэдытныя ўстановы і распараджацца імі. Ці згодны вы з супрацоўнікам банка?

## § 7. Асновы працоўнага права

***Успомніце.*** **1.** Што такое праца? **2.** Якія канстытуцыйныя гарантыі правоў на працу і адпачынак грамадзян Рэспублікі Беларусь?

***Працоўнае права*** — гэта галіна права, якая рэгулюе працоўныя адносіны паміж наймальнікамі і работнікамі, устанаўлівае дзяржаўныя гарантыі працоўных правоў і свабод грамадзян, абараняе правы і інтарэсы работнікаў і наймальнікаў.

**Прававы механізм працаўладкавання.** Пры ўладкаванні на працу заключаецца працоўны дагавор, г. зн. пагадненне паміж наймальнікам і работнікам аб умовах працы і яе аплаты.

Пры заключэнні працоўнага дагавора грамадзянін павінен прад'явіць наймальніку наступныя дакументы:

пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу;

дакумент воінскага ўліку (для ваеннаабавязаных і асоб, якія падлягаюць прызыву на воінскую службу);





Правообладатель Народная асвета

працоўную кніжку (за выключэннем тых, хто ўпершыню паступае на працу);

дыплом або іншы дакумент аб адукацыі;

накіраванне на працу (калі спецыяліст прыбыў на працу па размеркаванні навучальнай установы);

заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі (МРЭК) аб стане здароўя (для інвалідаў).

Іншы раз таксама патрабуецца прад'явіць дэкларацыю аб даходах і маёмасці, страхавое пасведчанне, медыцынскае заключэнне аб стане здароўя і некаторыя іншыя дакументы.

З мэтай праверкі адпаведнасці работніка даручаемай яму рабоце працоўны дагавор можа быць заключаны з умовай папярэдняга выпрабавання на тэрмін не больш чым 3 месяцы. Папярэдняе выпрабаванне пры заключэнні працоўнага дагавора не ўстанаўліваецца для работнікаў, якія не дасягнулі 18 гадоў, а таксама для маладых рабочых і спецыялістаў па заканчэнні прафесійна-тэхнічных, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, для інвалідаў, часовых і сезонных работнікаў, пры пераводзе на працу ў іншую мясцовасць або да іншага наймальніка; пры прыёме на працу па конкурсе або па выніках выбараў.

Забараняецца прымяненне працы асоб, маладзейшых за 18 гадоў, на цяжкіх работах і на работах са шкоднымі ці небяспечнымі ўмовамі працы, на падземных і горных работах. Забараняецца таксама падыманне і перамяшчэнне непаўналетнімі цяжару ўручную, калі перавышаны вызначаныя для іх гранічныя нормы.

Усе асобы, маладзейшыя за 18 гадоў, прымаюцца на працу толькі пасля папярэдняга медыцынскага агляду і ў далейшым, да дасягнення 18 гадоў, штогод падлягаюць абавязковаму медыцынскаму агляду. Забараняецца прыцягваць работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, да начной і звышурочнай працы, працы ў дзяржаўныя святы і іншыя святочныя дні, працы ў выхадныя дні. Працоўныя адпачынкі работнікам, маладзейшым за 18 гадоў, прадастаўляюцца ў летні час, або, па іх жаданні, у любую іншую пару года.

**Правы і абавязкі наймальніка і работніка.** Заключэнне працоўнага дагавора цягне за сабой устанаўленне пэўных правоў і абавязкаў работніка і наймальніка. У адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь работнікі і наймальнікі маюць наступныя правы і абавязкі (табліца 1).

Правообладатель Народная асвета

*Табліца 1*

**Правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў**

| | |
|---|---|
| *Работнік мае права на:*<br>выбар работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай;<br>здаровыя і бяспечныя ўмовы працы;<br>павагу свайго прыватнага жыцця і асабістай годнасці;<br>абарону эканамічных і сацыяльных правоў і інтарэсаў, уключаючы права на аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, заключэнне калектыўных дагавораў, пагадненняў і права на забастоўку;<br>удзел у кіраванні прадпрыемствам (арганізацыяй);<br>своечасовую справядлівую аплату сваёй працы ў адпаведнасці з яе колькасцю, якасцю і грамадскім значэннем;<br>абедзенны перапынак, выхадныя дні, адпачынак;<br>сацыяльнае страхаванне, пенсійнае забеспячэнне і гарантыі ў выпадку прафесійнага захворвання, працоўнага калецтва, інваліднасці і страты работы;<br>судовую і іншую абарону працоўных правоў | *Работнік абавязаны:*<br>добрасумленна выконваць свае працоўныя абавязкі;<br>выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку, пісьмовыя і вусныя загады наймальніка, якія не супярэчаць заканадаўству;<br>выконваць устаноўленыя патрабаванні да якасці выпрабляемай прадукцыі, выконваемых работ, аказваемых паслуг;<br>выконваць тэхніку бяспекі;<br>падтрымліваць сваё рабочае месца, абсталяванне ў спраўным стане, парадку і чыстаце;<br>беражліва адносіцца да маёмасці наймальніка і прымаць меры па папярэджванні шкоды;<br>прымаць меры па тэрміновым устараненні прычын і ўмоў, якія перашкаджаюць нармальнаму выкананню работы (аварыя, прастой і г. д.);<br>выконваць іншыя абавязкі, якія вынікаюць з дзеючага заканадаўства, калектыўнага і працоўнага дагавора |
| *Наймальнік мае права:*<br>заключаць і скасоўваць працоўныя дагаворы з работнікамі;<br>уступаць у калектыўныя перагаворы і заключаць калектыўныя дагаворы;<br>заахвочваць работнікаў;<br>патрабаваць ад работнікаў выканання ўмоў працоўнага дагавора і правілаў унутранага працоўнага распарадку;<br>прыцягваць работнікаў да дысцыплінарнай і матэрыяльнай адказнасці;<br>звяртацца ў суд для абароны сваіх правоў | *Наймальнік абавязаны:*<br>азнаёміць работніка з даручанай работай, умовамі і аплатай працы; растлумачыць яго правы і абавязкі; афарміць заключэнне працоўнага дагавора;<br>азнаёміць работніка з калектыўным дагаворам і дакументамі, якія рэгламентуюць унутраны працоўны распарадак;<br>забяспечыць працоўную і вытворчую дысцыпліну;<br>своечасова выдаваць заработную плату ў памерах, вызначаных заканадаўствам, калектыўным дагаворам, пагадненнем або працоўным дагаворам; |


Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| | правесці ўводны інструктаж па ахове працы; забяспечыць здаровыя і бяспечныя ўмовы працы; прымаць неабходныя меры па прафілактыцы вытворчага траўматызму, прафесійных і іншых захворванняў работнікаў і інш. |

**Рабочы час і час адпачынку.** У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь працоўныя маюць права на адпачынак. Для тых, хто працуе па найме, гэта права забяспечваецца нарміраванай працягласцю працоўнага тыдня, скарочанай працягласцю работы ў начны час, прадастаўленнем штогадовых аплачваемых адпачынкаў, дзён штотыднёвага адпачынку.

Рабочым лічыцца час, на працягу якога работнік у адпаведнасці з працоўным і калектыўным дагаворамі, правіламі ўнутранага працоўнага распарадку павінен знаходзіцца на рабочым месцы і выконваць свае працоўныя абавязкі. Да рабочага часу адносіцца таксама выкананне па распараджэнні наймальніка звышурочных работ, работ у святочныя і выхадныя дні.



На будаўніцтве гандлёвага цэнтра ў г. Віцебску

Правообладатель Народная асвета

Працягласць рабочага часу не можа перавышаць 40 гадзін у тыдзень. Для работнікаў, занятых на работах са шкоднымі ўмовамі працы, устанаўліваецца скарочаная працягласць рабочага часу — не больш за 35 гадзін у тыдзень. Для работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, законам таксама вызначана скарочаная працягласць рабочага часу: ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — не больш як 23 гадзіны ў тыдзень; ад 16 да 18 гадоў — не больш за 35 гадзін у тыдзень.

На працягу рабочага дня работнікам прадастаўляецца перапынак для адпачынку і харчавання працягласцю не меншай як 20 хвілін і не большай за дзве гадзіны. Усім работнікам прадастаўляюцца выхадныя дні, прычым не павінна быць больш чым шэсць рабочых дзён запар.

Работнікі маюць права на працоўны адпачынак з захаваннем заработнай платы. Працягласць працоўнага адпачынку не можа быць меншай за 24 каляндарныя дні. Працоўны адпачынак за першы каляндарны год прадастаўляецца не раней чым праз шэсць месяцаў работы ў дадзенага наймальніка; разам з тым законам прадугледжаны некаторыя выключэнні з гэтага правіла — для асоб, маладзейшых за 18 гадоў, жанчын, якія маюць двух і болей дзяцей да 14 гадоў, і г. д.

Частка працоўнага адпачынку, якая перавышае 21 каляндарны дзень, па пагадненні паміж работнікам і наймальнікам можа быць заменена грашовай кампенсацыяй.



У даследчай лабараторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі


Правообладатель Народная асвета



Права на адпачынак гарантуецца
Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь

Акрамя працоўнага адпачынку, работніку можа прадастаўляцца сацыяльны адпачынак: па доглядзе за дзецьмі; у сувязі з вучобай; па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару.

**Аплата працы і яе асаблівасці для непаўналетніх.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе асобам, якія працуюць па найме, справядлівае ўзнагароджанне за працу ў адпаведнасці з яе колькасцю, якасцю і грамадскім значэннем.

Заработная плата работнікам, маладзейшым за 18 гадоў, пры скарочанай працягласці штодзённай працы выплачваецца ў тым жа памеры, што і работнікам адпаведных катэгорый пры поўнай працягласці працоўнага дня.

Аплата працы навучэнцаў школ, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, каледжаў, тэхнікумаў і г. д., якія працуюць у свабодны ад вучобы час, ажыццяўляецца прапарцыянальна адпрацаванаму часу або ў залежнасці ад выработкі. Наймальнікамі могуць устанаўлівацца даплаты да заработнай платы навучэнцаў.

**Працоўная дысцыпліна.** *Працоўная дысцыпліна* — гэта абавязковае для ўсіх работнікаў падпарадкаванне ўстаноў-

Правообладатель Народная асвета

ленаму працоўнаму распарадку і належнае выкананне сваіх абавязкаў.

Працоўная дысцыпліна прадугледжвае своечасовую яўку на працу, прытрымліванне працягласці ўстаноўленых перапынкаў, недапушчэнне прагулаў і простояў. Яна ўключае ў сябе таксама добрасумленныя, творчыя адносіны кожнага работніка да сваіх абавязкаў. За невыкананне або неналежнае выкананне работнікам сваіх працоўных абавязкаў устанаўліваецца *дысцыплінарная адказнасць*. Да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны могуць быць прыменены дысцыплінарныя спагнанні: заўвага, вымова, звальненне, а таксама пазбаўленне прэмій, змяненне часу прадастаўлення працоўнага адпачынку і інш.

**Парадак спынення працоўнага дагавора, пагадненя.** Працоўны дагавор можа быць спынены па пагадненню работніка і наймальніка, па ўласным жаданні работніка, а таксама па ініцыятыве наймальніка.

Падставамі для спынення працоўнага дагавора з'яўляюцца: заканчэнне тэрміну працоўнага дагавора; перавод работніка да іншага наймальніка; адмова работніка ад пераводу на працу ў іншую мясцовасць разам з наймальнікам; неадпаведнасць работніка даручаемай рабоце, устаноўленая ў ходзе папярэдняга выпрабавання, а таксама некаторыя іншыя абставіны.

Работнік мае права скасаваць працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, папярэдзіўшы аб гэтым наймальніка пісьмова за адзін месяц. Па заканчэнні тэрміну папярэджання работнік мае права спыніць працу. У апошні дзень працы наймальнік абавязаны выдаць работніку працоўную кніжку і правесці з ім канчатковы разлік.

Па пагадненні бакоў і ў выпадках, прадугледжаных у калектыўным дагаворы, працоўны дагавор можа быць скасаваны да заканчэння тэрміну папярэджання. Работнік мае права да заканчэння тэрміну папярэджання пісьмова адклікаць сваю заяву, калі на яго месца не запрошаны іншы работнік.

Працоўны дагавор, заключаны на вызначаны тэрмін (кантракт), можа быць спынены датэрмінова па патрабаванні работніка ў выпадку яго хваробы ці інваліднасці, якія перашкаджаюць выкананню работы па працоўным дагаворы, або пры парушэнні наймальнікам заканадаўства аб працы,


Правообладатель Народная асвета

калектыўнага або працоўнага дагавора, па іншых уважлівых прычынах.

Працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, а таксама тэрміновы працоўны дагавор могуць быць скасаваны датэрмінова наймальнікам у выпадку:

ліквідацыі арганізацыі або спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці штата работнікаў;

неадпаведнасці работніка займаемай пасадзе;

сістэматычнага невыканання работнікам без уважлівых прычын абавязкаў, ускладзеных на яго працоўным дагаворам;

прагула (у тым ліку адсутнасці на рабоце больш за 3 гадзіны на працягу рабочага дня) без уважлівых прычын;

нез'яўлення на работу на працягу больш як чатыры месяцы запар з прычыны часовай непрацаздольнасці (не лічачы адпачынку па цяжарнасці і родах);

з'яўлення на рабоце ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення, а таксама распіцця спіртных напіткаў, ужывання наркатычных сродкаў у рабочы час або па месцы працы;

учынення па месцы працы крадзяжу маёмасці наймальніка;

аднаразовага грубага парушэння правілаў аховы працы, якое прывяло да знявечання або смерці іншых работнікаў.

?!

**1.** Дайце азначэнні паняццяў: *працоўнае права, працоўны дагавор, працоўная дысцыпліна*.

**2.** Якія дакументы павінен прад'явіць работнік наймальніку пры заключэнні працоўнага дагавора? Для якіх катэгорый работнікаў не ўстанаўліваецца папярэдняе выпрабаванне?

**3.** Якія асноўныя правы і абавязкі наймальніка і работніка?

**4.** Якім чынам беларускае працоўнае заканадаўства рэгламентуе рабочы час, час адпачынку, аплату працы работнікаў?

**5.** Якія асаблівасці працаўладкавання, аплаты працы, адпачынку непаўналетніх? *(Выкарыстайце матэрыялы 2, 3 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 100—101.)*

**6.** На якіх падставах можа быць скасаваны працоўны дагавор? Ахарактарызуйце парадак спынення працоўнага дагавора.

Правообладатель Народная асвета

# § 8. Асновы сямейнага права

**Успомніце.** Якія асноўныя функцыі сям'і?

***Сямейнае права*** — гэта галіна права, нормы якой рэгулююць асабістыя немаёмасныя і маёмасныя адносіны, што ўзнікаюць пры заключэнні і скасаванні шлюбу, а таксама ў працэсе сямейнага жыцця грамадзян. Сямейнае заканадаўства накіравана на ўмацаванне сям'і; яно абараняе правы членаў сям'і.

**Заключэнне і скасаванне шлюбу.** *Шлюб* — гэта добраахвотны саюз мужчыны і жанчыны, які накіраваны на стварэнне сям'і і параджае ўзаемныя правы і абавязкі бакоў. *Сям'я* — гэта заснаванае на шлюбе або кроўнай роднасці аб'яднанне людзей, звязаных паміж сабой агульнасцю быту, узаемнай адказнасцю і ўзаемадапамогай. Сям'ю звычайна характарызуюць як першасную ячэйку грамадства, грамадства ў мініяцюры.

Юрыдычнае значэнне мае толькі шлюб, зарэгістраваны ў дзяржаўных органах. Не зарэгістраваны шлюб (шлюб па рэлігійным абрадзе або фактычнае сумеснае пражыванне) не выклікае прававых наступстваў, прадугледжаных заканадаўствам.

Для заключэння шлюбу неабходна ўзаемная згода мужчыны і жанчыны, якія бяруць шлюб, дасягненне імі шлюбнага ўзросту (18 гадоў) і адсутнасць перашкод для заключэння шлюбу, прадугледжаных Кодэксам аб шлюбе і сям'і.

У адпаведнасці з сямейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не дапускаецца заключэнне шлюбу:

паміж людзьмі, з якіх хоць бы адзін ужо знаходзіцца ў іншым шлюбе;



Новая сям'я

паміж блізкімі сваякамі, а таксама паміж усынавіцелямі і ўсыноўленымі;

паміж людзьмі, з якіх хоць бы адзін прызнаны судом недзеяздольным з прычыны псіхічнай хваробы або слабага розуму.

Утойванне асобай, якая ўступае ў шлюб, акалічнасцей, якія



Правообладатель Народная асвета

перашкаджаюць яго заключэнню, з'яўляецца падставай для прызнання шлюбу несапраўдным.

Заключэнне шлюбу адбываецца ва ўзгодненыя бакамі тэрміны, але не раней чым праз 15 дзён пасля падачы заявы ў орган ЗАГСа (запіс актаў грамадзянскага стану). Рэгістрацыя заключэння шлюбу праводзіцца па месцы жыхарства аднаго з уступаючых у шлюб або іх бацькоў. Мужчына і жанчына, якія ўступаюць у шлюб, абавязаны асабіста прысутнічаць пры рэгістрацыі заключэння шлюбу. Рэгістрацыя шлюбу па даверанасці не дапускаецца.

Шлюб спыняецца з прычыны смерці мужа ці жонкі. Дакументам, які сведчыць спыненне шлюбу, з'яўляецца пасведчанне аб смерці аднаго з іх. Пры жыцці шлюб можа быць скасаваны судом па заяве мужа ці жонкі. Шлюб лічыцца скасаваным з таго дня, калі ўступіла ў законную сілу рашэнне суда аб скасаванні шлюбу.

Скасаванне шлюбу недапушчальнае падчас цяжарнасці жонкі і на працягу трох гадоў пасля нараджэння дзіцяці без пісьмовай згоды жонкі на развод. Жонка можа прад'явіць іск аб скасаванні шлюбу ў любы час.

**Правы і абавязкі мужа і жонкі.** Правы і абавязкі мужа і жонкі ўзнікаюць з дня рэгістрацыі заключэння шлюбу дзяржаўнымі органамі. Гэтыя правы і абавязкі могуць быць канкрэтызаваны і замацаваны ў шлюбнай дамове, засведчанай у органах натарыята.

У сямейных праваадносінах паміж мужам і жонкай узнікаюць *асабістыя немаёмасныя і маёмасныя* правы і абавязкі. Многія асабістыя немаёмасныя адносіны паміж мужам і жонкай (каханне, узаемапавага і да т. п.) рэгуляванню з боку заканадаўства не падлягаюць.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, вызначаючы немаёмасныя правы мужа і жонкі, устанаўлівае, што яны маюць права:

*сумесна вырашаць усе пытанні шлюбных і сямейных адносін*. Муж і жонка роўныя ў праваадносінах, і ўмяшанне, без іх згоды, у вырашэнне пытанняў сям'і з боку блізкіх сваякоў і іншых асоб недапушчальна;

*права на выбар прозвішча пры заключэнні шлюбу*. Заканадаўства забяспечвае роўныя правы для мужа і жонкі на выбар прозвішча пры заключэнні шлюбу. Муж і жонка па сваім жаданні выбіраюць прозвішча аднаго з іх у якасці

Правообладатель Народная асвета

агульнага прозвішча або кожны з іх захоўвае сваё дашлюбнае прозвішча. У практыцы часцей за ўсё сустракаюцца выпадкі, калі нявеста выбірае прозвішча жаніха;

*права на свабодны выбар заняткаў, прафесіі і месца жыхарства.* Забароны або пярэчанні мужа ці жонкі ў гэтых адносінах юрыдычнага значэння не маюць. Адзін з іх можа толькі нешта рэкамендаваць, аднак усё ж канчатковае рашэнне кожны прымае самастойна. Муж ці жонка, зыходзячы з канкрэтнай сітуацыі, па ўзаемнай згодзе, могуць пражываць сумесна альбо нейкі час асобна. Абавязак мужа і жонкі пражываць сумесна мае маральны, а не юрыдычны характар.

Асабістыя немаёмасныя правы мужа і жонкі цесна звязаны з маёмаснымі праваадносінамі ў сям'і. Маёмасць, нажытая мужам і жонкай у перыяд шлюбу, незалежна ад таго, на каго з іх яна набывалася або кім з іх унесены грашовыя сродкі, з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю.

Муж і жонка карыстаюцца роўнымі правамі на сумесна нажытую маёмасць і ў тым выпадку, калі адзін з іх у перыяд шлюбу быў заняты вядзеннем хатняй гаспадаркі, доглядам за дзецьмі або па іншых уважлівых прычынах не меў самастойнага заработку (даходу).

Маёмасць, якая належала мужу і жонцы да ўступлення ў шлюб, а таксама атрыманая імі ў перыяд шлюбу ў дар або ў парадку атрымання ў спадчыну, з'яўляецца ўласнасцю кожнага з іх. Рэчы індывідуальнага карыстання (вопратка, абутак і г. д.), за выключэннем каштоўнасцей і іншых прадметаў раскошы, хоць і набытыя ў перыяд шлюбу за кошт агульных сродкаў мужа і жонкі, прызнаюцца маёмасцю таго з іх, хто імі карыстаўся.

У шлюбным дагаворы можа быць прадугледжана іншае ўрэгуляванне ўсіх гэтых маёмасных адносін паміж мужам і жонкай.

Муж і жонка абавязаны матэрыяльна падтрымліваць адзін аднаго. У выпадку адмовы ў такой падтрымцы непрацаздольны муж (або жонка), які яе патрабуе, а таксама жонка ў перыяд цяжарнасці і на працягу трох гадоў пасля нараджэння дзіцяці маюць права патрабаваць ад мужа (або жонкі), які валодае неабходнымі для гэтага сродкамі, прадастаўлення аліментаў у судовым парадку.

**Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.** У праваадносінах паміж бацькамі і дзецьмі таксама ўзнікаюць асабістыя не-


Правообладатель Народная асвета

маёмасныя і маёмасныя правы і абавязкі. Да *асабістых немаёмасных* правоў і абавязкаў бацькоў адносяцца правы і абавязкі па вызначэнні ўласнага імя, імя па бацьку, прозвішча дзяцей; вызначэнні грамадзянства дзяцей у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб грамадзянстве; вызначэнні месца жыхарства дзяцей; выхаванні дзяцей, ажыццяўленні догляду і нагляду за імі; ажыццяўленні прадстаўніцтва ад імя сваіх дзяцей; забеспячэнні абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей.

Прозвішча дзіцяці вызначаецца прозвішчам бацькоў. Пры розных прозвішчах бацькоў дзіцяці прысвойваецца прозвішча маці або бацькі са згоды бацькоў. Уласнае імя дзіцяці таксама даецца са згоды бацькоў.

Імя па бацьку прысвойваецца па ўласным імені бацькі. Згоды бацькоў аб імені па бацьку дзіцяці не патрабуецца. Месцам жыхарства дзіцяці лічыцца месца жыхарства яго бацькоў.

Бацькі з'яўляюцца законнымі прадстаўнікамі сваіх непаўналетніх дзяцей і выступаюць у абарону іх правоў і інтарэсаў ва ўсіх установах, у тым ліку ў судах, без спецыяльных паўнамоцтваў.

Бацькі абавязаны клапаціцца аб фізічным, духоўным і маральным развіцці дзяцей, аб іх здароўі, адукацыі і падрыхтоўцы да самастойнага жыцця. Бацька і маці маюць роўныя правы і абавязкі ў адносінах да сваіх дзяцей. Той з бацькоў, хто пражывае асобна ад дзяцей, мае права мець зносіны з імі і абавязаны прымаць удзел у іх выхаванні.



Рэгістрацыя нараджэння дзіцяці

Правообладатель Народная асвета





Моцная сям'я — аснова моцнай дзяржавы

Той з бацькоў, пры якім пражываюць дзеці, не мае права перашкаджаць другому з бацькоў мець зносіны з дзецьмі і ўдзельнічаць у іх выхаванні.

У бацькоў ёсць таксама правы і абавязкі па кіраванні справамі і маёмасцю непаўналетніх і непрацаздольных дзяцей. Сямейнае заканадаўства зыходзіць з прынцыпу паасобнасці маёмасці бацькоў і дзяцей. Гэта значыць, што дзеці, хаця яны і пражываюць разам з бацькамі і карыстаюцца іх маёмасцю, права на маёмасць бацькоў не маюць. Тое ж неабходна сказаць і аб бацьках, якія карыстаюцца маёмасцю дзяцей, калі дзеці атрымалі яе ў дар ці ў спадчыну або набылі за кошт свайго заработку.

Бацькі могуць даваць парады, але не маюць права дыктаваць дзіцяці, як яму распараджацца сваім заработкам, а таксама выкарыстоўваць маёмасць, аддадзеную яму для свабоднага ўжывання — камп'ютар, магнітафон, веласіпед і да т. п.

Бацькі абавязаны ўтрымліваць сваіх непаўналетніх і патрабуючых дапамогі непрацаздольных паўналетніх дзяцей. У выпадку, калі бацькі не прадастаўляюць утрыманне сваім дзецям, сродкі на іх утрыманне (аліменты) спаганяюцца з бацькоў у судовым парадку.

Дзеці ў сваю чаргу абавязаны клапаціцца аб бацьках і аказваць ім дапамогу. Утрыманне непрацаздольных, патрабуючых дапамогі бацькоў з'яўляецца абавязкам іх паўналетніх працаздольных дзяцей. Непрацаздольнымі па ўзросце прызнаюцца жанчыны, якія дасягнулі 55 гадоў, і мужчыны, якія дасягнулі 60 гадоў. Непрацаздольнымі з'яўляюц-


Правообладатель Народная асвета

ца таксама асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым парадку інвалідамі незалежна ад прычын і групы інваліднасці. Разам з тым дзеці могуць быць вызвалены ад абавязку па ўтрыманні бацькоў і пакрыцці затрат па доглядзе за імі, калі судом будзе ўстаноўлена, што бацькі ўхіляліся ад выканання бацькоўскіх абавязкаў.

?!

1. Дайце азначэнні паняццяў: *сямейнае права, шлюб, сям'я*.
2. Назавіце ўмовы заключэння і скасавання шлюбу. У якім выпадку шлюб не параджае прававых наступстваў?
3. Як сямейнае заканадаўства нашай краіны абараняе правы маці і дзіцяці?
4. Ахарактарызуйце асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы і абавязкі мужа і жонкі. *(Выкарыстайце матэрыял 5 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 103—105.)* Якія адносіны паміж мужам і жонкай не рэгулююцца законам? Хто (або што) рэгулюе гэтыя адносіны?
5. Ці з'яўляецца залатое кальцо, падоранае мужам, асабістай уласнасцю жонкі? Ці будзе аўтамабіль, атрыманы мужам у перыяд шлюбу ў спадчыну, агульнай уласнасцю мужа і жонкі?
6. Якія асноўныя абавязкі бацькоў і дзяцей? *(Выкарыстайце матэрыялы 4, 6 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 101—103, 105.)*
7. На думку сучасных педагогаў, сям'я — гэта грамадства ў мініяцюры, ад цэласнасці якога залежыць бяспека ўсяго вялікага чалавечага грамадства. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Сваё меркаванне аргументуйце.

## § 9. Асновы адміністрацыйнага права

***Успомніце.*** У чым падабенства і адрозненне норм маралі і права?

Большасць грамадзян нашай краіны — законапаслухмяныя людзі. Яны добра разумеюць, што строгае выкананне ўстаноўленых норм, павага да закона з'яўляюцца асновай дабрабыту кожнага асобнага чалавека, усёй нашай дзяржавы і грамадства ў цэлым. Разам з тым у грамадстве ёсць людзі, якія ўчыняюць проціpraўныя дзеянні. У адпаведнасці з законамі краіны яны прыцягваюцца да адказнасці (за менш цяжкія правапарушэнні — да адміністрацыйнай, за больш цяжкія і небяспечныя — да крымінальнай адказнасці). У гэтым і наступным параграфах вы даведаецеся аб ценявых,

Правообладатель Народная асвета

негатыўных баках жыцця. Канешне, хацелася б, каб у ім не было месца ні адміністрацыйным праступкам, ні крымінальным злачынствам і адпаведным пакаранням. Мэта беларускай дзяржавы заключаецца не проста ў пакаранні парушальнікаў, а перш за ўсё ў аднаўленні справядлівасці, абароне інтарэсаў чалавека і грамадства, фарміраванні прававой культуры насельніцтва і прафілактыцы правапарушэнняў.

Для таго каб паспяхова змагацца з правапарушэннямі, кожны з нас павінен ведаць патрабаванні законаў, выконваць іх і выразна ўсведамляць, што адступленні ад іх будуць пакараны.

***Адміністрацыйнае права*** — гэта галіна права, якая рэгулюе грамадскія адносіны, што ўзнікаюць у працэсе арганізацыі і ажыццяўлення дзяржаўнага кіравання.

**Суб'екты адміністрацыйна-прававых адносін.** *Суб'ектамі* адміністрацыйна-прававых адносін з'яўляюцца органы выканаўчай улады і іх службовыя асобы, якія ў афіцыйнай форме выказваюць волю і інтарэсы дзяржавы. У некаторых выпадках, вызначаных заканадаўствам, у ролі суб'ектаў дадзеных адносін могуць выступаць суды (напрыклад, пры разглядзе адміністрацыйных спраў) і грамадскія аб'яднанні (напрыклад, прафсаюзы пры кіраванні падведамаснымі санаторна-курортнымі установамі).

**Адміністрацыйная правіннасць.** Паводзіны людзей у грамадстве бываюць як правамернымі, так і неправамернымі (проціпраўнымі). Адміністрацыйныя правапарушэнні (правіннасці) з'яўляюцца адной з разнавіднасцей проціпраўных паводзін грамадзян.

*Адміністрацыйным правапарушэннем,* як вызначана законам, прызнаецца проціпраўны вінаваты ўчынак (дзеянне або бяздзеянне), за які ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасць.

Да ліку прымет, якія адрозніваюць адміністрацыйнае правапарушэнне ад іншых відаў правапарушэнняў (злачынстваў, дысцыплінарных правіннасцей), адносяцца пэўная грамадская небяспека, адміністрацыйная проціпраўнасць, адміністрацыйная каральнасць і вінаватасць.

Паводзіны чалавека могуць быць ацэнены як адміністрацыйнае правапарушэнне ў тым выпадку, калі яны ўяўляюць пэўную пагрозу грамадскім адносінам. Грамадская не-


Правообладатель Народная асвета



Парушэнне Правілаў дарожнага руху

бяспека асобных правіннасцей (напрыклад, безбілетны праезд у аўтобусе) не на столькі відавочна, як небяспека злачынстваў. Аднак у сукупнасці нават такія, на першы погляд, нязначныя правіннасці прычыняюць істотную шкоду грамадству, і таму яны падлягаюць пакаранню.

Адміністрацыйнай правіннасцю могуць быць прызнаны толькі такія паводзіны, якія забаронены нормамі адміністрацыйнага права і за ўчыненне якіх прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

Абавязковай прыметай адміністрацыйнага правапарушэння з'яўляецца *вінаватасць* здзейсненага ўчынка. Віна паказвае свядомыя адносіны чалавека да ўчыненага і яго вынікаў. Таму для прызнання ўчынку (дзеяння або бяздзеяння) правапарушэннем неабходна ўстанавіць, што ён здзейснены свядома, г. зн. з'явіўся вынікам дзейнасці чалавека, які знаходзіцца пры сваім розуме. Не можа ацэньвацца як адміністрацыйна караемы ўчынак, здзейснены асобай, якая пакутуе ад расстройства псіхікі і не здольна кіраваць сваімі дзеяннямі, усведамляць іх наступствы.

Любое адміністрацыйнае правапарушэнне характарызуецца наяўнасцю ўсіх вышэй названых прымет. Адсутнасць любой з іх азначае, што разглядаемы ўчынак не з'яўляецца адміністрацыйнай правіннасцю. У такім выпадку ён можа быць прызнаны або правамернымі паводзінамі, або якім-небудзь іншым правапарушэннем.

**Віды адміністрацыйных спагнанняў.** У выпадку ўчынення грамадзянамі адміністрацыйнага правапарушэння

Правообладатель Народная асвета

да іх могуць быць прыменены розныя віды адміністрацыйных спагнанняў. У Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях вызначаны наступныя віды *адміністрацыйных спагнанняў*: папярэджанне, штраф, папраўчыя работы, адміністрацыйны арышт, пазбаўленне спецыяльнага права, канфіскацыя і інш. Характарыстыка розных відаў адміністрацыйных спагнанняў прадстаўлена ў табліцы 2.

*Табліца 2*

**Віды адміністрацыйных спагнанняў**

| Від адміністрацыйнага спагнання | Характарыстыка |
|---|---|
| Папярэджанне | Пісьмовая афіцыйна выказаная адмоўная ацэнка паводзін парушальніка — фізічнай асобы. Вуснае папярэджанне не з'яўляецца адміністрацыйным спагнаннем |
| Штраф | Грашовае спагнанне. Яго памер вызначаецца зыходзячы з базавай велічыні, устаноўленай заканадаўствам на дзень вынясення пастановы аб накладанні адміністрацыйнага спагнання |
| Папраўчыя работы | Адбываюцца па месцы пастаяннай працы фізічнай асобы; устанаўліваюцца на тэрмін ад 1 да 2 месяцаў. З заробтку фізічнай асобы ў даход дзяржавы ўтрымліваецца 20 % |
| Адміністрацыйны арышт | Утрыманне фізічнай асобы ва ўмовах ізаляцыі ў месцах, вызначаных органам, які наглядае за выкананнем адміністрацыйных спагнанняў; устанаўліваецца на тэрмін да 15 сутак. Гэта — адзін з найбольш цяжкіх відаў адміністрацыйных спагнанняў |
| Пазбаўленне спецыяльнага права | Прымяняецца за грубае парушэнне фізічнай асобай парадку карыстання гэтым правам (напрыклад, пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам); устанаўліваецца на тэрмін ад 3 месяцаў да 3 гадоў |
| Пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю | Прымяняецца пры ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння, звязанага з дзейнасцю, на ажыццяўленне якой патрабуецца спецыяльны дазвол (ліцэнзія); устанаўліваецца на тэрмін ад 6 месяцаў да 1 года |


Правообладатель Народная асвета

| Від адміністрацыйнага спагнання | Характарыстыка |
|---|---|
| Канфіскацыя | Прымусовае бязвыплатнае адчужэнне ва ўласнасць дзяржавы даходу, атрыманага ў выніку проціпраўнай дзейнасці, а таксама прылад і сродкаў учынення адміністрацыйнага правапарушэння, што належалі асобе, якая ўчыніла адміністрацыйнае правапарушэнне |
| Дэпартацыя | Адміністрацыйнае выдварэнне за межы Рэспублікі Беларусь. Прымяняецца ў адносінах да замежнага грамадзяніна і асобы без грамадзянства |
| Спагнанне вартасці прадмета адміністрацыйнага правапарушэння | Прымусовае адчужэнне ва ўласнасць дзяржавы грашовай сумы, якая складае вартасць прадметаў адміністрацыйнага правапарушэння (тавараў і (або) транспартных сродкаў) |

Адміністрацыйныя спагнанні маюць права прымяняць суддзі, органы ўнутраных спраў (міліцыя), камісіі па справах непаўналетніх, падатковыя органы і іншыя ўпаўнаважаныя на гэта дзяржаўныя органы.

**Абставіны, якія абцяжваюць адказнасць за адміністрацыйны праступак.** Адказнасць за адміністрацыйны праступак узрастае, калі ён быў учынены пры абцяжваючых абставінах. У адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях такімі абставінамі прызнаюцца: працяг проціпраўных паводзін, нягледзячы на патрабаванне спыніць іх; учыненне адміністрацыйнага правапарушэння паўторна; уцягванне непаўналетняга ў адміністрацыйнае правапарушэнне; учыненне адміністрацыйнага правапарушэння групай асоб.

Адказнасць за адміністрацыйнае правапарушэнне таксама ўзрастае, калі яно было ўчынена: ва ўмовах стыхійнага бедства або пры іншых надзвычайных абставінах; па матывах расавай, нацыянальнай або рэлігійнай розніцы; у адносінах жанчыны, цяжарнасць якой безумоўна вядома правапарушальніку; з выкарыстаннем асобы, якая пакутуе псіхічным захворваннем або слабым розумам, аб чым вядома правапарушальніку. Адказнасць за адміністрацыйнае правапарушэнне ўзрастае і ў тым выпадку, калі яно было

Правообладатель Народная асвета

ўчынена ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў.

?!

1. Што такое адміністрацыйнае права? Хто можа быць суб'ектам адміністрацыйна-прававых адносін?
2. Ахарактарызуйце прыметы і прывядзіце прыклады адміністрацыйных правапарушэнняў.
3. Ці з'яўляюцца адміністрацыйнымі правапарушэннямі наступныя ўчынкі:

   а) грамадзянін Л. перайшоў вуліцу ў нявызначаным месцы. На праезджай частцы гэтай вуліцы праводзіліся рамонтныя работы, у сувязі з чым праезд транспартных сродкаў па ёй быў забаронены;

   б) дарожна-транспартнае правапарушэнне адбылося ў выніку таго, што вадзіцель аўтамабіля раптоўна страціў прытомнасць і не мог кіраваць ім.

   Сваё меркаванне аргументуйце.
4. Якія віды адміністрацыйных спагнанняў прымяняюцца ў нашай краіне? Ахарактарызуйце іх. *(Выкарыстайце матэрыял 7 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 105—108.)*
5. Назавіце абставіны, якія абцяжваюць адміністрацыйную адказнасць.
6. Старажытнакітайскі філосаф Канфуцый (каля 551—479 да н. э.) сцвярджаў, што на дабро неабходна адказваць дабром, а на зло — па справядлівасці. У чым, на вашу думку, заключаецца сэнс прыцягнення правапарушальніка да адміністрацыйнай адказнасці?

## § 10. Асновы крымінальнага права

***Успомніце.*** Што такое прававая культура асобы?

Крымінальнымі ў старадаўнасці называлі злачынствы, за якія вінаватыя падлягалі смяротнай кары або некаторым іншым, вельмі цяжкім пакаранням.

***Крымінальнае права*** — гэта сукупнасць юрыдычных норм, якія вызначаюць злачыннасць і каральнасць учынкаў, небяспечных для існуючай сістэмы грамадскіх адносін. Яго функцыямі з'яўляюцца забеспячэнне законнасці і правапарадку, спыненне, абмежаванне або папярэджанне злачынных дзеянняў асобных членаў грамадства. Крымінальнае за-


Правообладатель Народная асвета

канадаўства вызначае, як неабходна пакараць тых, хто ўчыніў самае сур'ёзнае правапарушэнне — *злачынства*.

**Пакаранне, яго мэта і віды.** *Пакаранне* з'яўляецца мерай крымінальна-прававога ўздзеяння, якая прымяняецца па прыгаворы суда да асобы, асуджанай за злачынства. Пакаранне носіць прымусовы характар. Гэта значыць, што яно накладваецца на вінаватую асобу незалежна ад яе жадання ці нежадання. Прымусовая мера прымяняецца ад імя дзяржавы, а не ад імя асобных людзей, напрыклад суддзі. Суд выносіць прыгавор «ад імя Рэспублікі Беларусь». Пакаранне вызначаецца ў прыгаворы; яно падлягае выкананню толькі тады, калі прыгавор набыў законную сілу.

Пакаранне заключаецца ў прадугледжаных законам пазбаўленні або абмежаванні правоў і свабод асуджанага. Штраф, напрыклад, абмяжоўвае эканамічныя правы асуджанага, папраўчыя работы — працоўныя і эканамічныя правы, смяротная кара — права на жыццё як асноўнае права кожнага чалавека. Пакаранне цягне за сабой таксама прававыя наступствы, якія называюцца *судзімасцю*, што звязана з пэўнымі абмежаваннямі правоў асобы пасля адбывання пакарання.

Пакаранне мае на ўвазе тры важныя мэты: ахоўную, выхаваўчую і прафілактычную. Ахове (або абароне) падлягаюць асноўныя каштоўнасці чалавека і грамадства. Выхаваўчае ўздзеянне пакарання звязана са змяненнем свядомасці правапарушальніка ў бок паводзін, якія адпавядаюць закону. Прафілактыка накіравана на недапушчэнне правапарушэнняў у будучым.



Закрытае судовае пасяджэнне

Правообладатель Народная асвета

Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь прадугледжаны наступныя віды пакаранняў: грамадскія работы; штраф; пазбаўленне права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю; папраўчыя работы; арышт; абмежаванне волі; накіраванне ў дысцыплінарную воінскую часць (для ваеннаслужачых тэрміновай службы); пазбаўленне волі. Найвышэйшай, выключнай мерай пакарання з'яўляецца смяротная кара (расстрэл). Як альтэрнатыва смяротнай кары дапускаецца пажыццёвае заключэнне. Гэтыя пакаранні прызначаюцца судом за некаторыя асабліва цяжкія злачынствы, звязаныя з наўмысным пазбаўленнем чалавека жыцця пры абцяжваючых абставінах.

**Абставіны, якія выключаюць крымінальную адказнасць.** У адпаведнасці з прынцыпам справядлівасці пакаранне павінна адпавядаць характару і ступені грамадскай небяспекі злачынства, абставінам яго ўчынення і асобе вінаватага.

У Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь прадугледжаны шэраг сітуацый, у якіх пры ўчыненні чалавекам правапарушэнняў крымінальная адказнасць не наступае. У прыватнасці, гэта адносіцца да тых выпадкаў, калі дзеянні, якія выклікалі прычыненне шкоды іншаму чалавеку, былі ўчынены:

пры абароне жыцця, здароўя, правоў таго, хто абараняецца, або іншай асобы, а таксама інтарэсаў грамадства або дзяржавы ад грамадска небяспечнага замаху і пры гэтым не было допушчана перавышэння меж *неабходнай абароны*;

пры затрыманні асобы, якая ўчыніла злачынства, перадачы яе органам улады і спыненні магчымасці ўчынення ёю новых злачынстваў;

з мэтай папярэджвання або ўстаранення небяспекі, якая непасрэдна пагражае гэтаму чалавеку або іншым людзям, іх правам і законным інтарэсам, а таксама інтарэсам грамадства або дзяржавы;

пры выкананні загаду або распараджэння, аддадзеных ва ўстаноўленым парадку. Крымінальную адказнасць за прычыненне такой шкоды нясе асоба, якая аддала незаконны загад або распараджэнне.

Не цягне за сабой крымінальную адказнасць знаходжанне сярод саўдзельнікаў злачынства па спецыяльным заданні. Аднак гэта правіла не прымяняецца да асобы, якая ўчы-


Правообладатель Народная асвета

ніла асабліва цяжкае або цяжкае злачынства, звязанае з замахам на жыццё або здароўе чалавека.

Прынцыпова важнай умовай выключэння крымінальнай адказнасці пры ўказаных вышэй абставінах з'яўляецца прызнанне таго, што якімі-небудзь іншымі сродкамі затрымаць чалавека, які здзейсніў злачынства, або ўстараніць небяспеку, якая пагражала асобе, грамадству і дзяржаве, было немагчыма. Пры гэтым прычыненая шкода павінна быць менш значнай, чым прадухіленая, і не павінна быць дапушчана перавышэння неабходных для гэтага мер.

**Неабходная абарона.** *Неабходная абарона* ўяўляе сабой правамернае прычыненне шкоды пры абароне інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад небяспечных замахаў. Правамерным з'яўляецца прычыненне любой шкоды замахвальніку, калі яго нападзенне было звязана з насіллем, небяспечным для жыцця таго, хто абараняўся, або іншай асобы, ці з непасрэднай пагрозай прымянення насілля. Такое прычыненне шкоды фармальна ўтрымлівае прыметы злачынства, але пры выкананні правілаў абароны не цягне крымінальнай адказнасці.

Самаабарона як сінонім паняцця «неабходная абарона» азначае, што той, хто абараняецца, устараняе замах сам, сваімі сіламі. Грамадзянін мае права абараняць свае жыццё, здароўе, жыллё, зберажэнні, транспартны сродак, г. зн. усё, што абаронена законам. Цалкам гэта адносіцца і да жыцця, здароўя, жылля сваякоў, сяброў, суседзяў і нават зусім незнаёмых людзей. Не выключаецца абарона законных інтарэсаў фірмы, грамадскай арганізацыі і г. д. Такія дзеянні прызнаюцца грамадска карыснымі, паколькі перашкаджаюць учыненню злачынства, ствараюць становішча нецярпімасці да проціпраўных дзеянняў, выхоўваюць у людзей актыўную грамадзянскую пазіцыю.

Аднак нельга абараняцца ад законных дзеянняў. Пазбаўлены права на самаабарону той правапарушальнік, чые злачынныя дзеянні перарываюцца службовымі асобамі або проста якімі-небудзь людзьмі. Процідзеянне асобам, якія ажыццяўляюць правамернае затрыманне правапарушальніка, яго дастаўку ў адпаведныя органы ўлады і да т. п., знаходзіцца за межамі неабходнай абароны.

Не мае права таксама спасылацца на стан неабходнай абароны чалавек, уцягнуты, напрыклад, у бойку яе ініцыятарам,

Правообладатель Народная асвета



У экспертна-крыміналістычнай лабараторыі

калі ён тлумачыць свае дзеянні тым, што завадатару бойкі пагражала небяспека. Не можа быць прызнаны ў стане неабходнай абароны і чалавек, які справакаваў напад дзеля таго, каб выкарыстаць яго як прычыну для ўчынення проціпраўных дзеянняў (расправы, помсты і інш.).

**Абставіны, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць.** Адказнасць за ўчыненне злачынства ўзрастае, калі яно было ўчынена пры абцяжваючых абставінах. Пры ацэнцы характару абставін учынення злачынства пад увагу бярэцца: кім і ў адносінах да каго было ўчынена злачынства; якія былі мэты, сродкі і наступствы ўчынення злачынства.

У адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь абставінамі, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць, прызнаецца ўчыненне злачынства асобай, якая раней ужо ўчыніла якое-небудзь злачынства (калі не скончыўся тэрмін даўнасці або не знята судзімасць за яго), а таксама асобай, якая парушыла прынятую ёй прысягу або прафесійную клятву. Да абцяжваючых абставін адносяцца стан алкагольнага ап'янення або стан, выкліканы ўжываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў.

Больш цяжкім прызнаецца злачынства, учыненае групай асоб па папярэднім згаворы, арганізаванай групай ці злачыннай арганізацыяй, а таксама з выкарыстаннем заведама малалетняга або асобы, вядомай вінаватаму як тая, што пакутуе псіхічным захворваннем або слабым розумам.

Заканадаўства прадугледжвае ўзрастанне крымінальнай адказнасці за злачынствы, учыненыя ў адносінах да малалетняга, састарэлага або асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане, а таксама ў некаторых іншых выпадках.

Крымінальная адказнасць узрастае, калі злачынства ўчыняецца з карыслівых або іншых ганебных намераў, па матывах расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці ці розніцы, палітычнай або ідэалагічнай варожасці, або з мэтай скрыць іншае злачынства ці аблягчыць яго ўчыненне.


Правообладатель Народная асвета

Абставінамі, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць, таксама з’яўляюцца:

учыненне злачынства з асаблівай жорсткасцю або здзекам;

свядомае парушэнне устаноўленых правілаў бяспекі, якое прывяло да ўчынення злачынства;

выкарыстанне ў злачынных мэтах умоў грамадскага бедства або надзвычайнага становішча.

**Адказнасць непаўналетніх за крымінальныя правапарушэнні.** Крымінальнай адказнасці падлягае асоба, якая дасягнула на момант учынення злачынства 16-гадовага ўзросту. За асабліва цяжкія злачынствы крымінальная адказнасць наступае з 14 гадоў.

Да асобы, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да 18 гадоў, могуць быць прыменены наступныя пакаранні: грамадскія работы; штраф; пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчыя работы; арышт; абмежаванне волі; пазбаўленне волі. Характарыстыка пакаранняў прадстаўлена ў табліцы 3.

*Табліца 3*

**Пакаранні за злачынствы, учыненыя непаўналетнімі**

| Від пакарання | Характарыстыка |
| --- | --- |
| Грамадскія работы | Прызначаюцца асуджанаму, які дасягнуў 16-гадовага ўзросту, на тэрмін ад 30 да 180 гадзін. Працягласць грамадскіх работ не можа перавышаць 3 гадзін у дзень і 3 дзён у тыдзень. Асуджанымі, якія навучаюцца ва ўстановах адукацыі або маюць пастаяннае месца працы, грамадскія работы адбываюцца ў свабодны ад вучобы або асноўнай працы час |
| Штраф | Прызначаецца непаўналетняму, які ўчыніў злачынства, калі ён мае самастойны заработак або маёмасць (у памеры, які не перавышае 20 мінімальных заработных плат, а за карыслівае злачынства — 100 мінімальных заработных плат) |
| Пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю | Прызначаецца асобе, якая дасягнула 16-гадовага ўзросту, на тэрмін ад 1 да 3 гадоў |

Правообладатель Народная асвета

| Від пакарання | Характарыстыка |
|---|---|
| Папраўчыя работы | Прызначаюцца асобе, якая дасягнула 16-гадовага ўзросту, на тэрмін ад 2 месяцаў да 1 года па месцы працы. Частка заработку асуджанага адчужаецца ў даход дзяржавы (у межах ад 5 да 15 %) |
| Арышт | Прызначаецца асобе мужскога полу, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да 16 гадоў, на тэрмін ад 15 сутак да 3 месяцаў |
| Абмежаванне волі | Прызначаецца асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да 18 гадоў, на тэрмін ад 6 месяцаў да 3 гадоў |
| Пазбаўленне волі | Асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да 18 гадоў, тэрмін пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі не можа перавышаць: за менш цяжкае злачынства — 3 гады; за цяжкае злачынства — 7 гадоў; за асабліва цяжкае злачынства — 10 гадоў; за асабліва цяжкае злачынства, спалучанае з наўмысным замахам на жыццё чалавека, — 15 гадоў.<br>Асобе, якая не дасягнула 18-гадовага ўзросту да дня вынясення прыгавору, адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі прызначаецца ў выхаваўчай калоніі<br>Асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да 18 гадоў і якая дасягнула 18-гадовага ўзросту да дня вынясення прыгавору, адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі прызначаецца ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму |

Пры прызначэнні пакарання непаўналетняму ўлічваюцца ўмовы яго жыцця і выхавання, ступень псіхічнага развіцця, стан здароўя, узрост на дзень вынясення прыгавору, іншыя асаблівасці асобы, а таксама ўплыў іншых асоб. Асобе, якая ўпершыню ўчыніла злачынства ва ўзросце да 18 гадоў, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не прызначаецца.

?! 1. Што такое крымінальнае права? У чым заключаюцца яго грамадскія функцыі?



Правообладатель Народная асвета

2. Што такое пакаранне? Якія яго мэты? Назавіце віды пакаранняў, прадугледжаныя Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.
3. Ці лічыце вы неабходным захаванне ў нашай краіне смяротнай кары як вышэйшай меры пакарання? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
4. У якіх выпадках прычыненне шкоды іншаму чалавеку не цягне за сабой крымінальную адказнасць? Якія прынцыпова важныя ўмовы ўлічваюцца судом пры выключэнні крымінальнай адказнасці за ўчыненае правапарушэнне?
5. Што такое неабходная абарона? Прывядзіце прыклады сітуацый, у якіх яна лічыцца правамернай і неправамернай.
6. Дзесяцікласнік С. ішоў дадому. На пустэльнай вуліцы да яго падышлі двое хлопцаў, якіх ён ведаў. Яны пачалі зневажаць яго, а пасля ўдарылі. С. пабег клікаць на дапамогу сваіх сяброў. Праз паўгадзіны ўтрох яны знайшлі дваіх хуліганаў і нанеслі ім цялесныя пашкоджанні. Ці можна лічыць дзеянні С. (яго сяброў) неабходнай абаронай? Адказ растлумачце.
7. У якіх выпадках крымінальная адказнасць за ўчыненае злачынства ўзрастае? Назавіце абставіны, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць.
8. Якія асаблівасці крымінальнай адказнасці непаўналетніх? *(Выкарыстайце матэрыял 8 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 108—109.)*
9. Злачынства — бясспрэчнае зло. Ахвяры злачынства — тыя, хто зведвае на сабе зло, а злачынцы — тыя, хто прычыняе людзям зло. Нямецкі пісьменнік Г. Гесэ (1877—1962) лічыў: «Лепш трываць зло, чым прычыняць зло». Ці згодны вы з гэтым меркаваннем? Свой адказ аргументуйце.

## § 11. Праваахоўныя органы Рэспублікі Беларусь

***Успомніце.*** **1.** Назавіце органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь. **2.** У чым заключаецца прынцып вяршэнства права?

**Асноўныя задачы праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь.** Праваахоўная дзейнасць з'яўляецца адной з важных функцый дзяржавы. Усе органы заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады павінны прымаць меры для падтрымання законнасці і правапарадку ў дзяржаве. Строга выконваючы законы, забяспечваючы рэалізацыю грамадзянамі сваіх

Правообладатель Народная асвета

правоў, абараняючы законныя грамадскія і дзяржаўныя інтарэсы, усе дзяржаўныя органы прама або ўскосна ўдзельнічаюць у праваахоўнай дзейнасці. Для выяўлення, спынення і папярэджвання правапарушэнняў, прымянення розных санкцый да правапарушальнікаў дзяржава стварае спецыяльныя органы, якія і называюцца праваахоўнымі.

**Праваахоўныя органы Рэспублікі Беларусь**

- Суд
- Пракуратура
- Органы юстыцыі
- Органы ўнутраных спраў
- Органы дзяржаўнага кантролю
- Органы дзяржаўнай бяспекі
- Падатковыя органы
- Мытныя органы

Да *праваахоўных органаў* Рэспублікі Беларусь адносяць суд, пракуратуру, органы юстыцыі (ад лац. justitia — справядлівасць, законнасць), унутраных спраў (міліцыю), дзяржаўнага кантролю, дзяржаўнай бяспекі, падатковыя і мытныя органы.

**Суд.** *Судовую сістэму* Рэспублікі Беларусь, як вы ўжо ведаеце, складае Канстытуцыйны Суд, агульныя суды, гаспадарчыя суды.

Разбор спраў ва ўсіх судах адкрыты, за выключэннем некаторых выпадкаў, асобна агавораных законам. Бакі і асобы, якія ўдзельнічаюць у судовым працэсе, маюць права на абскарджанне рашэнняў, прыгавораў і іншых судовых пастаноў у парадку, прадугледжаным законам.

Канстытуцыйны Суд адыгрывае асобую ролю ў судовай сістэме краіны. Ён дае заключэнне аб адпаведнасці нашай Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь:

прынятых Нацыянальным сходам законаў, а таксама дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта;


Правообладатель Народная асвета

міжнародных дагавораў і іншых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь;

рашэнняў міждзяржаўных утварэнняў, у якія ўваходзіць наша краіна;

пастаноў Савета Міністраў;

актаў Вярхоўнага Суда, Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Генеральнага пракурора, а таксама актаў любога іншага дзяржаўнага органа ўлады.

Нарматыўныя акты або іх асобныя палажэнні, прызнаныя неканстытуцыйнымі, страчваюць сілу.

**Пракуратура.** ***Пракуратура Рэспублікі Беларусь*** — гэта адзіная і цэнтралізаваная сістэма органаў, якія ажыццяўляюць ад імя дзяржавы нагляд за дакладным і аднолькавым выкананнем нарматыўных прававых актаў (законаў, дэкрэтаў, загадаў) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Задачамі пракуратуры з'яўляюцца забеспячэнне вяршэнства права, законнасці і правапарадку, абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян і арганізацый, а таксама грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў.

Пракуратура каардынуе праваахоўную дзейнасць дзяржаўных органаў, ажыццяўляе барацьбу са злачыннасцю і карупцыяй.

У выпадках, прадугледжаных Крымінальна-працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, пракуратура праводзіць папярэдняе следства. Пракуроры прымаюць удзел у разглядзе судамі грамадзянскіх спраў, а таксама спраў, звязаных



Пасяджэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

Правообладатель Народная асвета

з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці, падтрымліваюць дзяржаўнае абвінавачванне па крымінальных справах.

Дзейнасць пракуратуры грунтуецца на прынцыпах законнасці, роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, незалежнасці пракурора, падпарадкаванасці ніжэйстаячых пракурораў вышэйстаячым пракурорам, галоснасці, абавязковасці выканання патрабаванняў пракурора.

**Органы юстыцыі.** У сістэму *органаў юстыцыі* ўваходзяць: Міністэрства юстыцыі і падпарадкаваныя яму ўпраўленні юстыцыі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, дзяржаўныя натарыяльныя канторы і прыватныя натарыусы, аддзелы запісу актаў грамадзянскага стану (ЗАГСы) і інш.

Міністэрства юстыцыі з'яўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання. Яно падпарадкоўваецца Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, а па асобных пытаннях дзейнасці, прадугледжаных заканадаўствам, непасрэдна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

На Міністэрства юстыцыі ўскладзены задачы рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы правасуддзя, у тым ліку ўрэгуляванне калектыўных працоўных спрэчак, а таксама кіраўніцтва архіўнай справай у краіне, кіраўніцтва натарыятам і дзяржаўны кантроль за натарыяльнай дзейнасцю, кіраўніцтва і кантроль за рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану.

Міністэрства юстыцыі ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю палітычных партый, рэспубліканскіх прафесійных саюзаў, міжнародных і рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў. Яно вядзе Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, выконвае некаторыя іншыя функцыі.

*Натарыят* (ад лац. notarius — пісар) — дзяржаўны орган, які сведчыць рознага роду юрыдычныя акты (дагаворы, завяшчанні, даверанасці і г. д.), а таксама сапраўднасць подпісаў на дакументах і копій дакументаў. У Рэспубліцы Беларусь натарыят уключае дзяржаўных і прыватных натарыусаў, упаўнаважаных службовых асоб мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў у Рэспубліцы Беларусь. У іх абавязкі ўваходзіць забеспячэнне абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб, а так-


Правообладатель Народная асвета

сама дзяржаўных інтарэсаў шляхам ажыццяўлення натарыяльных дзеянняў ад імя Рэспублікі Беларусь.

У сістэму органаў юстыцыі нашай краіны ўваходзіць таксама *Рэспубліканскі працоўны арбітраж*. Ён з'яўляецца дзяржаўным органам, які ажыццяўляе разгляд калектыўных працоўных спрэчак, што ўзнікаюць у сацыяльна-эканамічнай сферы.

У гэту ж сістэму ўваходзіць і *Цэнтр судовых экспертыз і крыміналістыкі*. Яго асноўнымі задачамі з'яўляюцца: правядзенне экспертыз па крымінальных і грамадзянскіх справах, справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, гаспадарчых (эканамічных) спрэчках, а таксама правядзенне навуковых даследаванняў у галіне крыміналістыкі і судовай экспертызы.

**Органы ўнутраных спраў (міліцыя).** *Міліцыя* — гэта дзяржаўны праваахоўны орган, прызваны абараняць жыццё, здароўе, правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, грамадства і дзяржавы ад злачынных і іншых проціпраўных замахаў.

Задачамі міліцыі з'яўляюцца: ахова грамадскага парадку; забеспячэнне асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян, а таксама грамадскай бяспекі; папярэджванне і спыненне злачынстваў і іншых правапарушэнняў; выяўленне і раскрыццё злачынстваў, вышук асоб, якія іх учынілі; абарона ўсіх форм уласнасці ад проціпраўных замахаў; аказанне, у адпаведнасці з заканадаўствам, дапамогі грамадзянам, дзяржаўным органам, а таксама прадпрыемствам, установам і арганізацыям па абароне іх правоў і рэалізацыі ўскладзеных на іх абавязкаў; выкананне крымінальных пакаранняў і адміністрацыйных спагнанняў у межах сваёй кампетэнцыі.

Грамадзяне маюць права атрымаць ад работнікаў міліцыі тлумачэнні ў сувязі з абмежаваннем іх правоў і свабод. Асоба, якая лічыць, што дзеяннямі работніка міліцыі ўшчэмлены яе правы, свабоды і законныя інтарэсы, мае права абскардзіць гэтыя дзеянні вышэйстаячаму органу або службовай асобе міліцыі, пракурору, звярнуцца ў суд.

Міліцыя прадастаўляе магчымасць затрыманым і пасаджаным пад варту асобам рэалізаваць сваё права на юрыдычную абарону, неадкладна паведамляе аб месцы іх знаходжання сваякам, адміністрацыі па месцы працы або вучобы. Пры неабходнасці міліцыя прымае меры па неад-

Правообладатель Народная асвета



Урачысты рытуал выпуску афіцэраў у Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь

кладным аказанні ім медыцынскай і іншай дапамогі, а таксама ўстараненні небяспекі для чыйго-небудзь жыцця, здароўя або маёмасці, якая ўзнікла ў выніку затрымання або заключэння пад варту ўказаных асоб.

Дзейнасць міліцыі грунтуецца на прынцыпах законнасці, гуманізму, павагі правоў чалавека. Міліцыя абараняе кожнага чалавека незалежна ад яго грамадзянства, сацыяльнага, маёмаснага і іншага стану, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, узросту, адукацыі і мовы, адносін да рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў.

**Органы дзяржаўнага кантролю.** Для ажыццяўлення кантролю за выкарыстаннем дзяржаўнай уласнасці, выкананнем рашэнняў Прэзідэнта, Парламента, Урада і іншых дзяржаўных органаў у краіне створаны *Камітэт дзяржаўнага кантролю*. Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю назначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Камітэт дзяржаўнага кантролю сочыць за выкананнем заканадаўства ў галіне фінансаў і падаткаабкладання, за правільнасцю расходавання сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, законнасцю выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў і інш.

**Органы дзяржаўнай бяспекі.** Органы дзяржаўнай бяспекі ўтвараюць адзіную цэнтралізаваную сістэму. У яе ўваходзяць Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і ўпраўленні гэтага Камітэта па абласцях (тэрытарыяльныя органы).


Правообладатель Народная асвета

Асноўнай задачай *Камітэта дзяржаўнай бяспекі* краіны з’яўляецца барацьба са злачынствамі, якія ўяўляюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь. Да іх ліку адносяцца тэрарызм, арганізаваная злачыннасць, кантрабанда, незаконны гандаль зброяй і некаторыя іншыя злачынствы. Камітэт дзяржаўнай бяспекі ажыццяўляе таксама барацьбу з разведвальна-падрыўной дзейнасцю замежных спецслужб. Для вырашэння гэтых і іншых задач Камітэт ажыццяўляе збор, абагульненне, праверку інфармацыі, прызначанай для прыняцця адказных дзяржаўных рашэнняў, звязаных з забеспячэннем бяспекі краіны і яе паспяховага развіцця.

Органы дзяржаўнай бяспекі маюць у сваім падпарадкаванні спецыялізаваныя ўстановы адукацыі, воінскія часці, падраздзяленні спецыяльнага прызначэння і інш.

?!

1. Што адносяць да праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь? Якія іх асноўныя задачы?
2. Што такое пракуратура? Якая яе роля ў беларускай дзяржаве?
3. Назавіце асноўныя прынцыпы дзейнасці пракуратуры Рэспублікі Беларусь.
4. Што ўваходзіць у сістэму органаў юстыцыі нашай краіны? Якія задачы яны вырашаюць?
5. Што такое міліцыя? Якія яе асноўныя задачы? *(Выкарыстайце матэрыял 9 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 109—110.)*
6. У чым заключаецца асобая роля Канстытуцыйнага Суда ў судовай сістэме Рэспублікі Беларусь?
7. У чым заключаюцца функцыі органаў дзяржаўнага кантролю і дзяржаўнай бяспекі?

## Практыкум «Моладзь і права»

**1.** У якасці кампанентаў прававой культуры чалавека звычайна вылучаюць веданне прынцыпаў і норм права, станоўчыя адносіны да права, праватмерныя паводзіны, актыўнасць праваахоўнай пазіцыі.

Правообладатель Народная асвета

1. Як вы думаеце, што такое «актыўнасць праваахоўнай пазіцыі» чалавека? Ці характэрна гэта якасць для беларускай моладзі?
2. Ці лічыце вы, што неабходна мець юрыдычную адукацыю для таго, каб быць законапаслухмяным грамадзянінам? Свой адказ аргументуйце.

**2.** Двое старшакласнікаў пераходзілі вуліцу на зялёны колер святлафора і, апынуўшыся на сярэдзіне дарогі, вырашылі перабегчы яе, нягледзячы на тое, што святлафор пераключыўся на чырвоны колер. Вадзіцель аўтамабіля, які ехаў з хуткасцю, вышэйшай за дазволеную, рэзка затармазіў, і яго вынесла на сустрэчную паласу, па якой ехаў аўтобус. Шафёр аўтобуса, які ў гэты момант прадаваў праязны білет пасажыру, на імгненне страціў пільнасць, і машыны сутыкнуліся.

На шчасце, ніхто не пацярпеў, тым не менш вінаватыя ў дарожна-транспартным здарэнні былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

1. Прааналізуйце, якія правапарушэнні прывялі ў апісаным выпадку да дарожна-транспартнага здарэння.
2. Як вы лічыце, ці існуюць правапарушэнні, не небяспечныя для грамадства?
3. Нормы якой галіны права парушаны ў наступных сітуацыях?

| Галіны права | Нумары адказаў |
|---|---|
| Адміністрацыйнае права | |
| Грамадзянскае права | |
| Крымінальнае права | |
| Працоўнае права | |

1) Пераход дарогі ў нявызначаным месцы;
2) збіванне чалавека;
3) прагул на працы;
4) парушэнне правілаў пажарнай бяспекі;
5) лоўля рыбы сеткаю;
6) крадзеж аўтамабіля.


Правообладатель Народная асвета

4. Якія з ніжэйпералічаных характарыстык садзейнічаюць або перашкаджаюць працаўладкаванню? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

| Садзейнічае працаўладкаванню | Перашкаджае працаўладкаванню | Не ўплывае на працаўладкаванне |
|---|---|---|
| | | |

1) Неахайны знешні выгляд;
2) манеры ўсёзнайкі;
3) дыплом з адзнакай;
4) няўменне выказвацца: слабы голас, дрэнная дыкцыя, моўныя памылкі;
5) наяўнасць дакладных жыццёвых мэт і задач;
6) недахоп шчырасці і ўраўнаважанасці;
7) адсутнасць інтарэсу і энтузіязму;
8) празмерная канцэнтрацыя ўвагі на грошах; зацікаўленасць толькі ў больш высокай аплаце;
9) ярка выяўленае нежаданне вучыцца;
10) імкненне да самаапраўдання, спасылкі на неспрыяльныя фактары пры тлумачэнні сваіх недахопаў;
11) пагардлівыя водзывы аб людзях;
12) адсутнасць пачуцця гумару;
13) недастатковыя веды па спецыяльнасці;
14) акцэнтаванне ўвагі суразмоўніка на сваіх «сувязях»;
15) уменне цаніць свой і чужы час;
16) адсутнасць цікавасці да грамадскай дзейнасці.

**5.** Дайце прававую ацэнку выкладзеным ніжэй сітуацыям (выкарыстайце пры неабходнасці дадатковую літаратуру).

1. Шаснаццацігадовы Яўген К. уладкаваўся на высокааплатную працу. На заробленыя грошы ён не толькі харчуецца і апранаецца, але і дапамагае хворай маці. На свае зберажэнні Яўген купіў сабе лічбавую відэакамеру, а праз некаторы час вырашыў яе прадаць і купіць ноўтбук. Сусед Яўгена па пад'ездзе, Максім С., пагадзіўся купіць відэакамеру ў крэдыт. Яўген аддаў Максіму відэакамеру, а Максім абавязаўся выплаціць грошы за відэакамеру на працягу месяца.

Правообладатель Народная асвета

Маці Яўгена, даведаўшыся аб гэтай здзелцы, пачала апасацца, што сын застанецца і без відэакамеры, і без грошай. Яна звярнулася да Максіма з патрабаваннем вярнуць відэакамеру.

Як Максім, так і Яўген заявілі, што ніхто не мае права ўказваць Яўгену, як абыходзіцца з яго рэчамі, набытымі на заробленыя грошы, тым больш што ён не толькі не залежыць ад сваёй маці, але і, наадварот, аказвае ёй дапамогу.

**?** Ці адпавядаюць закону дзеянні Яўгена К.?

2. Навучэнец каледжа Андрэй М., 14 гадоў, са згоды бацькоў пачаў збіраць грошы для куплі камп'ютара. Праз год ён меў неабходную для куплі суму, прычым 20 % гэтай сумы былі ім адкладзены са стыпендыі, 30 % перадаў яму праз бацькоў у дар дзед, а астатнія 50 % ён зарабіў сам у час канікулаў.

Не спытаўшы дазволу ў бацькоў, Андрэй купіў у свайго сябра па каледжы, 16-гадовага Сяргея Р., камп'ютар, прычым у яго засталася яшчэ некаторая сума, на якую ён адкрыў рахунак у банку.

Бацькі Андрэя, лічачы, што іх сын учыніў няўдалую куплю, запатрабавалі ад Сяргея і яго бацькоў скасавання дагавора. Між тым Андрэй і Сяргей заявілі, што яны не будуць скасоўваць дагавор, паколькі і грошы, і камп'ютар бацькам не належалі.

**?** Ці адпавядаюць закону юрыдычныя дзеянні, учыненыя Андрэем і Сяргеем?

3. Вучань 8-га класа па вусным распараджэнні дырэктара камбіната бытавога абслугоўвання быў прыняты на працу інспектарам у бюро даведак (з рэжымам працы 5 разоў у тыдзень па 5 гадзін). Праз два дні да дырэктара звярнулася маці хлопчыка і папрасіла звольніць сына, лічачы, што ён быў прыняты на працу незаконна (без яе згоды) і павінен прадоўжыць вучобу ў школе.

**?** Ці правільна быў афармлены прыём на працу падлетка? Ці мае маці права патрабаваць звальнення непаўналетняга сына і каму павінна быць выдадзена заработная плата за адпрацаваны час?


Правообладатель Народная асвета

4. Жанчына-прадавец прыцягнула да працы сваю дачку, якая калі-нікалі працавала разам з маці, а часам замяняла ў яе адсутнасць. Дырэктар магазіна абʼявіў жанчыне вымову за парушэнне працоўнай дысцыпліны і забараніў прыцягваць да працы пабочную асобу. Пры гэтым ён спаслаўся на норму, якая абавязвае работнікаў асабіста выконваць працоўныя абавязкі.

? Ці законныя дзеянні дырэктара магазіна? Ці мае права работнік перапаручаць выкананне сваіх працоўных абавязкаў іншай асобе?

5. 15-гадовай дзяўчыне было адмоўлена ў прыёме на працу прадаўцом магазіна. Дырэктар абгрунтаваў свой адказ тым, што ў аддзеле, дзе патрабуецца прадавец, рэалізуюцца спірныя напіткі, тытунёвыя вырабы, піва. Акрамя таго, прадаўцу прыходзіцца падымаць і перасоўваць цяжар, які перавышае нормы падʼёму цяжару непаўналетнімі.

? Ці правільныя дзеянні дырэктара магазіна?

6. Да дырэктара магазіна звярнуўся 14-гадовы Сяргей П. Ён прасіў прыняць яго на працу ў свабодны ад заняткаў час (штодзённа з 15 да 19 гадзін). Дырэктар прапанаваў Сяргею прыйсці разам з бацькамі, каб атрымаць іх згоду. Сяргей растлумачыў, што бацькі не дазваляюць яму працаваць, але ён хоча працаваць, каб аказаць матэрыяльную дапамогу сямʼі.

? Як павінен быў паступіць дырэктар магазіна? Які парадак прыёму на працу непаўналетніх ва ўзросце ад 14 гадоў?

7. Грамадзянін Н. быў падвергнуты адміністрацыйнаму арышту на 15 сутак за дробнае хуліганства. Лічачы пастанову суддзі аб арышце несправядлівай, Н. звярнуўся са скаргаю да пракурора, у якой ён указаў, што суддзя не звярнуў увагі на тое, што правапарушэнне было ўчынена ў стане апʼянення. У цвярозым стане такога ўчынку ён бы не здзейсніў.

? Ці абгрунтавана скарга грамадзяніна Н.?

8. Грамадзянка М. зарэгістравала шлюб з грамадзянінам І. у чэрвені 2005 г. У красавіку 2008 г. у судзе была ўзбуджана справа па іску пракурора аб прызнанні шлюбу

Правообладатель Народная асвета

паміж М. і І. несапраўдным. Сваё патрабаванне пракурор матываваў тым, што ў 2002 г. І. зарэгістраваў з грамадзянкай В. шлюб, які да гэтага часу не скасаваны. Пры рэгістрацыі шлюбу з М. грамадзянін І. утаіў гэтыя абставіны. Адзнакі ў пашпарце грамадзяніна І. аб першым шлюбе не было. Пашпарт І. быў атрыманы ў 2003 г. у сувязі са стратай ранейшага, і пры яго выдачы ў ім не была зроблена адзнака аб знаходжанні ў шлюбе.

? Ці меў пракурор права патрабаваць прызнання шлюбу несапраўдным у гэтай сітуацыі?

9. Двое падлеткаў вырашылі папалохаць прахожых. Калі сцямнела, яны, раптам выскачыўшы з хмызняку, запатрабавалі ў праходзячага міма К. кашалёк. Калі той палез у кішэню, адзін з падлеткаў засмяяўся і сказаў: «Мы пажартавалі». Аднак К. выхапіў з кішэні нож і нанёс аднаму з падлеткаў раненне.

? Ці можна гаварыць аб перавышэнні К. меж неабходнай абароны? Чаму?

**6.** Вядомы розныя пункты гледжання па пытанні аб прычынах процiпраўных паводзін чалавека. Напрыклад:

а) на злачынны шлях людзей штурхаюць неспрыяльныя ўмовы сацыяльнага асяроддзя;

б) віна за злачынныя паводзіны чалавека ляжыць на самім чалавеку, на яго скажоным духоўным свеце, на яго няздольнасці процістаяць адмоўным уплывам звонку.

?
1. Які з двух пунктаў гледжання вам уяўляецца больш правільным? Чаму?
2. Як бы вы адказалі на пытанне: чаму людзі ўчыняюць процiпраўныя дзеянні?

**7.** Рускі пісьменнік Я. І. Замяцін (1884—1937), аўтар рамана «Мы», уклаў у вусны галоўнага героя наступныя разважанні аб свабодзе: «Свабода і злачынства гэтак жа непарыўна звязаны паміж сабой, як рух аэра і яго хуткасць: хуткасць аэра = 0, і ён не рухаецца; свабода чалавека = 0, і ён не ўчыняе злачынстваў. Значыць, адзіны сродак пазбавіць чалавека ад злачынстваў — гэта пазбавіць яго ад свабоды».


Правообладатель Народная асвета

1. Ці згодны вы з гэтымі разважаннямі? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
2. Прапануйце пералік мер, якія, на вашу думку, дазволяць знізіць узровень правапарушэнняў сярод моладзі.

**8.** Часта ў злачынную дзейнасць непаўналетнія уцягваюцца праз «сяброўскія» адносіны з равеснікамі і старэйшымі прыяцелямі, якія ўжо ступілі на злачынны шлях. Пэўную ролю тут іграе боязь падлетка праславіцца «здраднікам», «баязліўцам», «мамчыным сынком». На шчасце, не ўсе дзеці паддаюцца на такую прымітыўную «агітацыю».

Часам падлеткі-правапарушальнікі ідуць на злачынства пад уплывам дарослых. Рукамі непаўналетніх дарослыя ўчыняюць іншы раз даволі небяспечныя злачынствы, застаючыся ў цені, каб пазбегчы адказнасці. Самі падлеткі, схільныя парушаць маральныя нормы грамадства, ідуць насустрач такім «апекунам», атрымліваючы ад іх «узнагароджанне».

1. Што б вы параілі маладому чалавеку, які трапіў пад уплыў злачыннай групы?
2. Сфармулюйце правілы паводзін, якіх неабходна прытрымлівацца, каб засцерагчы сябе ад уцягвання ў злачынную дзейнасць.

## Дакументы і матэрыялы

**1. З Дзіцячай юрыдычнай энцыклапедыі**

Правілы, якіх неабходна прытрымлівацца пры заключэнні дагавора:

1. Ніколі не падпісвайце дагавор пры першым знаёмстве з фірмай. Вазьміце экзэмпляр дагавора з сабой, уважліва прачытайце яго дома. Падкрэсліце ўсе месцы, якія вам незразумелыя. Калі вашы знаёмыя не могуць растлумачыць вам незразумелыя моманты, звярніцеся за дапамогаю да юрыста.

2. Пераканаўшыся, што ўсе палажэнні дагавора вам зразумелыя, падумайце, ці адлюстраваны ў ім максімальна падрабязна ўмовы, якія вы лічыце важнымі для заключаемага дагавора.

3. Паглядзіце, наколькі справядліва ў дагаворы размеркавана адказнасць бакоў. Не падпісвайце дагавор, калі ў ім падрабязна запісана адказнасць спажыўца і адсутнічае адказнасць фірмы.

Правообладатель Народная асвета

4. Калі якія-небудзь важныя для вас умовы ў дагаворы адсутнічаюць, прапануйце ўключыць іх у тэкст дагавора.

5. Не бойцеся патрабаваць тлумачэння па ўсіх незразумелых пытаннях. Дагавор — пагадненне раўнапраўных бакоў, кожны з якіх мае права прапанаваць свае ўмовы.

Не забывайце, што вы неабходны фірме больш, чым яна вам. Фірм шмат, а колькасць кліентаў абмежаваная. Таму адчувайце сябе гаспадаром становішча.

? З якога ўзросту ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь дазваляецца заключэнне дагавораў?

**2. З кнігі С. П. Кацубы «Моладзь і закон»**

Калі вы хочаце, каб пошук работы закончыўся поспехам, вызначце, што неабходна зрабіць, каб праваліць гэту задумку (так-так, менавіта праваліць). На першае месца пастаўце тое, што дакладней усяго прывядзе да правалу, тады ў другой калонцы, складзенай «па кантрасту», вы атрымаеце спіс дзеянняў, якія надзейна вядуць да поспеху.

Не разлічвайце знайсці дакладна такую ж работу, якая ў вас была. Будзьце гатовы да перамены дзейнасці так, каб справіцца з новай работай і атрымаць ад яе задавальненне.

Чым больш часу вы патраціце на вызначэнне таго, чым вы вылучаецеся з мноства іншых людзей, якія маглі б выконваць тую ж работу, тым вышэй вашыя шансы.

Сачыце за сабой увесь час, будзьце ахайныя, добра апранутыя, не забывайце аб добрых манерах, куды б вы ні накіроўваліся, дзе б вы ні знаходзіліся. Ніколі не ведаеш, хто цябе ўбачыць, але любая сустрэча можа самым рашучым (і часам абсалютна нечаканым) чынам паўплываць на атрыманне работы.

Тое, як вы займаецеся пошукамі работы, з'яўляецца для большасці работадаўцаў паказчыкам таго, як вы будзеце працаваць, атрымаўшы яе. Таму, займаючыся пошукамі без душы, спусціўшы рукавы, вы асуджаеце сябе на няўдачу.

Галоўнае, што цікавіць работадаўцу, — як вы выконваеце тое, што ўмееце. Вельмі важна прадэманстраваць свае ўменні і навыкі (захапіце на субяседаванне прыклады сваёй работы).

Старайцеся зрабіць самае выйгрышнае ўражанне і спадабацца, нават калі бачыце, што ў гэтым месцы для вас няма


Правообладатель Народная асвета

нічога падыходзячага. Магчыма, калі вы зробіце добрае ўражанне, вам дадуць слушную параду або нават парэкамендуюць іншай фірме пры зручным выпадку.

У час гутаркі з работадаўцам не гаварыце маналогаў даўжэй за 2 хвіліны; ідэальны расклад: палову часу гаварыць, а палову — слухаць.

Калі вы для сябе вызначылі, якую работу шукаеце, растлумачце гэта ўсім навокал. Чым больш вачэй і вушэй дапамагае вам, тым лепш.

?

1. Якія асобасныя якасці, на ваш погляд, найбольш важныя пры пошуку работы? Свой адказ абгрунтуйце.
2. Сучаснае грамадства дынамічна змяняецца, прад'яўляючы новыя патрабаванні да чалавека, яго ведаў, уменняў, асобасных якасцей. Як вы лічыце, якія фактары садзейнічаюць паспяховай самарэалізацыі сучаснага чалавека?

**3. З Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь**

*Артыкул 272.* Узрост, з якога дапускаецца заключэнне працоўнага дагавора

Не дапускаецца заключэнне працоўнага дагавора з асобамі, маладзейшымі за шаснаццаць гадоў.

З пісьмовай згоды аднаго з бацькоў (усынавіцеляў, папячыцеляў) працоўны дагавор можа быць заключаны з асобай, якая дасягнула ўзросту чатырнаццаці гадоў, для выканання лёгкай работы, якая:

1) не з'яўляецца шкоднай для яго здароўя і развіцця;

2) не шкодзіць наведванню агульнаадукацыйнай установы, а таксама ўстановы, якая забяспечвае атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

?

1. Чым, на ваш погляд, абумоўлены ўстаноўленыя Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь абмежаванні пры заключэнні працоўных дагавораў з непаўналетнімі?
2. Як бы вы адказалі на пытанне: чалавек жыве, каб працаваць, або працуе, каб жыць?

**4. З Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і**

*Артыкул 59.* Сям'я

Сям'я — гэта аб'яднанне асоб, злучаных паміж сабой маральнай і матэрыяльнай агульнасцю і падтрымкай, вя-

Правообладатель Народная асвета

дзеннем агульнай гаспадаркі, правамі і абавязкамі, якія вынікаюць са шлюбу, блізкага сваяцтва, усынаўлення.

Іншыя сваякі мужа і жонкі, непрацаздольныя ўтрыманцы, а ў выключных выпадках і іншыя асобы могуць быць прызнаны ў судовым парадку членамі сям'і, калі яны жывуць сумесна і вядуць агульную гаспадарку.

*Артыкул 65.* Правы і абавязкі сям'і

Сям'я абавязана садзейнічаць рэалізацыі правоў і законных інтарэсаў членаў сям'і, на яе ўскладваецца адказнасць за выхаванне і ўтрыманне дзяцей, іх абарону.

За сям'ёй прызнаюцца пераважнае права і абавязак вызначаць формы, сродкі і метады выхавання дзяцей. Абавязкі сям'і ў адносінах да дзяцей вызначаюцца правамі дзяцей, устаноўленымі гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 66.1.* Абарона правоў і законных інтарэсаў дзяцей

Пры невыкананні ці неналежным выкананні бацькамі або адным з іх, а таксама іншымі асобамі і арганізацыямі, якія прымаюць удзел у выхаванні і ўтрыманні дзяцей, сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей, або злоўжыванні сваімі правамі, або адмоўным уплыве на паводзіны дзяцей, або жорсткім абыходжанні з імі дзеці маюць права звярнуцца за абаронай сваіх правоў і законных інтарэсаў у камісіі па справах непаўналетніх, органы апекі і апякунства, пракуратуру, а па дасягненні чатырнаццаці гадоў — і ў суд.

Бацькі маюць права звярнуцца ў суд з іскам аб абароне правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх дзяцей да юрыдычнай або фізічнай асобы, якая парушыла іх правы і законныя інтарэсы.

*Артыкул 89.* Кіраванне справамі непаўналетняга дзіцяці

Бацькі маюць права ўчыняць ад імя дзіцяці ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў маёмасныя здзелкі, даваць згоду на ўчыненне здзелак з дзецьмі ва ўзросце ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў, а таксама кіраваць маёмасцю дзіцяці да дасягнення ім паўналецця як законныя прадстаўнікі.

Пры гэтым бацькі не маюць права без згоды органа апекі і апякунства:

адчужаць, аддаваць у залог маёмасць, якая належыць дзіцяці;


Правообладатель Народная асвета

адмаўляцца ад спадчыны ад імя дзіцяці, прымаць спадчыну пад умовай;

адмаўляцца ад прыняцця ў дар;

патрабаваць падзелу маёмасці дзіцяці;

учыняць іншыя здзелкі, якія супярэчаць інтарэсам дзіцяці.

Бацькі абавязаны з належным клопатам ажыццяўляць кіраванне маёмасцю дзіцяці, захоўваць памер гэтай маёмасці, а пры магчымасці і памнажаць яго.

?

1. Якія галоўныя прыметы сям'і?
2. У паўсядзённым жыцці вы часта чуеце выраз «сямейны абавязак». У чым, на вашу думку, ён заключаецца? Хто каму і што павінен?
3. Якія органы забяспечваюць абарону правоў і законных інтарэсаў дзяцей?
4. Ці лічыце вы справядлівым прадугледжанае Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і абмежаванне правоў бацькоў кіраваць маёмасцю дзіцяці?

**5. Аб шлюбным дагаворы**

Большасць людзей, збіраючыся стварыць сям'ю, не задумваюцца аб заключэнні шлюбнага кантракта. Большасць нашых суграмадзян ведаюць аб ім пераважна з заходніх фільмаў і навін з жыцця «зорак».

Розум многіх людзей ніяк не можа пагадзіцца з думкай аб тым, як жа гэта магчыма — будаваць адносіны паміж мужам і жонкай на нейкім дагаворы. Ды яшчэ і прадугледжваць у ім пытанні, якія могуць узнікнуць, калі муж і жонка раптам акажуцца перад неабходнасцю разводу.

Насуперак агульнапрынятаму меркаванню, права першынства ў вынаходніцтве шлюбнага кантракта не належыць ні сучаснай Еўропе, ні Амерыцы. Гэты дакумент не такі малады, як мы думаем. Тысячы гадоў таму ў Старажытнай Грэцыі і Рыме мужчыны і жанчыны, перш чым стварыць сям'ю, афармлялі пагадненне, дзе апісвалі свае маёмасныя адносіны, адразу абмяркоўваючы таксама і пытанні атрымання ў спадчыну ў будучым сумесна нажытай маёмасці.

Зараз шлюбны кантракт найбольш распаўсюджаны ў краінах Заходняй Еўропы, у ЗША і Канадзе. Такой папулярнасцю ён абавязаны магутным феміністкім рухам і барацьбе «слабай палавіны» за свае правы, раўнапраўе муж-

Правообладатель Народная асвета

чыны і жанчыны ў шлюбе. Часцей за ўсё шлюбны кантракт афармляюць заможныя людзі — палітыкі, бізнесмены, спевакі, зоркі кіно.

У розных краінах гэты інстытут мае свае асаблівасці, але асноўная мэта шлюбнага дагавора — прадаставіць мужу і жонцы дастаткова шырокія магчымасці для вызначэння ў шлюбе сваіх маёмасных адносін.

У законах еўрапейскіх дзяржаў часта ўказана, што шлюбны дагавор не павінен супярэчыць «добрым норавам», парушаць нормы грамадзянскага і сямейнага права. Палажэнні шлюбнага дагавора не могуць парушаць раўнапраўе мужа і жонкі, абмяжоўваць іх свабоду ў выбары прафесіі і роду заняткаў. Шлюбны дагавор не павінен адмяняць абавязкі ўзаемнай адданасці, дапамогі і падтрымкі, абмяжоўваць асабістыя правы і абавязкі мужа і жонкі па выхаванні і ўтрыманні дзяцей.

Парадак заключэння шлюбнага дагавора ў замежных краінах, як правіла, патрабуе захавання пісьмовай формы і прысутнасці мужа і жонкі. У Францыі ён падлягае натарыяльнаму сведчанню. У Італіі ён павінен быць зарэгістраваны ў мясцовым органе ўлады, а калі дагавор тычыцца нерухомай маёмасці, то — у органах, якія рэгіструюць здзелкі з нерухомасцю.

Заключэнне шлюбнага кантракта аказвае сур’ёзны ўплыў на адносіны ў пары. Згодна з ацэнкамі спецыялістаў у галіне сямейнай псіхалогіі, шлюбны дагавор не правакуе развод, як многія думаюць, а ў большасці выпадкаў стрымлівае ад яго. Бо калі ў «некантрактнай сям’і» муж ці жонка чуць што могуць сказаць: «Не падабаецца — ідзі!», то пры шлюбным дагаворы сто разоў прыйдзецца падумаць, бо ў гэтым выпадку муж і жонка пазбаўляюцца пэўнай часткі агульнай маёмасці. На думку псіхолагаў, колькасць разводаў «пад гарачую руку» павінна паменшыцца. Пры шлюбным кантракце, які складзены належным чынам, ні муж ні жонка не зацікаўлены ў стварэнні «разводнай» сітуацыі. А калі хто-небудзь з іх усё ж прызнае ўчыненую памылку і адважыцца на скасаванне шлюбу, то, па крайняй меры, гэта рашэнне будзе пацверджана гатоўнасцю несці дзеля свабоды пэўныя матэрыяльныя страты. Кантракт істотна аблягчае шлюбаразводны працэс, як у юрыдычным, так і псіхалагічным плане. Перш за ўсё брачны кантракт на карысць агуль-


Правообладатель Народная асвета

ным дзецям, хаця б таму, што пры «кантрактным» разводзе дзіцё не выкарыстоўваюць як зброю помсты і барацьбы паміж бацькам і маці...

?! 1. Як вы лічыце, ці садзейнічае шлюбны дагавор умацаванню сям'і?
2. Прывядзіце свае аргументы «за» і «супраць» шлюбнага дагавора.

**6.** Разважаючы аб сям'і, гавораць, што бацькі часта бачаць сябе ў сваіх дзецях. Калі яны крыўдзяцца і крытыкуюць нейкія тваe памылкі і промахі, цалкам магчыма, што гэта менавіта тыя памылкі і промахі, якія яны некалі рабілі самі. Бацькі, якія мяркуюць, што ў падлеткавым узросце ў іх нешта не атрымалася — можа быць, яны не мелі поспеху ў спорце, як ім хацелася б, — могуць вельмі актыўна перашкаджаць табе займацца менавіта гэтай дзейнасцю, каб засцерагчы цябе ад магчымага краху. Некаторыя бацькі надта настойліва падштурхоўваюць сваіх дзяцей у якім-небудзь пэўным напрамку, або, наадварот, усяляк адгаворваюць і перашкаджаюць займацца тым, што ім падабаецца. Бацькі, якія праяўляюць празмерную апеку, звычайна думаюць, што заўжды лепш усцерагчы сваіх дзяцей ад засмучэнняў і непрыемнасцей, нават калі гэта азначае, што дзіця ніколі не зможа рэалізаваць сябе, даказаць сабе свае магчымасці. Калі вашы бацькі адносяцца да гэтай катэгорыі, вам прыйдзецца навучыцца, як мага больш эфектыўна процістаяць іх ціску. Гэта надзвычай цяжка, але вы павінны ісці сваім шляхам.

Ёсць і поўная процілегласць гэтай катэгорыі бацькоў — яны лічаць, што іх дзіцяці адкрыты ўсе межы. Вы можаце сказаць: «Гучыць выдатна! Дзе б знайсці такіх бацькоў?» Хочаце — верце, хочаце — не, але большасць, маючы такіх усё дазваляючых бацькоў, вельмі перажываюць, мяркуючы, што бацькі наогул пра іх не клапоцяцца, што ім абыякавы іх лёс.

? Як вы лічыце, якія дзеянні бацькоў у большай ступені садзейнічаюць паспяховай самарэалізацыі дзяцей?

**7. З Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях**

*Артыкул 4.3.* Узрост, з якога наступае адміністрацыйная адказнасць

Правообладатель Народная асвета

1. Адміністрацыйнай адказнасці падлягае фізічная асоба, якая дасягнула на момант учынення правапарушэння шаснаццацігадовага ўзросту, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Фізічная асоба, якая ўчыніла забароненае гэтым Кодэксам дзеянне ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў, падлягае адміністрацыйнай адказнасці толькі:

1) за наўмыснае прычыненне цялеснага пашкоджання;

2) за дробны крадзеж;

3) за наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці;

4) за парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў лясах ці на тарфяніках;

5) за жорсткае абыходжанне з жывёламі;

6) за распальванне вогнішчаў у забароненых месцах;

7) за дробнае хуліганства;

8) за парушэнне правіл, якія забяспечваюць бяспеку руху на чыгуначным або гарадскім электрычным транспарце;

9) за парушэнне правіл карыстання сродкамі чыгуначнага транспарту;

10) за парушэнне правіл карыстання транспартным сродкам;

11) за парушэнне правіл карыстання метрапалітэнам;

12) за парушэнне патрабаванняў па забеспячэнні захаванасці грузаў на транспарце;

13) за знішчэнне, пашкоджанне або страту гісторыка-культурных каштоўнасцей або матэрыяльных аб'ектаў, якім можа быць прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці;

14) за парушэнне парадку раскопвання воінскіх пахаванняў і правядзення пошукавых работ;

15) за незаконныя дзеянні ў адносінах газавай, пнеўматычнай або металічнай зброі;

16) за незаконныя дзеянні ў адносінах халоднай зброі.

*Артыкул 4.6.* Адказнасць непаўналетніх

1. Адміністрацыйная адказнасць непаўналетніх ва ўзросце ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў, якія ўчынілі адміністрацыйныя правапарушэнні, наступае ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

2. На непаўналетніх ва ўзросце ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў не можа накладвацца адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, а на не-


Правообладатель Народная асвета

паўналетніх ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў не могуць накладвацца таксама адміністрацыйныя спагнанні ў выглядзе штрафу (за выключэннем выпадкаў, калі яны маюць свае заработак, стыпендыю і (або) іншы ўласны даход) ці папраўчых работ.

3. На непаўналетніх ва ўзросце ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў можа накладвацца адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе папярэджання незалежна ад таго, ці прадугледжана яно ў санкцыях артыкула Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

*Артыкул 17.1.* Дробнае хуліганства

Нецэнзурная лаянка ў грамадскім месцы, абразлівае прыставанне да грамадзян і іншыя наўмысныя дзеянні, якія парушаюць грамадскі парадак, дзейнасць арганізацый або спакой грамадзян і выяўляюцца ў выразнай непавазе да грамадства, цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзвюх да трыццаці базавых велічынь або адміністрацыйны арышт.

*Артыкул 17.3.* Распіццё алкагольных напіткаў у грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе

1. Распіццё алкагольных напіткаў на вуліцы, стадыёне, у скверы, парку, грамадскім транспарце або ў іншых грамадскіх месцах, акрамя месцаў, прызначаных для ўжывання алкагольных напіткаў, або з'яўленне ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе, які зневажае чалавечую годнасць і мараль, цягнуць накладанне штрафу ў памеры да васьмі базавых велічынь.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзвюх да пятнаццаці базавых велічынь або адміністрацыйны арышт.

*Артыкул 17.6.* Заведама лжывае паведамленне

1. Заведама лжывае паведамленне, якое пацягнула прыняцце мер рэагавання міліцыяй, хуткай медыцынскай дапамогай, падраздзяленняў па надзвычайных становішчах або іншымі спецыялізаванымі службамі, цягне накладанне штрафу ў памеры ад чатырох да пятнаццаці базавых велічынь.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за

Правообладатель Народная асвета

такое ж парушэнне, цягне накладанне штрафу ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь.

*Артыкул 17.9.* Курэнне (спажыванне тытунёвых вырабаў) у забароненых месцах

Курэнне (спажыванне тытунёвых вырабаў) у месцах, дзе яно ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі забаронена, цягне накладанне штрафу ў памеры ад адной дзясятай да пяці дзясятых базавай велічыні.

*Артыкул 18.23.* Парушэнне Правілаў дарожнага руху пешаходам і іншымі ўдзельнікамі дарожнага руху

1. Парушэнне Правілаў дарожнага руху пешаходам, асобай, якая кіруе веласіпедам, гужавой павозкай, або асобай, якая ўдзельнічае ў дарожным руху і не кіруе транспартным сродкам, цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да пяці дзясятых базавай велічыні.

2. Парушэнне Правілаў дарожнага руху асобамі, указанымі ў частцы першай гэтага артыкула, здзейсненае ў стане ап'янення, цягне накладанне штрафу ў памеры ад адной да трох базавых велічынь.

?

1. З якога ўзросту чалавек можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці? Якія асаблівасці адміністрацыйнай адказнасці непаўналетніх?
2. Аб якіх абставінах, якія абцяжваюць адміністрацыйную адказнасць, упамінаецца ў вышэйпрыведзеным фрагменце Кодэкса?

**8. З Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь**

*Артыкул 27.* Узрост, з якога наступае крымінальная адказнасць

1. Крымінальнай адказнасці падлягае асоба, якая на момант учынення злачынства дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту, за выключэннем выпадкаў прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Асобы, якія ўчынілі забароненыя гэтым Кодэксам дзеянні ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў, падлягаюць крымінальнай адказнасці толькі за:

1) забойства;

2) прычыненне смерці па неасцярожнасці;

3) наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання;


Правообладатель Народная асвета

4) наўмыснае прычыненне меней цяжкага цялеснага пашкоджання;

5) згвалтаванне;

6) гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару;

7) выкраданне чалавека;

8) крадзеж;

9) грабеж;

10) разбой;

11) вымагальніцтва;

12) выкраданне транспартнага сродку або маламернага воднага судна;

13) наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці;

14) захоп заложніка;

15) крадзеж агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў або выбуховых рэчываў;

16) наўмыснае прывядзенне ў непрыгоднасць транспартнага сродку або шляхоў зносін;

17) крадзеж наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў;

18) хуліганства;

19) заведама лжывае паведамленне аб небяспецы;

20) апаганенне збудаванняў і пашкоджанне маёмасці;

21) уцёкі з папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, арыштнага дома або з-пад варты.

**?** Чаму, на ваш погляд, узрост, з якога наступае крымінальная адказнасць за шэраг правапарушэнняў, згодна з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь паніжаны да 14 гадоў?

**9.** У структуру органаў унутраных спраў (ОУС) уваходзіць некалькі падраздзяленняў. Самым вялікім па колькасці падраздзяленнем з'яўляецца міліцыя грамадскай бяспекі. Яе асноўная задача — ахова і падтрыманне грамадскага парадку. Адно з падраздзяленняў міліцыі грамадскага парадку так і называецца — аддзел аховы правапарадку і прафілактыкі. У яго складзе дзейнічае ППС (патрульна-паставая служба). Кожны аўтамабіль ППС пастаянна патрулюе свой участак у чаканні сігналу. Задача патрулёў — спыняць любыя парушэнні грамадскага парадку.

Правообладатель Народная асвета

У складзе міліцыі грамадскай бяспекі дзейнічае таксама служба ўчастковых інспектараў. Участковы інспектар — гэта супрацоўнік міліцыі, адказны за парадак на канкрэтным участку.

Участковы інспектар павінен не проста сачыць за парадкам на сваім участку, але і папярэджваць правапарушэнні. Ён самастойна (дзе гэта магчыма) прымае меры ў выпадку ўчынення правапарушэнняў або выклікае нарады міліцыі, калі неабходны больш сур'ёзныя дзеянні.

Яшчэ адно падраздзяленне міліцыі грамадскай бяспекі — аддзяленне па папярэджванні правапарушэнняў непаўналетніх (ІСН — інспекцыя па справах непаўналетніх). Работа супрацоўнікаў інспекцыі будуецца на зносінах з усімі вучнямі і настаўнікамі, з сем'ямі тых, хто блізкі да ўчынення правапарушэння. Калі ж закон усё ж такі парушаны, супрацоўнікі гэтага аддзялення ўключаюцца ў расследаванне аж да перадачы справы ў суд.

У склад міліцыі грамадскай бяспекі ўваходзіць і аддзяленне Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі — ДАІ.

Другім буйным падраздзяленнем органаў унутраных спраў з'яўляецца крымінальная міліцыя. Яе галоўная задача — барацьба з небяспечнымі злачынствамі. Адным з найважнейшых падраздзяленняў крымінальнай міліцыі з'яўляецца крымінальны вышук. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўступаюць у дзеянне, калі злачынства ўжо адбылося або калі рыхтуецца яго здзяйсненне. Як толькі гэта выяўляецца, узбуджаецца крымінальная справа. Даныя для яе здабываюць супрацоўнікі аддзялення крымінальнага вышуку.

У склад крымінальнай міліцыі ўваходзяць таксама падраздзяленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй, барацьбе з эканамічнымі і падатковымі злачынствамі, барацьбе з незаконным абаротам наркотыкаў, экспертна-крыміналістычныя і некаторыя іншыя падраздзяленні.

?

1. Якія падраздзяленні вылучаюць у структуры органаў унутраных спраў?
2. Якія асноўныя задачы падраздзяленняў міліцыі?

### 10. Са свету юрыдычных прафесій

У нашы дні вялікую папулярнасць сярод моладзі набыла юрыдычная адукацыя. Конкурс абітурыентаў на юрыдычныя факультэты вышэйшых навучальных устаноў — адзін


Правообладатель Народная асвета

з самых высокіх у рэспубліцы. На жаль, не ўсе выпускнікі школ маюць выразнае ўяўленне аб асаблівасцях юрыдычных прафесій, патрабаваннях, якія яны прад'яўляюць да чалавека. Разгледзім асноўныя функцыі прадстаўнікоў юрыдычных прафесій.

*Адвакат:*

кансультуе і дае тлумачэнні, вусныя і пісьмовыя даведкі па юрыдычных пытаннях;

складае заявы, скаргі і іншыя дакументы прававога характару;

ажыццяўляе прадстаўніцтва ў судах, арганізацыях па грамадзянскіх справах і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях;

ажыццяўляе прававое абслугоўванне камерцыйных аперацый, заключэнне кантрактаў, распрацоўку статутаў, дакументаў;

ажыццяўляе абарону правоў грамадзян пры аказанні ім псіхіятрычнай дапамогі;

удзельнічае ў крымінальным судаводстве ў якасці абаронцы, прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка.

*Натарыус:*

сведчыць здзелкі, дагаворы, абставіны;

сведчыць сапраўднасць копій дакументаў;

учыняе натарыяльныя дзеянні ад імя дзяржавы;

прымае меры для аховы спадчыннай маёмасці, накладвае забарону на адчужэнне маёмасці;

прымае дакументы на захаванне.

*Пракурор:*

ажыццяўляе агульны нагляд за выкананнем законаў усімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі;

ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў органамі, якія праводзяць аператыўна-вышуковую дзейнасць, дазнанне, папярэдняе следства;

ажыццяўляе нагляд за выкананнем правоў і свабод чалавека і грамадзяніна;

удзельнічае ў разглядзе спраў судамі;

каардынуе дзейнасць праваахоўных органаў па барацьбе са злачыннасцю.

Правообладатель Народная асвета

*Суддзя:*

рыхтуецца да судовага разбору справы, выклікае адказчыкаў, істцоў, сведак, экспертаў і г. д.;

ажыццяўляе правасуддзе ад імя дзяржавы, выносячы пастанову, рашэнне, прыгавор па справе;

разглядае справы па заявах, скаргах, якія паступілі ў час асабістага прыёму насельніцтва.

1. Чым, на ваш погляд, абумоўлены павышаны інтарэс сучаснай моладзі да юрыдычных прафесій?
2. Якія патрабаванні да асобасных якасцей чалавека прад'яўляюць юрыдычныя прафесіі?

## Урок абагульнення

1. Дайце азначэнні паняццяў: *грамадзянскае права, праваздольнасць, дзеяздольнасць, працоўнае права, сямейнае права, адміністрацыйнае права, правапарушэнне, адміністрацыйная адказнасць, крымінальнае права, крымінальная адказнасць, пракуратура.*

2. Сістэматызуйце свае веды аб галінах права. Запоўніце табліцу.

| Галіны права | Сфера прымянення | Суб'екты прававых адносін | Асаблівасці рэгулявання прававых адносін непаўналетніх |
|---|---|---|---|
| Грамадзянскае | | | |
| Працоўнае | | | |
| Сямейнае | | | |
| Адміністрацыйнае | | | |
| Крымінальнае | | | |

3. Раскрыйце сутнасць паняццяў, канкрэтызуйце іх прыкладамі: *юрыдычная асоба, адміністрацыйнае правапарушэнне, працоўная дысцыпліна, правы і абавязкі наймаль-*


Правообладатель Народная асвета

*ніка і работніка, рабочы час, час адпачынку, неабходная абарона, правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.*

4. Пабудуйце структурныя схемы:

1) абставіны, якія выключаюць крымінальную адказнасць;

2) абставіны, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць.

5. Якія віды адміністрацыйных спагнанняў і крымінальных пакаранняў установлены беларускім заканадаўствам? Якія з іх могуць быць прыменены да непаўналетніх?

6. Назавіце праваахоўныя органы Рэспублікі Беларусь і іх асноўныя задачы.

Правообладатель Народная асвета

# Тэма 3
# Палітыка беларускай дзяржавы

## § 12. Сацыяльны партрэт Беларусі

***Успомніце.*** **1.** Што такое сацыяльная структура грамадства? **2.** Прывядзіце прыклады вялікіх і малых сацыяльных груп.

**Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва краіны.** Апісаць канкрэтнае грамадства, зразумець асаблівасці яго развіцця, дынаміку яго сацыяльнай структуры дазваляе такая навука, як сацыялогія. Яна і ёсць той «мастак», які можа намаляваць «партрэт» грамадства.

Паняцце *сацыяльны склад* насельніцтва краіны па сваймy зместу блізкае да паняцця *сацыяльная структура* грамадства. Яно адлюстроўвае не проста наяўнасць тых ці іншых груп у грамадстве, але і іх колькасць, а таксама іх узаемасувязі.

У сацыяльнай структуры любога грамадства прадстаўлены ў першую чаргу групы людзей, якія адрозніваюцца па месцы жыхарства — *насельніцтва горада* або *вёскі*. У сацыяльным складзе насельніцтва абавязкова вылучаюцца *этнічныя* групы (беларусы, рускія, украінцы, палякі, яўрэі і г. д.). Важнае значэнне маюць таксама *рэлігійныя супольнасці* (праваслаўныя, католікі, іудзеі, мусульмане і інш.). Ёсць групы людзей, якія адрозніваюцца ў залежнасці ад характару іх адносін да ўласнасці (уладальнікі фірм і наёмныя работнікі), а таксама прафесійныя групы (будаўнікі, работнікі сельскай гаспадаркі, настаўнікі, урачы). У асобныя групы аб’ядноўваюцца людзі па месцы ў кіраванні грамадствам, па памерах даходаў, па ўзроўні адукацыі.

У нашай краіне пражывае каля 9,5 млн чалавек. Па колькасці насельніцтва Рэспубліка Беларусь займае 5 месца сярод краін СНД. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 47 чалавек на 1 кв. км — прыблізна такая ж, як і ў многіх іншых еўрапейскіх краінах.

Прыкладна 74 % насельніцтва Беларусі пражывае ў гарадах, адпаведна 26 % — гэта сельскае насельніцтва. Гарадское насельніцтва сканцэнтравана ў 112 гарадах і 96 па-


Правообладатель Народная асвета

сёлках гарадскога тыпу. 13 гарадоў маюць насельніцтва больш за 100 тыс. чалавек; у сталіцы нашай краіны г. Мінску пражывае больш за 1,8 млн чалавек. На 1000 мужчын прыходзіцца каля 1145 жанчын; ва ўзроставых групах, старэйшых за 50 гадоў, гэта розніца павялічваецца.

Наша краіна з'яўляецца этнічна неаднароднай. У краіне пражываюць прадстаўнікі 130 нацыянальнасцей. 81 % грамадзян Рэспублікі Беларусь лічаць сябе беларусамі, 11 % — рускімі, амаль 4 % — палякамі, 2 % — украінцамі, 0,3 % — яўрэямі.

У Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных напрамкаў, дзейнічае больш за 3 тыс. рэлігійных арганізацый.

Для сацыяльнага складу краіны важным паказчыкам з'яўляецца размеркаванне працуючых па галінах нацыянальнай эканомікі і па ўзроўні адукацыі (гл. дыяграмы).

Палова занятага насельніцтва краіны звязана з дзяржаўнай формай уласнасці; некалькі менш — з прыватнай формай уласнасці; расце колькасць людзей, звязаных з замежнай або са змешанай уласнасцю з замежным удзелам.

У Беларусі працуе каля 2,5 тыс. дактароў навук і больш як 14 тыс. кандыдатаў навук.




Правообладатель Народная асвета




Дынаміка сацыяльнай структуры сучаснага беларускага грамадства адпавядае тым тэндэнцыям, якія характэрны для развітых прамысловых дзяржаў: узрастанне долі гарадскога насельніцтва, рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, узрастанне долі работнікаў кваліфікаванай працы.

**Якасць і ўзровень жыцця насельніцтва.** Найважнейшым напрамкам дзяржаўнай палітыкі ў нашай краіне з'яўляецца далейшае павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. *Узровень жыцця* характарызуе забяспечанасць насельніцтва матэрыяльнымі дабротамі і паслугамі, ступень задавальнення патрэб насельніцтва. Для вызначэння ўзроўню жыцця насельніцтва выкарыстоўваюцца розныя паказчыкі: суадносіны мінімальнага спажывецкага бюджэту і мінімальнай заработнай платы, доля расходаў на харчаванне ў сямейным бюджэце, спажыванне тавараў працяглага карыстання, колькасць жылой плошчы на аднаго чалавека і інш. *Якасць жыцця* — гэта шырокае паняцце, якое характарызуе агульны дабрабыт людзей. Яно ўключае не толькі эканамічныя паказчыкі, але і ўзровень аховы здароўя, адукацыі, стан навакольнага асяроддзя і г. д.

Наша дзяржава ў сваёй дзейнасці арыентавана перш за ўсё на забеспячэнне росту рэальных грашовых даходаў як асновы паляпшэння жыцця насельніцтва, на пераадоленне малазабяспечанасці, на недапушчэнне праяўленняў сацыяльнай несправядлівасці і сацыяльнага напружання ў грамадстве. У Беларусі на працягу шэрагу гадоў назіраецца ўстойлівы рост даходаў насельніцтва. Доля малазабяспечанага насельніцтва скарацілася з 42 % у 2000 г. да 6 % у 2008 г. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў сярод краін СНД.


Правообладатель Народная асвета

Асноўнымі крыніцамі фарміравання грашовых даходаў насельніцтва краіны з'яўляюцца заработная плата, пенсіі, дапамогі, стыпендыі. Іх доля ў агульнай суме грашовых даходаў насельніцтва склала ў 2008 г. 75,9 %. У пачатку 2010 г. сярэднямесячная заработная плата ў Беларусі склала больш за 1 млн руб. Самая высокая зарплата ў нашай краіне ў работнікаў праектна-вышукальных арганізацый, фінансава-банкаўскай сферы, навукі, інфармацыйнага абслугоўвання, будаўніцтва, ніжэйшая зарплата — у ахове здароўя, адукацыі, сацыяльным забеспячэнні, сельскай гаспадарцы.

Важным напрамкам дзейнасці беларускай дзяржавы з'яўляецца забеспячэнне дзяржаўных гарантый у галіне аплаты працы, гэта значыць устанаўленне і захаванне мінімальнага памеру заработнай платы. ***Мінімальная заработная плата*** — гэта заканадаўча ўстаноўленая мяжа аплаты працы, ніжэй за якую не можа выплачваць ні адзін наймальнік, пры ўмове выканання наёмнымі работнікамі норм рабочага часу і аб'ёмаў работ. У снежні 2008 г., у самым пачатку сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, мінімальная заработная плата ў доларавым эквіваленце раўнялася ў Беларусі 97 (у Расіі — 83, ва Украіне — 90).

**Сацыяльная абарона насельніцтва.** ***Сацыяльная абарона*** — гэта сукупнасць мер, якія рэалізуе дзяржава, каб абараніць чалавека ў найбольш цяжкія моманты яго жыцця (страта працы, хвароба, страта карміцеля, стыхійныя бедствы, старасць, інваліднасць і інш.). Напярэдадні сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу каля 60 % дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь расходавалася на сацыяльныя патрэбы. Гэты паказчык сведчыць аб высокай сацыяльнай арыентаванасці дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

У цяперашні час у краіне пражывае каля 2,6 млн пенсіянераў, каля 40 тыс. чалавек — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Да працоўных пенсій ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ўстаноўлены спецыяльныя надбаўкі. Вялікая ўвага надаецца сацыяльнай абароне інвалідаў. Ажыццяўляюцца мерапрыемствы па медыцынскай, прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Праводзіцца работа па стварэнні «безбар'ернага» асяроддзя, г. зн. забеспячэнні інвалідам свабоднага доступу да жылых, вытворчых будынкаў і збудаванняў, да аптэк, магазінаў і г. д.

Правообладатель Народная асвета




Адрасная сацыяльная дапамога пенсіянерам, адзінокім пажылым людзям

У Рэспубліцы Беларусь штогод распрацоўваюцца Дзяржаўная і рэгіянальныя праграмы занятасці насельніцтва. У апошнія гады ўзровень беспрацоўя не перавышае 1 % ад агульнай колькасці працаздольнага насельніцтва. Ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу захаваць такое становішча на рынку працы даволі складана, тым не менш палітыка дзяржавы і ў гэтых цяжкіх умовах накіравана на тое, каб не дапусціць масавых звальненняў, захаваць высокі ўзровень занятасці. У Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь у 2009 г. падкрэслена: «Пры ўсіх эканамічных цяжкасцях прыярытэтным у развіцці нашай дзяржавы быў і застаецца сацыяльны сектар. Мы ніколі не зменім свайму галоўнаму прынцыпу — клопату пра чалавека. ...На першым плане па-ранейшаму застаецца забеспячэнне занятасці насельніцтва. Ні пры якіх умовах нельга дапусціць масавага звальнення работнікаў. Магчыма, гэтыя меры будуць недзе нават на шкоду бягучай эканамічнай эфектыўнасці. Затое мы захаваем кадравы патэнцыял, які з'яўляецца для краіны найбольш значным рэсурсам».



У аддзяленні занятасці насельніцтва Партызанскага раёна г. Мінска

Адным з ключавых напрамкаў дзейнасці беларускай дзяржавы з'яўляецца вызначэнне дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў. ***Дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты*** — гэта пэўны ўзровень сацыяльнай абароны грамадзян, які гарантуецца


Правообладатель Народная асвета

дзяржавай. Гэтыя стандарты забяспечваюць задавальненне асноўных фізіялагічных і сацыяльных патрэб чалавека; устанаўліваюцца розныя нормы грашовых выплат, дапамог, прадастаўлення сацыяльна значных паслуг. Дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты вызначаюць віды і якасць найважнейшых сацыяльных паслуг у адукацыі, ахове здароўя, у фізічнай і духоўнай культуры, у жыллёва-камунальнай гаспадарцы, гандлі, на транспарце, у сувязі, бытавым абслугоўванні. На III Усебеларускім народным сходзе (2006 г.) было адзначана, што «павышэнне сацыяльных стандартаў, сацыяльных гарантый для ўсіх слаёў грамадства з'яўляецца прадметам неаслабнага клопату дзяржавы».

**Дэмаграфічная палітыка.** ***Дэмаграфічная палітыка*** — гэта сістэма мер, якія ажыццяўляюцца дзяржавай у адносінах да пэўных груп грамадства з мэтай рэгулявання дэмаграфічных працэсаў — нараджальнасці, смяротнасці, міграцыі. У студзені 2002 г. у нашай краіне быў прыняты Закон «Аб дэмаграфічнай бяспецы Рэспублікі Беларусь»; на 2007—2010 гг. распрацавана Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

***Дэмаграфічная бяспека*** — гэта стан абароненасці сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы і грамадства ад дэмаграфічных пагроз. Дэмаграфічная бяспека забяспечвае развіццё краіны ў адпаведнасці з яе нацыянальнымі дэмаграфічнымі інтарэсамі. ***Дэмаграфічнымі пагрозамі*** называюцца тыя дэмаграфічныя з'явы і тэндэнцыі, сацыяльна-эканамічныя наступствы якіх аказваюць адмоўнае ўздзеянне на ўстойлівае развіццё краіны.

У Беларусі, як і ў большасці развітых краін, існуюць дэмаграфічныя пагрозы: неспрыяльная ўзроставая структура насельніцтва, звязаная, у першую чаргу, са старэннем насельніцтва; памяншэнне колькасці шлюбаў, нізкі ўзровень нараджальнасці, у выніку чаго не ўзнаўляецца колькасць насельніцтва; пагаршэнне здароўя некаторых катэгорый грамадзян; недастаткова высокая працягласць жыцця; скарачэнне колькасці сельскага насельніцтва; нарастанне нелегальнай міграцыі.

Дзяржаўная дэмаграфічная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь накіравана на рашэнне наступных задач: стабілізаваць у бліжэйшыя гады смяротнасць і ў доўгатэрміновай перспектыве знізіць гэты паказчык; забяспечыць далейшае зні-

Правообладатель Народная асвета

жэнне дзіцячай смяротнасці і не дапускаць перавышэння яе ўзроўню, характэрнага для развітых краін — 4—5 % (гэта задача практычна дасягнута, паколькі паказчык дзіцячай смяротнасці склаў у 2008 г. 4,1 %); палепшыць стан здароўя насельніцтва, павялічыць працягласць жыцця да парогавых значэнняў развітых краін — 74—75 гадоў; павялічыць нараджальнасць да ўзроўню, які забяспечваў бы хаця б простае замяшчэнне пакаленняў; узмацніць сацыяльную абарону сем'яў з дзецьмі; пашырыць меры дзяржаўнай дапамогі няпоўным сем'ям; упарадкаваць міграцыю насельніцтва.

Пастаяннай увагі дзяржавы патрабуе становішча пажылых людзей. Старэнне насельніцтва — праблема амаль усіх развітых краін свету. Сёння многія з іх пераглядаюць сваю палітыку ў гэтай галіне, арыентуючыся на тое, што пажылыя людзі ўяўляюць сабой каштоўны кампанент людскіх рэсурсаў грамадства. Таму неабходны праграмы па стварэнні ўмоў, якія будуць садзейнічаць занятасці пажылых людзей, дазволяць ім весці здаровы спосаб жыцця, павысіць яго якасць.



Шматдзетная сям'я

У Беларусі сярод усіх працуючых доля жанчын складае 53,1 %, мужчын — 46,9 %. Некаторыя галіны эканомікі краіны з'яўляюцца, па сутнасці, «жаночымі». Доля жанчын у гандлі і грамадскім харчаванні складае 72,7 %, ва ўстановах культуры — 72 %, у адукацыі — 81,2 %, у ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні — 82,7 %. Сярод рабочых пераважаюць мужчыны, а сярод служачых — жанчыны, але пры гэтым доля кіраўнікоў мужчын сярод служачых вышэйшая, чым жанчын, хаця доля жанчын, якія маюць вышэйшую адукацыю, у нашай краіне амаль у 1,5 раза большая, чым мужчын.


Правообладатель Народная асвета

Задачай ***гендэрнай*** (ад лац. genus, англ. gender — род) ***палітыкі*** ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца дасягненне рэальнай роўнасці полаў (мужчын і жанчын), устанаўленне гендэрнага балансу ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Адным з паказчыкаў выніковасці руху ў гэтым напрамку з'яўляецца склад беларускага парламента і мясцовых Саветаў дэпутатаў. У Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь жанчыны складаюць каля 32 %, у мясцовых Саветах дэпутатаў — каля 46 %. Паводле ацэнкі вучоных, на постсавецкай прасторы Беларусь з'яўляецца лідэрам па гендэрнай роўнасці.

Рэалізацыя кожнага з напрамкаў сацыяльнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў. Праблемы, звязаныя з сусветным фінансава-эканамічным крызісам, ускладнілі ажыццяўленне сацыяльных праектаў у многіх краінах. Але беларуская дзяржава прыкладвае максімум намаганняў для таго, каб не дапусціць «згортвання» сацыяльных праграм, захаваць дасягнуты ўзровень жыцця і садзейнічаць яго павышэнню.

?!

**1.** Ахарактарызуйце сацыяльны склад насельніцтва Беларусі. Якія асноўныя тэндэнцыі ў дынаміцы сацыяльнай структуры сучаснага беларускага грамадства? Чым, на ваш погляд, яны абумоўлены?

**2.** Назавіце асноўныя паказчыкі, якія выкарыстоўваюцца для характарыстыкі ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва краіны. Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, матэрыялы СМІ, пачніце падрыхтоўку прэзентацыі «Дзейнасць беларускай дзяржавы па павышэнні ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва». Прадоўжыце выкананне гэтага задання пры вывучэнні параграфаў 13—18.

**3.** Канкрэтызуйце прыкладамі вывад аб высокай сацыяльнай арыентаванасці дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Што такое «дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты»?

**4.** Дайце азначэнне паняццю «дэмаграфічная бяспека». Ахарактарызуйце дэмаграфічную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь. (*Выкарыстайце тэкст параграфа, а таксама матэрыялы 3, 4 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 173—175.*) Назавіце асноўныя задачы дэмаграфічнай палітыкі беларускай дзяржавы.

**5.** Якія прававыя, адукацыйныя перадумовы маюцца ў беларускім грамадстве для паспяховага вырашэння гендэрных праблем?

Правообладатель Народная асвета

6. Падрыхтуйце паведамленне аб сацыяльным складзе насельніцтва вашага рэгіёна (вобласці, раёна, горада). Якім чынам работнікі вашага рэгіёна размеркаваны па галінах эканомікі, па ўзроўні адукацыі? Якія прафесіі запатрабаваны сёння ў вашым рэгіёне?

## § 13. Беларуская сацыяльна-эканамічная мадэль

*Успомніце.* **1.** Што такое эканоміка? **2.** Якія існуюць эканамічныя сістэмы?

**Асноўныя паказчыкі нацыянальнай эканомікі.** Існуюць эканамічныя паказчыкі, якія характарызуюць стан эканомікі краіны. Яны дазваляюць параўнаць эканомікі розных краін, аналізаваць эканамічныя працэсы, ацэньваць эфектыўнасць эканамічнай дзейнасці і дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Найважнейшымі з іх з'яўляюцца: валавы ўнутраны прадукт, які вылічаецца як у абсалютных велічынях, так і ў разліку на душу насельніцтва; якасць і склад працоўных рэсурсаў: доля занятых высокакваліфікаванай працай, размеркаванне работнікаў па галінах вытворчасці; доля навукаёмістых высокатэхналагічных галін у структуры вытворчасці. Ёсць таксама спецыяльныя эканамічныя паказчыкі, напрыклад прадукцыйнасць працы, матэрыялаёмістасць і энергаёмістасць вытворчасці, прыбытак і рэнтабельнасць і г. д.

Важнымі крытэрыямі развіцця нацыянальнай эканомікі з'яўляюцца паказчыкі, якія адлюстроўваюць узровень сацыяльнай абароны чалавека (памеры пенсій, дапамогі па беспрацоўю, даступнасць і якасць медыцынскай дапамогі і г. д.). Ад узроўню развіцця нацыянальнай эканомікі залежыць таксама стан сістэмы адукацыі, яе даступнасць, якасць, адпаведнасць патрэбам чалавека, грамадства, дзяржавы.

Эфектыўнасць нацыянальнай эканомікі характарызуецца такімі паказчыкамі, як тэмпы эканамічнага росту і тып эканамічнага росту. ***Эканамічны рост*** — гэта станоўчая дынаміка развіцця эканомікі ў выніку колькасных і якасных змяненняў, якія ў ёй адбываюцца. Эканамічны рост бывае экстэнсіўны і інтэнсіўны. ***Экстэнсіўны*** (ад лац. extensivus — пашыраны, расцяжны) ***рост*** — гэта колькаснае павелічэнне эканамічных паказчыкаў за кошт прыцягнення дадатковых рэсурсаў. ***Інтэнсіўны*** (ад лац. intensio — на-


Правообладатель Народная асвета

пружанне, узмацненне) ***рост*** забяспечваецца за кошт якаснага ўдасканальвання фактараў вытворчасці, выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. ***Эфектыўнасць вытворчасці*** вызначаецца суадносінамі затрат, якія панёс вытворца ў працэсе вытворчасці, і вынікаў, якія ён атрымаў у выглядзе пэўнага даходу.

Любая нацыянальная эканоміка мае асаблівасці, якія абумоўлены спецыфікай геаграфічнага асяроддзя, наяўнасцю тых ці іншых прыродных рэсурсаў, грамадскімі традыцыямі, менталітэтам насельніцтва, гістарычнымі адрозненнямі, асаблівасцямі арганізацыі палітычнай улады. У адносінах да аднолькавых праблем урады ў розных дзяржавах прымаюць неаднолькавыя рашэнні, напрыклад па-рознаму выкарыстоўваюць наяўныя прыродныя, матэрыяльныя і людскія рэсурсы, устанаўліваюць розныя падаткі, уводзяць розныя пошліны на тавары. Таму і вынікі эканамічнай дзейнасці ва ўсіх краінах розныя.

Каб зразумець асаблівасці беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця, неабходна ведаць умовы яе станаўлення.

На працягу 70 гадоў Беларусь (БССР) знаходзілася ў складзе СССР. Эканоміка рэспублікі была неад’емнай часткай адзінага народнагаспадарчага комплексу Савецкага Саюза. Яе структура была арыентавана на вываз прадукцыі ў іншыя рэгіёны велізарнай краіны. Эканоміка Савецкага Саюза насіла планава-цэнтралізаваны характар. Яна кіравалася з адзінага цэнтра. Яе эканамічнай асновай была дзяржаўная форма ўласнасці і цэнтралізаванае размеркаванне прыродных, матэрыяльных, людскіх рэсурсаў. Яна развівалася па экстэнсіўным шляху.

Гэтыя асаблівасці прадвызначылі асноўныя напрамкі эканамічных рэформ, якія сталі непазбежнымі, калі адбыўся распад Савецкага Саюза і Беларусь набыла самастойнасць. Адным з напрамкаў гэтых рэформ сталі меры па пераадоленні вынікаў разрыву гаспадарчых сувязей, выкліканага распадам адзінай эканомікі Савецкага Саюза. Другі напрамак склалі мерапрыемствы па стварэнні новай эканамічнай сістэмы, заснаванай на розных формах уласнасці, у тым ліку і на прыватнай. Трэці напрамак быў звязаны з тэхнічнай і тэхналагічнай мадэрнізацыяй вытворчасці, павышэннем яе эфектыўнасці.

Правообладатель Народная асвета

Глыбокі сістэмны крызіс, які ўзнік пасля распаду СССР, Рэспубліка Беларусь пераадолела інакш, чым некаторыя іншыя краіны, якія ўтварыліся пры гэтым: не шляхам паскоранай прыватызацыі ўласнасці, а на аснове паступовага ўваходжання ў рынак, пры захаванні моцнай рэгулюючай ролі дзяржавы.

Шлях рэформ не быў лёгкім, але сёння сітуацыя ў краіне зусім іншая, чым была ў пачатку 1990-х гг. Беларусь стала адной з першых дзяржаў — удзельніц СНД, якая к пачатку XXI ст. дасягнула і перавысіла ўзровень дакрызіснага 1990 г. У цяперашні час асноўныя паказчыкі беларускай эканомікі дазваляюць гаварыць аб істотных поспехах у развіцці нашай краіны. У 2007 г. Рэспубліка Беларусь была ўпершыню аднесена экспертамі ААН да групы краін з высокім узроўнем развіцця. За апошнія 10 гадоў валавы ўнутраны прадукт вырас больш чым у 2 разы і ў маі 2009 г. дасягнуў амаль 50 трлн руб. За гэты ж час у 2,5 раза ўзрасла вытворчасць прамысловай прадукцыі, у 4,5 раза павялічыўся рознічны тавараабарот, рэальныя грашовыя даходы насельніцтва выраслі ў 3,4 раза. Беларусь вырабляе шмат высакаякаснай бытавой тэхнікі: халадзільнікаў, пральных машын, газавых пліт, пыласосаў, тэлевізараў і маніитораў, у тым ліку вадкакрышталічных. Высокага ўзроўню развіцця дасягнула беларускае мышынабудаванне (вытворчасць аўтамабіляў, трактароў, камбайнаў, аўтобусаў, тралейбусаў і г. д.). Беларусь мае гандлёва-эканамічныя адносіны з больш як 170 краінамі свету, экспартуе свае тавары ў 130 краін. Устойліва развіваецца сельскагаспадарчая вытворчасць, расце ўраджайнасць збожжавых. У апошнія гады яна складае ў сярэднім 40 ц/га. Павялічваецца вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі. Рэзка ўзраслі інвестыцыі ў эканоміку краіны. У 2000—2005 гг. гэты паказчык склаў 20 млрд дол. США; на працягу 2006—2010 гг. намечана інвесціраваць 80 млрд дол.

Але праблемы яшчэ ёсць, і для таго, каб ісці ў нагу з сусветнымі тэндэнцыямі і вытрымліваць жорсткую канкурэнцыю на сусветных рынках, Беларусь павінна максімальна выкарыстоўваць усе свае моцныя бакі: выгаднае эканоміка-геаграфічнае і геапалітычнае становішча, развітыя сістэмы транспартных камунікацый, значныя зямельныя, водныя, лясныя рэсурсы, наяўнасць некаторых карысных выкапняў


Правообладатель Народная асвета



Зборка збожжаўборачных камбайнаў на ВА «Гомсельмаш»

(калійныя і каменная солі, сыравіна для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і інш.), значны навукова-тэхнічны патэнцыял, шматгаліновы прамысловы комплекс, моцная сельская гаспадарка, высокі адукацыйны ўзровень насельніцтва, шматвектарныя знешнеэканамічныя сувязі.

Галоўная стратэгічная задача сучаснага этапу — забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Канцэпцыя ***ўстойлівага развіцця*** сцвярджае, што развіццё грамадства павінна быць арыентавана на рост вытворчасці і спажывання з улікам стану прыроды, яе рэсурсаў і інтарэсаў наступных пакаленняў людзей.

**Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Прыярытэтнымі напрамкамі сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны з'яўляюцца:

усебаковае гарманічнае развіццё чалавека, удасканальванне сістэмы адукацыі, фарміраванне эфектыўнай сістэмы аховы здароўя. У сучасных умовах найважнейшым рэсурсам эканамічнага развіцця становіцца чалавек, яго творчы патэнцыял, уменні, навыкі, здольнасці да распрацоўкі новых ідэй і іх эфектыўнай рэалізацыі, а таксама яго здароўе;

пераход на інавацыйны шлях развіцця эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне;

нарошчванне экспартнага патэнцыялу краіны;



Селекцыйна-гібрыдны цэнтр «Задняпроўскі»
ў в. Бабынічы Аршанскага раёна

развіццё аграпрамысловага комплексу і спалучаных галін, сацыяльнай сферы сяла;

развіццё малых і сярэдніх гарадоў, жыллёвае будаўніцтва.

(Некаторыя з гэтых пытанняў будуць разгледжаны больш падрабязна ў наступных параграфах.)

**Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка.** У сучасным свеце дзяржава з'яўляецца найважнейшым фактарам развіцця нацыянальнай эканомікі. Толькі дзяржава можа стрымліваць праяўленні негатыўных наступстваў стыхійнага развіцця рыначнай эканомікі. Толькі дзяржава можа забяспечыць належную арганізацыю вытворчасці тых даброт і паслуг, якія выкарыстоўваюцца членамі грамадства сумесна (грамадскі транспарт, дарогі, лініі электраперадачы, утрыманне вакзалаў, паркаў, арганізацыя дзейнасці «надзвычайных службаў» і г. д.). Толькі дзяржава можа сацыяльна абараніць тых грамадзян, якія не могуць канкурыраваць на рынку працы. Гэтым абумоўлена неабходнасць дзяржаўнага рэгулявання эканамічных і сацыяльных адносін.

Ва ўсіх рашэннях, якія сёння прымаюцца органамі дзяржаўнай улады, сцвярджаецца імкненне беларускай дзяржавы рэалізаваць мадэль *сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі.*

 Правообладатель Народная асвета

Сацыяльна арыентаваная мадэль развіцця вылучаецца высокай доляй дзяржаўнай уласнасці, шырокімі маштабамі дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, дзяржаўнай падтрымкай малога і сярэдняга бізнесу, высокай доляй сацыяльных расходаў у дзяржаўным бюджэце, удзелам работнікаў у кіраванні вытворчасцю. Гэта мадэль спалучае свабодную прыватную ініцыятыву, канкурэнцыю з актыўнай роллю дзяржавы, эканамічную эфектыўнасць з высокім узроўнем сацыяльнай абароны насельніцтва.

*Беларуская сацыяльна-эканамічная мадэль* заснавана на моцным дзяржаўным рэгуляванні эканомікі і сацыяльнай сферы, захаванні ў руках дзяржавы значнай долі ўласнасці, удасканальванні механізма пераразмеркавання даходаў, за кошт якога забяспечваецца развіццё дзяржаўнага сектара эканомікі і ажыццяўляецца сацыяльная абарона і падтрымка многіх катэгорый насельніцтва.




Сукупнасць мерапрыемстваў, якія праводзіць дзяржава па развіцці сацыяльнай сферы грамадства, складае змест ***сацыяльнай палітыкі*** дзяржавы.

Галоўная задача сацыяльнай палітыкі — гэта забеспячэнне спрыяльных умоў для развіцця ўсіх грамадскіх груп, гарманічнага ўзаемадзеяння паміж імі, дасягнення балансу іх інтарэсаў. Такая дзейнасць садзейнічае дасягненню стабільнасці ў грамадстве.

Сацыяльная палітыка беларускай дзяржавы на сучасным этапе ўключае ў сябе палітыку ў галіне даходаў насельніцтва (жыццёвы ўзровень, спажывецкі кошык, дабрабыт); палітыку ў сферы працы і працоўных адносін (аплата працы, ахова працы і сацыяльнае страхаванне, занятасць насельніцтва і

Правообладатель Народная асвета



Дом быту ў г. Валожыне

інш.). Яна ўключае таксама сацыяльную падтрымку і абарону непрацаздольных і маламаёмных слаёў насельніцтва (пенсійнае забеспячэнне, сацыяльнае абслугоўванне, сацыяльныя гарантыі і інш.), развіццё галін сацыяльнай сферы (ахова здароўя, адукацыя, навука, культура, фізічная культура і спорт). Элементамі сацыяльнай палітыкі з'яўляюцца таксама меры па развіцці сучаснай інфраструктуры (жыллё, транспарт, дарогі, сувязь, гандлёвае і бытавое абслугоўванне), сямейная, маладзёжная палітыка дзяржавы, міграцыйная палітыка.

Асноўныя прынцыпы сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы на сучасным этапе вызначаны ў Канстытуцыі, законах краіны, у Пасланнях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь:

«Беларусь — дзяржава для чалавека. Наша крэда — моцная сацыяльная палітыка. Ад гэтай палітыкі мы не адступім...

...Сацыяльная палітыка сучаснай дзяржавы павінна быць інтэгрыраванай. А гэта дапускае не толькі абарону слабых, сацыяльна ўразлівых катэгорый грамадзян, але і падтрымку моцных, працаздольных груп насельніцтва...

Сацыяльная дапамога павінна быць адраснай і індывідуальнай. Безумоўнай абароны патрабуюць інваліды, адзінокія старыя, дзеці-сіроты. Іншым, хто трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю, неабходна рука дапамогі, каб падняцца на ногі, а не пажыццёвае ўтрыманне...

...Важна, каб у свядомасці кожнага трывала ўкаранілася разуменне — дзяржава ў адносінах да працаздольнага чала-


Правообладатель Народная асвета

века мае адзіны абавязак: стварыць умовы для таго, каб ён мог праявіць карысную ініцыятыву і зарабіць».

Паспяховае функцыянаванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі стварае ўмовы для фарміравання сярэдняга класа. Колькасныя паказчыкі, па якіх людзі адносяцца да сярэдняга класа, маюць у розных краінах свае асаблівасці, але часцей за ўсё ў склад сярэдняга класа ўваходзяць урачы, дзяржаўныя служачыя, уладальнікі малых прадпрыемстваў, кваліфікаваныя рабочыя, выкладчыкі ВНУ і навуковыя супрацоўнікі, фермеры, іншыя людзі з дастаткова высокім узроўнем даходаў і трывалым грамадскім становішчам.

У сучасных развітых дзяржавах, як правіла, сярэдні клас складае каля 60 % насельніцтва. Наяўнасць такой магутнай праслойкі паміж багатымі і беднымі не дазваляе разрастацца сацыяльным канфліктам, садзейнічае стабільнасці ў грамадстве.

?!

1. Назавіце асноўныя паказчыкі, якія характарызуюць стан эканомікі краіны. Раскрыйце іх сутнасць. Ахарактарызуйце развіццё эканомікі Рэспублікі Беларусь у канцы першага дзесяцігоддзя XXI ст.
2. Якімі былі асноўныя напрамкі эканамічных рэформ у Рэспубліцы Беларусь пасля распаду СССР? Чым яны былі абумоўлены? У чым заключаліся асаблівасці эканамічных рэформ у Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі СНД?
3. Якія прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у пачатку XXI ст.? Чым, на вашу думку, абумоўлена іх першарадная значнасць для нашай краіны? (*Выкарыстайце матэрыял 5 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 175—176.*)
4. Дайце азначэнне паняццю «сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка». Ахарактарызуйце асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. (*Выкарыстайце матэрыял 1 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 172.*)
5. Якія задачы, асноўныя напрамкі і прынцыпы сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы на сучасным этапе?
6. Пракаменціруйце ніжэйпрыведзеныя пункты гледжання аб сацыяльнай справядлівасці. У чым, на ваш погляд, павінна заключацца сацыяльная справядлівасць?

   а) Вядомы персанаж аповесці М. Булгакава «Сабачае сэрца» П. П. Шарыкаў лёгка вырашаў праблему сацыяльнай справядлівасці: «Узяць усё і падзяліць».

Правообладатель Народная асвета

б) Сацыяльная справядлівасць — утопія. У рэчаіснасці яе не можа быць, паколькі ўсе людзі розныя, іх патрэбы задаволіць у роўнай меры немагчыма.

**7.** Выкарыстоўваючы мясцовы перыядычны друк, ахарактарызуйце асноўныя напрамкі сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця вашага рэгіёна (вобласці, раёна, горада).

## § 14. Інавацыйнае развіццё краіны

***Успомніце.*** **1.** Што такое навука? **2.** Назавіце асноўныя грамадскія функцыі навукі.

**Навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь.** У Рэспубліцы Беларусь, як і ў іншых развітых краінах, сфарміравана эфектыўная сістэма навуковай дзейнасці. Найважнейшымі кампанентамі гэтай сістэмы з’яўляюцца адукацыя (ад студэнцкай лаўкі да падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі) і навуковыя ўстановы, якія ажыццяўляюць даследчую і навукова-тэхнічную дзейнасць. Атрыманне вышэйшай адукацыі ў нашай краіне забяспечваюць больш як 50 ВНУ дзяржаўнай і прыватнай форм уласнасці; навуковыя даследаванні і распрацоўкі выконваюць больш як 300 арганізацый (уключаючы ВНУ). Вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыяй у краіне з’яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі (НАН Беларусі).

Навуковы патэнцыял нашай краіны сёння складаюць навуковыя школы ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук, якія склаліся ў савецкі час, а таксама навуковыя школы, якія атрымалі развіццё ўжо ў суверэннай Беларусі. Беларуская навука займае трывалыя пазіцыі на сусветным узроўні ў такіх галінах, як інфарматызацыя і праграмнае забеспячэнне, нанатэхналогіі і новыя матэрыялы, энергаэфектыўныя лазерныя тэхналогіі, генетыка і біятэхналогіі, экалагічная ўстойлівасць, радыяцыйная бяспека і інш. У мэтах захавання і развіцця навуковага патэнцыялу ў Рэспубліцы Беларусь створаны фонды Прэзідэнта краіны па спецыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў, таленавітай моладзі. Устаноўлены надбаўкі і вылучаны спецыяльныя стыпендыі дзеячам навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры, а таксама таленавітым маладым вучоным.


Правообладатель Народная асвета

Актыўна развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва беларускіх вучоных. Гэта абумоўлена інтэрнацыянальным характарам навуковай дзейнасці. Немагчыма плённа даследаваць многія важныя з’явы, напрыклад стан навакольнага асяроддзя, інфекцыйныя захворванні, міграцыю насельніцтва або эканамічныя праблемы, толькі з нацыянальных пазіцый. Для правядзення найбольш перспектыўных і складаных навуковых даследаванняў нацыянальнага фінансавання часта недастаткова, і патрабуюцца аб’яднаныя намаганні шэрагу краін. Рэспубліка Беларусь заключыла міжурадавыя пагадненні аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве больш як з 40 дзяржавамі і міжнароднымі навуковымі арганізацыямі. У рамках гэтых міжурадавых пагадненняў выконваюцца сумесныя навукова-тэхнічныя праграмы, праекты па найбольш актуальных напрамках.

**Сутнасць інавацыйнага шляху развіцця.** *Інавацыя* (ад лац. innovation — абнаўленне) — любая новая ідэя, рэалізаваная на практыцы. Гэта не толькі глабальныя тэхналагічныя прарывы (атамная энергетыка, камп’ютар і г. д.), інавацыямі былі ў свой час і лісткі для заметак, якія прыклейваюцца, і цукар-рафінад, і чай у пакеціках. Да інавацый неабходна аднесці і значныя поспехі шэрагу кампаній у сістэме арганізацыі вытворчасці, прымяненні новых метадаў кіравання і прынцыпаў кантролю за якасцю выпускаемай прадукцыі. Згодна з вызначэннем, прапанаваным Старшынёй Прэзідыума НАН Беларусі М. У. Мясніковічам, ***інавацыі*** — гэта новаўвядзенні, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці чалавечай дзейнасці. Адрозніваюць два тыпы інавацый: паляпшаючыя і радыкальныя. Першыя накіраваны на ўдасканальванне, паляпшэнне асобных характарыстык выпускаемай прадукцыі, выкарыстоўваемых тэхналогій, метадаў работы. Радыкальныя інавацыі змяняюць спосаб вытворчай дзейнасці — яго тэхнічныя, тэхналагічныя, арганізацыйныя асновы.

Інавацыйны шлях забяспечвае развіццё чалавечага патэнцыялу, а таксама доўгатэрміновы ўстойлівы рост эфектыўнасці эканомікі. Асноўным фактарам росту эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці эканомікі з’яўляецца навуковая, навукова-тэхнічная і ўкараняльная дзейнасць. Пераход Рэспублікі Беларусь на інавацыйны шлях развіцця забяспечвае *нацыянальная інавацыйная сістэма*. Яна ўключае перш за ўсё атрыманне новых ведаў, а таксама іх распаўсюджванне

і практычнае ўвасабленне ў новай прадукцыі, тэхналогіях, паслугах. Гэта дапускае камерцыялізацыю новаўвядзенняў (атрыманне прыбытку ад навуковых распрацовак). Нацыянальная інавацыйная сістэма ажыццяўляе рэсурснае, у тым ліку фінансавае, забеспячэнне інавацый, а таксама кіраванне і рэгуляванне інавацыйных працэсаў. Важную ролю ў функцыянаванні гэтай сістэмы адыгрывае адукацыя і прафесійная падрыхтоўка кадраў.

Перад беларускімі вучонымі і канструктарамі пастаўлена задача — забяспечваць атрыманне новых навуковых вынікаў на ўзроўні адкрыццяў і вынаходніцтваў, праектна-канструктарскіх распрацовак — на ўзроўні патэнтаў, у тым ліку замежных, інавацыйнай прадукцыі — на ўзроўні не ніжэйшым за сусветныя аналагі і стандарты.

Важнымі элементамі нацыянальнай інавацыйнай сістэмы з'яўляюцца эканамічнае стымуляванне інавацый праз вызваленне ад падаткаў сродкаў, якія накіроўваюцца на асваенне новаўвядзенняў, падатковыя ільготы малому інавацыйнаму бізнесу і да т. п. Развіццё прадпрымальніцтва актывізуе творчасць, стварае новыя рабочыя месцы і з'яўляецца адным з фактараў фарміравання сярэдняга класа, які, як ужо адзначалася, з'яўляецца асновай сацыяльнай стабільнасці ў грамадстве. Паводле шматлікіх даследаванняў, эканамічная аддача ад інвестыцый у інавацыі значна перавышае акупнасць у любых іншых сферах прымянення фінансавых рэсурсаў.

Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гг. прадугледжвае рэалізацыю больш як 1000 буйных інавацыйных праектаў. Праграма таксама прадугледжвае адкрыццё звыш 100 новых прадпрыемстваў, стварэнне каля 400 новых вытворчасцей, правядзенне мадэрнізацыі соцень дзеючых прадпрыемстваў на аснове ўкаранення перадавых тэхналогій. Каля 70 % праектаў рэалізуецца на базе распрацовак беларускіх вучоных.

**Навуковае забеспячэнне інавацыйнага развіцця.** Адным з асноўных фактараў бурнага эканамічнага росту многіх краін у XX ст. з'явілася развіццё навукі. Навука стала асноўным інструментам дасягнення поспеху і захавання перадавых пазіцый ва ўмовах глабальнай эканамічнай канкурэнцыі. У сучасных умовах толькі дзяржавы, якія актыўна ўкараняюць навуковыя дасягненні ў розныя сферы жыццядзейнасці

 Правообладатель Народная асвета




Нацыянальная інавацыйная сістэма

грамадства, здольны забяспечыць высокі ўзровень дабрабыту людзей і заняць дастойнае месца на сусветнай арэне.

Практычнае выкарыстанне вынікаў навуковых даследаванняў у нашай краіне ў апошнія гады дазволіла забяспечыць значныя эканамічныя дасягненні ў галіне аўтамабілебудавання і трактарабудавання, мікраэлектронікі, вытворчасці медыцынскага абсталявання, лекавых прэпаратаў і інш. Прадукцыя многіх беларускіх прадпрыемстваў шырока

Правообладатель Народная асвета

прадстаўлена на сусветным рынку. Так, вытворчае аб'яднанне «Мінскі трактарны завод» уваходзіць у сямёрку буйнейшых сусветных вытворцаў трактароў; вытворчае аб'яднанне «БелАЗ» займае трэць сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў. На аснове навуковых распрацовак яны паспяхова мадэрнізуюць сваю вытворчую базу, што дазваляе ім істотна павышаць канкурэнтаздольнасць выпускаемай прадукцыі.

У новых эканамічных умовах прамысловыя прадпрыемствы Беларусі пераходзяць ад укаранення ўжо вядомых навуковых распрацовак да заказу на канкрэтныя распрацоўкі, якія забяспечваюць павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі.

Важным інструментам развіцця міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з'яўляюцца сумесныя структуры, якія ствараюцца для каардынацыі дзейнасці беларускіх вучоных і канструктараў з замежнымі партнёрамі. Напрыклад, пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дзейнічае Сумесная камісія НАН Беларусі і Нацыянальнага цэнтра навуковых даследаванняў Францыі, Карэйска-Беларускі цэнтр супрацоўніцтва ў галіне прамысловых тэхналогій, Сумесны беларуска-турэцкі камітэт па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву і інш. Таксама эфектыўна функцыянуе шэраг сумесных лабараторый на базе арганізацый НАН Беларусі.

**Высокія тэхналогіі.** *Высокімі тэхналогіямі* называюць працэсы, заснаваныя на выкарыстанні перадавых дасягненняў навукі. Асаблівую ролю тут адыгрывае інфарматызацыя. Адзіная інфармацыйная прастора — неабходная ўмова ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны. На стварэнне цэласнай і эфектыўнай нацыянальнай інфармацыйнай сістэмы нацэлена ажыццяўляемая ў краіне праграма «Электронная Беларусь». У адпаведнасці з гэтай праграмай фарміруецца адзіны парадак збору, апрацоўкі, назапашвання, захавання, пошуку і распаўсюджвання інфармацыі аб самых розных баках эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і духоўнага жыцця беларускага грамадства. Дзякуючы рэалізацыі гэтай праграмы інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі знойдуць дзейснае выкарыстанне ў эканоміцы, адукацыі, навуцы, ахове здароўя, культуры, дзяржаўным кіраванні. Важнай састаўной часткай праграмы з'яўляецца стварэнне эфектыўнага маніторынгу (ад лац. monitor — які назірае) рынку, г. зн. арганізацыя пастаяннага назірання за сітуацыяй на рынку: суадносінамі паміж попытам і прапановай, цэна-


Правообладатель Народная асвета

мі на розныя тавары і паслугі і г. д. На гэтай аснове можна ажыццяўляць інавацыі ў сферы праектавання, вытворчасці прадукцыі, яе збыту і абслугоўвання.

З мэтай распрацоўкі высокіх тэхналогій, у тым ліку інфармацыйных, і іх укаранення ў практыку ў нашай краіне створана адпаведная структура — Парк высокіх тэхналогій. Падобныя тэхнапаркі існуюць у ЗША, Кітаі, Ізраілі, Ірландыі, Фінляндыі, шэрагу іншых высокаразвітых краін. Ажыццяўленне такога праекта ў Беларусі накіравана на развіццё ўласных інфармацыйных тэхналогій, а таксама на прыцягненне ў рэспубліку дадатковых інвестыцый.

Беларусь дасягнула значных вынікаў у стварэнні суперкамп'ютараў — сістэм звышвысокай прадукцыйнасці, незаменных для выканання многіх навуковых даследаванняў, асваення новых і даволі складаных тэхналогій. У рамках праграм, фінансуемых з бюджэту Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, вучонымі дзвюх краін створаны цэлы набор суперкамп'ютараў «СКІФ» з пікавай вытворчасцю ад дзясяткаў мільярдаў да некалькі трыльёнаў аперацый за секунду. Гэтыя ўнікальныя камп'ютары знойдуць выкарыстанне не толькі ў навуцы, але і ў прамысловасці, медыцыне, гідраметэаралогіі, ваеннай сферы.

Беларускімі арганізацыямі сумесна з расійскімі партнёрамі распрацаваны і ўкаранёны сродкі і тэхналогіі атрымання, апрацоўкі і адлюстравання касмічнай інфармацыі, створаны элементы адзінай сістэмы забеспячэння касмічнай інфармацыяй спажыўцоў у Расіі і Беларусі.



Макет Парка высокіх тэхналогій у г. Мінску

Правообладатель Народная асвета



Беларуска-расійскі суперкамп’ютар «Скіф»

Наша краіна валодае тэхналогіямі масавай вытворчасці вуглародных нанаматэрыялаў, якія маюць выключныя ўласцівасці, неабходныя для развіцця ўсіх важнейшых галін прамысловасці. Напрыклад, сінтэзаваныя беларускімі вучонымі вуглародныя нанатрубкі валодаюць трываласцю, якая ў 100 разоў перавышае трываласць сталі; пры гэтым яны ў 5 разоў лягчэйшыя за алюміній, маюць такую ж цеплаправоднасць, як алмаз, і такую ж электраправоднасць, як медзь. Вартасць гэтых матэрыялаў шматразова ніжэйшая за цану аналагаў, якія вырабляюцца ў іншых краінах. Ажыццяўляюцца работы па стварэнні на аснове нанаматэрыялаў новага пакалення дысплееў, вытворчасць якіх дазволіць нашай краіне ўмацаваць свае пазіцыі на сусветным рынку тэлівізійнай тэхнікі.

**Энергазберажэнне.** Раней прамысловасць Беларусі фарміравалася ва ўмовах адзінай савецкай сістэмы энергазабеспячэння. Асноўныя энергарэсурсы (нафта і газ) пастаўляліся ў неабходнай колькасці з РСФСР па адзіных ва ўсім СССР цэнах, значная частка неабходнай электраэнергіі паступала ў БССР з суседніх рэспублік. Пасля распаду СССР Беларусь сутыкнулася с праблемай энергазабеспячэння эканомікі, што ў сваю чаргу вылучыла праблему забеспячэння эканамічнай бяспекі краіны.

Адзін з важнейшых шляхоў іх рашэння — энергазберажэнне. Чым менш энергіі затрачваецца на вытворчасць адзінкі прадукцыі, тым менш энергарэсурсаў неабходна набываць за мяжой. Менавіта на энергазберажэнне накіравана Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 3 «Экано-


Правообладатель Народная асвета



Макет беларускай АЭС

мія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы», выдадзеная ў 2007 г. і разлічаная на доўгатэрміновую перспектыву. Выкананне пастаўленых у ёй задач патрабуе актыўнага выкарыстання самых сучасных навукова-тэхнічных рашэнняў, у прыватнасці, замяшчэння імпартуемых паліўна-энергетычных рэсурсаў мясцовымі і ўзнаўляемымі крыніцамі энергіі.

Важнае значэнне для забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны мае найбуйнейшы ў гісторыі суверэннай Беларусі энергетычны праект — будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Разам з тым энергазберажэнне заклікана стаць клопатам кожнага з нас. Не павінна быць запаленых дарэмна лямпачак, а замест надта неэканамічных лямпачак напальвання неабходна выкарыстоўваць сучаснае асвятляльнае абсталяванне; дамы павінны будавацца на аснове сучасных тэхналогій энергазберажэння і г. д.

?!

1. Ахарактарызуйце навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. (*Выкарыстайце матэрыял 7 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 176—177.*)
2. Што такое інавацыі? Якія тыпы інавацый адрозніваюць? Прывядзіце прыклады інавацый у розных сферах грамадскага жыцця. (*Выкарыстайце матэрыял 6 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 176.*)
3. Якія фактары, на ваш погляд, абумоўліваюць паспяховае інавацыйнае развіццё нашай краіны? Свой адказ аргументуйце. Якім чынам у Рэспубліцы Беларусь стымулююцца інавацыі?
4. Як вы разумееце сцверджанне: «Інавацыйны шлях забяспечвае развіццё чалавечага патэнцыялу, а таксама доўгатэрміновы ўстойлівы рост эфектыўнасці эканомікі»?

Правообладатель Народная асвета

5. Што называюць высокімі тэхналогіямі? Падрыхтуйце паведамленне аб развіцці высокіх тэхналогій у Рэспубліцы Беларусь. (*Выкарыстайце матэрыял 8 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 177—178.*)
6. Якія, на ваш погляд, найбольш эфектыўныя шляхі забеспячэння энергетычнай бяспекі Рэспублікі Беларусь? Сваё меркаванне абгрунтуйце. (*Выкарыстайце матэрыял 9 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 178—179.*)
7. Якая роля кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у павышэнні энергетычнай бяспекі краіны?

## § 15. Рэгіянальная і аграрная палітыка

***Успомніце.*** Выкарыстоўваючы веды па геаграфіі Беларусі, ахарактарызуйце структуру і спецыялізацыю гаспадаркі Беларусі.

**Рэгіянальная палітыка беларускай дзяржавы. Асноўныя задачы развіцця рэгіёнаў.** *Рэгіён* (ад англ. *region* < лац. *regio*) — гэта вобласць (раён; частка краіны), якая адрозніваецца ад іншых абласцей сукупнасцю натуральных і (або) адносна ўстойлівых эканоміка-геаграфічных і іншых асаблівасцей, якія склаліся гістарычна, напрыклад нацыянальнага складу насельніцтва. Своеасаблівасць рэгіёнаў уплывае на вылучэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак краіны.

У Рэспубліцы Беларусь *адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі* з'яўляюцца вобласць, раён, горад, раён горада, пасёлак гарадскога тыпу. У іх ствараюцца мясцовыя Саветы дэпутатаў (акрамя раёна горада), выканаўчыя і распарадчыя органы. Тэрытарыяльнымі адзінкамі з'яўляюцца невялікія населеныя пункты, дзе такія органы не ствараюцца, а таксама тэрыторыі, якія маюць спецыяльны рэжым выкарыстання, — запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі, тэрыторыі гістарычных помнікаў і інш.

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь складае 207,6 тыс. кв. км і падзелена на шэсць абласцей (Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская). У межах абласцей вылучаюцца 118 раёнаў. Горад Мінск вызначаны ў якасці асобнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Ён мае асобы статус сталіцы Рэспублікі Беларусь і ўключае дзевяць раёнаў.

У нашай краіне на 01.01.2010 г. налічвалася 112 гарадоў, з якіх — 79 малых (да 20 тыс. чалавек), 20 — сярэдніх


Правообладатель Народная асвета

(20—100 тыс. чалавек), 13 — вялікіх (звыш 100 тыс. чалавек). Акрамя таго, у Беларусі на ўказаны час было 96 пасёлкаў гарадскога тыпу, больш як 1300 сельскіх саветаў. Кожны сельсавет аб'ядноўвае па 16 і больш вёсак. Усяго ў Рэспубліцы Беларусь звыш 23 700 сельскіх пасяленняў.

Спецыфіка рэгіянальнага дзялення Беларусі вызначаецца тым, што на працягу 1950—1980-х гг. яна пераўтварылася з пераважна аграрнай у прамысловую рэспубліку. Увесь гэты час адбывалася даволі хуткая ўрбанізацыя, развівалася інфраструктура гарадоў, павялічваўся працэнт гарадскога насельніцтва.

Для Рэспублікі Беларусь важнай праблемай з'яўляюцца адрозненні паміж умовамі жыцця гарадскіх і сельскіх пасяленняў. Гэта адрозненні ў развіцці эканомікі, сацыяльна-культурнай інфраструктуры, г. зн. умоў працы і быту




Адміністрацыйны падзел Рэспублікі Беларусь

людзей. Нагадаем, што *інфраструктурай* называюць тыя галіны эканомікі, якія абслугоўваюць вытворчасць (вытворча-эканамічная інфраструктура), а таксама забяспечваюць жыццядзейнасць чалавека і грамадства (сацыяльна-культурная інфраструктура). У першым выпадку гэта транспартныя і энергетычныя сістэмы, складская гаспадарка і г. д. У другім — гэта сістэмы аховы здароўя, адукацыі, жыллёва-камунальная гаспадарка, бытавое абслугоўванне насельніцтва і інш.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай схемай комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі краіны вылучаюцца 4 тыпы рэгіёнаў (або зон): урбанізаваныя, сельскагаспадарчыя, прыродныя, асобыя. У залежнасці ад дамінуючых функцый кожная з адміністрацыйных адзінак краіны адносіцца да аднаго з гэтых тыпаў рэгіёнаў.

Да *ўрбанізаваных рэгіёнаў* адносяцца зоны ўплыву буйных гарадоў. Гэтыя зоны характарызуюцца высокай канцэнтрацыяй гарадскога насельніцтва, інтэнсіўнай сельскагаспадарчай вытворчасцю, высокай рухомасцю насельніцтва, якая звязана з працоўнай дзейнасцю людзей, іх сацыяльным абслугоўваннем і адпачынкам. У Мінскім рэгіёне і іншых зонах уплыву буйных гарадоў сканцэнтраваны асноўны прамыслова-вытворчы, сацыяльна-дэмаграфічны і навукова-тэхнічны патэнцыял краіны. Развітая вытворча-эканамічная і сацыяльная інфраструктура робіць урбанізаваныя рэгіёны больш прывабнымі для насельніцтва. Таму для іх характэрна адносна спрыяльная дэмаграфічная сітуацыя.

У *сельскагаспадарчых рэгіёнах* Беларусі вядучай функцыяй з'яўляецца вытворчасць і перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі. Насельніцтва іх працягвае скарачацца.

Ёсць у нашай краіне і *прыродныя рэгіёны*. На іх тэрыторыях знаходзяцца запаведнікі і нацыянальныя паркі. Гэтыя рэгіёны валодаюць унікальнымі магчымасцямі для комплекснай арганізацыі адпачынку, турызму і санаторна-курортнага лячэння.

*Асобыя зоны* — гэта раёны радыеактыўнага забруджвання, якія пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Яны ахопліваюць тэрыторыі са шчыльнасцю радыеактыўнага забруджвання ад 1 да 15 кю/кв. км.

***Рэгіянальная палітыка дзяржавы*** — гэта мэтанакіраваная дзейнасць органаў дзяржаўнай улады па забеспячэнні аптымальнага развіцця рэгіёнаў і адміністрацыйна-тэрыта-

 Правообладатель Народная асвета

рыяльных адзінак. Забяспечваючы магчымасці для развіцця рэгіёнаў, дзяржава тым самым стварае ўмовы для ўстойлівага развіцця краіны ў цэлым. Стратэгічная мэта заключаецца ў забеспячэнні стабільнага сацыяльна-эканамічнага развіцця пасяленняў і тэрыторый, захавання спрыяльнага навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Гэта развіццё накіравана на задавальненне жыццёвых патрэб як цяперашняга, так і будучых пакаленняў людзей. Мэта рэгіянальнай палітыкі дзяржавы заключаецца таксама ў тым, каб звесці да мінімуму няроўнасць паміж рэгіёнамі.

На аснове аналізу і ацэнкі сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэгіёнах распрацоўваюцца рэгіянальныя эканамічныя, сацыяльныя і экалагічныя праграмы, а таксама праграмы развіцця свабодных эканамічных зон (СЭЗ) і інш.

*Рэгіянальная прамысловая палітыка* ў нашай краіне накіравана на ўдасканальванне галіновай структуры прамысловага комплексу на аснове ажыццяўлення праектаў навукаёмістай, высокатэхналагічнай накіраванасці ў рэгіёнах з высокім навукова-тэхнічным патэнцыялам. Прыярытэтны характар мае развіццё галін і вытворчасцей, якія працуюць на мясцовай сыравіне (Брэсцкая, Гродзенская і Мінская вобласці). Укараненне энерга- і рэсурсазберагальных тэхналогій асабліва важныя ў рэгіёнах, арыентаваных пераважна на прывазную сыравіну (Віцебская, Гомельская і Магілёўская вобласці).

*Рэгіянальная аграрная палітыка* нацэлена на стварэнне высокаэфектыўнай сельскагаспадарчай вытворчасці, яе рацыянальную спецыялізацыю з улікам эканамічных, глебава-кліматычных і іншых асаблівасцей сельскагаспадарчых зон, паскоранае развіццё кармавой базы жывёлагадоўлі, павышэнне прадукцыйнасці зямель, стварэнне новай спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў забруджаных радыенуклідамі зонах.

Асноўнымі задачамі *рэгіянальнай сацыяльнай палітыкі* з'яўляюцца паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі, стварэнне ўмоў і магчымасцей прадастаўлення насельніцтву гарантаванага аб'ёму сацыяльна значных паслуг у адпаведнасці з зацверджанымі сацыяльнымі стандартамі, умацаванне сацыяльнай інфраструктуры сяла і малых гарадоў, пашырэнне аб'ёмаў абслугоўвання насельніцтва за кошт прыватнага прадпрымальніцтва, развіццё агратурыстычных комплексаў,

Правообладатель Народная асвета



Агратурыстычны цэнтр «Гіпіка» ў Ашмянскім раёне

захаванне і аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёнаў, а значыцца, і краіны ў цэлым.

**Развіццё малых і сярэдніх гарадоў.** Галоўнымі мэтамі развіцця малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў з'яўляюцца стварэнне ў іх спрыяльных умоў для жыцця насельніцтва, стабілізацыя сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту. Плануецца, па-магчымасці, захаваць прадпрыемствы, якія існуюць, і стварыць адпаведныя ўмовы для размяшчэння новых вытворчасцей, арыентаваных, перш за ўсё, на мясцовыя рэсурсы, традыцыі мясцовых жыхароў і патрэбнасці рэгіёна; стымуляваць прадпрымальніцкую дзейнасць грамадзян, адраджаць традыцыйныя рамёствы і промыслы; шырока прыцягваць інвестыцыі, у тым ліку замежныя.

Асноўная ўвага надаецца пасяленням, у якіх узровень беспрацоўя перавышае сярэдні па вобласці, а таксама ўключаным у пералік населеных пунктаў, якія знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання або якія маюць адну горадаўтваральную арганізацыю.

Стратэгіі ўстойлівага развіцця рэгіёнаў атрымалі назву Мясцовыя павесткі XXI. Мэта Мясцовых павестак — вызначыць асноўныя напрамкі пераходу рэгіёнаў да ўстойлівага развіцця з улікам іх эфектыўнага ўдзелу ў агульным працэсе развіцця краіны. Першым Мясцовую павестку прыняў г. Тураў у 1999 г.; некалькі пазней да гэтай работы падключыліся пас. Капаткевічы Петрыкаўскага раёна Гомель-


Правообладатель Народная асвета

скай вобласці, г. Дзяржынск, г. Фаніпаль, іншыя населеныя пункты.

**Дзяржаўная праграма адраджэння беларускай вёскі.** Як ужо адзначалася раней, адной з асноўных сацыяльных праблем у нашай краіне з'яўляюцца значныя адрозненні ва ўмовах жыцця горада і вёскі. У сельскай мясцовасці нярэдка горшыя, чым у горадзе, жыллёвыя ўмовы; менш развіты комплекс сацыяльна-бытавых паслуг, ніжэйшы ўзровень заработнай платы, менш спрыяльныя ўмовы для развіцця адукацыі і правядзення вольнага часу, асабліва моладзі. У сувязі з гэтым неспрыяльнай з'яўляецца дэмаграфічная сітуацыя.

25 сакавіка 2005 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ «Аб Дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця сяла на 2005—2010 гады». Мэта Праграмы — паляпшэнне ўмоў жыцця сельскага насельніцтва і далейшае развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. На яе рэалізацыю з бюджэту рэспублікі было вылучана 70 трлн рублёў.

Праграма вызначыла, што адраджэнне і развіццё сяла павінна адбывацца на аснове ўмацавання аграрнай эканомікі, павышэння даходаў сельскага насельніцтва, узроўню сацыяльна-бытавога і інжынернага добраўпарадкавання сельскіх населеных пунктаў, захавання і аздараўлення экалогіі ў іх пры рацыянальным выкарыстанні дзяржаўных і іншых інвестыцый.

У адпаведнасці з Праграмай сёння ствараюцца перадумовы для павышэння прывабнасці сельскага спосабу жыцця і працы. Адной з найбольш значных мер у гэтым на-



Аграгарадок Хальч у Веткаўскім раёне

Правообладатель Народная асвета



Дзіцячы сад у аграгарадку
Заказель Драгічынскага раёна

прамку з'яўляецца будаўніцтва сельскіх пасёлкаў якасна новага тыпу — аграгарадкоў. *Аграгарадок* — гэта добраўпарадкаваны населены пункт, у якім ствараюцца вытворчая і сацыяльная інфраструктуры для забеспячэння выканання ўсіх сацыяльных стандартаў насельніцтву, якое ў ім пражывае, і жыхарам тэрыторый, якія прылягаюць. На працягу 2005—2010 гг. намечана пабудаваць каля 1500 аграгарадкоў.

У сельскай мясцовасці развіваецца жыллёвае будаўніцтва і камунальнае абслугоўванне з мэтай наблізіць жыллё па камфортнасці да гарадскога. Ажыццяўляецца газіфікацыя ўсіх жылых дамоў, сельскія населеныя пункты забяспечваюцца стацыянарнай або мабільнай сувяззю. Паляпшаюцца ўмовы для культурнага адпачынку, развіцця традыцыйнай культуры рэгіёнаў, для заняткаў фізічнай культурай і спортам.

?!

1. Ахарактарызуйце рэгіянальнае дзяленне Рэспублікі Беларусь. Якія асаблівасці таго рэгіёна, у якім вы жывяце?
2. Назавіце асноўныя задачы рэгіянальнай прамысловай, аграрнай і сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы.
3. Выкарыстоўваючы матэрыял мясцовага перыядычнага друку, ахарактарызуйце асноўныя напрамкі прамысловага, аграрнага, сацыяльнага развіцця вашага рэгіёна (вобласці, раёна, горада).


Правообладатель Народная асвета

4. Што такое Мясцовыя павесткі XXI? Назавіце асноўныя напрамкі развіцця малых і сярэдніх гарадоў, адраджэння і развіцця беларускай вёскі.
5. Якія, на ваш погляд, найбольш эфектыўныя шляхі развіцця малых і сярэдніх гарадоў, адраджэння вёскі? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
6. Падрыхтуйце паведамленне аб рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла ў вашым рэгіёне (вобласці, раёне, горадзе).

## § 16. Нацыянальная і канфесійная палітыка

*Успомніце.* **1.** Назавіце асноўныя прыметы нацыі. **2.** Які нацыянальны склад насельніцтва нашай рэспублікі? **3.** Што такое рэлігія, верацярпімасць, свабода сумлення?

**Беларусь — краіна міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды.** На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пражываюць людзі розных нацыянальнасцей, прадстаўнікі розных канфесій.

Паводле даных сацыялагічных даследаванняў, веруючыя складаюць прыкладна палову дарослага насельніцтва Беларусі. Найбольш распаўсюджанымі канфесіямі з'яўляюцца праваслаўе і каталіцызм. Да праваслаўнай царквы адносіць сябе каля 80 % веруючага насельніцтва рэспублікі. На пачатак 2009 г. *Беларуская праваслаўная царква* аб'ядноўвала амаль 1500 праваслаўных прыходаў, 11 епархій, 5 духоўных навучальных устаноў, 31 манастыр, каля 1300 праваслаўных храмаў.

Каталікі складаюць каля 14 % ад агульнай колькасці веруючых. На сённяшні дзень чатыры епархіі *Рымска-каталіцкай царквы* аб'ядноўваюць прыкладна 470 абшчын. У Беларусі дзейнічаюць 8 каталіцкіх манастыроў, больш як 450 касцёлаў.

На пачатак 2009 г. у Беларусі дзейнічалі таксама каля 1000 *пратэстанцкіх* рэлігійных абшчын і 5 духоўных навучальных устаноў. Найбольш шматлікімі з'яўляюцца хрысціяне веры евангельскай (каля 500 абшчын).

Акрамя таго, у Беларусі існуюць іудзейскія, мусульманскія і іншыя рэлігійныя аб'яднанні. У цэлым у рэспубліцы зарэгістраваны рэлігійныя арганізацыі, якія належаць да 25 канфесій.

Правообладатель Народная асвета



Спаса-Еўфрасіннеўскі праваслаўны манастыр
у г. Полацку

У нашай краіне склаліся старадаўнія традыцыі суіснавання і ўзаемадзеяння прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей і рэлігій. Для сучаснага беларускага грамадства характэрны верацярпімасць, адкрытасць да дыялогу, адсутнасць канфліктаў і вострых супярэчанняў на нацыянальнай і рэлігійнай аснове. Беларусь з'яўляецца тэрыторыяй міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды.

Важную ролю ў іх забеспячэнні адыгрываюць як менталітэт беларусаў, так і палітыка дзяржавы ў галіне міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, накіраваная на мірнае суіснаванне рэлігійных і этнічных супольнасцей у інтарэсах устойлівага развіцця краіны.

**Нацыянальная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь.** Станаўленне суверэннай беларускай дзяржавы было звязана з развіццём культуры і нацыянальнага жыцця беларускага этнасу. У пачатку 1990-х гг. пачалі актыўна ствараццa грамадскія арганізацыі, у якіх аб'ядноўваліся людзі, якія праяўлялі цікавасць да беларускай мовы, беларускай культуры і гісторыі. Заахвочвалася выкладанне вучэбных дысцыплін на беларускай мове.

26 студзеня 1990 г. быў прыняты Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», які вызначыў статус беларускай мовы як дзяржаўнай. Пры гэтым Закон забяспечваў права карыстацца рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін і


Правообладатель Народная асвета

нацэльваў на стварэнне ўмоў для развіцця ўсіх нацыянальных моў, якімі карысталася насельніцтва Беларусі. У маі 1995 г. на рэспубліканскім рэферэндуме 83 % грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаванні, выказаліся за наданне рускай мове аднолькавага статусу з беларускай. Вясной 1998 г. у Закон аб мовах былі ўнесены змяненні і дапаўненні, якія замацавалі дзеючы на сучасным этапе механізм ажыццяўлення двухмоўя ў нашай краіне. У 2008 г. прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Новая рэдакцыя правілаў пачала дзейнічаць з 1 верасня 2010 г.



Каталіцкі храм у г. Глыбокае

Беларуская нацыя фарміравалася ва ўмовах пастаяннага ўзаемадзеяння з іншымі нацыямі. Гэта абумовіла пераважную этнічную талерантнасць беларусаў. Каля 2/3 беларусаў маюць сваякоў іншых нацыянальнасцей. Па выніках сацыялагічных апытанняў, пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці не з'яўляецца для большасці беларусаў вызначальным у паўсядзённых зносінах. У Беларусі няма прычын для ўзнікнення канфліктаў на этнічнай, расавай, моўнай глебе.

Важным фактарам, які забяспечвае мірнае суіснаванне і гарманічнае развіццё розных нацыянальных супольнасцей, з'яўляецца нацыянальная палітыка беларускай дзяржавы. ***Нацыянальная палітыка*** — гэта палітыка шматнацыянальных дзяржаў у адносінах да нацыянальных, этнічных груп, якія ў іх пражываюць.

Канстытуцыяй нашай краіны вызначаецца, што дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў (артыкул 14 Канстытуцыі). Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь (артыкул 15 Канстытуцыі).

Правообладатель Народная асвета

Нацыянальная прыналежнасць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь не фіксуецца ў дакументах і не павінна брацца пад увагу пры разглядзе дзелавых якасцей саіскальнікаў любой пасады ў органах дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь. Знявага нацыянальнай годнасці праследуецца па закону. Кожнаму грамадзяніну закон дае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін, выхавання і навучання.

Законы Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі» і «Аб культуры» даюць нацыянальным супольнасцям права на вывучэнне роднай мовы ў спецыяльных класах, групах, школах, а таксама на адраджэнне нацыянальнай культуры і традыцый. У дзяржаўных навучальных і выхаваўчых установах у адпаведнасці з пажаданнямі прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей дазваляецца вывучэнне нацыянальных моў, можа ажыццяўляцца навучанне і выхаванне на гэтых мовах.

У Беларусі функцыянуюць больш як 120 грамадскіх арганізацый, якія прадстаўляюць 24 нацыянальныя супольнасці. Гэтыя арганізацыі рэалізуюць культурна-асветніцкія, інфармацыйныя, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы. Яны дзейнічаюць пры падтрымцы рэспубліканскіх, абласных, раённых і гарадскіх улад. Выпускаюцца газеты на ўкраінскай, польскай, літоўскай мовах. Грамадскімі нацыянальнымі аб'яднаннямі ствараюцца культурна-асветніцкія цэнтры, калектывы самадзейнай народнай творчасці. З мясцовых бюджэтаў фінансуецца развіццё самадзейнага мастацтва, аказваецца падтрымка дзейнасці створаных нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі ўстаноў культуры. У краіне праводзяцца Усебеларускія фестывалі нацыянальных культур. Галоўная ідэя фестываляў — паказ самабытнасці народаў, якія насяляюць Беларусь.

**Свабода сумлення і веравызнання ў Рэспубліцы Беларусь.** ***Канфесійная палітыка*** — гэта палітыка шматканфесійных дзяржаў па ўрэгуляванні адносін паміж рознымі канфесіямі. Яе асноўныя напрамкі вызначаны ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», прынятым у 2002 г. У Законе замацаваны правы грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду сумлення і веравызнання, роўнасць перад законам незалежна ад адносін да рэлігіі, роўнасць рэлігій перад законам. У Законе гаворыцца таксама аб прызнанні «вызначальнай ролі Пра-


Правообладатель Народная асвета



Літоўскі цэнтр культуры і адукацыі
ў в. Рымдзюны Астравецкага раёна

васлаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа; духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі; неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангелічна-лютэранскай царквы, іудаізму і ісламу». Гэтыя рэлігіі афіцыйна прызнаюцца традыцыйнымі веравызнаннямі беларусаў.

Закон не дапускае якога-небудзь прымусу пры вызначэнні грамадзянінам сваіх адносін да рэлігіі; да прызнання або адказу ад прызнання рэлігіі, да ўдзелу або няўдзелу ў богаслужэннях, рэлігійных абрадах і цырымоніях, да навучання рэлігіі.

*Свабода сумлення* — састаўная частка права кожнага чалавека на свабодны светапоглядны выбар. Яна ўключае правы вызначаць свае адносіны да рэлігіі, спавядаць любую рэлігію або не спавядаць ніякай рэлігіі. Свабода веравызнання прадугледжвае права мець, змяняць, распаўсюджваць як рэлігійныя, так і нерэлігійныя перакананні, выключае якія-небудзь перавагі або абмежаванні ў карыстанні грамадзянскімі правамі ў залежнасці ад адносін да рэлігіі.

Разам з тым у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца: «Забараняецца дзейнасць рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды ці звязана з парушэннем правоў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзяна-

Правообладатель Народная асвета

мі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або прычыняе шкоду іх здароўю і маральнасці» (артыкул 16 Канстытуцыі).

Дзяржава прызнае значнасць рэлігіі як інстытута, які выконвае важныя сацыяльныя функцыі, звязаныя з фарміраваннем духоўных, культурных традыцый, і не выключае магчымасцей супрацоўніцтва з рэлігійнымі арганізацыямі ў інтарэсах грамадскага развіцця.

У 2003 г. было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой, у межах якога былі распрацаваны некаторыя сумесныя праграмы. Яны тычацца выхавання і адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, аховы навакольнага асяроддзя. Праводзяцца сустрэчы Кіраўніка дзяржавы з кіраўніцтвам як Праваслаўнай, так і Рымска-каталіцкай царквы. Рэлігійныя арганізацыі вызваляюцца ад абкладання зямельным падаткам і падаткам на нерухомасць. Разам з тым дзяржава не ўмешваецца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый, калі яна не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Важную ролю ў распрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў этнаканфесійнай сферы адыгрывае *апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей*, які дзейнічае ў нашай краіне. У яго паўнамоцтвы ўваходзіць вывучэнне пытанняў, якія ўзнікаюць ва ўзаемаадносінах дзяржавы і рэлігійных арганізацый, а таксама дзяржавы і гра-





Сустрэчы Кіраўніка дзяржавы з кіраўніцтвам Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай царквы


Правообладатель Народная асвета

мадскіх аб'яднанняў грамадзян, якія адносяць сябе да нацыянальных меншасцей. Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей ажыццяўляе кантроль за выкананнем рэлігійнымі арганізацыямі заканадаўства, а таксама забяспечвае мыгчымасці для дзейнасці рэлігійных арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў грамадзян, якія адносяцца да нацыянальных меншасцей.

Пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей дзейнічае *Кансультатыўны міжканфесійны савет*, у які ўваходзяць прадстаўнікі розных рэлігійных арганізацый. У ліку задач Савета — садзейнічанне захаванню і ўмацаванню міжканфесійнага міру і згоды ў Рэспубліцы Беларусь, падтрыманне традыцый верацярпімасці, талерантнасці і дыялога паміж прадстаўнікамі розных канфесій.

?!

1. Ахарактарызуйце канфесійны склад насельніцтва Беларусі. Якія канфесіі з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі ў нашай краіне?
2. Успомніце з курса гісторыі, якія вытокі поліэтнічнага і поліканфесійнага складу насельніцтва Беларусі. Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, прывядзіце прыклады, якія дэманструюць уклад прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у сацыяльнае і духоўнае развіццё нашай краіны.
3. Назавіце фактары, якія, на вашу думку, забяспечваюць шматнацыянальную і міжканфесійную згоду ў Рэспубліцы Беларусь.
4. Ахарактарызуйце асноўныя напрамкі нацыянальнай і канфесійнай палітыкі беларускай дзяржавы. *(Выкарыстайце матэрыял 10 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 179—182.)* Якая роля апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў этнаканфесійнай сферы?
5. Падрыхтуйце паведамленні аб:
   а) асноўных напрамках узаемадзеяння беларускай дзяржавы з рэлігійнымі арганізацыямі;
   б) нацыянальным складзе насельніцтва вашага рэгіёна (вобласці, раёна, горада) і развіцці культур нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у ім.

Правообладатель Народная асвета

# § 17. Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі

**Успомніце.** **1.** Што такое культура? **2.** Якія адрозніваюць формы культуры?

**Палітыка ў галіне культуры.** Адукацыя і культура з'яўляюцца асновай сучаснага грамадства. Іх высокі ўзровень — залог развіцця, паказчык сталасці краіны і важная ўмова забеспячэння яе міжнароднага аўтарытэту. Высокі ўзровень адукацыі і культуры забяспечвае неабходныя перадумовы для палітычнага, сацыяльнага, эканамічнага і духоўнага выхавання грамадзян краіны. Таму ўсебаковае развіццё культуры з'яўляецца найважнейшым напрамкам палітыкі беларускай дзяржавы.

*Нацыянальная культура* ўяўляе сабой сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей грамадства і ўключае мову, гісторыка-культурную спадчыну, традыцыі, фальклор, народныя промыслы і рамёствы, прафесійнае і самадзейнае мастацтва, мастацкую адукацыю, установы і кадры культуры, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя культурныя сувязі.

Разам з правам чалавека на адукацыю Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь замацоўвае і гарантуе права кожнага грамадзяніна на ўдзел у культурным жыцці, на карыстанне дасягненнямі культуры, яе каштоўнасцямі. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права займацца любым відам культурнай дзейнасці, акрамя той, якая забаронена законам. Яны могуць добраахвотна аб'ядноўвацца ў творчыя саюзы, асацыяцыі, таварыствы і іншыя культурныя суполкі. Абавязкам кожнага грамадзяніна з'яўляюцца беражлівыя адносіны да гісторыка-культурнай спадчыны свайго народа і ўсяго чалавецтва.

Палітыка беларускай дзяржавы ў галіне культуры накіравана на забеспячэнне свабоды творчай дзейнасці, стварэнне ўсім грамадзянам краіны ўмоў для далучэння да духоўных каштоўнасцей. Важную ролю адыгрываюць таксама забеспячэнне гуманістычнай накіраванасці працэсаў, якія працякаюць у духоўным жыцці грамадства, умацаванне яго духоўных асноў. Клопатам дзяржавы з'яўляецца і забеспячэнне сувязей беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў.


Правообладатель Народная асвета



Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча

У Рэспубліцы Беларусь праводзіцца вялікая работа па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, развіцці мастацкай аматарскай і прафесійнай творчасці, адраджэнні і развіцці народных промыслаў і рамёстваў. У цяперашні час у Беларусі дзейнічае звыш 13 тыс. розных устаноў культуры і мастацтва. У сістэму Міністэрства культуры ўваходзяць дзіцячыя школы мастацтва, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. У рэспубліцы працуе каля 30 прафесійных тэатраў. Нацыянальнай гордасцю з'яўляюцца Дзяржаўны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы, Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча, Дзяржаўны ансамбль танца, Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» і інш. У сферы культуры працуюць больш як 40 тыс. чалавек.

У Рэспубліцы Беларусь пастаянна расце колькасць розных фестываляў і аглядаў. Шырокую вядомасць у краіне і за яе межамі атрымалі Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», Міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер» у Магілёве, «Беларуская музычная восень» у Мінску, «Мінская вясна», рэгіянальны фальклорны фестываль «Палескі карагод» у Пінску, Рэспубліканскі фестываль харэаграфіі ў Брэсце, фестываль камернай музы-

Правообладатель Народная асвета

кі ў Заслаўі, Міжнародны кінафестываль «Лістапад», міжнародныя фестывалі сярэдневяковай культуры ў Нясвіжы, Навагрудку, Заслаўі і інш. Усяго ў Беларусі пастаянна праводзіцца больш за 30 міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных фестываляў.

У рэспубліцы створана больш як 60 Дамоў рамёстваў і каля 50 Дамоў фальклору. На развіццё самадзейнай мастацкай творчасці накіравана работа больш як 25 тыс. гурткоў і калектываў пры клубных установах. У краіне дзейнічае 185 музеяў і іх філіялаў, у якіх сабрана велічэзная колькасць унікальных экспанатаў.

У апошнія гады ў Беларусі пачалі планамерна ажыццяўляцца рэстаўрацыя і ўвядзенне ў культурны абарот помнікаў гісторыі і культуры, гістарычных комплексаў, запаведных тэрыторый, мемарыяльных паркаў. У цяперашні час дзейнічае адрэстаўрыраваны замкава-паркавы комплекс у гарадскім пасёлку Мір, працягваюцца рэстаўрацыйныя работы ў палацава-паркавым ансамблі (замку Радзівілаў) у горадзе Нясвіжы. Распрацаваны дзяржаўныя праграмы па развіцці Полацка і Полацкага Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра.



Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»


Правообладатель Народная асвета

 

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры
і быту каля г. Мінска

Вялікая ўвага надаецца пытанням развіцця бібліятэчнай справы. У рэспубліцы дзейнічаюць больш за 5 тыс. публічных бібліятэк. Асаблівай з'явай культурнага і сацыяльна-палітычнага жыцця краіны з'явілася будаўніцтва новага корпуса Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Яна аснашчана самым сучасным абсталяваннем для захавання і перадачы інфармацыі. Будынак бібліятэкі з'яўляецца своеасаблівым архітэктурным сімвалам нашай сталіцы.

**Сродкі масавай інфармацыі і развіццё інфармацыйнай культуры.** ***Сродкі масавай інфармацыі (СМІ)*** — гэта сукупнасць сродкаў распаўсюджвання інфармацыі на масавыя аўдыторыі з выкарыстаннем якога-небудзь матэрыяльнага носьбіта. У нашы дні вылучаюць друкаваныя, электронныя і Інтэрнэт-СМІ.

У Беларусі ў цяперашні час зарэгістраваны 9 інфармацыйных агенцтваў, больш за 70 тэлепраграм, больш як 150 праграм радыёвяшчання, прыкладна 1300 перыядычных выданняў, у тым ліку каля 650 газет, больш чым 600 часопісаў. Прыкладна 400 выданняў належаць дзяржаве, астатнія — прыватныя. Самая масавая з выдаваемых у краіне газет — «Советская Белоруссия». Яе разавы тыраж перавышае 500 тыс. экзэмпляраў. Многія газеты і часопісы выдаюцца на беларускай мове.

Уплыў СМІ на жыццё сучаснага грамадства настолькі вялікі, што іх іншы раз называюць чацвёртай уладай. СМІ адыгрываюць усё больш значную ролю ў адукацыі людзей, фарміраванні іх грамадска-палітычных поглядаў і перака-

Правообладатель Народная асвета

нанняў. СМІ надзвычай пашыраюць магчымасці доступу чалавека да дасягненняў культуры. У той жа час яны ў многім садзейнічаюць стандартызацыі і камерцыялізацыі культуры. У многіх краінах першыя старонкі ў газетах і часопісах, лепшы час на тэлебачанні аддаюцца тым артыкулам, матэрыялам, праграмам, фільмам, якія прынясуць найбольш высокі прыбытак, нават калі іх узровень і культурная каштоўнасць невысокія.

Таму адной з найважнейшых задач палітыкі беларускай дзяржавы ў галіне культуры з'яўляецца фарміраванне ў грамадстве патрабавальных адносін да дзейнасці СМІ.

**Палітыка ў галіне аховы здароўя.** ***Ахова здароўя*** — гэта сістэма дзяржаўных, грамадскіх і медыцынскіх мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне і ўмацаванне здароўя людзей, прафілактыку і лячэнне захворванняў, а таксама сістэма спецыяльных устаноў і арганізацый, якія іх ажыццяўляюць.

Асновай сістэмы аховы здароўя Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца дзяржаўныя медыцынскія ўстановы. За апошнія гады шырокае распаўсюджанне атрымалі таксама недзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя, якія аказваюць платныя паслугі. Некаторыя платныя паслугі пачалі аказваць і дзяржаўныя медыцынскія ўстановы.

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам «Аб ахове здароўя», прынятым у чэрвені 2008 г., устаноўлена, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь незалежна ад пола, расы, мовы, нацыянальнасці, службовага і сацыяльнага становішча, месца жыхарства і іншых абставін маюць права на ахову здароўя.

Палітыка беларускай дзяржавы ў галіне аховы здароўя насельніцтва нацэлена на забеспячэнне даступнасці, бясплатнасці і павышэнне якасці медыцынскай дапамогі. Прыярытэтнае значэнне маюць прафілактыка захворванняў, забеспячэнне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту грамадзян.

У Беларусі паслядоўна вырашаецца задача вывядзення медыцынскага абслугоўвання на еўрапейскі ўзровень развіцця. Для гэтага шырока ўкараняюцца сучаснае абсталяванне і новыя тэхналогіі, павышаецца якасць абслугоўвання і медыцынскай рэабілітацыі хворых.

 Правообладатель Народная асвета

Беларускімі ўрачамі праведзены аперацыі па перасадцы пячонкі і сэрца, унікальныя аперацыі на сасудах. Істотна знізіліся за апошнія гады дзіцячая смяротнасць, колькасць інфекцыйных захворванняў, смяротнасць ад інфаркту міякарда і інш.

Добра вядома, што хваробы лягчэй папярэдзіць, чым лячыць. Таму кожны з нас павінен берагчы і ўмацоўваць сваё здароўе. Адзін з асноўных шляхоў — далучэнне да фізічнай культуры, вядзенне актыўнага, здаровага спосабу жыцця.

**Фізічная культура і спорт. Фарміраванне здаровага спосабу жыцця.** Удасканальванне аховы здароўя ў нашай краіне непарыўна звязана з палітыкай дзяржавы ў галіне фізічнай культуры, спорту і турызму. У сістэме фізічнага выхавання вылучаюць тры асноўныя напрамкі: займанне фізкультурай і спортам у галіне масавай фізічнай культуры; інтэнсіўная падрыхтоўка ў сферы спорту вышэйшых дасягненняў; фізічнае выхаванне дзяцей і падлеткаў, моладзі, якая вучыцца. Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне фізічнай культуры, спорту і турызму замацаваны ў законах Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце», «Аб турызме», а таксама ў адпаведных Дзяржаўных праграмах.

Папулярнасць заняткаў спортам у Беларусі год ад году расце. Узведзены многія сучасныя спартыўныя аб’екты, якія з’яўляюцца даступнымі для грамадзян, дазваляюць ім праводзіць свой вольны час цікава і з карысцю для здароўя. У рэспубліцы функцыянуюць сотні стадыёнаў, спартыўных манежаў, плавальных басейнаў, тысячы спартыўных залаў, каля 10 тыс. адкрытых спартыўных пляцовак.

Штогод у Рэспубліцы Беларусь праводзіцца каля 80 міжнародных спартыўных мерапрыемстваў. У больш чым 470 спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах забяспечваецца стабільная і планамерная падрыхтоўка спартыўнага рэзерву. У іх праходзяць падрыхтоўку каля 175 тыс. спартсменаў.



Аляксей Грышын — чэмпіён Алімпійскіх гульняў у г. Ванкуверы (2010 г.)

Правообладатель Народная асвета







Сяргей Новікаў — сярэбраны і Дар'я Домрачава — бронзавы прызёры Алімпійскіх гульняў у г. Ванкуверы (2010 г.)

Мы з поўным правам ганарымся нашымі фрыстайлістамі, біятланістамі, прадстаўнікамі мастацкай гімнастыкі, лёгкай атлетыкі і іншых відаў спорту. «Беларусь была, ёсць і будзе дзяржавай спартыўнай. Вялікі спорт, рэкордныя дасягненні нашых спартсменаў — важная ўмова выхавання патрыятызму, умацавання міжнароднага аўтарытэту краіны», — падкрэсліў у адным са сваіх выступленняў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

Дзейнасць дзяржавы па развіцці фізічнай культуры і спорту, ахове здароўя, павышэнні культуры грамадства садзейнічае фарміраванню здаровага спосабу жыцця кожнага чалавека.

***Здаровы спосаб жыцця*** — гэта спосаб жыцця, у аснове якога ляжаць свядомыя адносіны чалавека да свайго здароўя як каштоўнасці. Ён прадугледжвае высокую культуру харчавання, адмову ад курэння і іншых шкодных звычак, рэгулярныя заняткі спортам, імкненне напоўніць свой вольны час цікавым зместам.

У нашай краіне вялікая ўвага надаецца развіццю турызму. Рэспубліка Беларусь — краіна з непаўторнымі па прыгажосці рэкамі і азёрамі, маляўнічымі ландшафтамі. Для аматараў прыроды арганізуюцца конныя, пешыя, водныя прагулкі, назіранні за дзікімі жывёламі, падводная рыбная лоўля і г. д. Шырока развіваецца сельскі турызм.


Правообладатель Народная асвета

?!

1. Ахарактарызуйце асноўныя напрамкі палітыкі беларускай дзяржавы ў галіне культуры. Якія праблемы ў развіцці культуры, на ваш погляд, патрабуюць першачарговага рашэння? Свой адказ аргументуйце.
2. Якія дасягненні ў развіцці беларускай культуры ў 2000—2010 гг. вы лічыце найбольш значнымі?
3. Ахарактарызуйце ролю СМІ ў сучасным беларускім грамадстве. Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць або абвяргаюць вывад: «СМІ надзвычай пашыраюць магчымасці доступу чалавека да дасягненняў культуры. У той жа час яны ў многім садзейнічаюць стандартызацыі і камерцыялізацыі культуры». Што, на ваш погляд, неабходна змяніць у дзейнасці беларускіх СМІ?
4. Якім чынам у Рэспубліцы Беларусь забяспечваецца канстытуцыйнае права грамадзян на ахову здароўя? Назавіце асноўныя напрамкі палітыкі беларускай дзяржавы ў галіне аховы здароўя. Падрыхтуйце паведамленне аб дасягненнях сучаснай беларускай медыцыны.
5. Ахарактарызуйце палітыку беларускай дзяржавы ў галіне фізічнай культуры, спорту і турызму. Якія меры, па вашым меркаванні, будуць садзейнічаць умацаванню здаровага спосабу жыцця ў маладзёжным асяроддзі? Падрыхтуйце паведамленне аб найбольш значных дасягненнях беларускіх спартсменаў.
6. Падрыхтуйце паведамленні аб развіцці культуры, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту, турызму ў вашым рэгіёне (вобласці, раёне, горадзе).

## § 18. Маладзёжная палітыка

***Успомніце.*** Назавіце асноўныя характарыстыкі моладзі як сацыяльна-дэмаграфічнай групы.

**Неабходнасць дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.** Сацыяльнае і палітычнае самавызначэнне маладога пакалення заўсёды было звязана з пераадольваннем пэўных цяжкасцей. Гэта выразна праявілася ў 1990-я гг., у перыяд станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы. Сусветны фінансава-эканамічны крызіс, які распачаўся ў канцы першага дзесяцігоддзя XXI ст., таксама адбіўся на сацыяльным становішчы моладзі: абвастрыліся праблемы занятасці, больш размытымі сталі каштоўнасныя арыентацыі часткі моладзі. У гэтай сувязі ўзнікла неабходнасць узмацнення дзяржаўнага ўплы-

Правообладатель Народная асвета

ву на працэсы фарміравання моладзі як асобнага сацыяльнага слоя. Актывізацыі маладзёжнай палітыкі, якая з'яўляецца важнай састаўной часткай сацыяльнай палітыкі і адным з галоўных напрамкаў ідэалагічнай дзейнасці дзяржавы, у цяперашні час надаецца асаблівае значэнне.

Маладзёжныя праблемы ў Беларусі ахопліваюць не толькі фарміраванне палітычных поглядаў і арыентацый моладзі, але і пытанні яе адукацыі, вольнага часу, здароўя, працаўладкавання, а таксама матэрыяльныя, сацыяльна-бытавыя, сацыякультурныя праблемы маладых сем'яў і інш.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (артыкул 32) замацавала палажэнне аб тым, што моладзі гарантуецца права на яе духоўнае, маральнае і фізічнае развіццё, а таксама ўстанавіла, што дзяржава бярэ на сябе абавязацельствы стварыць неабходныя ўмовы для свабоднага і эфектыўнага ўдзелу моладзі ў палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным развіцці краіны.

У Законе «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» вызначана, што ***дзяржаўная маладзёжная палітыка*** — гэта сістэма сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных, прававых і іншых мер, накіраваных на падтрымку маладых грамадзян Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 14 да 31 года. Яна ажыццяўляецца ў мэтах сацыяльнага станаўлення і развіцця моладзі, найбольш поўнай рэалізацыі яе патэнцыялу ў інтарэсах усяго грамадства.

У Законе вызначаны мэты, прынцыпы і асноўныя напрамкі маладзёжнай палітыкі. Устаноўлены гарантыі дзяржавы па забеспячэнні моладзі права на адукацыю, працу, аб'яднанне, па падтрымцы таленавітай і адоранай моладзі, маладых сем'яў; прадугледжаны меры, якія садзейнічаюць фарміраванню здаровага спосабу жыцця моладзі, развіццю і рэалізацыі маладзёжных грамадска значных ініцыятыў, міжнароднаму супрацоўніцтву. У Законе таксама вызначаны меры па інфармацыйным і навуковым забеспячэнні маладзёжнай палітыкі.

Асноўныя напрамкі маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы канкрэтызуюцца ў спецыяльнай праграме «Моладзь Беларусі».

Эфектыўная маладзёжная палітыка дазваляе выкарыстоўваць велічэзны творчы патэнцыял моладзі ў вырашэнні задач пабудовы моцнай, квітнеючай, дэмакратычнай Бе-


Правообладатель Народная асвета

ларусі. Важнай умовай з’яўляецца прыцягненне самой моладзі, маладзёжных арганізацый да фарміравання і практычнага ажыццяўлення маладзёжнай палітыкі.

**Прыярытэты маладзёжнай палітыкі.** Мэтай маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы з’яўляецца стварэнне сацыяльна-эканамічных, культурна-адукацыйных, прававых, арганізацыйных умоў і гарантый грамадзянскага станаўлення, выхавання і сацыяльнай самарэалізацыі моладзі. Практычнае ажыццяўленне маладзёжнай палітыкі забяспечваецца скаардынаванымі дзеяннямі ўсіх органаў дзяржаўнай улады, усіх яе суб’ектаў, пачынаючы ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і аж да мясцовых распарадчых і выканаўчых органаў.

Разгледзім больш дэталёва прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

*Прафарыентацыя, адукацыя і працаўладкаванне моладзі.* Ужо ў перыяд вучобы ў школе праводзіцца актыўная прафарыентацыйная работа, накіраваная на тое, каб маладыя людзі «знайшлі сябе» ў пэўным напрамку дзейнасці, неабходным краіне. Створана шырокая сістэма інфармавання моладзі аб сітуацыі на рынку працы, аб магчымасцях навучання і павышэння кваліфікацыі.

Сучасная беларуская эканоміка адчувае патрэбу ў кваліфікаваных работніках. Іх рыхтуюць прафесійна-тэхнічныя вучылішчы (ПТВ), а таксама прафесійныя ліцэі. Дзейнасць устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі заснавана на прагназаванні патрэб у працоўных рэсурсах і сфарміраваным заказе на падрыхтоўку рабочых. Амаль 95 % навучэнцаў гэтых адукацыйных устаноў прымаюцца на вучобу па дагаворах з арганізацыямі-заказчыкамі, што гарантуе выпускнікам працу па спецыяльнасці.

У нашай краіне ўдалося захаваць і ўмацаваць сістэму ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Штогод больш за 50 тыс. маладых людзей паступаюць у каледжы, тэхнікумы і іншыя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Павялічваецца прыём студэнтаў на будаўнічыя і тэхнічныя спецыяльнасці, а таксама спецыяльнасці ў сферы грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання.

Стратэгія пераходу Беларусі на інавацыйны шлях развіцця абумовіла асаблівую ўвагу да якаснага ўдасканаль-

Правообладатель Народная асвета




Выступленне А. Р. Лукашэнкі
ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова

вання вышэйшай адукацыі. У цяперашні час на 10 тыс. насельніцтва краіны прыпадае больш за 440 студэнтаў ВНУ, што адпавядае паказчыкам развітых еўрапейскіх дзяржаў. Айчынныя ВНУ забяспечваюць падрыхтоўку спецыялістаў для ўсіх галін эканомікі і сацыяльнай сферы краіны.

Такім чынам, перад маладымі людзьмі адкрываюцца шырокія магчымасці для атрымання рабочай спецыяльнасці або працягу вучобы і атрымання як сярэдняй спецыяльнай, так і вышэйшай адукацыі, а ў далейшым — павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

У Беларусі сфарміравана эфектыўная сістэма садзейнічання занятасці моладзі. Забяспечваюцца гарантыі першага рабочага месца, аказваецца падтрымка руху студэнцкіх будаўнічых атрадаў і г. д. У Працоўным кодэксе Рэспублікі Беларусь ёсць глава «Асаблівасці рэгулявання працы моладзі», у якой вызначаны ільготы, працягласць рабочага дня, рабочага часу для навучэнцаў і інш.

*Паляпшэнне жыллёвых умоў моладзі.* У краіне ўдасканальваецца заканадаўства, якое адносіцца да гэтай сферы, выкарыстоўваюцца розныя формы стымулявання і дзяржаўнай падтрымкі будаўніцтва жылля для моладзі і ма-

 Правообладатель Народная асвета

ладых сем'яў (прадастаўленне субсідый, доўгатэрміновых крэдытаў, прыцягненне пазабюджэтных крыніц фінансавання).

*Сацыяльна-эканамічная падтрымка маладой сям'і.* У Беларусі створаны і паспяхова працуюць цэнтры садзейнічання маладой сям'і ў вырашэнні эканамічных, юрыдычных, сацыяльна-бытавых, псіхалагічных праблем. Дзяржаўная палітыка ў гэтай галіне абапіраецца на палажэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь аб тым, што шлюб, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства знаходзяцца пад абаронай дзяржавы (артыкул 32).

Да прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі адносіцца таксама дзейнасць, накіраваная на грамадзянскае станаўленне, духоўна-маральнае і патрыятычнае выхаванне моладзі, падтрымку яе навуковай і навукова-тэхнічнай творчасці, вынаходніцтва і рацыяналізатарства.

Надзвычай вялікае значэнне мае садзейнічанне ўцягванню моладзі ў сельскагаспадарчую вытворчасць і замацаванню маладых спецыялістаў у вёсцы, стварэнне належных умоў для працы і быту рабочай і сельскай моладзі, развіццё і падтрымка маладзёжнага прадпрымальніцтва.

Дзяржава аказвае featureрознабаковую дапамогу масаваму дзіцячаму і маладзёжнаму спорту і турызму, развіццю творчага патэнцыялу таленавітай моладзі. Яна клапоціцца аб умацаванні ў свядомасці моладзі стандартаў здаровага спосабу жыцця, фарміраванні ў маладых людзей экалагічнай культуры і беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя. Аказваецца падтрымка маладзёжным сродкам масавай інфармацыі.

У нашай краіне рэалізуецца шэраг грамадскіх і дзяржаўных праграм па рабоце з дзецьмі і моладдзю. Многія з іх ініцыянаваны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам. Гэта перш за ўсё праграма «Дзеці Беларусі» (у яе структуры вылучаны праграмы «Дзеці Чарнобыля», «Дзеці-інваліды» і інш.).

**Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі.** Важнейшым напрамкам маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы з'яўляецца падтрымка таленавітай і адоранай моладзі.

У краіне створаны і паспяхова функцыянуюць спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы тале-

Правообладатель Народная асвета



Уручэнне прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў

навітай моладзі. Фонды ажыццяўляюць выплату стыпендый і прэмій, аказваюць аднаразовую матэрыяльную дапамогу, вылучаюць сродкі (гранты) на аплату стажыровак навучэнцаў, студэнтаў, маладых педагогаў. З дапамогай фондаў праводзяцца майстар-класы вядучымі дзеячамі мастацтва, арганізуюцца конкурсы, фестывалі, канцэрты, выставы, публікацыі творчых работ і іншыя мерапрыемствы па выяўленні і заахвочванні маладых талентаў. Сродкі фондаў выкарыстоўваюцца на фінансаванне студэнцкіх навукова-даследчых аб'яднанняў, якія атрымалі грамадскае прызнанне перспектыўнымі распрацоўкамі, набыццё музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, матэрыялаў і абсталявання для заняткаў мастацкай творчасцю і г. д.

Дзяржаўная праграма «Маладыя таленты Беларусі» накіравана на тое, каб пашырыць магчымасці для самарэалізацыі таленавітых маладых людзей, а іх дасягненні і поспехі выкарыстоўваць у мэтах сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця нашай краіны.


Правообладатель Народная асвета

**Роля моладзі ў ажыццяўленні палітыкі беларускай дзяржавы.** У цяперашні час у краіне дзейнічае больш за 160 маладзёжных і дзіцячых грамадскіх арганізацый. Самай уплывовай з іх з'яўляецца *Беларускі Рэспубліканскі Саюз Моладзі (БРСМ)*. Гэта арганізацыя актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі стратэгічнай мэты дзяржаўнай палітыкі — стварэнні моцнай і квітнеючай Беларусі. Яна ажыццяўляе шмат важных праектаў па ўмацаванні сярод моладзі здаровага спосабу жыцця, праводзіць розныя культурна-масавыя мерапрыемствы, патрыятычныя акцыі, актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. БРСМ шмат робіць таксама для вырашэння праблемы занятасці моладзі. Яшчэ адзін напрамак дзейнасці БРСМ — удзел у міжнародным супрацоўніцтве маладзёжных арганізацый, прапагандзе дасягненняў нашай краіны.

Важную ролю ў жыцці краіны адыгрываюць і многія іншыя маладзёжныя арганізацыі, у прыватнасці студэнцкі прафсаюз. Найбольшая колькасць маладзёжных арганізацый створана ва ўстановах адукацыі, а таксама ў сферы сацыяльнай абароны і рэабілітацыі моладзі, у галіне спорту, турызму і адпачынку. У апошнія гады назіраецца павелічэнне колькасці маладзёжных і дзіцячых грамадскіх фарміраванняў патрыятычнай, праваахоўнай накіраванасці, а таксама дабрачынных і гуманітарных фондаў, нацэленых на работу з моладдзю і дзейнічаючых пры яе ўдзеле. Маладзёжныя арганізацыі актыўна займаюцца вывучэннем гісторыі і



Патрыятычная акцыя БРСМ «Мы перамаглі»

Правообладатель Народная асвета



Валанцёры нааднаўленні замка
ў г. п. Любча Навагрудскага раёна

культуры Беларусі. Эфектыўна дзейнічаюць экалагічныя арганізацыі. Развіваецца ў нас і валанцёрскі рух.

Усё гэта дазваляе зрабіць вывад аб тым, што беларуская моладзь уносіць істотны ўклад у развіццё сваёй краіны, аказвае дзейсную дапамогу ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў эканамічнай, сацыяльнай і духоўнай сферах жыцця грамадства.

?!

1. Чым абумоўлена неабходнасць ажыццяўлення ў нашай краіне маладзёжнай палітыкі як асобнага напрамку сацыяльнай і ідэалагічнай дзейнасці дзяржавы? Якія маладзёжныя праблемы, на ваш погляд, патрабуюць першачарговага рашэння? Сваё меркаванне аргументуйце.
2. Якія задачы і прыярытэтныя напрамкі маладзёжнай палітыкі ў нашай краіне? (*Выкарыстайце матэрыял 11 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 182—183.*) Падрыхтуйце паведамленне аб тым, як яны рэалізуюцца ў вашым рэгіёне (вобласці, раёне, горадзе).
3. Як у нашай краіне ажыццяўляецца падтрымка таленавітай моладзі?
4. Сучасныя сацыёлагі лічаць, што неабходна карэнная ломка стэрэатыпаў выхавання моладзі як групы сацыяльнай апекі. Моладзь — частка грамадства, і стварэнне для яе спецыяльных камфортных умоў існавання не можа быць мэтаю. Гэта несправядліва ў адносінах да астатніх сацыяльных груп


Правообладатель Народная асвета

і неэфектыўна з эканамічнага пункту гледжання. Моладзь павінна навучыцца разумець, што яна нічога не атрымлівае проста так, без пэўных абавязацельстваў з яе боку. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Свой адказ аргументуйце.

5. У выступленнях палітычных дзеячаў моладзь часта называецца «стратэгічным рэсурсам дзяржавы». Як вы разумееце такую характарыстыку моладзі? Якія якасці сучаснай моладзі (асобасныя, адукацыйныя, прафесійныя), на ваш погляд, дазваляюць ёй быць «стратэгічным рэсурсам дзяржавы»?
6. Падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці маладзёжных аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь (у вашым рэгіёне).
7. Напішыце эсэ на тэму: «Моладзь. Новыя сацыяльныя ролі: дадатковыя абавязкі або ўзросшыя магчымасці?».

## Практыкум «Роля моладзі ў станаўленні моцнай і квітнеючай Беларусі»

**1.** У чэрвені 1990 г. у горадзе Таледа на Міжнародным сімпозіуме ААН па праблемах моладзі быў прыняты дакумент «Праблемы далучэння маладых людзей да жыцця грамадства». У дакуменце адзначаецца, што дзяржавы павінны забяспечваць актыўны ўдзел юнакоў і дзяўчат у палітычным, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці грамадства. З другога боку, моладзь сама павінна праяўляць актыўнасць у гэтых адносінах.

? 1. Як вы расцэньваеце сцверджанне, што актыўны ўдзел юнакоў і дзяўчат у жыцці грамадства магчымы толькі ў тым выпадку, калі яны:
ведаюць, падзяляюць і прымаюць мэты і задачы дзяржаўнага і грамадскага развіцця, звязваюць з імі свае жыццёвыя перспектывы;
валодаюць неабходнымі якасцямі (фізічнымі, асобаснымі, адукацыйнымі, прафесійнымі) для вырашэння задач эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага і культурнага развіцця краіны;
забяспечаны неабходнымі рэсурсамі і магчымасцямі для актыўнага ўключэння ў рашэнне задач развіцця грамадства.
А якія, на ваш погляд, рэсурсы і магчымасці неабходны для актыўнага ўключэння моладзі ў вырашэнне задач развіцця грамадства?

Правообладатель Народная асвета

2. Ці згодны вы з тым, што малады чалавек, які мае актыўную грамадзянскую пазіцыю:
   ведае і выконвае Канстытуцыю і законы сваёй краіны;
   прад'яўляе да сябе і іншых людзей высокія патрабаванні;
   умее адстойваць свае погляды і перакананні;
   прымае актыўны ўдзел у грамадскіх акцыях (мерапрыемствах па ахове прыроды, дапамозе ветэранам і інш.);
   добрасумленна адносіцца да вучобы, любой даручанай справы;
   добра ведае беларускія традыцыі, культуру, гісторыю;
   цікавіцца падзеямі, якія адбываюцца ў нашай краіне і за мяжой.
3. У чым, на ваш погляд, праяўляецца актыўная грамадзянская пазіцыя сучаснай беларускай моладзі? Ці важная яна сёння? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

**2. З «Еўрапейскай хартыі аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўні» (прынята Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад Еўропы. 10-я сесія. 21 мая 2003 г.)**

Для дасягнення рэальнага ўдзелу моладзі ў жыцці грамадства неабходна прадаставіць у распараджэнне моладзі пэўны набор інструментаў. Гэта прадугледжвае развіццё сістэмы навучання моладзі па пытаннях удзелу ў жыцці грамадства, пастаяннае інфармаванне яе, прадастаўленне сродкаў камунікацыі, падтрымку маладзёжных праектаў і прызнанне гатоўнасці маладых людзей прысвяціць сябе службе грамадству і бязвыплатнай працы. Удзел у жыцці грамадства можна лічыць паўнацэнным толькі ў тым выпадку, калі прызнаецца роля моладзі ў палітычных партыях, прафсаюзах і грамадскіх аб'яднаннях і, самае галоўнае, калі прыкладваюцца намаганні да таго, каб садзейнічаць фарміраванню маладзёжных аб'яднанняў з удзелам і сіламі саміх маладых людзей.

**!** Вылучыце найбольш важныя ўмовы актыўнага ўключэння моладзі ў жыццё грамадства. Прадоўжыце запаўненне табліцы.

| Умовы, якія забяспечваюцца грамадствам і дзяржавай | Умовы, якія залежаць ад моладзі |
|---|---|
| 1. Навучанне моладзі па пытаннях удзелу ў жыцці грамадства | 1. Атрыманне адукацыі<br>2. Адмова ад сацыяльнага ўтрымання |


Правообладатель Народная асвета

**3.** Маладзёжная палітыка з'яўляецца прыярытэтным напрамкам дзяржаўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. З 1996 г. у краіне рэалізуецца праграма «Моладзь Беларусі». У рамках гэтай праграмы прадугледжваецца вырашэнне наступных задач:

павышэнне адукацыйнага ўзроўню моладзі, яе гатоўнасці да працы;

патрыятычнае выхаванне маладых грамадзян, фарміраванне ў іх прававой і палітычнай культуры, матывацыі да свядомага, адказнага і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці краіны;

павышэнне якасці жыцця сельскай моладзі, зніжэнне ўзроўню міграцыі маладых грамадзян, якія працуюць у сельскіх населеных пунктах;

актывізацыя сацыяльна значнай дзейнасці дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў;

развіццё пазітыўных маладзёжных ініцыятыў, якія адпавядаюць ідэалогіі і напрамкам сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай дзяржавы;

фарміраванне здаровага спосабу жыцця, умацаванне здароўя моладзі;

удасканальванне сістэмы сацыяльнай абароны моладзі і маладой сям'і;

развіццё маладзёжнага турызму і міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва.

На аснове рэспубліканскай праграмы «Моладзь Беларусі» распрацоўваюцца рэгіянальныя праграмы.

?!
1. Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, падрыхтуйце паведамленне аб рэалізацыі праграмы «Моладзь Беларусі» ў вашым рэгіёне (вобласці, раёне, горадзе).
2. Якія прапановы вы ўнеслі б у план мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтай праграмы ў вашым рэгіёне.

**4.** Важнай састаўной часткай дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца стварэнне ўмоў для забеспячэння занятасці моладзі: садзейнічанне прафесійнай арыентацыі, прафесійнай падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы маладых грамадзян. Беларуская дзяржава гарантуе прадастаўленне першага працоўнага месца выпускнікам дзяржаўных устаноў, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю на бюджэтнай аснове.

Правообладатель Народная асвета

?! 1. Хутка вы закончыце школу і атрымаеце атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі. Але ўжо сёння вы павінны вызначыць свае прафесійныя (выбар будучай прафесіі) і адукацыйныя (выбар установы для працягу адукацыі) планы. Прааналізуйце свае прафесійныя і адукацыйныя планы з пазіцыі наступных пытанняў:

   Якую прафесію я хачу атрымаць?

   Якія асаблівасці гэтай прафесіі (патрабуемыя прафесійныя якасці, умовы працы, яе змест)?

   Ці адпавядаюць мае асабістыя асаблівасці (тэмперамент, характар, здольнасці) патрабаванням прафесіі?

   У якіх установах адукацыі (ВНУ, сярэдніх спецыяльных навучальных установах, прафтэхвучылішчах) можна атрымаць прафесію, якая мяне цікавіць?

   Якія патрэбы нашага рэгіёна (вобласці, раёна, горада) у спецыялістах выбранай мною прафесіі?

2. Прадастаўленне першага працоўнага месца выпускнікам дзяржаўных устаноў, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю на бюджэтнай аснове, забяспечваецца шляхам размеркавання маладых спецыялістаў пасля заканчэння навучальнай установы. Малады спецыяліст абавязаны адпрацаваць па месцы размеркавання 2 гады.

   Ацаніце факт размеркавання маладых спецыялістаў з пазіцыі:

   а) дзяржаўных інтарэсаў;

   б) інтарэсаў рэгіёна (вобласці, раёна, горада), установы, прадпрыемства, куды накіраваны малады спецыяліст;

   в) інтарэсаў самога маладога спецыяліста.

   Якія меры, на ваш погляд, дазволяць узгадніць і задаволіць інтарэсы ўсіх бакоў?

**5.** У ходзе апытання, праведзенага сярод моладзі, вывучаўся пункт погляду маладых людзей на тое, што дапамагае атрымаць добрую працу. Былі атрыманы наступныя адказы:

сувязі і знаёмствы;

наяўнасць высокай кваліфікацыі, ведаў;

ініцыятыўнасць, прадпрымальнасць;

атрыманне спецыяльнасці;

гатоўнасць працаваць з поўнай аддачай;

уменне ладзіць з начальствам;

дысцыплінаванасць, стараннасць, адказнасць.


Правообладатель Народная асвета

? 1. Што такое, у вашым разуменні, добрая праца?
2. Як вы самі адказалі бы на пытанне, што дапамагае атрымаць добрую працу? Сваё меркаванне аргументуйце.

**6.** На думку сацыёлагаў, паводзіны індывіда, групы людзей у большасці выпадкаў вызначаюцца характэрнымі для іх уяўленнямі аб жадаемым. Гэтыя ўяўленні, якія ўплываюць на выбар варыянтаў, сродкаў і мэт дзеянняў, называюцца каштоўнасцямі.

?! 1. Прывядзіце прыклады, якім чынам каштоўнасці (уяўленні аб жадаемым) могуць паўплываць на вызначэнне прафесійных і адукацыйных планаў выпускніка сярэдняй школы.
2. Якія каштоўнасці вызначаюць ваш адукацыйны і прафесійны выбар?
3. Правядзіце апытанне сярод старшакласнікаў вашай школы, сваіх бацькоў, бабуль і дзядуль, прапанаваўшы ім адказаць на пытанне: якія з ніжэйпералічаных паняццяў для вас найбольш значныя? *(Выберыце не больш за 3 варыянты адказу.)*

| | |
|---|---|
| Справядлівасць | Роўнасць |
| Стабільнасць | Уласнасць |
| Свабода | Добрая праца |
| Дастатак | Сям'я |
| Патрыятызм | Кар'ера |
| Правы чалавека | Прадпрымальнасць |
| Камфорт | Маральнасць |

Абагульніце і прааналізуйце вынікі апытання і адкажыце на наступныя пытанні:
1. Якія з паняццяў маюць аднолькавую значнасць для прадстаўнікоў розных пакаленняў?
2. Якія з паняццяў па-рознаму ацэньваюцца прадстаўнікамі розных пакаленняў? Чым гэта можна растлумачыць?
3. Якія каштоўнасці, на ваш погляд, у найбольшай меры садзейнічаюць прагрэсіўнаму развіццю сучаснага беларускага грамадства? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
4. Якія каштоўнасці ў першую чаргу неабходна фарміраваць у сучаснай моладзі, каб яна магла ўнесці свой уклад у станаўленне моцнай і квітнеючай Беларусі?

Правообладатель Народная асвета

## Дакументы і матэрыялы

**1.** Згодна з дакладам ААН 2009 г. аб чалавечым развіцці Беларусь займае 68 месца ў агульным рэйтынгу, уваходзіць у групу краін з высокім індэксам чалавечага развіцця і апярэджвае ўсе краіны СНД (Расія — 71 месца, Казахстан — 82, Арменія — 84, Украіна — 85, Азербайджан — 86, Малдова — 117). Індэкс чалавечага развіцця — гэта комплексны паказчык, які ўключае ў сябе паказчыкі дабрабыту: працягласць жыцця, даход на душу насельніцтва, які характарызуецца пакупной здольнасцю, узровень пісьменнасці насельніцтва.

Па пытанні аб дзяржаўнай дапамозе, якая выдзяляецца сацыяльным сектарам эканомікі (85,4 % ад агульнага аб'ёму дапамогі), Беларусь з'яўляецца бясспрэчным лідэрам у СНД (Украіна — 64 %, Арменія — 54,6 %, Азербайджан — 45,7 %, Казахстан — 32, 8 %).

У рэйтынгу краін па індэксу развіцця з улікам гендэрнага фактару Беларусь займае 52 месца сярод 182 краін і першае месца ў СНД (Расія — 59 месца, Казахстан — 66, Арменія — 68, Украіна — 69, Азербайджан — 73, Малдова — 97, Узбекістан — 99, Кыргызстан — 100).

Па ўзроўню адукацыі Беларусь апярэджвае многія дзяржавы, якія ўваходзяць у групу краін з вельмі высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу (Андора, Вялікабрытанія, Германія, Грэцыя, Ізраіль, Кіпр, Кувейт, Мальта, ААЭ, Партугалія, Швейцарыя, Японія), і знаходзіцца на другім месцы ў СНД, уступаючы толькі Казахстану.

? Якія асаблівасці беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі, на ваш погляд, абумоўліваюць вышэйуказаныя паказчыкі развіцця нашай краіны?

**2. З Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі» (у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2002 г. са змяненнямі і дапаўненнямі).**

*Артыкул 1.* Дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі

Дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі засноўваецца на наступных прынцыпах:

прыярытэтнасці адукацыі;

абавязковасці агульнай базавай адукацыі;


Правообладатель Народная асвета

ажыццяўлення пераходу да абавязковай агульнай сярэдняй адукацыі;

даступнасці дашкольнай, прафесійна-тэхнічнай і на конкурснай аснове сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;

пераемнасці і бесперапыннасці ўзроўняў і ступеняў адукацыі;

нацыянальна-культурнай асновы адукацыі;

прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, правоў чалавека, гуманістычнага характару адукацыі:

навуковасці;

экалагічнай накіраванасці адукацыі;

дэмакратычнага характару кіравання адукацыяй;

свецкага характару адукацыі.

У арганізацыях сістэмы адукацыі (далей — установы адукацыі) не дапускаюцца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія праследуюць палітычныя мэты, а таксама стварэнне і ананімная ці іншая дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая супярэчыць заканадаўству.

Установы адукацыі ў пытаннях выхаваўчай дзейнасці на аснове пісьмовых заяў законных прадстаўнікоў дзяцей (саміх паўналетніх навучэнцаў) у пазавучэбны час могуць узаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

?

1. Як вы разумееце прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі?
2. Што азначае выраз: «Адукацыя — не на ўсё жыццё, а праз усё жыццё»?

**3.** Дэмаграфічная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь накіравана на недапушчэнне далейшага пагаршэння дэмаграфічнай сітуацыі і фарміраванне перадумоў паляпшэння працэсаў узнаўлення насельніцтва ў краіне. У якасці асноўных задач забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі дзяржавы разглядаюцца наступныя:

Правообладатель Народная асвета

рэалізацыя сістэмы мер сацыяльна-эканамічнага, прававога, арганізацыйнага характару, накіраваных на павышэнне якасці жыцця насельніцтва;

рэалізацыя комплексу мер па паляпшэнні рэпрадуктыўнага здароўя насельніцтва, аховы здароўя маці і дзіцяці;

зніжэнне захворвання і смяротнасці насельніцтва за кошт мерапрыемстваў па фарміраванні здаровага спосабу жыцця і ўстараненні ўплыву неспрыяльных фактараў асяроддзя пражывання;

аптымізацыя ўнутраных і знешніх міграцыйных патокаў; прыцягненне і замацаванне спецыялістаў у сельскай мясцовасці;

зніжэнне смяротнасці насельніцтва ў выніку рэалізацыі мерапрыемстваў па:

а) зніжэнні злачынстваў, якія ўчыняюцца ў стане алкагольнага ап'янення і на бытавой глебе, узроўню дарожна-транспартнага траўматызму;

б) паляпшэнні ўмоў і аховы працы, зніжэнні ўзроўню вытворчага траўматызму;

в) актыўным інфармаванні насельніцтва аб магчымых небяспеках і пагрозах для жыцця і здароўя;

г) стварэнні бяспечных умоў жыццядзейнасці чалавека.

?!
1. Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ і іншыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленні аб мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Рэспубліцы Беларусь па забеспячэнні дэмаграфічнай бяспекі дзяржавы.
2. Якія мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі ў рэспубліцы, на ваш погляд, з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

**4.** Важнай характарыстыкай сучасных сацыяльных працэсаў з'яўляецца існаванне гендэрных праблем. Гендэрныя праблемы выкліканы дыскрымінацыяй па прымеце полу і адсутнасцю ў грамадстве роўных магчымасцей для мужчын і жанчын у рэалізацыі сваіх патрэб і інтарэсаў, у самарэалізацыі.

Гендэрныя праблемы ў розных краінах маюць сваю спецыфіку. Гэта звязана з асаблівасцямі культуры, гісторыі, рэлігіі, эканомікі і інш. На думку вучоных, да гендэрных праблем у нашай краіне можна аднесці перагружанасць жанчыны хатняй работай, яе большую ў параўнанні з муж-


Правообладатель Народная асвета

чынай занятасць выхаваннем дзяцей, наяўнасць некаторай няроўнасці ў доступе да тых пасад, якія звязаны з уладаю і кіраваннем.

Разам з тым, паводле даных Інстытута статыстыкі ЮНЕСКА, Беларусь увайшла ў лік 19 краін, якія сталі пазітыўным выключэннем па паказчыку гендэрнай роўнасці сярод асоб, якія атрымалі навуковую ступень пасля вышэйшай адукацыі. Гэтыя краіны маюць роўную або большую колькасць жанчын, чым мужчын, якія маюць вучоную ступень.

?

1. Якія гендэрныя праблемы характэрны для беларускага грамадства? Назавіце магчымыя шляхі іх вырашэння.
2. У сучасным свеце адной з важнейшых гендэрных праблем з'яўляецца праблема насілля ў сям'і. Якія, на ваш погляд, прычыны, праяўленні, наступствы і магчымыя шляхі вырашэння гэтай праблемы?

**5.** Паводле штогадовага даклада «Вядзенне бізнесу-2010» Міжнароднай фінансавай карпарацыі і Сусветнага банка Беларусь заняла 4 месца ў свеце сярод краін, якія найбольш актыўна ажыццяўляюць рэформы, накіраваныя на паляпшэнне дзелавога і інвестыцыйнага клімату, уключаючы спрашчэнне дзяржаўнага рэгулявання вядзення бізнесу.

Канферэнцыя ААН па гандлі і развіцці ў Аглядзе інвестыцыйнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь за 2009 г. адзначае, што рэформы, пачатыя ў нашай краіне ў 2007 г., відавочна і істотна знізілі ўскладзены на бізнес заканадаўчы і адміністрацыйны цяжар. Аб гэтым сведчаць спрашчэнне рэгулявання бізнесу, падатковай сістэмы для малых і сярэдніх прадпрыемстваў, а таксама новыя схемы заахвочвання па прыцягненні інвестыцый у высокатэхналагічныя сектары і найменш развітыя рэгіёны краіны.

У якасці прычын росту цікавасці замежных партнёраў да нашай краіны вылучаюцца геаграфічнае і геапалітычнае становішча, развітая транспартная інфраструктура, кваліфікаваная рабочая сіла, адносна нізкія расходы на размяшчэнне вытворчасці, стабільная сітуацыя ў краіне, а таксама высокі навукова-тэхнічны патэнцыял.

?!

1. У чым прычыны росту цікавасці замежных партнёраў да нашай краіны?

Правообладатель Народная асвета

2. Паляпшэнню дзелавога і інвестыцыйнага клімату ў рэспубліцы садзейнічаюць мерапрыемствы па лібералізацыі ўмоў эканамічнай дзейнасці. Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, дадатковую літаратуру, падрыхтуйце паведамленне аб змяненнях у дзяржаўным рэгуляванні бізнесу ў Беларусі.
3. Адной са стратэгічных задач эканамічнага развіцця Беларусі з'яўляецца максімальна поўнае выкарыстанне яе геаграфічнага становішча. Якія меры, на ваш погляд, будуць садзейнічаць паспяховаму рашэнню гэтай задачы?
4. Стратэгію беларускай дзяржавы па прыцягненні замежных інвестыцый вызначыў Прэзідэнт краіны А. Р. Лукашэнка: «Мы павінны супрацоўнічаць не проста з інвестарамі, а са стратэгічнымі партнёрамі, гатовымі развіваць эканоміку, яе ключавыя сектары і адначасова садзейнічаць фарміраванню сацыяльнай сферы».
   Што, на ваш погляд, павінна ўлічвацца пры разглядзе (адборы) замежных інвестыцыйных праектаў?

**6.** Аўтар тэрміна «інавацыя» аўстрыйскі эканаміст Йозэф Шумпетэр, вылучаючы змяненні ў якасці адрознай прыметы інавацый, яшчэ ў 1911 г. сфармуляваў пяць асноўных відаў змяненняў:

1. Выкарыстанне новай тэхнікі, новых тэхналагічных працэсаў або новага рыначнага забеспячэння вытворчасці (купля-продаж).
2. Укараненне прадукцыі з новымі якасцямі.
3. Выкарыстанне новай сыравіны.
4. Змяненні ў арганізацыі вытворчасці і яе матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.
5. З'яўленне новых рынкаў збыту.

**!** Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, падрыхтуйце паведамленне аб тым, якія віды інавацый характэрны для развіцця вашага рэгіёна (вобласці, раёна, горада).

**7.** Задачы развіцця беларускай навукі на сучасным этапе былі вызначаны Першым з'ездам вучоных Рэспублікі Беларусь (лістапад 2007 г.). У адпаведнасці з рашэннямі з'езда намаганні вучоных і інжынерна-тэхнічных работнікаў павінны быць сканцэнтраваны на дасягненні высокіх паказчыкаў устойлівага развіцця краіны па розных напрамках, у тым ліку:


Правообладатель Народная асвета

энергетычная бяспека;

харчовая і біябяспека;

ахова здароўя і лекавая бяспека;

экалагічная бяспека і ахова навакольнага асяроддзя;

навуковае суправаджэнне стварэння і развіцця высокатэхналагічных прадпрыемстваў і вытворчасцей у галінах прамысловасці (аўтамабіле-, трактара-, камбайна-, станкабудаванне, электроннае прыладабудаванне, вырабы радыё-, мікра-, нана-, СВЧ-электронікі, мікрасенсорыкі, лазернааптычнай і касмічнай тэхнікі, нанатэхналогіі, нанаматэрыялы, нанасістэмная тэхніка і абсталяванне);

інфармацыйныя і камунікацыйныя сістэмы і тэхналогіі;

адукацыя.

**!** Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, падрыхтуйце паведамленні аб дасягненнях беларускіх вучоных і ролі беларускай навукі ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця краіны.

**8.** Парк высокіх тэхналогій — гэта ўнікальнае спрыяльнае асяроддзе для развіцця высокіх тэхналогій у Рэспубліцы Беларусь. Мэтай яго стварэння з'яўляюцца павышэнне канкурэнтаздольнасці нацыянальных галін эканомікі, звязаных з выкарыстаннем высокіх тэхналогій, правядзенне распрацовак сучасных інфармацыйных тэхналогій і праграмнага забеспячэння, павелічэнне іх экспарту, а таксама прыцягненне ў гэтую сферу айчынных і замежных інвестыцый.

Парк створаны на падставе Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб Парку высокіх тэхналогій», падпісанага 22 верасня 2005 г. Тэрмін дзеяння спецыяльнага прававога рэжыму для Парка складае 15 гадоў. Сукупнасць эканамічных, сацыяльных і прававых ільгот для дзейнасці рэзідэнтаў Парка па шэрагу пазіцый пераўзыходзіць узровень, дасягнуты на сённяшні дзень у аналагічных Парках Заходняй і Усходняй Еўропы, Расіі, Індыі і Кітая.

Ажыццяўляючы дзейнасць ў рамках устаноўленага прававога рэжыму, рэзідэнты Парка вызваляюцца ад выплаты падаткаў на прыбытак, падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ), падатку на нерухомасць, ад падаткаў, збораў і іншых плацяжоў у рэспубліканскі бюджэт, дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя і пазабюджэтныя фонды, якія выплачваюцца з выручкі ад рэалізацыі тавараў.

Правообладатель Народная асвета

?! 1. Падрыхтуйце паведамленні аб Парках высокіх тэхналогій Заходняй і Усходняй Еўропы, Расіі, Індыі і Кітая. Якая задача гэтых Паркаў? Чаму яны так называюцца?
2. Рашэнню якіх задач сучаснага беларускага грамадства, на ваш погляд, будзе садзейнічаць дзейнасць Парка высокіх тэхналогій у Рэспубліцы Беларусь?

**9.** Спецыялісты мяркуюць, што ў XXI ст. агульнае энергаспажыванне на планеце падвоіцца. Сусветная супольнасць ужо зараз сур'ёзна заклапочана праблемай магчымага дэфіцыту энергарэсурсаў і пошукам найбольш эфектыўных крыніц энергіі. Нягледзячы на тое, што, па крайняй меры, у бліжэйшыя 20—30 гадоў вуглевадародная сыравіна захавае за сабой статус найбольш запатрабаванай крыніцы энергіі, непазбежны змяненні ў структуры вытворчасці энергіі, абумоўленыя як эканамічнымі (павышэнне цэн на нафту і газ і іх зменлівасць), так і прыродаахоўнымі фактарамі.

Будаўніцтва ў Беларусі АЭС дазволіць перабудаваць структуру паліўна-энергетычнага комплексу краіны ў напрамку выцяснення вуглевадароднага паліва, якое з'яўляецца каштоўнай хімічнай сыравінай, адрозніваецца адносна высокай вартасцю, а таксама з'яўляецца галоўнай, пастаянна ўзрастаючай крыніцай выкідаў вуглякіслага газу, што ў значнай ступені ўплывае на глабальнае пацяпленне. Адна з асноўных пераваг атамнай энергетыкі ў параўнанні з цеплавой — высокая каларыйнасць ядзернага паліва (уран), якая пераўзыходзіць на адзінку масы ў 2 млн разоў цеплату згарання арганічнага паліва (нафта, вугаль, газ).

Акрамя таго, будаўніцтва АЭС у нашай краіне дазволіць:

знізіць вартасць вытворчасці электрычнай энергіі на 40—50 % (пры прагназуемых цэнах на прыродны газ);

стварыць спрыяльныя ўмовы для экспарту электрычнай энергіі;

забяспечыць эканомію каля 1 млрд дол. США у год на імпарце прыроднага газу;

павысіць энергетычную бяспеку краіны;

паменшыць гадавыя пастаўкі прыроднага газу на 3—3,5 млрд куб. м;

скараціць выкіды «парніковых газаў» на 12—15 млн т.


Правообладатель Народная асвета

Поруч з развіццём атамнай энергетыкі вялікі патэнцыял для забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны маюць вадародная і сонечная энергетыка.

Вадародная энергетыка прадугледжвае шырокае выкарыстанне вадароду ў якасці энерганосьбіту для прымянення ў электрахімічных крыніцах току (паліўных элементах), дзе ККДз пераўтварэння хімічнай энергіі ў электрычную можа дасягаць 80 %. Валодаючы выключнай экалагічнай чысцінёй, вадародная энергетыка здольна рэвалюцыянізаваць сферу аўтамабілебудавання, бытавой энергетыкі і транспарту. Для навуковага забеспячэння развіцця вадароднай энергетыкі ў Беларусі ажыццяўляецца комплекс даследаванняў, накіраваных, у тым ліку, на праектаванне і вытворчасць узораў энергетычных установак на аснове паліўных элементаў, даследаванне мадыфікаваных паліўных сумясей з дабаўленнем вадароду для рухавікоў унутранага згарання, забеспячэнне бяспекі атрымання, захавання і ўтылізацыі вадароду і інш. Дальнейшаму развіццю энергетычнага сектара паслужыць плануемая распрацоўка і ўкараненне сістэм атамна-вадароднай энергетыкі, якая прадугледжвае вытворчасць на базе ядзерных рэактараў не толькі электраэнергіі, але і вадароду.

Значнымі перспектывамі валодаюць навуковыя распрацоўкі, якія забяспечваюць пераўтварэнне энергіі сонца. Прагназуецца, што з развіццём тэхналогіі вытворчасці сонечных элементаў і павелічэннем іх энергетычнай эфектыўнасці сонечная энергетыка зойме належнае месца ў сістэме энергазабеспячэння краіны.

?

1. Чаму пошук найбольш эфектыўных крыніц энергіі з'яўляецца адной з актуальных праблем сучаснай навукі?
2. У чым, на ваш погляд, заключаюцца перавагі і недахопы вуглевадароднага паліва? Якія перавагі атамнай, вадароднай і сонечнай энергетыкі?

**10. З Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» (у рэдакцыі Закона ад 31 кастрычніка 2002 г.).**

Гэты Закон рэгулюе праваадносіны ў галіне правоў чалавека і грамадзяніна на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, зыходзячы з:

Правообладатель Народная асвета

права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад адносін да рэлігіі;

роўнасці рэлігій перад законам;

прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа;

духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі;

неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангелічна-лютэранскай царквы, іудаізму і ісламу;

неабходнасці садзейнічання дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання.

*Артыкул 4.* Права на свабоду сумлення

Кожны мае права на свабоду выбару атэістычных ці рэлігійных перакананняў, а менавіта: самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, аднаасобна ці сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію ці не вызнаваць ніякай.

*Артыкул 5.* Права на свабоду веравызнання

Кожны мае права свабодна выбіраць, мець, мяняць, выказваць і распаўсюджваць рэлігійныя перакананні і дзейнічаць у адпаведнасці з імі, удзельнічаць у выкананні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам.

Ніхто не абавязаны паведамляць аб сваіх адносінах да рэлігіі і не можа падвяргацца якому-небудзь прымушэнню пры вызначэнні сваіх адносін да рэлігіі, да вызнання той ці іншай рэлігіі, да ўдзелу ці няўдзелу ў дзейнасці рэлігійных арганізацый.

Бацькі ці асобы, якія іх замяняюць, па ўзаемнай згодзе маюць права выхоўваць сваіх дзяцей у адпаведнасці са сваімі ўласнымі адносінамі да рэлігіі. Дзяржава не можа ўмешвацца ў выхаванне дзіцяці, заснаванае на пэўным рэлігійным светапоглядзе бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць, за выключэннем выпадкаў, калі прымушэнне да рэлігійных дзеянняў пагражае непасрэдна жыццю ці здароўю дзіцяці, парушае яго законныя правы.

*Артыкул 6.* Раўнапраўе рэлігій

Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам.

Ідэалогія рэлігійных арганізацый не можа ўстанаўлівацца як абавязковая для грамадзян.


Правообладатель Народная асвета

*Артыкул 8.* Дзяржава і рэлігія

Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Дзяржава не ўскладвае на рэлігійныя арганізацыі выкананне якіх-небудзь дзяржаўных функцый, не ўмешваецца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый, калі яна не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Рэлігійныя арганізацыі маюць права ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, а таксама выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Рэлігійныя арганізацыі не ўдзельнічаюць у дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, і не аказваюць ім фінансавай і іншай падтрымкі.

У месцах богаслужэнняў не дапускаюцца выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі, правядзенне сходаў, мітынгаў, перадвыбарнай агітацыі і іншых мерапрыемстваў палітычнага характару, а таксама выступленні, заклікі, якія абражаюць прадстаўнікоў органаў дзяржаўнай улады, службовых асоб і асобных грамадзян.

Дзяржава садзейнічае ўстанаўленню адносінаў цярпімасці і павагі паміж веруючымі і няверуючымі грамадзянамі, рэлігійнымі арганізацыямі розных веравызнанняў.

Дзяржава можа будаваць свае ўзаемаадносіны з рэлігійнымі аб'яднаннямі шляхам заключэння з імі пагадненняў у адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 9.* Адукацыя і рэлігія

Нацыянальная сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь мае свецкі характар і не мае на мэце фарміраванне тых ці іншых адносін да рэлігіі.

Грамадзяне маюць права на роўныя магчымасці доступу да нацыянальнай сістэмы адукацыі незалежна ад іх адносін да рэлігіі.

Ва ўстановах адукацыі не дапускаюцца стварэнне і ананімная ці іншая дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая супярэчыць заканадаўству.

Правообладатель Народная асвета

Установы адукацыі ў пытаннях выхаваўчай дзейнасці на падставе пісьмовых заяў бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць (саміх паўналетніх навучэнцаў), у пазавучэбны час могуць узаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Рэлігійныя арганізацыі, зарэгістраваныя ў парадку, устаноўленым гэтым Законам, маюць права ў адпаведнасці са сваімі статутамі ствараць для рэлігійнай адукацыі дзяцей і дарослых навучальныя групы і нядзельныя рэлігійныя школы, выкарыстоўваючы для гэтага памяшканні, якія ім належаць і (ці) прадастаўляюцца ім у карыстанне, акрамя памяшканняў, якія належаць дзяржаўным установам адукацыі.

?!
1. Назавіце асноўныя прынцыпы канфесійнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Якім чынам у прэамбуле Закона вызначана роля розных канфесій у жыцці беларускага грамадства? Праілюструйце гэтыя палажэнні прыкладамі з курса гісторыі Беларусі.
3. Якія прававыя асновы ўзаемаадносін дзяржавы і рэлігіі, адукацыі і рэлігіі?

**11. З Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» (7 снежня 2009 г.).**

*Артыкул 16.* Садзейнічанне рэалізацыі права моладзі на працу

Дзяржава рэалізуе сістэму мер, накіраваных на садзейнічанне ў прафесійнай арыентацыі і працаўладкаванні моладзі, у тым ліку па эканамічнай, арганізацыйнай, прававой падтрымцы прадпрымальніцкай дзейнасці моладзі.

Дзяржава забяспечвае моладзі прадастаўленне першага рабочага месца і іншыя гарантыі ў галіне садзейнічання занятасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб працы.

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае сістэма інфармавання моладзі, у тым ліку безработнай, аб прафесіях (спецыяльнасцях), запатрабаваных на рынку працы, магчымасцях атрымання адукацыі па ім, працаўладкаванні і часовай працоўнай занятасці, а таксама ажыццяўляецца прафесійнае на-


Правообладатель Народная асвета

вучанне безработнай моладзі па запатрабаваных на рынку працы прафесіях (спецыяльнасцях).

Для далучэння моладзі да грамадска карыснай працы і атрымання ёю працоўных навыкаў арганізуецца часовая працоўная занятасць моладзі, якая навучаецца ва ўстановах адукацыі, у вольны ад вучобы час.

*Артыкул 17.* Дзяржаўная падтрымка моладзі ў атрыманні адукацыі

У Рэспубліцы Беларусь гарантуецца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў адпаведнасці са здольнасцямі і бясплатнасць на конкурснай аснове сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў дзяржаўных установах адукацыі.

Дзяржава аказвае падтрымку ў атрыманні адукацыі, стварае і забяспечвае для гэтага неабходныя ўмовы, у тым ліку шляхам:

фінансавання са сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў дзяржаўных устаноў адукацыі;

стварэння ўмоў для атрымання адукацыі з улікам нацыянальных традыцый, індывідуальных патрэбнасцей, здольнасцей і запытаў моладзі;

прадастаўлення магчымасці выбару ўстаноў адукацыі, форм атрымання адукацыі;

стварэння спецыяльных умоў для атрымання адукацыі маладымі грамадзянамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

устанаўлення мер сацыяльнай абароны, уключаючы стыпендыяльнае забеспячэнне, прадастаўленне адпачынкаў, забеспячэнне месцамі ў інтэрнатах або пакрыццё расходаў па найму жылля ў час вучобы;

садзейнічання ў прадастаўленні на льготных умовах крэдытаў для атрымання вышэйшай адукацыі на платнай аснове ва ўстаноўленным законам парадку.

? Якія ўмовы рэалізацыі правоў моладзі на працу і атрыманне адукацыі гарантуе заканадаўства Рэспублікі Беларусь?

Правообладатель Народная асвета

## Урок абагульнення

1. Дайце азначэнні паняццяў: *дэмаграфічная бяспека, дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты, сацыяльна арыентаваная рынчная эканоміка, высокія тэхналогіі.*

2. Ахарактарызуйце сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва нашай краіны.

3. Раскрыйце сутнасць паняццяў: *сацыяльная абарона, устойлівае развіццё, інавацыйны шлях развіцця, свабода сумлення і веравызнання, энергетычная бяспека.*

4. Назавіце асноўныя рысы беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця. Якія прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у пачатку XXI ст.? Назавіце асноўныя фактары ўстойлівага развіцця нашай краіны.

5. Якія асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе? Якія фактары забяспечваюць паспяховае інавацыйнае развіццё нашай краіны? Ахарактарызуйце ўклад навукі і адукацыі ў інавацыйнае развіццё краіны.

6. Канкрэтызуйце прыкладамі вывад: «Рэспубліка Беларусь — тэрыторыя міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды».

7. Якая роля моладзі ў ажыццяўленні палітыкі беларускай дзяржавы?

8. Выкарыстоўваючы прэзентацыю, падрыхтаваную ў ходзе вывучэння тэмы 3, ахарактарызуйце дзейнасць беларускай дзяржавы па павышэнні ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва.

9. Сістэматызуйце свае веды аб палітыцы беларускай дзяржавы на сучасным этапе. Запоўніце табліцу.

| Напрамкі палітыкі | Задачы | Прыярытэтныя напрамкі дзейнасці дзяржавы | Вынікі дзейнасці дзяржавы |
|---|---|---|---|
| Дэмаграфічная | | | |
| Рэгіянальная | | | |
| Нацыянальная | | | |
| Канфесійная | | | |


Правообладатель Народная асвета

*Працяг*

| Напрамкі палітыкі | Задачы | Прыярытэтныя напрамкі дзейнасці дзяржавы | Вынікі дзейнасці дзяржавы |
|---|---|---|---|
| Палітыка ў галіне культуры | | | |
| Палітыка ў галіне аховы здароўя | | | |
| Палітыка ў галіне фізічнай культуры, спорту і турызму | | | |
| Маладзёжная | | | |

Правообладатель Народная асвета

# Тэма 4
# Беларусь у сучасным свеце

## § 19. Аблічча сучаснага свету

***Успомніце.*** **1.** У чым сутнасць фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння гісторыі? **2.** Што такое цывілізацыя?

**Разнастайнасць сучаснага свету.** Сучасны свет характарызуецца незвычайнай разнастайнасцю. Розныя яго часткі — рэгіёны, краіны — адрозніваюцца па ўзроўню сацыяльна-эканамічнага і навукова-тэхнічнага развіцця, маюць культурна-гістарычныя і іншыя асаблівасці. У абліччы сучаснага свету прадстаўлена амаль што ўся гісторыя чалавецтва. Рэшткі першабытнаабшчыннага ладу выяўляюцца, напрыклад, у жыццядзейнасці некаторых аўстралійскіх абарыгенаў, у той час як развітыя краіны знаходзяцца ўжо на стадыі постіндустрыяльнага грамадства.

Да нядаўняга часу асноўнай структурнай часткай свету з'яўлялася нацыянальная дзяржава, якая была аддзелена ад іншых дзяржаў межамі і мела характэрныя для яе культурныя традыцыі, мову, палітычнае ўпарадкаванне, пераважаючы спосаб вытворчасці, што склаліся гістарычна. Заснаваны на прыярытэце нацыянальнай дзяржавы сусветны парадак праіснаваў амаль да сярэдзіны 70-х гг. ХХ ст., калі пачалася эпоха глабалізацыі. (Аб ёй гаворка пойдзе ў § 23.)

Сярод падыходаў, якія тлумачаць ход гістарычнага развіцця і звязаную з ім разнастайнасць сучаснага свету, поруч з ужо вядомымі вам *фармацыйным* і *цывілізацыйным*, можна вылучыць *стадыяльны* падыход. Так, амерыканскі сацыёлаг У. Растоу прапанаваў дзяліць гісторыю чалавецтва на 5 стадый: 1) традыцыйнае грамадства, якое вылучаецца надзвычайнай павольнасцю развіцця, нізкім узроўнем прадукцыйнасці працы, перавагай аграрнага сектара ў эканоміцы; 2) «пераходнае грамадства», у якім ажыццяўляецца пераход да больш дынамічнай, капіталістычнай вытворчасці; 3) «перыяд зруху», які характарызуецца прамысловымі рэвалюцыямі і пачаткам індустрыялізацыі; 4) «перыяду сталасці», калі заканчваецца індустрыялізацыя і з'яўляюцца высока-


Правообладатель Народная асвета

развітыя ў эканамічных адносінах краіны; 5) «эра высокага ўзроўню масавага спажывання», характэрная для найбольш перадавых сучасных краін.

**Фактары разнастайнасці сучаснага свету. Сучасныя цывілізацыі.** Фармацыйны і стадыяльны падыходы акцэнтуюць увагу на адзінстве гістарычнага развіцця свету, прычым падставаю гэтага адзінства прызнаецца або спосаб эканамічнай вытворчасці (фармацыйны падыход), або ўзровень навукова-тэхнічнага развіцця і дабрабыту грамадства (стадыяльны падыход). Цывілізацыйны падыход разглядае ў якасці фактараў дыферэнцыяцыі краін і народаў існаванне незалежных адна ад адной культурна-гістарычных супольнасцей, кожная з якіх характарызуецца непаўторным наборам духоўных, рэлігійных і культурных рыс.

Сярод канцэпцый, якія рэалізуюць цывілізацыйны падыход, асаблівую цікавасць выклікаюць тэорыі О. Шпэнглера (1880—1936), П. А. Сарокіна (1889—1968), А. Тойнбі (1889—1975), С. Ханцінгтана (1927—2008). У канцэпцыі нямецкага філосафа О. Шпэнглера гістарычны працэс разглядаецца як чарада змяняючых адна другую культур. Культуры, як жывыя арганізмы, маюць свой лёс і перажываюць стадыі ўзнікнення, сталасці, старасці і завядання. Сапраўднымі творцамі сусветнай гісторыі з'яўляюцца такія культуры, якія дасягнулі навышэйшага росквіту і ўздыму. Да іх О. Шпэнглер адносіць егіпецкую, вавілонскую, індыйскую, кітайскую, «магічную» (араба-візантыйскую), «апалонаўскую» (грэка-рымскую) і фаўстаўскую (заходнееўрапейскую) культуры. *Культуры, якія цалкам сябе вычарпалі*, ён называе *цывілізацыямі*. Цывілізацыі як заключны этап развіцця культуры характарызуюцца, па Шпэнглеру, заняпадам мастацтва, рэлігіі, творчасці і перавагай рацыяналізму, атэізму, панаваннем навукова-тэхнічнага прагрэсу, абязлічваннем чалавека. У сваёй кнізе «Канец Еўропы» (1918—1922) О. Шпэнглер прыходзіць да вываду аб хуткай гібелі заходнееўрапейскай культуры, якая ўступіла ў пачатку XX ст. у цывілізацыйную фазу.

Класіфікацыя цывілізацый, распрацаваная расійска-амерыканскім сацыёлагам П. А. Сарокіным, заснавана на сістэме пануючых у кожнай з іх каштоўнасцей культуры. У залежнасці ад канкрэтнага спалучэння гэтых каштоўнасцей ён вылучае наступныя тыпы культуры: *ідэяцыйная*, у асно-

Правообладатель Народная асвета

ву якой пакладзена рэлігійная вера (культура брахманскай Індыі, Сярэдневякоўя, будысцкая культура); *ідэалістычная*, якая дапускае адзінства рэлігійных і рацыянальна-пачуццёвых каштоўнасцей (культура Антычнасці), *пачуццёвая*, або *рэалістычная* (культура сучаснага Захаду).

Амерыканскі вучоны С. Ханцінгтан разглядае цывілізацыю як шырокамаштабную культурную супольнасць, якая вызначаецца наяўнасцю шэрагу агульных рыс (мова, гісторыя, рэлігія, звычаі, інстытуты), а таксама адпаведнай самаідэнтыфікацыяй людзей. Следам за англійскім філосафам і гісторыкам А. Тойнбі ён адводзіць рэлігійнаму пачатку галоўную ролю ў якасці крытэрыя прыналежнасці да той ці іншай цывілізацыі. Асноўнымі цывілізацыямі сучаснасці С. Ханцінгтан лічыць англа-саксонскую, каталіцка-пратэстанцкую, славяна-праваслаўную, канфуцыянскую (кітайскую), японскую, мусульманскую, лацінаамерыканскую і афрыканскую. Наяўнасць цывілізацыйных разломаў, сцвярджае С. Ханцінгтан, можа прывесці да небяспечных канфліктаў; самыя сур'ёзныя з іх вынікаюць з сутыкнення заходняй, мусульманскай і канфуцыянскай цывілізацый.

**Геапалітычны статус Рэспублікі Беларусь.** Геапалітычны статус нашай краіны характарызуецца яе знаходжаннем на стыку паміж заходнееўрапейскай і славяна-праваслаўнай цывілізацыямі. З аднаго боку, вялікая выгада для краіны — знаходзіцца на мяжы цывілізацый. Гэта садзейнічае фарміраванню полікультурнага грамадства, якое ўключае ў сябе разнастайнасць рэлігій, вераванняў, нацыянальнасцей, звычаяў, моў і дыялектаў, мастацкіх і літаратурных стыляў, фальклору. Полікультурнае грамадства закладвае асновы нацыянальнай і моўнай талерантнасці, верацярпімасці, павагі да іншых народаў. З другога боку, у полікультурным грамадстве існуе небяспека канфліктаў, выкліканых непадабенствам культурных тыпаў людзей, якія ў ім жывуць.

***Геапалітыка*** (ад грэч. *gē* — Зямля, *politike* — палітыка) — гэта тэорыя, якая сцвярджае залежнасць палітыкі дзяржавы ад геаграфічных фактараў (клімат, прыродныя рэсурсы, тэрыторыя, насельніцтва і інш.), або вучэнне аб геаграфічнай абумоўленасці палітычных з'яў. Геапалітыка як навуковая дысцыпліна складваецца на мяжы XIX—XX стст. у выніку асэнсавання і аналізу ўпарадкавання свету ва ўмовах праціборства асноўных цэнтраў сілы, якія вядуць


Правообладатель Народная асвета

барацьбу за падзел сфер уплыву. Тэрмін *геапалітыка* ўвёў шведскі гісторык і палітык Р. Чэлен (1864—1922), які разглядаў дзяржаву як *геаграфічны арганізм*. У апошні час геапалітыка ўсё больш канцэнтруе ўвагу на ўліку не толькі геаграфічных, але і звязаных з імі эканамічных, нацыянальных, ваенных і іншых фактараў, якія ўплываюць на расстаноўку палітычных сіл на міжнароднай арэне.

У пачатку XXI ст. геапалітычны малюнак свету характарызуецца *шматполюснасцю (поліцэнтрычнасцю)*, г. зн. наяўнасцю шматлікіх полюсаў (цэнтраў), вакол якіх канцэнтруюцца палітычныя, ваенна-стратэгічныя, эканамічныя, культурныя інтарэсы ўдзельнікаў сусветнага працэсу. Асноўная функцыя геапалітыкі заключаецца ў пошуку дзяржавай узаемавыгадных саюзнікаў і партнёраў, а таксама напрамкаў і рэгіёнаў распаўсюджвання свайго ўплыву.

Беларусь па свайму геаграфічнаму становішчу знаходзіцца ў цэнтры Еўропы і з’яўляецца як бы звязуючым звяном паміж Расіяй і астатняй Еўропай. Тэрыторыя нашай краіны характарызуецца ўнутранай спаянасцю і кампактнасцю. Працягласць тэрыторыі з поўначы на поўдзень складае 560 км, з захаду на ўсход — 650 км. Рэспубліка Беларусь мяжуе з пяццю краінамі, тры з якіх — Літва, Латвія і Польшча — уваходзяць у склад Еўрапейскага Саюза (ЕС). На поўначы і ўсходзе Беларусь мяжуе з Расійскай Федэрацыяй, на поўдні — з Украінай, на захадзе — з Польшчай, на паўночным захадзе — з Латвіяй і Літвой. Агульная працягласць меж складае 2969 км.

У геапалітычным аспекце Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні транспартных шляхоў з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход. На захад і поўнач ад нашай краіны знаходзяцца краіны ЕС (Польшча, Чэхія, Славакія, Венгрыя, краіны Балтыі), на поўдзень ад нас — краіны Чарнаморскага басейна (Украіна, Малдова, Румынія, Балгарыя, Турцыя), а на ўсход — Расія. Такім чынам, Рэспубліка Беларусь з’яўляецца транзітным калідорам для энерганосьбітаў, аўтамабільнага транспарту, які злучае паміж сабой Балтыйскі і Чарнаморскі рэгіёны, Расію з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, а таксама еўрапейскія краіны і Цэнтральную Азію. Такое становішча з’яўляецца важным геастратэгічным рэсурсам Беларусі, але разам з тым садзейнічае абвастрэнню ў рэспубліцы праблемы нелегальнай міграцыі з афраазіяцкіх

Правообладатель Народная асвета




Дзяржаўныя межы Рэспублікі Беларусь

краін, якая можа пахіснуць канфесійную і этнічную стабільнасць у грамадстве. Акрамя таго, вялікі паток аўтамабільнага транспарту праз Беларусь вядзе да забруджвання атмасфернага паветра, што патрабуе дадатковай увагі да аховы навакольнага асяроддзя. Другой асаблівасцю геаграфічнага становішча Беларусі з'яўляецца адсутнасць выхаду да мора, у сувязі з чым узнікае неабходнасць супрацоўніцтва з краінамі Балтыйскага рэгіёна, Расіяй і Украінай з мэтай выкарыстання іх марскіх партоў.

У эканамічных адносінах Беларусь арыентавана на высокаразвітыя ў навукова-тэхнічных адносінах сучасныя галіны машынабудавання, хімічнай і электроннай прамысловасці. Аднак недахоп сыравіны і энерганосьбітаў абумоўлівае патрэбу ў рознабаковым або, як кажуць, шматвектарным геаэканамічным партнёрстве. З геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь вынікае перш за ўсё неабходнасць развіцця адносін з Расійскай Федэрацыяй. Расія забяспечвае Беларусь энерганосьбітамі і некаторымі іншымі важнымі відамі прадукцыі, а таксама з'яўляецца галоўным рынкам


Правообладатель Народная асвета

збыту беларускай прадукцыі. Акрамя таго, праз Беларусь праходзіць каля 80 % расійскіх перавозак у краіны ЕС.



Міжнародныя аўтаперавозкі

У ваенна-стратэгічных адносінах Рэспубліка Беларусь выступае за захаванне добрасуседскіх адносін з усімі краінамі. У той жа час існуе неабходнасць пастаяннага павышэння баяздольнасці арміі ў мэтах забеспячэння належнай абараназдольнасці краіны. Беларусь удзельнічае ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), з'яўляецца членам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) і іншых падобных міжнародных арганізацый. Наша краіна добраахвотна адмовілася ад статуса ядзернай дзяржавы і з канца 1996 г. фармальна і фактычна з'яўляецца бяз'ядзернай зонай, а таксама ўдзельніцай усіх дамоўленасцей у сферы нераспаўсюджвання зброі масавага знішчэння: Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі, Канвенцыі аб забароне хімічнай зброі, Канвенцыі аб забароне біялагічнай і таксічнай зброі, Дагавора аб усёабдымнай забароне ядзерных выпрабаванняў.

***Знешняя палітыка дзяржавы*** — гэта агульны курс дзяржавы за межамі яе тэрыторыі, накіраваны на рэаліза-




Транспартны калідор Новая Гута на адной з важных транспартных артэрый Еўропы

Правообладатель Народная асвета

цыю нацыянальных інтарэсаў. У сферу нацыянальных інтарэсаў любой дзяржавы ўваходзяць забеспячэнне нацыянальнай бяспекі як асновы ўнутранай стабільнасці дзяржавы, яе надзейнай абараназдольнасці, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці, а таксама нацыянальныя эканамічныя інтарэсы, зацікаўленасць у падтрыманні сусветнага парадку. З моманту набыцця незалежнасці Рэспубліка Беларусь прыступіла да правядзення самастойнай знешняй палітыкі, накіраванай на плённае ўключэнне краіны ў сусветныя палітычныя і эканамічныя працэсы.

Стратэгічная задача Рэспублікі Беларусь у знешняй палітыцы заключаецца ў наладжванні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з рознымі рэгіёнамі свету. У знешняй палітыцы Рэспубліка Беларусь арыентуецца на прыярытэт агульнапрызнаных норм міжнароднага права. Важным прынцыпам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца *шматвектарнасць,* якая азначае развіццё супрацоўніцтва з усімі рэгіёнамі свету. Асноўныя геапалітычныя арыенціры Беларусі ўключаюць цеснае эканамічнае супрацоўніцтва і знешнепалітычнае партнёрства з Расіяй і іншымі краінамі СНД, узаемавыгадныя сувязі з Еўрапейскім Саюзам, пошук новых эканамічных партнёраў, далейшае развіццё эканамічнага і іншага супрацоўніцтва з Кітаем, краінамі Блізкага і Сярэдняга Усходу, Лацінскай Амерыкай, Індыяй, Афрыкай.

Асаблівая роля ў знешнепалітычным і знешнеэканамічным супрацоўніцтве адводзіцца Расіі і краінам СНД, што тлумачыцца прычынамі ваенна-стратэгічнага характару, а таксама эканамічнай выгадай (зняцце мытных бар'ераў, выкарыстанне ўнутраных рынкаў гэтых краін для збыту беларускай прадукцыі).

Рэспубліка Беларусь нацэлена на ўсебаковы ўдзел у агульнасусветным працэсе ў якасці самастойнага і паўнапраўнага суб'екта міжнародных адносін, на пабудову раўнапраўнага партнёрства па ўсіх напрамках і ва ўсіх рэгіёнах.

?!

1. У чым заключаецца разнастайнасць сучаснага свету? Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі.
2. Назавіце стадыі грамадскага развіцця, вылучаныя У. Растоу. Выкарыстоўваючы веды па гісторыі, вызначце храналагічныя рамкі гэтых стадый.


Правообладатель Народная асвета

3. Якія фактары, на ваш погляд, вызначаюць разнастайнасць сучаснага свету? Свой адказ аргументуйце.
4. Ацаніце наступныя пункты гледжання аб фактарах грамадскага развіцця:
   а) вызначальны фактар грамадскага развіцця — тэхніка і тэхналогія;
   б) геаграфічныя ўмовы вызначаюць характар дзейнасці людзей і развіццё грамадства;
   в) развіццё грамадства вызначаецца матэрыяльнымі ўмовамі, змяненнямі ў вытворчасці.
   Што, на ваш погляд, з'яўляецца вызначальным фактарам грамадскага развіцця?
5. Што такое геапалітыка? Ахарактарызуйце геапалітычнае становішча нашай краіны. Дайце яму ацэнку. Якія асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь абумоўлены яе геапалітычным статусам?
6. Ці згодны вы са сцверджаннем, што геапалітычнае становішча — важны стратэгічны рэсурс Рэспублікі Беларусь? Сваю думку аргументуйце. Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, прывядзіце прыклады таго, як беларуская дзяржава выкарыстоўвае сваё геаграфічнае становішча ў нацыянальных інтарэсах.

## § 20. Сістэма міжнародных адносін

***Успомніце.*** Выкарыстоўваючы веды па сусветнай гісторыі, ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі развіцця міжнародных адносін у другой палове XX — пачатку XXI ст.

**Паняцце і віды міжнародных адносін.** Пачынаючы з глыбокай старажытнасці і аж да цяперашняга часу міжнародныя адносіны займаюць найважнейшае месца ў жыцці ўсіх краін і народаў. Сёння яны складваюцца ў выніку ўзаемадзеяння дзяржаў, якія знаходзяцца на розных этапах эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця.

***Міжнародныя адносіны*** — гэта сукупнасць палітычных, эканамічных, ідэалагічных, прававых, дыпламатычных, ваенных, культурных і іншых сувязей паміж дзяржавамі, арганізацыямі, народамі і асобнымі асобамі.

Неад'емнай часткай міжнародных адносін з'яўляецца *міжнароднае права* як сістэма дагаворных, юрыдычна за-

Правообладатель Народная асвета

мацаваных норм і прынцыпаў, якія рэгулююць адносіны паміж дзяржавамі і іншымі ўдзельнікамі (суб'ектамі) міжнародных адносін.

Віды міжнародных адносін розняцца:

па сферах грамадскага жыцця (палітычныя, эканамічныя, ваенна-стратэгічныя, культурныя, ідэалагічныя міжнародныя адносіны);

па ўдзельніках (міждзяржаўныя адносіны, міжпартыйныя адносіны, узаемныя адносіны міжнародных арганізацый, транснацыянальных карпарацый);

па расстаноўцы сіл (можна казаць аб розных станах міжнародных адносін: шматполюсны свет, двухполюсны (біпалярны) свет з дамінаваннем дзвюх дзяржаў або дзвюх сістэм дзяржаў; аднаполюсны свет);

па ступені напружанасці міжнародных адносін (мірнае суіснаванне, супрацоўніцтва, недалучэнне, «халодная вайна», вайна, а таксама стан стабільнасці і нестабільнасці, даверу і варожасці, супрацоўніцтва і канфлікту).

**Асноўныя міжнародныя арганізацыі.** *Міжнародныя арганізацыі* ствараюцца ў эканамічнай, палітычнай, культурнай, ваеннай галінах. Яны могуць быць міжурадавымі і няўрадавымі, а таксама змешанага тыпу, куды ўваходзяць і ўрадавыя структуры, і грамадскія арганізацыі. Першай міжнароднай арганізацыяй прынята лічыць *Сусветны паштовы саюз (СПС)*, створаны ў 1874 г.



Будынак ААН у Нью-Ёрку

Калі ў пачатку XX ст. існавала толькі 20 міжурадавых і каля 200 няўрадавых міжнародных арганізацый, то ў цяперашні час іх адпаведна каля 300 і больш за 2500.

Вядучую ролю ў сістэме міжнародных адносін адыгрывае *Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)*. Яна з'яўляецца глабальнай арганізацыяй, якая налічвае 192 дзяржавы-члены (павод-


Правообладатель Народная асвета

ле даных на 2009 г.). Афіцыйна ААН існуе з 24 кастрычніка 1945 г. Гэты дзень штогод адзначаецца як Дзень ААН.

Мэтамі ААН выступаюць: падтрыманне міждзяржаўнага міру і бяспекі; развіццё сяброўскіх адносін паміж нацыямі; ажыццяўленне супрацоўніцтва ў вырашэнні міжнародных праблем; узгадненне дзеянняў нацый у дасягненні агульных мэт.

ААН у сваёй дзейнасці кіруецца наступнымі прынцыпамі: суверэнная роўнасць усіх членаў; вырашэнне спрэчак мірнымі сродкамі; устрыманне ад пагрозы сілай або прымянення сілы супраць любой дзяржавы. Дзяржавы павінны аказваць ААН усялякую дапамогу ў дзеяннях, якія прадпрымаюцца ёю ў адпаведнасці са Статутам. Статут не дае ААН права на ўмяшанне ў справы, якія ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю якой бы то ні было дзяржавы.

Структура ААН уключае шэсць галоўных органаў: Генеральную Асамблею, Савет Бяспекі, Эканамічны і Сацыяльны Савет, Савет па апецы, Міжнародны суд і Сакратарыят. У структуры ААН дзейнічае таксама 15 спецыялізаваных устаноў.

Сярод міждзяржаўных аб'яднанняў, у якія ўваходзіць наша краіна, важная роля належыць СНД і Саюзнай дзяржаве Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. 8 снежня 1991 г. кіраўнікі Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіны падпісалі Пагадненне аб стварэнні *Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)*. 21 снежня 1991 г. у г. Алматы кіраўнікі 11 суверэнных дзяржаў (Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана, Украіны) падпісалі Пратакол да гэтага Пагаднення, у якім падкрэслілі, што ўтвараюць СНД на раўнапраўных пачатках. Месца знаходжання Выканаўчага камітэта СНД — Мінск, Міжпарламенцкай Асамблеі СНД — Санкт-Пецярбург.

У 1999 г. быў падпісаны *Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.* У рамках Саюзнай дзяржавы дзейнічаюць Вышэйшы Дзяржаўны Савет, Савет Міністраў, Пастаянны Камітэт, Парламенцкі Сход. Утвораны Пагранічны і Мытны камітэты, Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы.

Правообладатель Народная асвета




Садружнасць Незалежных дзяржаў заснавана
на пачатках суверэннай роўнасці ўсіх яе членаў

Беларусь разам з Расіяй, Казахстанам, Кыргызстанам і Таджыкістанам уваходзіць у склад *Еўразійскага эканамічнага супольніцтва (ЕўрАзЭС)*, утворанага ў 2000 г.

Вялікае значэнне ў сучасным свеце адыгрываюць *ваенна-палітычныя* саюзы. У 1949 г. была створана *Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавора* — НАТО (North Atlantic Treaty Organisation). Рэспубліка Беларусь узаемадзейнічае з НАТО ў рамках Савета Еўраатлантычнага партнёрства і праграмы «Партнёрства дзеля міру».

Для забеспячэння бяспекі на постсавецкай прасторы ў 2003 г. была створана *Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ)*. У яе ўваходзяць Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан і Узбекістан. Дагавор аб калектыўнай бяспецы адлюстроўвае абарончую накіраванасць ваеннай палітыкі дзяржаў-удзельніц АДКБ. Прыярытэт пры ўрэгуляванні і папярэджванні магчымых канфліктаў адводзіцца палітычным сродкам. Дзяр-


Правообладатель Народная асвета



Саміт кіраўнікоў дзяржаў СНД у г. Кішынёве (2009 г.)

жавы-ўдзельніцы Дагавора не разглядаюць ні адну з дзяржаў у якасці патэнцыяльнага праціўніка і выступаюць за ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з усімі краінамі. АДКБ процідзейнічае тэрарызму, незаконнай распрацоўцы і распаўсюджванню зброі, наркагандлю, незаконнай міграцыі. Беларусь разглядае АДКБ як арганізацыю, якая ў стане забяспечыць абарону нацыянальных інтарэсаў дзяржаў, якія ў яе ўваходзяць.

**Міжнароднае супрацоўніцтва.** Сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў міжнародным супрацоўніцтве, падзяляюцца на палітычныя, эканамічныя, ваенныя і прапагандысцкія. Да *палітычных сродкаў* адносіцца *дыпламатыя* — афіцыйная дзейнасць дзяржаў пры дапамозе спецыяльных інстытутаў, мерапрыемстваў і метадаў, дапушчальных з пазіцый міжнароднага права. Дыпламатыя ажыццяўляецца ў выглядзе перагавораў, візітаў, спецыяльных канферэнцый і нарад, сустрэч, падрыхтоўкі і заключэння двухбаковых і шматбаковых пагадненняў, дыпламатычнай перапісцы, удзелу ў рабоце міжнародных арганізацый.

Дыпламатыя бывае і народнай. Народная дыпламатыя азначае, што самыя розныя людзі, а не толькі дыпламаты, дапамагаюць устанаўліваць сяброўскія сувязі паміж народамі. Напрыклад, спорт — гэта важная форма народнай дыпламатыі, умацавання аўтарытэту краіны. Грамадзянін той

Правообладатель Народная асвета

ці іншай краіны, бываючы за мяжой, сваімі паводзінамі, зносінамі, выказваннямі стварае пэўныя ўяўленні не толькі аб сабе, але і аб сваёй краіне.

*Эканамічныя сродкі* маюць на ўвазе выкарыстанне эканамічнага патэнцыялу краін для дасягнення палітычных мэт. Дзяржава, якая валодае моцнай эканомікай, фінансавай магутнасцю, займае трывалае становішча на міжнароднай арэне. Нават невялікія па тэрыторыі дзяржавы з абмежаванымі прыроднымі рэсурсамі могуць адыгрываць істотную ролю на сусветнай арэне, калі іх эканоміка грунтуецца на перадавых тэхналогіях.

Да *ваенных сродкаў* прынята адносіць ваенную моц дзяржавы. Ваенныя сродкі могуць выкарыстоўвацца як прама, так і ўскосна. Да першых адносяцца войны, інтэрвенцыі, блакады, да другіх — выпрабаванне новых відаў зброі, вучэнні, манеўры, пагроза выкарыстання сілы.

Да *прапагандысцкіх* адносяць сучасныя сродкі масавай інфармацыі, прапаганды і агітацыі, якія выкарыстоўваюцца для ўмацавання аўтарытэту дзяржавы на міжнароднай арэне, садзейнічаюць забеспячэнню даверу з боку саюзнікаў і магчымых партнёраў. З дапамогай сродкаў масавай інфармацыі і дыпламатыі ў вачах сусветнай грамадскасці фарміруецца пэўны вобраз (імідж) дзяржавы. Пазітыўны імідж дзяржавы — фактар кансалідацыі грамадства, забеспячэння падтрымкі народам унутранай і знешняй палітыкі. Пры фарміраванні іміджу Рэспублікі Беларусь падкрэсліваюцца яе суверэнітэт, стабільнасць, дынамічнае развіццё.

**Рэспубліка Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін.** Згодна з артыкулам 18 Канстытуцыі Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці меж, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрынятых прынцыпаў і норм міжнароднага права. Рэспубліка Беларусь падтрымлівае дыпламатычныя адносіны са 166 краінамі свету, заключыла больш як 3 тыс. міжнародных дагавораў, мае 60 дыпламатычных прадстаўніцтваў у розных краінах (паводле даных на 2010 г.).

У рамках ААН Беларусь актыўна ўдзельнічае ў рабоце Камітэта Генеральнай Асамблеі ААН па пытаннях міжна-


Правообладатель Народная асвета

роднай бяспекі і раззбраення. Наша краіна з'яўляецца аўтарам рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН аб забароне распрацоўкі і вытворчасці новых відаў зброі масавага знішчэння і новых сістэм такой зброі, а таксама сааўтарам шэрагу рэзалюцый, прысвечаных надзённым праблемам міжнароднай бяспекі. Паслядоўна ўвасабляючы ў жыццё ідэю добрасуседства, Беларусь на сваёй тэрыторыі забяспечвае функцыянаванне міжнародных транспартных і энергетычных камунікацый, садзейнічае барацьбе з нелегальнай міграцыяй, умацаванню міжнароднай стабільнасці ў рэгіёне.

Без Беларусі не могуць быць вырашаны найвастрэйшыя для еўрапейскіх краін праблемы нелегальнай міграцыі, гандлю людзьмі, наркатрафіку, бяспекі граніц. Беларусь імкнецца да поўнафарматнага супрацоўніцтва з ЗША. Асобае месца ў сістэме прыярытэтаў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь займае Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён. Так, адносіны Беларусі з Кітаем набываюць характар доўгатэрміновых, заснаваных на імкненні да забеспячэння ўзаемных інтарэсаў. Адным з перспектыўных напрамкаў знешняй палітыкі Беларусі выступае азіяцка-афрыканскі вектар. На якасна новы ўзровень выходзяць адносіны Рэспублікі Беларусь з краінамі Лацінскай Амерыкі. Асаблівае значэнне маюць сяброўскія адносіны з Венесуэлай.



Візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
А. Р. Лукашэнкі ў Венесуэлу

Правообладатель Народная асвета

**Нацыянальная бяспека і нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы.** Базавым прынцыпам, на якім будуецца знешняя палітыка любой дзяржавы, з'яўляецца ўлік яе нацыянальных інтарэсаў, а яны цесна звязаны з нацыянальнай бяспекай. Нацыянальная бяспека прадугледжвае кантроль над унутранымі і знешнімі ўмовамі, неабходнымі для забеспячэння росквіту дзяржавы.

Суб'ектамі сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі з'яўляюцца дзяржаўныя органы, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні, а таксама асобныя грамадзяне. Асоба, грамадства і дзяржава з'яўляюцца адначасова і асноўнымі аб'ектамі нацыянальнай бяспекі. Кіраўніцтва сістэмай забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў нашай краіне ажыццяўляе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, які рэалізуе свае паўнамоцтвы ў гэтай сферы праз Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і іншыя дзяржаўныя органы.

Пад ***нацыянальнай бяспекай*** разумеецца стан абароненасці жыццёва важных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз. Жыццёва важныя інтарэсы — гэта сукупнасць патрэб, задавальненне якіх забяспечвае існаванне і магчымасці развіцця асобы, грамадства і дзяржавы. Забеспячэнне нацыянальнай бяспекі ўключае: вызначэнне жыццёва важных інтарэсаў; выяўленне фактараў, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы; фарміраванне сістэмы процідзеяння негатыўным фактарам і пагрозам, якія ўзнікаюць.

*Нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы* Беларусі заключаюцца ў захаванні і ўмацаванні суверэнітэту краіны, яе тэрытарыяльнай цэласнасці і бяспекі, абароне правоў і свабод грамадзян, захаванні міру і стабільнасці ў міжнародных адносінах.

*Нацыянальна-эканамічныя інтарэсы* — гэта забеспячэнне эканомікі краіны энергетычнымі і сыравіннымі рэсурсамі, канкурэнтаздольнасць выпускаемай прадукцыі, захаванне рабочых месцаў, стабільнасць грашовай адзінкі, экалагічная раўнавага і экалагічная бяспека.

?! **1.** Што такое міжнародныя адносіны? Якія вылучаюць віды міжнародных адносін? Прывядзіце прыклады розных відаў міжнародных адносін з курса гісторыі. (*Выкарыстайце матэрыял 1 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 240—241.*)


Правообладатель Народная асвета

2. Назавіце міжнародныя арганізацыі, якія адыгрываюць вядучую ролю ў сусветным супольніцтве. Якія асноўныя мэты і прынцыпы дзейнасці ААН? Падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці Рэспублікі Беларусь у рамках ААН, АБСЕ. (*Выкарыстайце матэрыялы 2, 3 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 242—244*.)
3. У якія міждзяржаўныя аб'яднанні ўваходзіць Рэспубліка Беларусь? Якія нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы рэалізуюцца пры гэтым?
4. Ахарактарызуйце асноўныя сродкі міжнароднага супрацоўніцтва. Прывядзіце прыклады іх выкарыстання ў сучаснай сусветнай палітыцы. (*Выкарыстайце матэрыялы СМІ*.)
5. Ахарактарызуйце месца Рэспублікі Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін. Якая роля нашай краіны ў забеспячэнні палітычнай стабільнасці і бяспекі ў рэгіёне?
6. Ахарактарызуйце прынцыпы і напрамкі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Растлумачце, чым яны абумоўлены. Канкрэтызуйце прыкладамі вывад аб шматвектарнай знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь. (*Выкарыстайце матэрыялы СМІ*.)
7. Што такое нацыянальная бяспека? Якія асноўныя нацыянальна-дзяржаўныя і нацыянальна-эканамічныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь?

## § 21. Глабальныя праблемы сучаснасці

***Успомніце.*** Выкарыстоўваючы веды з курсаў біялогіі і геаграфіі, назавіце глабальныя праблемы сучаснасці.

**Паняцце глабальных праблем.** ***Глабальнымі праблемамі сучаснасці*** называюць жыццёва важныя праблемы планетарнага характару, для рашэння якіх неабходна аб'яднанне намаганняў усіх дзяржаў, а іх нявырашанасць уяўляе рэальную пагрозу для будучыні чалавецтва.

Да 90-х гг. XX ст. асабліва вострай была праблема гонкі ўзбраенняў і прадухілення ядзернай катастрофы. У цяперашні час у сувязі са спыненнем «халоднай вайны» гэта праблема ўяўляецца некалькі менш пагражальнай. На авансцэну выйшла праблема нераўнамернага развіцця рэгіёнаў свету («бедны Поўдзень — багатая Поўнач»). Для багатых краін характэрны высокая прадукцыйнасць працы і арыентацыя насельніцтва на высокі ўзровень спажывання раз-

Правообладатель Народная асвета

настайных даброт. Для іх вытворчасці патрабуецца вялікая колькасць сыравіны, здабыча і перапрацоўка якой спалучаны з пагражальна хуткім расходаваннем незаменных прыродных рэсурсаў і забруджваннем навакольнага асяроддзя. Сярэдні ўзровень спажывання матэрыялаў і энергарэсурсаў на душу насельніцтва ў развітых краінах у 40—50 разоў большы, чым у самых бедных краінах. У той жа час большасць насельніцтва Азіі, Афрыкі і многіх краін Лацінскай Амерыкі пазбаўлена паўнацэннага харчавання, добраўпарадкаванага жылля, медыцынскага абслугоўвання, а ўзровень даходаў на душу насельніцтва застаецца вельмі нізкім. Гэта часткова звязана з нераўнамернасцю росту насельніцтва ў развітых краінах і тых, якія развіваюцца. У развітых краінах штогадовы прырост насельніцтва ў сярэднім складае 0,6 %, у той час як у краінах, якія развіваюцца, ён перавышае 2 % у год. У сувязі з гэтым у краінах, якія развіваюцца, абвастраюцца праблемы беспрацоўя, недахопу харчавання, адбываецца актывізацыя міжнароднага тэрарызму, наркамафіі.

Высокія жыццёвыя стандарты развітых краін выклікаюць масавую міграцыю насельніцтва з бедных краін, што тоіць у сабе новыя сацыяльныя канфлікты. Няпэўнасць становішча, адсутнасць надзеі на лепшую будучыню спараджаюць у бедных слаёў насельніцтва схільнасць да імпульсіўных дзеянняў. У выніку разбураецца не толькі навакольная прырода, але і, так сказаць, прырода самога чалавека, яго здароўе. Гэтыя праблемы разрастаюцца, цесна пераплятаюцца адна з другой і ахопліваюць усё новыя краіны, не прызнаючы ніякіх меж.

Асноўныя прыметы глабальных праблем — гэта іх *універсальнасць,* г. зн. усеагульныя маштабы праяўлення, а таксама *вастрыня ўздзеяння*, якая пагражае катастрафічнымі наступствамі для ўсяго чалавецтва. Глабальныя праблемы вызначаюць *комплексны характар* і магчымасць іх пераадольвання толькі намаганнямі ўсяго чалавецтва.

**Тыпы глабальных праблем.** Звычайна вылучаюць наступныя глабальныя праблемы:

*Праблемы ўзаемаадносін паміж рознымі сацыяльнымі супольнасцямі*. Да іх адносяцца праблемы раззбраення і прадухілення ядзернай вайны, пераадолення адсталасці, канфліктаў паміж развітымі краінамі і тымі, якія развіваюцца, а таксама ўнутры краін, не толькі бедных, але і са-

 Правообладатель Народная асвета

мых багатых, дзе нярэдка ўзнікаюць варожыя адносіны да імігрантаў.

*Праблемы ва ўзаемаадносінах паміж чалавекам і грамадствам, у развіцці культуры.* Гэта дэмаграфічная, культурная, адукацыйная, інфармацыйная праблемы, а таксама праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу, аховы здароўя, папярэджвання небяспечных хвароб. Развіццё сучасных відаў транспарту і актывізацыя кантактаў паміж людзьмі рэзка паскараюць распаўсюджванне вельмі небяспечных інфекцыйных захворванняў. Неспрыяльныя экалагічныя ўмовы параджаюць новыя, раней амаль невядомыя захворванні і абвастраюць праходжанне некаторых раней маланебяспечных хвароб. Імклівае развіццё навукі і тэхнікі прыводзіць да вельмі хуткага «старэння» раней атрыманай адукацыі і неабходнасці ўвесь час давучвацца і перавучвацца. Даступнасць вялікіх патокаў рознай інфармацыі параджае праблему распазнавання дакладных звестак і адкрытай дэзінфармацыі. Чалавеку ўсё цяжэй становіцца арыентавацца ў гэтых інфармацыйных патоках і адбіраць сапраўды неабходнае для справы. Расхістваюцца таксама маральныя каштоўнасці, культурныя асновы грамадскага жыцця.

*Праблемы ўзаемадзеяння чалавека з навакольным асяроддзем.* Да іх адносяцца энергасыравінная, харчовая праблемы, асваенне Сусветнага акіяна, космасу, зоны «вечнай мерзлаты» і, магчыма, самая вострая глабальная праблема — экалагічная.

**Экалагічная праблема.** У другой палове XX ст. чалавецтва ўсвядоміла рызыку знішчэння цывілізацыі з прычыны некантралюемага ўздзеяння чалавека на прыроднае асяроддзе. Безаглядная гаспадарчая дзейнасць людзей прывяла да экалагічнага крызісу. Вынікамі яго сталі ўзрастаючая пагроза здароўю людзей, забруджванне навакольнага асяроддзя высокатаксічнымі адходамі вытворчасці і жыццядзейнасці людзей.

Глабальныя экалагічныя праблемы ўзнікаюць у выніку дзвюх прычын: 1) прыродныя працэсы (цунамі, ураганы, навадненні, смерчы і інш.); 2) антрапагеннае (ад грэч. *antrōpos* — чалавек і *genos* — нараджэнне) уздзеянне і нерацыянальнае прыродакарыстанне («парніковы эфект», «азонавыя дзіркі», змяненне саставу атмасферы і інш.).

Правообладатель Народная асвета



Раставанне і абрушванне ледніка

У цяперашні час фіксуюцца:

*Глабальнае змяненне клімату*, у тым ліку павышэнне сярэдняй тэмпературы атмасферы. Гэта пагражае парушэннем таго механізма цыркуляцыі вод Сусветнага акіяна і кругазвароту вады ў прыродзе, які ўстаяўся. Паводле некаторых разлікаў, з прычыны глабальнага пацяплення клімату да 2100 г. узровень Сусветнага акіяна можа падняцца на 4 метры, а пад вадой апынуцца многія астраўныя дзяржавы і большая частка такіх гарадоў, як Санкт-Пецярбург, Амстэрдам, Шанхай, Новы Арлеан і інш.

*Змяненне саставу атмасферы* — падзенне працэнтнага ўтрымання кіслароду і павелічэнне долі вуглякіслага, чаднага, сярністага газаў і іншых забруджвальнікаў. Гэта прыводзіць да кіслотных дажджоў, росту кіслотнасці вадаёмаў і глеб, «парніковага эфекту».

*«Парніковы эфект»* — павышэнне тэмпературы ў ніжніх слаях атмасферы з прычыны выкідаў газаў, якія свабодна прапускаюць сонечную радыяцыю да Зямлі, але перашкаджаюць вяртанню цеплавога выпраменьвання ў верхнія слаі атмасферы. Перагрэў планеты прыводзіць да навадненняў, засухі, неспрыяльных змяненняў у прыродных экасістэмах.

*Вычэрпванне азонавага слою*, які затрымлівае небяспечнае для здароўя людзей касмічнае выпраменьванне, у тым ліку ўльтрафіялетавую радыяцыю. Асноўная прычына раз-


Правообладатель Народная асвета

бурэння азонавага слою і з'яўлення так званых «азонавых дзірак» — масавае выкарыстанне ў прамысловасці і быце азонаразбуральных рэчываў.

*Знішчэнне прыродных рэсурсаў планеты і забруджванне іх неўласцівымі прыродзе рэчывамі*, а таксама перавышэнне гранічна дапушчальных норм выкіду звычайных рэчываў. Нерацыянальная сельскагаспадарчая дзейнасць, у прыватнасці празмернае выкарыстанне мінеральных удабрэнняў, якія ўтрымліваюць вялікую колькасць кіслотаўтваральных аксідаў серы і азоту, прыводзіць да парушэння прыродных экасістэм, спустошэння глебавага покрыва, памяншэння запасаў прэснай вады, парушэння прыроднага ландшафту.

Гібель лясоў у выніку празмернай высечкі, а таксама з прычыны забруджвання навакольнага асяроддзя садзейнічае таму, што атмасфера штогод не атрымлівае да 15 млрд т кіслароду. Інтэнсіўныя высечкі лясных масіваў у басейне Амазонкі, у Інданезіі, у цэлым у трапічным поясе Зямлі пагражаюць канчаткова пазбавіць планету яе «зялёных лёгкіх». У цяперашні час лясы нашай планеты знікаюць з хуткасцю 6 млн га ў год.

Памяншаюцца запасы неаднаўляльных рэсурсаў, такіх, як нафта, вугаль. Адбываецца збядненне Сусветнага акіяна з прычыны яго забруджвання і няўмелага карыстання яго рэсурсамі. У цяперашні час ад 2 да 4 % паверхні Ціхага і Атлантычнага акіянаў пакрыта нафтавай плеўкай, з-за чаго іх біялагічная прадукцыйнасць прыметна скарацілася.

*Скарачэнне біялагічнай разнастайнасці флоры і фаўны*, г. зн. незваротная гібель некаторых відаў раслін і жывёл у выніку іх непамернага вынішчэння і знішчэння месцаў натуральнага пражывання. У цяперашні час пад пагрозай знік-





Экалагічны крызіс

Правообладатель Народная асвета

нення знаходзіцца да 10 % відаў раслін, каля 1000 відаў буйных жывёл і велізарная колькасць дробных.

*Празмерная нагрузка на некаторыя прыродна-тэрытарыяльныя комплексы* з прычыны перанасялення планеты, урбанізацыі і нераўнамернага выкарыстання прыродных рэсурсаў.

**Экалагічная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і ўдзел нашай краіны ў рэалізацыі міжнародных праектаў.** Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь накіравана на забеспячэнне экалагічнай бяспекі людзей, якія жывуць на яе тэрыторыі, дасягненне рацыянальнага прыродакарыстання і зніжэнне негатыўнага ўздзеяння чалавечай дзейнасці на навакольнае асяроддзе. Права кожнага на спрыяльнае навакольнае асяроддзе гарантавана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь (артыкул 46). Асноватворным нарматыўным дакументам у сферы аховы прыроды ў нашай краіне з'яўляецца Закон «Аб ахове навакольнага асяроддзя», а таксама цэлы шэраг заканадаўчых актаў у сферы аховы зямельных, лясных угоддзяў, атмасфернага паветра, расліннага і жывёльнага свету. Акрамя таго, Рэспубліка Беларусь кіруецца прынятымі міжнароднымі стандартамі і нормамі ў галіне абароны навакольнага асяроддзя.

Экалагічная сітуацыя ў Беларусі абумоўлена геаграфічным становішчам краіны, якая размешчана ў цэнтры еўрапейскага кантынента. Рэспубліка Беларусь знаходзіцца ў суседстве з індустрыяльна развітымі краінамі. Праз яе тэрыторыю праходзіць вялікая колькасць транспартных патокаў, у тым ліку і аўтамабільнага транспарту, які з'яўляецца адной з асноўных крыніц забруджвання атмасферы. Гэта патрабуе дадатковых выдаткаў на ахову навакольнага асяроддзя.

Характэрнай рысай сучаснага індустрыяльнага развіцця Беларусі з'яўляецца перавага буйных прадпрыемстваў машынабудаўнічай, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, пабудаваных яшчэ ў 50—60-я гг. XX ст. Недасканаласць некаторых ачышчальных збудаванняў і недахоп іх магутнасцей прыводзяць да паступлення адходаў вытворчасці ў атмасферу, а таксама ў рэкі і азёры. Таму ў Беларусі плануецца стварыць водаахоўныя зоны на ўсіх рэках даўжынёй больш за 10 км, дзе будзе дзейнічаць рэжым абмежавання


Правообладатель Народная асвета

гаспадарчай дзейнасці, а таксама санітарна-ахоўныя зоны вакол крыніц пітной вады і інш.

Першачарговай экалагічнай задачай з'яўляецца захаванне і павелічэнне біялагічнай разнастайнасці беларускай прыроды. Меліярацыя, высечкі лясоў, асушэнне балот прыводзяць да знікнення некаторых жывых арганізмаў. У адпаведнасці з Канцэпцыяй устойлівага развіцця лясной гаспадаркі да 2015 г. прадугледжваецца больш раўнамернае распаўсюджванне лясных масіваў па ўсёй тэрыторыі рэспублікі, вызначаны меры па захаванні іх біялагічнай разнастайнасці. У краіне створаны асоба ахоўныя прыродныя тэрыторыі, да ліку якіх адносяцца Бярэзінскі біясферны запаведнік і 4 нацыянальныя паркі (Прыпяцкі, Нарачанскі, Белавежская пушча, Браслаўскія азёры). Агульная плошча асоба ахоўных прыродных тэрыторый складае 8,6 % тэрыторыі Беларусі.

Пагаршэнне экалагічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь звязана з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, у выніку якой





Захаванне экалагічнай разнастайнасці беларускай прыроды — першачарговая экалагічная задача

Правообладатель Народная асвета

23 % тэрыторыі краіны зведала радыеактыўнае забруджванне. Найбольш пацярпелі паўднёвыя раёны рэспублікі, асабліва Хойніцкі, Брагінскі і Нараўлянскі. На забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі быў створаны Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік з мэтай папярэджвання разносу радыенуклідаў, недапушчэння другаснага забруджвання сумежных тэрыторый. На 2006—2010 гг. была прынята ўжо чацвёртая *Дзяржаўная праграма па пераадольванні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС*. Асноўнымі напрамкамі гэтай праграмы сталі паляпшэнне якасці жыцця і аднаўленне здароўя насельніцтва, якое пацярпела, экалагічная і сацыяльна-эканамічная рэабілітацыя забруджаных тэрыторый.

Рэспубліка Беларусь удзельнічае ў міжнародных чарнобыльскіх праграмах, накіраваных на забеспячэнне ўстойлівага развіцця забруджаных тэрыторый. Чарнобыльская праблематыка ўключана ў праграмы супрацоўніцтва Беларусі з міжнароднымі ўрадавымі і няўрадавымі арганізацыямі, многімі замежнымі дзяржавамі. Рэспубліка Беларусь сумесна з Расійскай Федэрацыяй і Украінай выступіла ініцыятарам прыняцця рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН ад 9 снежня 2007 г. *«Умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыі намаганняў у справе вывучэння, змякчэння і мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы»*, на аснове якой было абвешчана Дзясяцігоддзе ААН па рэабілітацыі і ўстойліваму развіццю пацярпелых тэрыторый.



Саркафаг над разбураным блокам Чарнобыльскай АЭС

Рэспубліка Беларусь актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі міжнародных праектаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя. Яна на пастаяннай аснове падтрымлівае кантакты з такімі міжнароднымі арганізацыямі, як Праграма ААН па навакольнаму асяроддзю, Сусветная метэаралагічная арганізацыя, Глабальны экалагічны фонд і інш. Беларусь падпісала тры гла-


Правообладатель Народная асвета

бальныя экалагічныя канвенцыі (Канвенцыю аб біялагічнай разнастайнасці, Рамачную канвенцыю ААН аб змяненні клімату, Канвенцыю па барацьбе з апустыньваннем), удзельнічае ў рэалізацыі цэлага шэрагу шматбаковых экалагічных пагадненняў.

?!

1. Што такое глабальныя праблемы? Якія іх асноўныя прыметы? Канкрэтызуйце прыкладамі вывад аб узаемасувязі глабальных праблем. (*Выкарыстайце матэрыялы 4, 9 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 244—245, 250.*)
2. Ахарактарызуйце тыпы глабальных праблем. Ці адносяцца, на вашу думку, да глабальных праблем сучаснасці праблемы адукацыі, здароўя людзей, сусветны фінансава-эканамічны крызіс, які пачаўся ў 2008 г.? Свой адказ аргументуйце.
3. Прааналізуйце адну з глабальных праблем сучаснасці па плане: прычыны, праяўленні, наступствы, магчымыя шляхі рашэння. Выкарыстайце дадатковую літаратуру, а таксама інфармацыю, атрыманую на ўроках геаграфіі, біялогіі, гісторыі. (*Выкарыстайце матэрыял 5 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 245—246.)*
4. Чым абумоўлена экалагічная сітуацыя ў Беларусі? Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, падрыхтуйце паведамленне аб экалагічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, у вашым рэгіёне (вобласці, раёне, горадзе).
5. Якія меры прымаюцца ў Рэспубліцы Беларусь па забеспячэнні экалагічнай бяспекі насельніцтва?
6. У рэалізацыі якіх міжнародных праектаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя прымае ўдзел Рэспубліка Беларусь? Для адказу на пытанне выкарыстайце дадатковую літаратуру, матэрыялы СМІ.

## § 22. Гарызонты інфармацыйнага грамадства

***Успомніце.*** Назавіце асноўныя прыметы традыцыйнага і індустрыяльнага грамадстваў.

**Тэхналагічныя ўклады.** Вам ужо вядома, што існуюць розныя падыходы да тыпалагізацыі грамадстваў. Адзін з іх — *тэхналагічны падыход*, які дазваляе вылучыць розныя тыпы грамадства ў залежнасці ад іх *тэхналагічных укладаў*. У аснове іх вылучэння — падобныя тэхналогіі, тэхніка

Правообладатель Народная асвета

і абумоўленая імі галіновая структура грамадскай вытворчасці. *Тэхналогія* (ад грэч. *teЉchnē* — мастацтва, майстэрства, уменне і *loЉgos* — слова, вучэнне) — сукупнасць метадаў апрацоўкі, змянення ўласцівасцей сыравіны (зыходнага матэрыялу) у працэсе вытворчасці прадукцыі. Тэхналогіямі таксама называюць аперацыі па здабычы, транспарціроўцы, захаванні прадукцыі. Гэтыя аперацыі з’яўляюцца часткай агульнага вытворчага працэсу. *Тэхніка* — гэта сукупнасць сродкаў, з дапамогай якіх чалавек уздзейнічае на прадмет працы ў працэсе вытворчасці.

Прыхільнікі тэхналагічнага падыходу лічаць, што менавіта ўзровень развіцця тэхнікі і тэхналогіі з’яўляецца вызначальным у развіцці грамадства. На гэтай аснове яны вылучаюць тры тэхналагічныя ўклады, якія паслядоўна змянялі адзін аднаго ў гісторыі чалавецтва. Гэтыя ўклады характарызуюць *традыцыйнае грамадства* (аграрна-рамеснае, або аграрнае), *індустрыяльнае* і *постіндустрыяльнае грамадства*.

Традыцыйнае грамадства, у адпаведнасці з тэхналагічным падыходам, характарызуецца ручной працай і прымітыўнай тэхнікай, высокай удзельнай вагой сельскай гаспадаркі ва ўсёй грамадскай вытворчасці, нязначнымі памерамі вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва, павольным тэхнічным прагрэсам. Яго вызначае таксама іерархічная сацыяльная структура грамадства (жорсткая падпарадкаванасць ніжэйшых слаёў насельніцтва вышэйшым) з нізкай сацыяльнай мабільнасцю. Традыцыйнае грамадства — гэта аграрны свет з панаваннем вёскі і традыцыйнага спосабу жыцця. Вызначальную ролю тут адыгрываюць уласнікі зямлі, свяшчэннаслужыцелі (духавенства), армія. Да гэтай стадыі тэхналагічнага развіцця адносяць амаль усю гісторыю чалавецтва аж да Новага часу.

На працягу XVII—XIX стст. у Еўропе ажыццяўляўся пераход да індустрыяльнага грамадства. Гэты працэс атрымаў назву *мадэрнізацыі*. Пад уздзеяннем тэхнічных, сацыяльна-эканамічных і культурных дасягненняў еўрапейскай мадэрнізацыі пераход да індустрыяльнага грамадства пачаў набываць глабальны характар.

Індустрыяльнае грамадства характарызуецца вызначальнай роллю прамысловасці ў сістэме гаспадарчай дзейнасці, панаваннем машыннай вытворчасці, масавай таварнай вы-

 Правообладатель Народная асвета

творчасцю, тэхналагічным падзелам працы, высокай канцэнтрацыяй вытворчасці і рабочай сілы, высокім узроўнем сацыяльнай мабільнасці. Развіваюцца таварна-грашовыя адносіны. Пануе дакладны эканамічны разлік. Прамысловае прадпрыемства цалкам аддзяляецца ад хатняй гаспадаркі. Адбываецца *ўрбанізацыя* — рост гарадоў і колькасці гарадскога насельніцтва. Гарады займаюць вызначальнае становішча ў жыцці грамадства. Асновай яго развіцця становіцца навукова-тэхнічны прагрэс, які падмацоўваецца духам прадпрымальніцтва, канкурэнцыі, рацыянальнасцю дзеянняў.

З пазіцыі тэхналагічнага падыходу капіталізм і сацыялізм — гэта ўсяго толькі разнавіднасці індустрыяльнага грамадства. Яму на змену прыходзіць постіндустрыяльнае грамадства.

**Канцэпцыя постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства.** Тэрмін «постіндустрыяльнае грамадства» належыць амерыканскаму сацыёлагу Д. Бэлу. Постіндустрыяльнае грамадства прыходзіць на змену індустрыяльнаму ў другой палове XX ст. пад уздзеяннем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Першапачаткова гэты працэс пачаўся ў ЗША, пасля ахапіў краіны Заходняй Еўропы і Японію. Пазней у працэс пераходу да постіндустрыяльнага грамадства пачалі ўцягвацца і іншыя індустрыяльныя краіны.

У постіндустрыяльным грамадстве эканоміку, заснаваную на вытворчасці тавараў, змяняе *эканоміка паслуг*. Ідзе скарачэнне колькасці занятых у матэрыяльнай вытворчасці — не толькі сельскагаспадарчай, але і прамысловай. Выкарыстоўваюцца рэсурсазберагальныя тэхналогіі, якія забяспечваюць павышэнне прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі. Вызначальнае месца ў працэсе вытворчасці займаюць спецыялісты, тэхнікі, менеджары. Адбываецца, як лічаць прыхільнікі гэтай канцэпцыі, «рэвалюцыя кіраўнікоў (менеджараў)»: роля кіраўнікоў карпарацыямі становіцца больш важнай, чым роля ўласнікаў капіталу. Рэзка ўзрастае грамадскае значэнне навуковых ведаў і інфармацыйных тэхналогій. Шматразова павялічваюцца капіталаўкладанні ў галіны, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс, або ў навукаёмістую вытворчасць. З'яўляюцца комплексныя навукова-вытворчыя аб'яднанні, якія злучаюць навуку, вытворчасць, адукацыю, абслугоўванне вырабляемай навукаёмістай прадукцыі.

Правообладатель Народная асвета

Пад уздзеяннем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі складваецца новы тып работніка. Гэта высокакваліфікаваны спецыяліст, які арыентаваны на пастаяннае павышэнне сваіх прафесійных ведаў і ўменняў, на бесперапынную адукацыю. Высокая якасць работніка ўключае не толькі яго кваліфікацыю, але і здароўе, псіхічны стан, маральна-валявыя якасці, агульную культуру. У постіндустрыяльным грамадстве паспяхова развіваецца індустрыя дабрабыту, нацэленая на задавальненне патрэб людзей. Усё больш сродкаў выдаткоўваецца на развіццё адукацыі, аховы здароўя, транспарту, сферы адпачынку.

У 80-х гг. XX ст. развіццё постіндустрыяльнага грамадства пачало грунтавацца на шырокім выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій і інфраструктур, у тым ліку сродкаў масавай камунікацыі. Фарміруецца ***інфармацыйнае грамадства***, якое ў многіх тэарэтычных канцэпцыях (Д. Бэл, А. Тофлер і інш.) разглядаецца як адна з разнавіднасцей постіндустрыяльнага грамадства, а часам нават як якасна новая ступень у развіцці грамадскага прагрэсу, якая прыходзіць на змену постіндустрыяльнаму. Тэхніка-тэхналагічнай асновай інфармацыйнага грамадства становяцца камп'ютары, тэлебачанне, спадарожнікавая сувязь і Інтэрнэт. Інфармацыя пераўтвараецца ў найбольш значны рэсурс, а вытворчасць і спажыванне інфармацыі — у найважнейшы від дзейнасці. Інфармацыйныя і тэлекамунікацыйныя тэхналогіі шырока ўкараняюцца ва ўсе сферы жыцця людзей, а інфармацыйнае асяроддзе, поруч з сацыяльным і экалагічным, выступае найважнейшым асяроддзем пражывання чалавека.

У *эканамічнай сферы* высокаразвітых краін інфармацыя становіцца асноўным рэсурсам, а работа з інфармацыяй — ключавой крыніцай занятасці. У ЗША ўжо з сярэдзіны 80-х гг. XX ст. больш за палову УВП ствралася з дапамогай інфармацыйных тэхналогій. Дзякуючы выкарыстанню гэтых тэхналогій павышаецца канкурэнтаздольнасць сярэдніх і дробных прадпрыемстваў; пашыраецца праца дома; дом нярэдка пераўтвараецца ў «электронны катэдж». Усё гэта магчыма таму, што ўсюды выкарыстоўваюцца камп'ютары і глабальныя інфармацыйныя сеткі, якія адкрываюць доступ да разнастайных баз даных.


Правообладатель Народная асвета

У *сацыяльнай сферы* пад уздзеяннем інфарматызацыі змяняецца структура грамадства. Тэарэтыкі інфармацыйнага грамадства лічаць, што на змену класам і сацыяльным слаям індустрыяльнага і пачатковага этапу постіндустрыяльнага грамадства прыходзяць «інфармацыйныя супольнасці», якія аб'ядноўваюць тых, хто валодае інфармацыйнымі тэхналогіямі і ўмела імі карыстаецца. Праца людзей непарыўна злучаецца з іх зносінамі з дапамогай камп'ютарных сетак. Галоўным з'яўляецца ўжо не проста колькасць выпрацаванай прадукцыі, а яе якасць. Адпаведна і дзейнасць людзей абумоўліваецца не толькі матэрыяльным інтарэсам, але і клопатам аб якасці жыцця, імкненнем атрымаць задавальненне ад зробленай працы.

У *палітычнай сферы*, згодна з канцэпцыяй інфармацыйнага грамадства, улада пачынае зрушвацца ад капіталу да ведаў. Сапраўдныя багацце і сіла забяспечваюцца валоданнем інфармацыяй і інфармацыйнымі тэхналогіямі. У інфармацыйным грамадстве пашыраецца свабодны доступ да палітычнай інфармацыі, фарміруецца электронная сістэма зваротнай сувязі паміж грамадзянамі і структурамі ўлады. Але адначасова ўзнікае праблема абароны прыватных інтарэсаў асобы. Сучасныя палітычныя тэхналогіі, злучаныя з электроннымі СМІ, даюць магчымасць маніпуліраваць грамадскай свядомасцю, ствараць «кіруемую дэмакратыю».

У *культурнай сферы* ўсё больш узрастае роля навукі і адукацыі. Фарміруецца новая інфармацыйная прастора — Інтэрнэт, а з ім і шырокія магчымасці для дыстанцыйнай адукацыі. Узнікае камп'ютарны адпачынак, шырокае распаўсюджанне атрымліваюць зносіны з «віртуальнай рэальнасцю». Сусветная інфармацыйная прастора пашырае дыялог паміж народамі і асобнымі людзьмі. Разам з тым чалавеку становіцца ўсё цяжэй крытычна асэнсоўваць інфармацыю, якая яму даецца. СМІ нярэдка распаўсюджваюць аднастайныя навіны і ацэнкі падзей, прапануюць людзям гатовыя вывады, прыклады паводзін, стандарты жыцця і г. д. Усё гэта ўплывае на культурнае жыццё.

**Месца Рэспублікі Беларусь у сучаснай інфармацыйнай прасторы.** Выкарыстанне сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій адкрывае новыя магчымасці для развіцця беларускага грамадства і дзяржавы. У цяперашні час інфармацыйныя тэхналогіі шырока выкарыстоўваюцца не

Правообладатель Народная асвета

толькі ў эканоміцы, адукацыі, навуцы, ахове здароўя, культуры ў цэлым, але і ў дзяржаўным кіраванні.

У Рэспубліцы Беларусь дзяржаўная палітыка ў галіне інфармацыі накіравана на фарміраванне ў краіне адзінай інфармацыйнай прасторы, развіццё сучаснай інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры і разам з тым на забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі краіны. Справа ў тым, што адкрытасць нашай інфармацыйнай прасторы стварае шэраг пагроз, звязаных з агрэсіўным знешнім інфармацыйным асяроддзем. Патокі празмернай і нярэдка ілжывай інфармацыі параджаюць небяспеку маніпуліравання свядомасцю людзей з боку тых палітычных сіл, якія зацікаўлены ў дэстабілізацыі становішча ў нашай краіне, навязванні каштоўнасцей, далёкіх ад нацыянальнай культурнай традыцыі, ідэалаў гуманізму. У агрэсіўным інфармацыйным асяроддзі губляюцца крытэрыі аб'ектыўнай ацэнкі інфармацыі, разладжваюцца маральныя і грамадзянскія асновы індывідуальнай свядомасці; узнікае новая — камп'ютарная — форма злачыннасці.

Месца Рэспублікі Беларусь у сучаснай інфармацыйнай прасторы вызначаецца перш за ўсё тым, што мы, беларусы, з'яўляемся носьбітамі самабытнай культуры, якая паспяхова развіваецца. Айчынная літаратура і музыка, шматлікія




На пасяджэнні міжведамаснай камісіі па інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь


Правообладатель Народная асвета





Рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы «Комплексная інфарматызацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь»

гістарычныя помнікі, нарэшце, нашы маляўнічыя прыродныя ландшафты з’яўляюцца не толькі здабыткам беларускага народа, але і агульнакультурнай каштоўнасцю, якую неабходна ўмела прапагандаваць. Наша краіна таксама вядома ў свеце сваімі дасягненнямі ў навуцы і тэхніцы, у тым ліку ў інфарматыцы. У многіх ВНУ і каледжах краіны ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій. Ва ўмовах інфармацыйнага грамадства перспектывы паспяховага развіцця Беларусі звязаны з асваеннем і эфектыўным выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій у мэтах умацавання эканомікі, удасканальвання дзяржаўнага кіравання, павышэння ўзроўню жыцця людзей, іх культуры.

?! 1. У чым заключаецца сутнасць тэхналагічнага падыходу да вывучэння грамадскага развіцця? Якія тэхналагічныя ўклады вылучаюць у гісторыі чалавецтва?
2. Дайце характарыстыку традыцыйнага, індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадства. Прааналізуйце, як змяня-

Правообладатель Народная асвета

ецца роля чалавека пры пераходзе ад традыцыйнага да індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадства.

3. Якія змяненні адбываюцца ў эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і культурнай сферах інфармацыйнага грамадства? (*Выкарыстайце матэрыял 7 да раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 246—248.*)
4. Якія, на ваш погляд, «плюсы» і «мінусы» інфармацыйнага грамадства?
5. Ахарактарызуйце месца Рэспублікі Беларусь у сучаснай інфармацыйнай прасторы. Якія меры ажыццяўляюцца ў Рэспубліцы Беларусь па фарміраванні адзінай інфармацыйнай прасторы, забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі? (*Выкарыстайце дадатковую літаратуру, матэрыялы СМІ.*)
6. Ці згодны вы са сцверджаннем, што ў сучаснай інфармацыйнай прасторы беларусам вельмі важна захаваць нацыянальную культуру? Сваё меркаванне аргументуйце.
7. Напішыце эсэ на тэму «Чалавек інфармацыйнага грамадства: новыя магчымасці, новыя абавязкі».

## § 23. Праблемы суіснавання і ўзаемадзеяння краін і народаў

*Успомніце.* **1.** Што такое інтэграцыя? **2.** Прывядзіце прыклады эканамічнай і палітычнай інтэграцыі краін у другой палове ХХ ст. (*Выкарыстайце веды па сусветнай гісторыі.*)

**Паняцце глабалізацыі.** У другой палове ХХ ст. чалавецтва ўступіла ў новы этап сацыяльнай эвалюцыі. Вызначальнай тэндэнцыяй гэтага этапу з'яўляецца глабалізацыя.

***Глабалізацыя*** (ад лац. globus — шар, фр. global — усеагульны) — гэта працэс усебаковага збліжэння розных краін і станаўлення адзінай глабальнай сістэмы тэхналагічных, фінансавых, эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных сувязей на аснове навейшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Глабалізацыя — гэта працэс сусветнай эканамічнай, палітычнай і культурнай інтэграцыі чалавецтва, які вядзе да фарміравання адзінай эканамічнай і інфармацыйнай прасторы, развіцця агульных стандартаў якасці жыцця. Гэта аб'ектыўны працэс, які абумоўлены тэхналагічным скачком, звязаным з развіццём інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, узрастаючай узаемазалежнасцю краін свету ў вы-

 Правообладатель Народная асвета

ніку трансгранічнага (які праходзіць праз граніцы) перамяшчэння капіталаў, тавараў, паслуг, інфармацыйных і людскіх патокаў.

**Супярэчлівы характар наступстваў глабалізацыі.** У эканамічным аспекце глабалізацыя праяўляецца ў пашырэнні маштабаў дзейнасці і значным росце ўплыву транснацыянальных карпарацый і міжнародных фінансавых структур, фарміраванні міжнароднага рынку працы.

*Эканамічная глабалізацыя* — гэта свабодны рух капіталаў, узрастаючая залежнасць нацыянальных эканомік ад сусветнага фінансавага рынку і транснацыянальных карпарацый (ТНК). Яна вядзе да ўзмацнення ролі міжнародных арганізацый, такіх, як Міжнародны валютны фонд (МВФ), Сусветны банк, Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА), Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР). З дапамогай гэтых арганізацый высокаразвітыя краіны Захаду, і ў першую чаргу ЗША, нярэдка аказвалі пасля Другой сусветнай вайны палітычны ціск на ўрады іншых краін з мэтай прывядзення нацыянальных эканомік у адпаведнасць з заходняй ліберальнай мадэллю.

Глабалізацыя — не толькі аб'ектыўны працэс, выкліканы новымі тэндэнцыямі ў эканоміцы, новымі камунікацыйнымі тэхналогіямі, але і адпаведная *палітыка*, якая




Павільён Нацыянальнай экспазіцыі Беларусі на Сусветнай выставе «Экспа-2010» у г. Шанхаі

Правообладатель Народная асвета

служыць пэўным інтарэсам. Глабалізацыя сучаснага свету, якая паскараецца, аслабляе дзяржаўны суверэнітэт і патрабуе стварэння інстытутаў наднацыянальнага характару. У палітычным аспекце глабалізацыя выяўляецца ў росце значэння міжнародных арганізацый. У цэлым тэмпы эканамічнай глабалізацыі намнога пераўзыходзяць тэмпы палітычнай глабалізацыі. Гэта звязана з нізкай кіруемасцю міжнароднымі працэсамі, небяспекай узнікнення вострых палітычных праблем. Глабалізацыю можна разглядаць і як *ідэалогію*, якая абараняе інтарэсы пэўных дзяржаў і ТНК, што сталі галоўнымі «архітэктарамі глабалізацыі». Такой ідэалогіяй стаў *неалібералізм*, які ўвабраў у сябе базавыя прынцыпы лібералізацыі эканомікі: аслабленне дзяржаўнага рэгулявання і прыватызацыю. Паводле неаліберальнай ідэалогіі глабалізацыя садзейнічае развіццю, росквіту, дэмакратыі і свабодзе. У размыванні меж (як геаграфічных, так і культурных), патрыятычных каштоўнасцей і як вынік — аслабленні суверэнітэту дзяржаў неалібералы бачаць якасна новы, і прытым прагрэсіўны, этап развіцця чалавечай цывілізацыі.

Уздзеянне глабалізацыі на сучасную культуру праяўляецца ва ўзрастанні ўплыву ўніверсальных, агульных для ўсяго чалавецтва феноменаў культуры (Інтэрнэт, мода, спорт, навука, адзіная арганізацыя сістэмы адукацыі і інш.), а таксама ва ўзмацненні аднастайнасці форм моўных зносін, шырокім распаўсюджванні адзіных стандартаў адпачынку, спосабу жыцця ў цэлым.

Глабалізацыя адкрывае магчымасці бесперашкоднага перамяшчэння людзей і інфармацыі, аблягчае ўзаемаразуменне паміж жыхарамі планеты, садзейнічае дасягненню дамоўленасці дзяржаў па важных пытаннях сусветнага значэння. Разам з тым узрастае нераўнамернасць эканамічнага развіцця і звязаная з гэтым небяспека дэградацыі эканомікі цэлых краін і рэгіёнаў, якія не змаглі знайсці сваё месца ў сістэме міжнароднага падзелу працы.

Глабалізацыя, як ужо адзначалася, уяўляе сабой надзвычай супярэчлівую з'яву. Адкрываючы дадатковыя магчымасці для развіцця, звязаныя з распаўсюджваннем новых тэхналогій, яна абвастрае існуючыя праблемы і параджае новыя глабальныя рызыкі. Да пазітыўных наступстваў глабалізацыі можна аднесці стварэнне адзінай сусветнай пра-


Правообладатель Народная асвета

сторы, у межах якой бесперашкодна перамяшчаюцца эканамічныя рэсурсы, свабодна распаўсюджваюцца ідэі, веды, адбываецца збліжэнне сістэм нацыянальнага заканадаўства, эканамічных і тэхналагічных працэсаў, а таксама збліжэнне культур розных краін, народаў. Відавочнымі вынікамі глабалізацыі сталі сусветныя камунікацыйныя сеткі, у тым ліку Інтэрнэт, а таксама ўзрастаючая «празрыстасць» дзяржаўных меж. Глабалізацыя дазволіла значнай частцы чалавецтва далучыцца да дасягненняў сусветнай цывілізацыі. Інфармацыйныя тэхналогіі і паглыбленне міжнароднага падзелу працы забяспечылі рост яе прадукцыйнасці, што садзейнічала зніжэнню сабекошту вырабляемай прадукцыі. Павысіўся ўзровень жыцця ў насельніцтва тых краін, якія ўзначалілі працэсы глабалізацыі, што працякаюць у сучасным свеце.

Да негатыўных наступстваў глабалізацыі адносіцца вялікая канцэнтрацыя багацця на адным полюсе — «багатая Поўнач», беднасці і галечы — на другім — «бедны Поўдзень». Ад глабалізацыі выйграюць эканамічна развітыя краіны і транснацыянальныя карпарацыі. Прайграюць менш развітыя краіны, у першую чаргу вымушана глабалізуемыя, не падрыхтаваныя да сапраўднага ўдзелу ў «сусветнай эканамічнай гонцы». У выніку глабалізацыі значна абвастраюцца супярэчнасці паміж развітымі краінамі і тымі, якія развіваюцца. Даныя ААН сведчаць, што на долю найбагацейшага 1 % насельніцтва свету прыходзіцца больш даходаў, чым маюць амаль 60 % найбяднейшага насельніцтва. Захад з менш як 15 % насельніцтва Зямлі рэальна валодае 70 % сусветных рэсурсаў, вытворчасці, гандлю і спажывання.

Неаліберальная глабалізацыя забяспечвае задавальненне штучна створаных і пастаянна ўзрастаючых патрэб «залатога мільярда», які складае насельніцтва найбольш багатых і высокаразвітых краін. Пры гэтым значная частка насельніцтва астатняга свету не можа задаволіць нават мінімальныя патрэбы ў ежы, пітной вадзе, вопратцы і да т. п. Глабальны рух капіталу, фінансавыя і інфармацыйныя патокі часта ставяць пад пагрозу стабільнасць сусветнай эканомікі, а таксама нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы многіх краін. Культурная ўніверсалізацыя, якую разумеюць як распаўсюджванне каштоўнасцей заходняй цывілізацыі на ўсе іншыя народы, нярэдка параджае зваротную рэакцыю:

Правообладатель Народная асвета

рост ксенафобіі (xénos у перакладзе з грэч. — «чужы» і phóbos — «страх», г. зн. боязь чужога), нацыяналізму і рэлігійнага фундаменталізму.

Разрыў ва ўмовах жыцця насельніцтва развітых краін і тых, што адсталі ў сваім развіцці, парадзіў масавыя і ў многім стыхійныя міграцыйныя працэсы. У выніку масавай іміграцыі заходнія грамадствы становяцца ўсё больш полікультурнымі, што прыводзіць да ўзнікнення і нарастання ў іх этнакультурнай напружанасці і нават варожасці. Акрамя таго, мігранты абвастраюць крызіс занятасці ў развітых краінах. Усё гэта параджае новыя канфлікты, звязаныя з падрывам сістэмы сацыяльнай абароны свайго насельніцтва, якая склалася ў развітых краінах. У сувязі з гэтым у развітых краінах становіцца больш жорсткім міграцыйнае заканадаўства, вядзецца барацьба з нелегальнымі мігрантамі: гэтыя краіны, якія раней разглядаліся як узорна ліберальныя, становяцца ўсё менш ліберальнымі.

Глабалізацыя ўскосна садзейнічае развіццю міжнароднай злачыннасці і міжнароднага тэрарызму. Сучасныя тэхналогіі ў галіне ўзбраення і камунікацыі значна павялічваюць разбуральны патэнцыял тэрарыстычных актаў, ускладняюць барацьбу з міжнароднай злачыннасцю.

**Антыглабалізм.** Рэакцыяй на супярэчлівы характар глабалізацыі з'яўляецца новы пратэстны рух — антыглабалізм. ***Антыглабалізм*** — гэта палітыка і ідэалогія, накіраваная супраць існуючай мадэлі глабалізацыі, якая прыносіць, галоўным чынам, прыбытак транснацыянальным карпарацыям з багацейшых краін свету, насельніцтва якіх называюць «залатым мільярдам». Супраціўленне глабалізацыі праяўляецца як на ўзроўні дзяржаў, так і на ўзроўні грамадскіх рухаў.

Масавыя выступленні антыглабалістаў з розных краін ледзь не сарвалі ў 1999 г. канферэнцыю Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) у Сіэтле (ЗША). У 2001 г. новыя масавыя выступленні антыглабалістаў адбыліся ў Генуі. Яны былі выкліканы сустрэчай васьмёркі (кіраўнікоў дзяржаў васьмі вядучых краін свету), якая там праходзіла. Дэманстрацыі антыглабалістаў у апошнія гады становяцца ўсё больш частымі і прымеркаваны, як правіла, да пасяджэнняў Сусветнага банка, СГА, МВФ, іншых міжнародных арганізацый. У гэтых арганізацыях антыглабалісты бачаць асноў-


Правообладатель Народная асвета




Акцыя антыглабалістаў

ных праваднікоў палітыкі глабалізацыі, адказных за яе негатыўныя наступствы.

Часцей за ўсё антыглабалістамі асуджаюцца разбуральныя сацыяльна-эканамічныя наступствы глабалізацыі і выстаўляюцца патрабаванні правядзення палітыкі «сацыяльна адказнай глабалізацыі». Лічыцца, што працэс глабалізацыі павінен быць звязаны з распаўсюджваннем прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці. Прыхільнікі антыглабалізму адзначаюць, што глабалізацыя паглыбляе экалагічныя праблемы, дазваляе ТНК пазбягаць кантролю і атрымліваць звышпрыбыткі за кошт эксплуатацыі бяднейшых краін і народаў, раскрадання іх прыродных і іншых рэсурсаў. На думку антыглабалістаў, калі «архітэктараў глабалізацыі» не заклікаць да адказу і не паставіць пад эфектыўны міжнародны дэмакратычны грамадскі кантроль, то наступствы могуць быць катастрафічнымі. Узаемная нецярпімасць, хваробы, экалагічныя катастрофы, войны, распад грамадства і палітычная нестабільнасць могуць стаць усеагульнымі.

Патрабаванні, якія выстаўляюць антыглабалісты, такія: рэформа той глабальнай фінансава-эканамічнай сістэмы, якая існуе, больш справядлівае размеркаванне даходаў паміж краінамі і рэгіёнамі, выкананне норм міжнароднага права і абароны навакольнага асяроддзя, скарачэнне знешняга доўгу для краін, якія развіваюцца.

**Пазіцыя Рэспублікі Беларусь у адносінах да працэсаў глабалізацыі.** Ва ўмовах глабалізацыі дзейнасць Рэспублікі

Правообладатель Народная асвета

Беларусь арыентавана на прыданне гэтаму працэсу большай сацыяльнай справядлівасці, адмову ад палітыкі двайных стандартаў і палітычнага дыктату ў адносінах да невялікіх краін і тых, хто адстае ў развіцці.

Павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, яе канкурэнтаздольнасці, асваенне новых, у тым ліку інфармацыйных, тэхналогій у спалучэнні з актыўнай шматвектарнай знешняй палітыкай узмацняюць устойлівасць беларускай дзяржавы ва ўмовах узрастаючых глабальных рызык і сусветных фінансава-эканамічных крызісаў.

У цяперашні час перад Рэспублікай Беларусь стаіць задача ў бліжэйшыя гады ўзняць айчынную вытворчасць на больш высокі ўзровень і паўнацэнна інтэгравацца ў сусветную эканоміку.

?

1. Што такое глабалізацыя? Чым яна абумоўлена? Ці згодны вы са сцверджаннем, што глабалізацыя з'яўляецца аб'ектыўным працэсам развіцця сучаснага грамадства? Сваю думку абгрунтуйце. (*Выкарыстайце матэрыял 6 да раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 246.*)
2. Ці можна назваць працэс глабалізацыі сучаснага свету прагрэсіўным? Сваё меркаванне аргументуйце.
3. Як праяўляецца глабалізацыя ў эканамічнай, палітычнай, культурнай сферах грамадскага жыцця?
4. Якія пазітыўныя і негатыўныя наступствы глабалізацыі?
5. Што такое антыглабалізм? Якія патрабаванні антыглабалістаў? Якія формы барацьбы яны выкарыстоўваюць?
6. Якая пазіцыя Рэспублікі Беларусь у адносінах да працэсаў глабалізацыі? Якія задачы неабходна рашыць Рэспубліцы Беларусь для таго, каб захаваць і ўмацаваць сваю ролю ў сусветным супольніцтве ва ўмовах глабалізацыі?

## § 24. Будучыня чалавецтва

***Успомніце.*** **1.** Што такое навукова-тэхнічны прагрэс? **2.** Якая роля НТП у гісторыі чалавецтва?

**Сучасныя цывілізацыі і перспектывы іх развіцця.** Сучаснае чалавецтва — гэта прыкладна 6,5 млрд жыхароў нашай планеты, некалькі тысяч вялікіх і малых народаў, каля 200 дзяржаў. Гэта яшчэ і разнастайнасць лакальных цывілізацыйных супольнасцей з характэрнымі для іх эканамічны-


Правообладатель Народная асвета

мі ўкладамі, формамі культурнага, палітычнага, сацыяльнага жыцця.

Сучасныя *лакальныя цывілізацыі* з іх унікальнай і багатай культурай не знаходзяцца ў ізаляцыі адна ад другой. Яны ўступаюць у кантакты і ўзаемадзейнічаюць не толькі з суседнімі, але і з тэрытарыяльна аддаленымі супольнасцямі, засвойваюць новыя ідэі, выкарыстоўваюць навукова-тэхнічныя дасягненні іншых народаў. Насычанасць і шматпланавасць гаспадарчых, палітычных, інфармацыйных сувязей сучаснага свету вядзе да размывання сацыяльна-культурных меж лакальных цывілізацый. Чалавецтва пад уплывам аб'ектыўных глабальных працэсаў рухаецца ад характэрнай для мінулага раз'яднанасці лакальных цывілізацый да больш цеснага цывілізацыйнага адзінства. Нараджаецца ў многім *адзіная сусветная цывілізацыя*, таму што фарміруецца новае, глабальнае тэхніка-эканамічнае і культурнае асяроддзе, ідзе працэс збліжэння, нават уніфікацыі інфармацыйнага, тэхналагічнага жыцця розных рэгіёнаў Зямлі. Паступова ў людзей, якія прадстаўляюць розныя народы і цывілізацыі, фарміруецца пачуццё прыналежнасці да адзінай чалавечай сям'і.

Мы аб'ектыўна становімся грамадзянамі свету, калі праяўляем занепакоенасць глабальнымі экалагічнымі праблемамі, змяненнем клімату Зямлі, выбухованебяспечнымі сітуацыямі ў тых ці іншых пунктах планеты, калі кіруемся агульнапрынятымі нормамі паводзін, уяўленнямі аб агульных правах чалавека як у сябе дома, так і за межамі сваёй краіны.

Гэты працэс фарміравання адзінай сусветнай цывілізацыі, які працякае аб'ектыўна, вельмі супярэчлівы. Многія краіны, народы ўспрымаюць яго як варожы, навязаны звонку, перш за ўсё з ЗША — галоўнага суб'екта глабалізацыі. Шэраг дзяржаў не адчувае сябе паўнапраўнай часткай глабальнай цывілізацыі, якая складваецца, не бачыць для сябе магчымасці быць у ёй актыўнымі ўдзельнікамі. Аднак многія арыенціры дзяржаўнага, эканамічнага і культурнага развіцця ў сучасным глабалізаваным свеце вызначаюцца ўжо не асобнымі краінамі, а вынікаюць з агульнага ходу сусветнага развіцця. Сучасны свет функцыянуе як адзіная сістэма, якая развіваецца самастойна, у ім ёсць агульныя геапалітычныя і геаэканамічныя законы, якія неабходна даследа-

Правообладатель Народная асвета

ваць і выкарыстоўваць на практыцы. Сусветная глабальная сістэма, калі яе патрабаванні ўлічваюцца, у цэлым дазваляе нацыянальным дзяржавам своечасова перабудоўвацца і развівацца, захоўваючы пры гэтым унутраную стабільнасць. Асноўным рычагом узаемадзеяння нацыянальных дзяржаў становіцца рэалізацыя ўзаемавыгадных праектаў, якія даюць доўгатэрміновы эфект.

Інтэрнацыяналізацыя гаспадарчага жыцця адбываецца ўжо на працягу некалькіх стагоддзяў. У канцы XX ст. шырока разгарнуўся працэс глабалізацыі сусветнай эканомікі. З сукупнасці больш або менш узаемазвязаных нацыянальных гаспадарак яна пачала ператварацца ў цэласную сістэму, аб’яднаную не толькі міжнародным падзелам працы, але і глабальнымі фінансавымі сувязямі, сусветнай арганізацыяй вытворчасці і збыту тавараў, планетарнай інфармацыйнай сеткай Інтэрнэт. Ступень эканамічнай, экалагічнай, навукова-тэхнічнай, прававой, інфармацыйнай узаемазалежнасці нацыянальных гаспадарак сёння вельмі высокая. У новых умовах многія дзяржавы імкнуцца аб’яднаць свае намаганні, каб больш паспяхова спраўляцца з узнікаючымі праблемамі. У наш час амаль кожная краіна ўваходзіць у той ці іншы гандлёвы блок, а то і ў некалькі такіх блокаў.

Характэрнай рысай развіцця сучаснага свету становяцца масавыя міграцыі прадстаўнікоў розных этнасаў, веравызнанняў, прафесій. Прычынамі міграцый могуць быць дрэннае экалагічнае становішча, пошукі лепшага жыцця, голад, ваенныя канфлікты, насільныя дэпартацыі, імкненне атрымаць адукацыю за мяжой, знайсці эфектыўнае прымяненне сваім ведам і ўменням і г. д. Пры гэтым людзі розных культур вымушаны вучыцца ўжывацца разам, паважаць культурную разнастайнасць краіны, у якой яны жывуць.

У пачатку XXI ст., калі свет усё больш выразна выяўляе прыметы цэласнай сістэмы, асобныя краіны і народы фактычна не маюць выбару — удзельнічаць або не ўдзельнічаць у сусветных працэсах; яны не могуць ухіліцца ад далейшай інтэграцыі ў сусветнае супольніцтва. У той жа час любая ізаляцыя, спроба закрыцца ад іншых краін вядзе да застою і вялікіх страт. Гэта неспрыяльна і для сусветнай стабільнасці, бо ў такіх краінах ствараюцца ўмовы для сацыяльнай напружанасці, міжэтнічных сутыкненняў, а нярэдка і арганізаванай злачыннасці.


Правообладатель Народная асвета

**Задачы гуманізацыі грамадскага жыцця. Футуралагічныя прагнозы.** Нягледзячы на існаванне многіх праблем і супярэчнасцей сучасны свет здольны мяняцца да лепшага. Ідуць працэсы паглыблення і пашырэння дэмакратыі, мабілізацыі рэсурсаў сусветнага супольніцтва для адказаў на выклікі сучаснасці, для вырашэння глабальных праблем, якія абвастрыліся, умацавання бяспекі жыцця людзей.

Чалавек заўсёды імкнуўся зазірнуць у будучыню. Прадугадванне будучыні непазбежна ўплывае на паводзіны людзей сёння. У залежнасці ад зместу сацыяльнага прагнозу людзі альбо актыўна імкнуцца да яго ажыццяўлення, паскараючы ход падзей, або супрацьдзейнічаюць наступленню негатыўных з'яў.

***Футуралогія*** (ад лац. futurum — будучае і грэч. lógos — слова, вучэнне) — гэта сукупнасць розных даследаванняў будучыні Зямлі і чалавецтва. Яна ахоплівае таксама сферу навуковых ведаў аб перспектывах сацыяльных працэсаў, г. зн. сацыяльнае прагназаванне.

*Навуковае прадбачанне* — гэта вызначэнне і апісанне на аснове навуковых законаў з'яў прыроды і грамадства, якія не вядомыя ў дадзены момант, але могуць узнікнуць або быць вывучанымі ў будучым. Часта выкарыстоўваецца таксама паняцце *прагноз* (ад грэч. prógnōsis — прадбачанне, прадказанне) — канкрэтнае меркаванне аб стане якой-небудзь з'явы ў будучым. Сучасныя метады футуралагічных прагнозаў хаця і недасканалыя, але ў цэлым даюць магчымасць вызначыць некаторыя гістарычныя перспектывы чалавецтва.

Рашэнне глабальных праблем сучаснасці футуролагі звязваюць звычайна з дасягненнямі навукова-тэхнічнага прагрэсу (НТП). У другой палове XX ст. ён стаў вядучым фактарам грамадскага развіцця і актыўна ўплывае на ўсе сферы жыццядзейнасці людзей. У сучаснай навуцы існуюць два падыходы да ацэнкі ролі НТП у грамадскім развіцці. Адны тэарэтыкі звязваюць будучае толькі з дасягненнямі навукова-тэхнічнага прагрэсу; на іх думку, пры яго паспяховым развіцці магчымы пераход усіх краін да постіндустрыяльнай стадыі, якая з'явіцца «грамадствам дастатку». Іншыя — цалкам адмаўляюць пазітыўны сацыяльны характар НТП, выступаючы за абмежаванне росту вытворчасці, спыненне безагляд-

Правообладатель Народная асвета




Інтэлектуальны гуманоідны робат фірмы «Хонда»

най дзейнасці па паскарэнні развіцця навукі, тэхнікі, пераўтварэнні прыроды.

Рост падобных настрояў, якія часта называюць «экатэхналагічным песімізмам», быў абумоўлены расчараваннем у навукова-тэхнічным прагрэсе, які пагражае далейшым паглыбленнем глабальнага экалагічнага крызісу. Аднак вылучаная некалькі дзесяцігоддзяў назад канцэпцыя «нулявога росту», якая прадугледжвала рэзкае абмежаванне развіцця навукі, тэхнікі і на гэтай аснове эканомікі, адразу ж падверглася абгрунтаванай крытыцы.

Сёння любая аднабаковая ацэнка ролі НТП у развіцці чалавецтва — як цалкам аптымістычная, так і крайне песімістычная — не выглядае пераканаўчай. Пры распрацоўцы праектаў будучага ўсё большая ўвага звяртаецца на сацыяльныя і маральныя аспекты развіцця цывілізацыі. Навука і тэхніка ў нашы дні разглядаюцца як сродкі забеспячэння належнай «якасці жыцця» насельніцтва. Навукова-тэхнічны прагрэс можа быць вялізным дабром, які садзейнічае сацыяльнаму вызваленню і духоўнаму ўзбагачэнню чалавека. Але ён можа стаць і найвялікшым злом. Тое, у якім напрамку пойдзе будучае развіццё сучаснай цывілізацыі, залежыць ад маральнай адказнасці вучоных, абгрунтаванасці палітычнага курсу краін свету, свядомасці сацыяльнага выбару іх народаў.

**Месца і роля Беларусі ў цывілізацыйным працэсе.** Сучасныя дзяржавы істотна адрозніваюцца паміж сабой па ступені міжнароднага ўплыву, тэрыторыі, насельніцтву, эканамічнаму патэнцыялу. З 200 дзяржаў прыкладна 90 маюць насельніцтва ад 3,5 да 5 млн чалавек, каля 60 дзяржаў налічваюць ад 0,5 да 2,5 млн, а 35 дзяржаў — менш чым 500 тыс. чалавек.

Рэспубліка Беларусь займае належнае месца ў сучасным свеце і ўносіць свой уклад у фарміраванне адзінай сусветнай цывілізацыі. Гэта сярэдняя еўрапейская краіна па паме-


Правообладатель Народная асвета



Нямецкае судна «Сонечная планета»,
якое працуе на сонечных батарэях

рах тэрыторыі (13 месца ў Еўропе) і колькасці насельніцтва (14 месца). За апошнія гады свет больш даведаўся пра Беларусь дзякуючы палітыцы нашай дзяржавы, дасягненням у галіне навукі, культуры і спорту. Многія творы беларускіх вучоных і пісьменнікаў перакладзены на замежныя мовы, за межамі краіны папулярны нацыянальная опера і балет, творчасць самадзейных і прафесійных выканаўцаў, мастакоў. У залаты фонд агульнаеўрапейскай культуры ўваходзяць нацыянальная народная творчасць, якая развівалася многімі пакаленнямі беларусаў, айчынныя помнікі архітэктуры.

У пачатку XXI ст. асноўнымі дасягненнямі сучаснай Беларусі з'яўляюцца стабільнасць развіцця нацыянальнай эканомікі, міжнароднае прызнанне краіны, пашырэнне яе ўдзелу ў міжнародных арганізацыях, развіццё адносін з многімі краінамі. Сёння эканамічныя інтарэсы Беларусі звязаны з неабходнасцю далейшай інтэграцыі ў сусветную гаспадарчую сістэму. Гэта абумоўлівае шматвектарную знешнюю палітыку, больш актыўнае ўключэнне краіны ў сістэму міжнароднага падзелу працы, прыцягненне замеж-



Кар'ерны самазвал БелАЗ
з дыстанцыйным кіраваннем

Правообладатель Народная асвета

ных інвестыцый і крэдытаў. У гэтых мэтах праводзяцца інвестыцыйныя форумы, іншыя акцыі, якія забяспечваюць дэманстрацыю інвестыцыйных магчымасцей Беларусі для прадстаўнікоў сусветнага бізнес-супольніцтва.

Беларусь прадае ў многія краіны нафтапрадукты, калійныя ўдабрэнні, прадукцыю машынабудавання, сельскай гаспадаркі, хімічныя валокны і г. д. Найбольш устойлівыя пазіцыі на сусветным рынку ў тых беларускіх вытворцаў, якія пастаўляюць шырокі асартымент высокаякасных тавараў і паслуг, створаных з выкарыстаннем новых тэхналогій.

Для Рэспублікі Беларусь з яе адкрытай эканомікай знешнія фактары могуць стаць адной з магутных крыніц паскоранага развіцця. У мэтах інтэграцыі айчыннай эканомікі ў сусветную гаспадарку на спрыяльных для краіны ўмовах ажыццяўляецца рэканструкцыя прадпрыемстваў, удасканальваецца іх матэрыяльна-тэхнічная база для павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі, рэалізуецца сістэма мерапрыемстваў па ўкараненні новай тэхнікі і тэхналогій, сертыфікацыі прадукцыі па міжнародных стандартах.

Інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у сусветнае супольніцтва садзейнічаюць культурныя, спартыўныя і іншыя сувязі з краінамі свету, якія ўсё больш пашыраюцца. Тысячы беларускіх дзяцей штогод праходзяць аздараўленне ў еўрапей-



Мінулае і будучае Беларусі


Правообладатель Народная асвета

скіх краінах. Павялічваецца колькасць замежных турыстаў, якія наведваюць нашу краіну. Многія беларускія грамадзяне, у сваю чаргу, рэгулярна здзяйсняюць замежныя турыстычныя паездкі, маюць дзелавых партнёраў, сяброў за межамі краіны. У рэспубліцы праходзяць міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы, выставы, канферэнцыі. Тысячы нашых суайчыннікаў вучацца, працуюць за мяжой. Беларусь з'яўляецца краінай, адкрытай свету, якая імкнецца да цывілізаваных, добразычлівых адносін з іншымі дзяржавамі.

?!

**1.** Канкрэтызуйце прыкладамі палажэнне: «Сучаснае чалавецтва — гэта разнастайнасць лакальных цывілізацыйных супольнасцей з характэрнымі для іх эканамічнымі ўкладамі, формамі культурнага, палітычнага, сацыяльнага жыцця».

**2.** Ці згодны вы са сцверджаннем, што сёння фарміруецца адзіная сусветная цывілізацыя? Сваё меркаванне аргументуйце.

**3.** Прывядзіце прыклады эканамічнай, экалагічнай, навукова-тэхнічнай, інфармацыйнай узаемазалежнасці сучасных дзяржаў. (*Выкарыстайце веды з курсаў гісторыі, біялогіі, геаграфіі.*)

**4.** Якія прычыны і наступствы масавай міграцыі насельніцтва ў сучасным свеце?

**5.** Ахарактарызуйце асноўныя падыходы да ацэнкі ролі НТП у развіцці сучаснага грамадства. (*Выкарыстайце матэрыял 10 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 250—251.*)

**6.** Яшчэ ў пачатку XX ст. англійскі пісьменнік-фантаст Г. Уэлс адзначаў, што найбольш важным фактарам грамадскага развіцця з'яўляецца навукова-тэхнічны прагрэс. На яго думку, карціна будучага свету будзе залежаць ад спосабаў прымянення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

**7.** Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, матэрыялы СМІ, ахарактарызуйце месца і ролю Беларусі ў сучасным цывілізацыйным працэсе. Што б вы аднеслі да асноўных дасягненняў суверэннай Рэспублікі Беларусь? Якія мерапрыемствы, на ваш погляд, будуць садзейнічаць паспяховай інтэграцыі беларускай эканомікі ў сусветную гаспадарчую сістэму? Сваё меркаванне аргументуйце. (*Выкарыстайце матэрыялы 8, 11 з раздзела «Дакументы і матэрыялы», с. 248—250, 251—252.*)

Правообладатель Народная асвета

## Практыкум
## «Стратэгічныя напрамкі развіцця Рэспублікі Беларусь у XXI стагоддзі»

**1. З Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г.**

Стратэгічнай мэтай устойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь з'яўляецца дынамічнае павышэнне ўзроўню дабрабыту, абагачэнне культуры, маральнасці народа на аснове інтэлектуальна-інавацыйнага развіцця эканамічнай, сацыяльнай і духоўнай сфер, захавання навакольнага асяроддзя для цяперашніх і будучых пакаленняў.

Асноўныя прынцыпы пераходу да ўстойлівага развіцця:

чалавек — мэта прагрэсу, узровень чалавечага развіцця — мера сталасці грамадства і дзяржавы;

прыярытэтнае развіццё сістэм аховы здароўя, адукацыі, навукі, культуры;

пераход на прыродаахоўны, рэсурсазберагальны, інавацыйны тып развіцця эканомікі;

экалагізацыя светапогляду чалавека, сістэм адукацыі, выхавання, маралі з улікам новых цывілізацыйных каштоўнасцей;

вядучая роля дзяржавы ў ажыццяўленні мэт і задач устойлівага развіцця.

?
1. У прыведзенай вышэй фармуліроўцы стратэгічнай мэты ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь выразна вылучаюцца тры кампаненты: павышэнне дабрабыту, абагачэнне культуры і маральнасці народа, захаванне навакольнага асяроддзя. У чым, на ваш погляд, заключаецца ўзаемасувязь гэтых кампанентаў?
2. Як вы разумееце сэнс выразу «экалагізацыя светапогляду чалавека»? Якая сувязь паміж гэтым і іншымі прынцыпамі пераходу да ўстойлівага развіцця краіны?

**2.** У адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. вылучаюць два этапы развіцця краіны: першы этап — да 2010 г.; другі — 2011—2020 гг.


Правообладатель Народная асвета

Прыярытэтнымі напрамкамі першага этапу з'яўляюцца:

развіццё чалавечага патэнцыялу на аснове якаснага ўдасканальвання сістэм адукацыі, аховы здароўя, жыллёвага будаўніцтва і іншых галін сферы паслуг;

інавацыйнае развіццё нацыянальнай эканомікі;

нарошчванне экспартнага патэнцыялу на аснове павышэння ўзроўню канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі, развіцця навукаёмістых высокатэхналагічных рэсурса- і энергазберагальных экалагічна чыстых галін і вытворчасцей;

развіццё аграпрамысловага комплексу і сацыяльнае адраджэнне вёскі.

На другім этапе будуць фарміравацца асновы постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства з новым тэхналагічным базісам, які забяспечыць пераход да рэсурсазберагальнага тыпу вытворчасці. Эканамічнае развіццё прадугледжваецца забяспечваць за кошт актывізацыі структурных пераўтварэнняў, пашырэння прыватнага бізнесу, шырокага ўкаранення дасягненняў навукі і тэхнікі, стварэння экалагічна чыстых вытворчасцей, паскарэння інтэграцыйных працэсаў з краінамі блізкага і далёкага замежжа, збалансаванага развіцця тэрыторый і населеных пунктаў.

?!

1. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, ахарактарызуйце асноўныя дасягненні Рэспублікі Беларусь на першым этапе ўстойлівага развіцця краіны (па кожнаму напрамку развіцця).
2. Якія дзяржаўныя рашэнні, прынятыя ў першым дзесяцігоддзі XXI ст., маюць, на ваш погляд, ключавое значэнне для паспяховага рашэння задач другога этапу пераходу да ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь?

**3. З Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь»**

Стратэгічнымі мэтамі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца:

абарона дзяржаўнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь;

пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне папярэджвання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, аховы на-

Правообладатель Народная асвета

вакольнага асяроддзя, у інфармацыйнай і гуманітарнай сферах;

прыцягненне знешніх інтэлектуальных і навуковых рэсурсаў у інтарэсах адукацыйнага, навуковага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

удзел у міжнародным супрацоўніцтве ў галіне абароны правоў чалавека.

?!
1. Якія палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь атрымалі развіццё ў гэтым Законе?
2. Прывядзіце прыклады канкрэтных дзеянняў нашай дзяржавы, накіраваных на дасягненне стратэгічных мэт знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Выкарыстайце дадатковую літаратуру.

**4.** Пачатак XXI ст. адзначаны ўзмацненнем многіх негатыўных сацыяльных, эканамічных і экалагічных працэсаў і з'яў у свеце. У сувязі з гэтым галоўным прыярытэтам палітыкі нашай дзяржавы становіцца забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Гэта, на думку палітолагаў, прадугледжвае рашэнне шэрагу задач у розных сферах жыцця грамадства:

*сацыяльна-палітычнай сферы*: умацаванне незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь; забеспячэнне грамадзянскай, нацыянальнай згоды і сацыяльнай стабільнасці; зніжэнне ўзроўню злачыннасці; развіццё міжнароднага супрацоўніцтва па пытаннях барацьбы з міжнародным тэрарызмам, арганізаванай злачыннасцю, наркабізнесам, нелегальнай міграцыяй; правядзенне дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на папярэджванне вайны і падтрыманне міру; стварэнне неабходнага абарончага патэнцыялу і эфектыўнага механізма яго выкарыстання; захаванне і развіццё ў грамадстве пачуцця патрыятызму, разумення кожным грамадзянінам краіны свяшчэннага абавязку па абароне Айчыны;

*эканамічнай сферы*: забеспячэнне паскоранага развіцця вытворчасці на аснове поўнага выкарыстання ўласнага навукова-тэхнічнага патэнцыялу, імпарту высокіх тэхналогій, больш шырокага прыцягнення знешніх і ўнутраных інвестыцый у эканоміку краіны; рацыянальнае выкарыстанне геаграфічнага становішча краіны;

*экалагічнай сферы*: стварэнне цэласнай сістэмы аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага, экалагічна бяс-


Правообладатель Народная асвета

печнага выкарыстання прыродных рэсурсаў; распрацоўка і ўкараненне экалагічна бяспечных тэхналогій у эканоміку; развіццё фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у галіне экалогіі і бяспекі жыццядзейнасці;

*інфармацыйнай сферы*: развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій, нацыянальнай індустрыі сродкаў інфарматызацыі і сувязі; забеспячэнне прававых і інфармацыйных умоў для папярэджвання, выяўлення і спынення злачынстваў у інфармацыйнай сферы;

*гуманітарнай сферы*: рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на духоўнае і маральнае развіццё асобы і грамадства, захаванне духоўнай і культурнай спадчыны, умацаванне традыцыйных каштоўнасцей грамадства; развіццё нацыянальнай годнасці, захаванне этнічнай, культурнай, моўнай самабытнасці грамадзян Рэспублікі Беларусь усіх нацыянальнасцей.

?!

1. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, ахарактарызуйце тыя сацыяльныя, эканамічныя і экалагічныя з’явы, якія сёння ўяўляюць найбольшую пагрозу для нашай краіны. Якія меры прымае беларуская дзяржава для іх папярэджвання і ліквідацыі?
2. У забеспячэнні нацыянальнай бяспекі краіны важную ролю прызваны адыграць розныя сацыяльныя інстытуты — сям’я, царква, адукацыя, навука, СМІ. А які ўклад, на ваш погляд, у забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь уносіць наша сістэма адукацыі?
3. Пацвердзіце прыкладамі думку аб тым, што палітыка беларускай дзяржавы — гэта важны фактар агульнай стабільнасці і бяспекі ў Еўропе і ў свеце ў цэлым.

**5.** У адпаведнасці з прынятай ЮНЕСКА Канвенцыяй аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972 г.) створаны спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны, у які ўключаюцца помнікі прыроды і культуры, якія маюць асаблівую гістарычную або экалагічную значнасць.

Па стану на 1 ліпеня 2009 г. у спісе Сусветнай спадчыны — 890 аб’ектаў (у тым ліку — 689 культурных, 176 — прыродных і 25 — змешаных), размешчаных у 148 краінах. Сярод іх: асобныя архітэктурныя збудаванні і ансамблі — Акропаль (Грэцыя), саборы ў Ам’ене і Шартры (Францыя), гістарычныя цэнтры Варшавы (Польшча) і

Правообладатель Народная асвета

Санкт-Пецярбурга (Расія), Маскоўскі Крэмль і Красная плошча (Расія) і інш.; гарады — Бразіліа, Венецыя і інш.; археалагічныя запаведнікі — Дэльфы (Грэцыя) і інш.; нацыянальныя паркі — Марскі парк Вялікага Бар'ернага рыфа (Аўстралія), Йелаўстонскі (ЗША) і інш.

У спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ўключаны таксама размешчаныя на тэрыторыі Беларусі Белавежская пушча, Мірскі замак, архітэктурны комплекс роду Радзівілаў у Нясвіжы, Геадэзічная дуга Струвэ.

?!
1. Падрыхтуйце паведамленні аб аб'ектах Сусветнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі.
2. Якія яшчэ культурныя і прыродныя аб'екты Беларусі, на ваш погляд, заслугоўваюць уключэння ў спіс Сусветнай спадчыны? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

**6.** Беларусь валодае значным патэнцыялам для развіцця турызму. Сёння ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей налічваецца амаль 5 тыс. помнікаў, размешчаных у невялікіх населеных пунктах. У 2009 г. вядомае брытанскае турыстычнае выданне Travel Mail назвала Беларусь у ліку 10 лепшых месцаў для турызму поруч з Аўстраліяй, ЗША, Егіптам, Польшчай, Мексікай, ААЭ, Карыбскімі і Галапагоскімі астравамі, Малайзіяй.

?!
1. Што, на ваш погляд, будзе садзейнічаць больш поўнай рэалізацыі турыстычнага патэнцыялу нашай краіны?
2. Распрацуйце праграмы турыстычных маршрутаў па Беларусі: пешаходных, водных, аўтамабільных. Падрыхтуйце прэзентацыі, якія рэкламуюць выдатныя мясціны Беларусі.
3. Складзіце праграму экскурсіі «Культурная спадчына нашага краю (раёна, горада)».

**7.** Дынамічнае развіццё інфармацыйных тэхналогій і іх укараненне ў паўсядзённае жыццё сталі неад'емнай часткай развіцця ўсіх дзяржаў свету. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка на саміце «Злучым прастору СНД», які адбыўся ў Мінску 26 лістапада 2009 г., падкрэсліў: «...забеспячэнне аднолькавага доступу да тэхналогій адпавядае інтарэсам усіх жыхароў планеты, дапамагае ўмацаванню супрацоўніцтва і ўзаемапаразумення ў глабальным маштабе... Мы плануем нарошчванне нацыянальных інфармацыйных


Правообладатель Народная асвета

рэсурсаў і электронных паслуг. Ужо ў 2015 г. неабходна сфарміраваць цэласную дзяржаўную сістэму электронных паслуг, прадастаўляемых арганізацыям і грамадзянам».

?!
1. Якія магчымасці адкрывае выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій для развіцця беларускага грамадства і дзяржавы?
2. Выкарыстоўваючы матэрыялы СМІ, ахарактарызуйце дасягненні Рэспублікі Беларусь у развіцці сучасных інфармацыйных тэхналогій, стварэнні нацыянальнай індустрыі сродкаў інфарматызацыі і сувязі. Падрыхтуйце прэзентацыю, якая адлюстроўвае гэтыя дасягненні.

**8.** У Аўстраліі, ЗША, краінах Еўрапейскага Саюза тэма барацьбы з глабальным пацяпленнем стала прадметам шырокага абмеркавання. Тысячы грамадзян Еўропы, якія дабіраюцца на працу на веласіпедах, усведамляюць, што яны не толькі эканомяць свае грошы, але і па меры сіл ратуюць планету ад будучай катастрофы — глабальнага пацяплення і ўсіх бедстваў, якія за гэтым могуць пачацца: раставанне ледавікоў, павышэнне ўзроўню Сусветнага акіяна, смерчаў, тайфунаў і засух.

?
1. Якія меры па выратаванні планеты ад глабальнай экалагічнай катастрофы прадпрымаюцца ў Беларусі?
2. У чым можа заключацца ўклад кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у рашэнне экалагічнай праблемы?

**9.** Прачытайце наступныя меркаванні і адкажыце на пытанні:

«Калі мы думаем аб XX стагоддзі, мы ўяўляем сабе небывалае развіццё навукі і тэхнікі: касмічныя палёты, біятэхналогія, робаты. Аднак наша будучыня — нешта значна больш складанае, чым новы больш высокі ўзровень развіцця тэхналогіі. Самыя дзіўныя адкрыцці XXI стагоддзя будуць зроблены не дзякуючы развіццю навукі і тэхнікі, а дзякуючы таму, што мы па-новаму ацэнім само паняцце «чалавек» (Дж. Нэсбіт, П. Эбурдан).

«Найбольш правільным крытэрыем цывілізацыі служыць не колькасць народанасельніцтва, не велічыня гарадоў, не ўраджай, а якасць людзей, якіх нараджае краіна» (Р. Эмерсан).

Правообладатель Народная асвета

? 1. Ці згодны вы з дадзенымі сцверджаннямі? Сваё меркаванне абгрунтуйце.
2. Якімі якасцямі павінен валодаць сучасны чалавек для таго, каб паспяхова рашаць узнікаючыя перад ім і грамадствам задачы?

**10.** У ходзе сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2008 г., рэспандэнтам задавалася пытанне аб тым, якія меры могуць палепшыць сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў краіне.

Былі атрыманы наступныя варыянты адказу:

1. Умацаванне саюза з Расіяй і іншымі краінамі СНД.
2. Забеспячэнне рэальнай сацыяльнай абароны насельніцтва.
3. Павышэнне дабрабыту насельніцтва.
4. Умацаванне законнасці і правапарадку ў краіне.
5. Пашырэнне эканамічных сувязей з заходнімі краінамі.
6. Правядзенне эканамічных рэформ паступова і абачліва.
7. Рыначныя адносіны.
8. Прыцягненне замежнага капіталу.
9. Узмацненне дзяржаўнага кантролю і рэгулявання.
10. Энергічнае правядзенне эканамічных рэформ.
11. Дзяржаўная падтрымка малога і сярэдняга бізнесу.
12. Забеспячэнне роўных умоў для развіцця ўсіх форм уласнасці.
13. Падтрымка дзяржаўных прадпрыемстваў.
14. Будаўніцтва АЭС.
15. Ажыццяўленне мер па эканоміі і зберажэнні энергарэсурсаў.
16. Адмена ільгот.

? 1 Якія з гэтых мер вы лічыце найбольш важнымі?
2. Як бы вы адказалі на гэта пытанне? Чаму?

**11.** Пасля распаду СССР у 1990-я гг. новыя незалежныя дзяржавы выбралі розныя палітычныя курсы. У тым жа сацыялістычным даследаванні рэспандэнтам задавалася пытанне: «Цеснае супрацоўніцтва з якімі краінамі, на Вашу думку, у найбольшай ступені адпавядае інтарэсам нашай краіны ў цяперашні час?» Адказы рэспандэнтаў размеркаваліся наступным чынам (у % ад ліку апытаных):


Правообладатель Народная асвета




1. Расія.
2. Іншыя краіны СНД.
3. Краіны Заходняй Еўропы (Германія, Францыя, Вялікабрытанія, Італія і інш.).
4. Краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (Польшча, Венгрыя, Чэхія і інш.).
5. Украіна.
6. Кітай.
7. Краіны Лацінскай Амерыкі (Венесуэла, Бразілія і інш.).
8. Краіны Балтыі.
9. Японія.
10. ЗША.
11. Індыя.
12. Куба.
13. Лівія.
14. Паўднёвая Карэя.
15. Іран.
16. Паўночная Карэя.
17. Ірак.

?

1. Чым, на ваш погляд, абумоўлена такое размеркаванне думак удзельнікаў апытання?
2. Як у далейшым могуць змяняцца адносіны грамадзян Беларусі да супрацоўніцтва з рознымі краінамі? Свой адказ абгрунтуйце.

**12.** У ходзе вывучэння грамадскай думкі беларускага грамадства рэспандэнтам задавалася таксама пытанне: «Як Вы лічыце, якія ідэі ў цяперашні час маглі б садзейнічаць аб'яднанню і далейшаму развіццю беларускага грамадства?» Былі атрыманы наступныя адказы:

1. Годнае жыццё.
2. Моцная дзяржава.
3. Моцная сям'я.

Правообладатель Народная асвета

4. Стабільнасць.
5. Сацыяльная абароненасць.
6. Законнасць і парадак.
7. Здароўе нацыі.
8. Роўнасць і справядлівасць.
9. Свабода.
10. Багацце, росквіт.
11. Захаванне і ўмацаванне незалежнасці і суверэнітэту.
12. Заходні спосаб жыцця.
13. Праваслаўе.
14. Камунізм.

? 1. Як бы вы адказалі на гэта пытанне? Чаму?
2. Якія ідэі ў дадзеным вышэй пераліку вы лічыце найбольш значнымі для развіцця сучаснага беларускага грамадства?

**13. З Паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу (2008 г.)**

«...Мы — горды, незалежны народ. У грамадзян нашай краіны цудоўны інтэлектуальны ўзровень. Мы хочам жыць на сваім куску зямлі, будаваць сваё жыццё. Але мы ніколі не будзем ні для кога ворагамі. Больш таго, мы нікому не прычынялі і не будзем прычыняць праблем.

...Мы рухаемся па тых жа рэйках, што і ўвесь свет. Няхай не так хутка дасягаем найвышэйшых мэт. На гэта патрэбен час.

Наперадзе ў Беларусі будзе толькі развіццё. Як яно пойдзе — хутчэй ці павольней, — залежыць толькі ад нас з вамі. У нас няма іншага выбару, акрамя як быць і заставацца моцнымі.

Упэўнены, мы — здаровая, адукаваная, духоўная нацыя, здольная рашаць задачы, вартыя XXI стагоддзя. Для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае, уключаючы самае галоўнае, — вялікі чалавечы патэнцыял, які мы павінны берагчы, развіваць і павялічваць у імя дабрабыту роднай Беларусі».

?! 1. Якія асноўныя стратэгічныя рэсурсы развіцця Беларусі ў XXI ст.?
2. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, прывядзіце прыклады гэтых напрамкаў у палітыцы беларускай дзяржавы.


Правообладатель Народная асвета

**14. З Паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу (2010 г.)**

Сёння на міжнароднай арэне ідзе перагляд прынцыпаў функцыянавання эканамічных сістэм. Значных поспехаў дасягае тая з іх, якая пастаянна абнаўляецца, убіраючы ў сябе ўсё лепшае з сусветнага вопыту. У гэтай сувязі нам жыццёва неабходны якасны прарыў у айчыннай эканоміцы. Што можа яго забяспечыць?

Перш за ўсё — новая тэхналагічная стратэгія. Яе састаўнымі часткамі павінны стаць:

структурныя пераўтварэнні эканомікі, якія прадугледжваюць перавагу галін, што выпрацоўваюць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю; стварэнне высокатэхналагічных вытворчасцей, здольных прапанаваць свету прынцыпова новыя віды тавараў і паслуг; фарміраванне рыначных стымулаў для павышэння інавацыйнай актыўнасці ўсіх суб'ектаў гаспадарання.

Наступны напрамак — выпрацоўка стратэгіі дзелавой актыўнасці. Яе галоўны прынцып: канкурэнцыя на змену манаполіям.

Далей — транзітная стратэгія, якая прадугледжвае пашырэнне транспартных, камунікацыйных і фінансавых калідораў. Гэта павінна стаць тым асноўным звяном, якое забяспечыць якасны рывок у эканамічным развіцці краіны і дазволіць, карыстаючыся геаграфічнымі перавагамі Беларусі, заняць сваю нішу ў міжнародным падзеле працы.

Энергетычная стратэгія павінна быць узмоцнена за кошт больш актыўнага выкарыстання аднаўляемых крыніц энергіі, будаўніцтва новых сучасных энергетычных магутнасцей, а таксама дыверсіфікацыі паставак традыцыйных рэсурсаў.

Прарыў у эканоміцы немагчымы без рэалізацыі стратэгіі ўсёабдымнай інфарматызацыі. Яна арыентавана на прадастаўленне шырокага спектру электронных паслуг для грамадзян і бізнесу. Пераход дзяржапарату на работу па прынцыпе інфармацыйнага ўзаемадзеяння.

Гэтыя стратэгічныя напрамкі дазваляюць Беларусі не толькі захаваць дастойнае месца ў сучасным пераменлівым свеце, але і ісці наперад, працаваць больш эфектыўна, чым раней.

Правообладатель Народная асвета

1. Якія стратэгічныя напрамкі развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе?
2. Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, прывядзіце прыклады рэалізацыі дадзеных напрамкаў у палітыцы беларускай дзяржавы.

## Дакументы і матэрыялы

**1.** У тэорыі міжнародных адносін вылучаюць некалькі сістэм:

*Вестфальская сістэма* міжнародных адносін была створана пасля заканчэння Трыццацігадовай вайны 1618—1648 гг. Яна грунтавалася на ідэі нацыянальнай дзяржавы і прынцыпе дзяржаўнага суверэнітэту (у аснове сістэмы — узаемадзеянне суверэнных раўнапраўных дзяржаў).

*Венская сістэма* міжнародных адносін склалася пасля напалеонаўскіх войнаў (замацавана Венскім кангрэсам 1814—1815 гг.). Венская сістэма міжнародных адносін грунтавалася на ідэі балансу сіл паміж вялікімі еўрапейскімі дзяржавамі: Расіяй, Аўстрыяй, Прусіяй, Францыяй, Вялікабрытаніяй.

Сістэма міжнародных адносін, якая існавала паміж дзвюма сусветнымі войнамі, называлася *Версальска-Вашынгтонскай*. Яе асновы былі закладзены Версальскім мірным дагаворам 1919 г., дагаворамі з саюзнікамі Германіі, а таксама пагадненнямі, заключанымі на Вашынгтонскай канферэнцыі 1921—1922 гг.

Нестабільнасць гэтай сістэмы міжнародных адносін была абумоўлена шэрагам фактараў: ігнараванне інтарэсаў пераможаных і зноў утвораных краін, адмова ЗША ад удзелу ў функцыянаванні Версальскай сістэмы, ізаляцыя Савецкай Расіі, антыгерманская накіраванасць. Усё гэта павялічвала магчымасць будучага сусветнага канфлікту. Састаўной часткай Версальскага мірнага дагавора было стварэнне Лігі нацый, якая практычна спыніла сваё існаванне ў 1939 г., з пачаткам Другой сусветнай вайны.

*Ялцінска-Патсдамская* сістэма міжнародных адносін была створана пасля Другой сусветнай вайны (замацавана дагаворамі і пагадненнямі Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый). Для Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адно-


Правообладатель Народная асвета

сін была характэрна *двухполюснасць (біпалярнасць)* — процістаянне паміж капіталістычнымі і сацыялістычнымі краінамі ў эканамічнай, палітычнай, ідэалагічнай і іншых сферах, якое атрымала назву «халоднай вайны». Вядучую ролю ў гэтай сістэме міжнародных адносін адыгрывалі дзве звышдзяржавы — СССР і ЗША. ЗША хацелі ўстанавіць у свеце амерыканскую гегемонію, СССР — перамогі сацыялізму ў сусветным маштабе. Гэта сістэма міжнародных адносін характарызавалася стварэннем ваенна-палітычных блокаў, гонкай узбраенняў, узмацненнем міжнароднай напружанасці.

Адным з найважнейшых элементаў Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін з'яўлялася Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, створаная ў мэтах падтрымання міжнароднага міру і бяспекі.

У канцы 1980 — пачатку 1990-х гг. адбыліся радыкальныя змяненні ў краінах Усходняй Еўропы, распаўся ваенна-палітычны блок *Арганізацыя Варшаўскага Дагавора*, у 1991 г. падпісана Белавежскае пагадненне аб роспуску СССР. Сучасныя палітолагі і палітыкі звязваюць з гэтымі падзеямі пачатак новай эпохі ў міжнародных адносінах.

Распад сусветнага сацыялістычнага лагеру прывёў да скасавання дзвюхполюснай (біпалярнай) сістэмы міжнародных адносін. Некаторыя лічаць, што свет уступіў у эпоху глабальнага дамінавання (гегемоніі) ЗША. На думку іншых даследчыкаў, сучасны свет з'яўляецца *шматполюсным* (*шматпалярным*), г. зн. шэраг дзяржаў валодае прыкладна аднолькавым эканамічным і ваенным патэнцыялам.

Новы этап міжнародных адносін характарызуецца вялікай колькасцю ваенных канфліктаў ва ўсім свеце, рэзкім абвастрэннем барацьбы за энергетычныя рэсурсы.

!

1. Ахарактарызуйце асноўныя этапы эвалюцыі сістэмы міжнародных адносін.
2. У аснове любой сістэмы міжнародных адносін ляжыць прынцып «балансу сіл». Баланс сіл у міжнародных адносінах — гэта размеркаванне сусветнага ўплыву паміж асобнымі цэнтрамі сілы. Сусветнае ўпарадкаванне можа быць аднаполюсным, двухполюсным і шматполюсным. Растлумачце, чаму наша краіна паслядоўна выступае за раўнапраўныя міжнародныя адносіны ў рамках шматполюснай мадэлі міжнародных адносін.

Правообладатель Народная асвета

**2.** Дзейнасць Беларусі ў ААН.

З'яўляючыся адным з заснавальнікаў ААН, Беларусь з 1945 г. актыўна ўдзельнічае ў рашэнні ўсяго спектра сусветных праблем. Ключавым ва ўзаемадзеянні Беларусі з ААН з'яўляецца ўдзел афіцыйных дэлегацый Рэспублікі Беларусь у рабоце штогадовых і спецыяльных сесій Генеральнай Асамблеі ААН і іншых органаў Арганізацыі, спецыялізаваных устаноў ААН, а таксама ў рабоце розных міжнародных форумаў, якія праходзяць пад эгідай ААН.

Беларусь з'яўляецца членам спецыялізаваных устаноў ААН і іншых міжурадавых арганізацый, якія ажыццяўляюць узаемадзеянне з ААН на аснове спецыяльных пагадненняў. У іх ліку: Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Міжнародная арганізацыя працы (МАП), Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ), Арганізацыя Аб'яднаных нацый па прамысловым развіцці (ЮНІДО), Міжнароднае агенства па атамнай энергетыцы (МАГАТЭ) і інш.

З 1993 г. у Мінску дзейнічае Аддзяленне ААН — Праграма развіцця ААН (ПРААН) — для ажыццяўлення праектаў тэхнічнай дапамогі Беларусі і аказання кансультацыйнага садзейнічання ў галіне рыначных пераўтварэнняў. У Мінску адкрыта таксама аддзяленне Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) для ажыццяўлення праграмы па абароне мацярынства і дзяцінства.

Намаганні Беларусі ў рамках ААН сёння нацэлены на:

далейшае прасоўванне ініцыятыў, якія адлюстроўваюць нацыянальныя прыярытэты рэспублікі ў галіне знешняй і ўнутранай палітыкі, і іх замацаванне ў выніковых дакументах і рашэннях Генеральнай Асамблеі ААН;

адстойванне прапаноў, якія тычацца рэфармавання і ўмацавання сістэмы ААН і адпавядаюць інтарэсам Беларусі;

далейшае павелічэнне ўкладу Беларусі ў працэсы ядзернага і звычайнага раззбраення, умацавання рэжымаў яго нераспаўсюджвання, стварэння новай сістэмы міжнароднай калектыўнай бяспекі на субрэгіянальным, рэгіянальным і глабальным узроўнях;

фарміраванне ўмоў для замацавання ў юрыдычна абавязальнай форме існуючага дэ-факта бяз'ядзернага статуса Цэнтральнай і Усходняй Еўропы;


Правообладатель Народная асвета

фарміраванне адкрытай сістэмы міжнароднага гандлю, ядром якой заклікана стаць Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА).

Канкрэтнымі вынікамі дзейнасці Беларусі ў ААН з'яўляюцца:

усебаковае адстойванне інтарэсаў Беларусі як дзяржавы з пераходнай эканомікай у гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, прыродаахоўнай і сацыяльна-гуманітарнай сферах праграмнай дзейнасці ААН;

прыцягненне рэсурсаў і вопыту міжурадавых арганізацый сістэмы ААН для паўнацэннай інтэграцыі краін з пераходнай эканомікай у сістэму сусветных гаспадарчых сувязей; пашырэнне ўкладу ААН ва ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і замацаванне доўгатэрміновага падыходу ААН да рашэння паслячарнобыльскіх праблем.

!

1. Назавіце і ахарактарызуйце асноўныя напрамкі ўдзелу Беларусі ў дзейнасці ААН.
2. Падрыхтуйце паведамленні аб дзейнасці арганізацыі ЮНЕСКА і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі.

**3.** Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе актыўнае супрацоўніцтва ў сферы міжнароднай бяспекі з Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ). Пры ўступленні ў АБСЕ ў 1992 г. Беларусь далучылася да Хельсінскага заключнага акта 1975 г.

Дзяржавы — удзельніцы Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, якая праходзіла ў Хельсінкі, абвясцілі ў Заключным акце наступныя прынцыпы ўзаемных адносін:

I. Суверэнная роўнасць, павага правоў, уласцівых суверэнітэту.

II. Неўжыванне сілы або пагрозы сілай.

III. Непарушнасць меж.

IV. Тэрытарыяльная цэласнасць дзяржаў.

V. Мірнае ўрэгуляванне спрэчак.

VI. Неўмяшанне ва ўнутраныя справы.

VII. Павага правоў чалавека і асноўных свабод, уключаючы свабоду думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў.

VIII. Раўнапраўе і права народаў распараджацца сваім лёсам.

Правообладатель Народная асвета

IX. Супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

X. Добрасумленнае выкананне абавязацельстваў па міжнароднаму праву.

?! 1. Якія прынцыпы, выпрацаваныя ўдзельнікамі Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, рэалізаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?

2. Падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці АБСЕ.

**4.** Міжнародная грамадскасць пачала ўсведамляць пагрозу глабальнага экалагічнага крызісу яшчэ ў 40-х гг. XX ст. У 1948 г. па ініцыятыве ЮНЕСКА была створана няўрадавая міжнародная арганізацыя, якая займаецца даследаваннем прыродных рэсурсаў — *Міжнародны саюз аховы прыроды і прыродных рэсурсаў* (МСАП), якая выдае Міжнародную Чырвоную кнігу. У 1971 г. актывістамі з Канады і ЗША была створана незалежная міжнародная грамадская арганізацыя *«Грынпіс»* (ад англ. Greenpeace — «Зялёны свет»), якая ставіць сабе за мэту папярэджванне дэградацыі навакольнага асяроддзя.

Паваротным пунктам у прыцягненні ўвагі міжнароднай грамадскасці да экалагічных праблем стала *Стакгольмская канферэнцыя ААН па навакольнаму асяроддзю* (1972 г.). На канферэнцыі былі выпрацаваны практычныя рэкамендацыі па розных аспектах прыродаахоўнага права, якія тычацца стану і кіравання навакольным асяроддзем, кантролю за яго забруджваннем, экалагічнай адукацыі, а таксама развіцця навакольнага асяроддзя. Вынікам працы канферэнцыі было рашэнне аб стварэнні *Праграмы ААН па навакольнаму асяроддзю (ЮНЕП)* у мэтах распрацоўкі і рэалізацыі праектаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя.

У 1992 г. у Рыа-дэ-Жанейра была праведзена *Канферэнцыя ААН па навакольнаму асяроддзю і развіццю (ЮНСЕД)*, на якой была прынята канцэпцыя ўстойлівага развіцця як асноўнага шляху развіцця чалавецтва ў новым тысячагоддзі. Найважнейшымі дакументамі, прынятымі на канферэнцыі ў Рыа-дэ-Жанейра, былі *Дэкларацыя па навакольнаму асяроддзю і развіццю*, дзе абвяшчаўся прынцып аховы навакольнага асяроддзя як неад'емнай часткі развіцця, а таксама *Павестка дня на XXI стагоддзе*, якая змяшчала праграму дзеянняў на працяглую перспектыву. У адпаведнасці


Правообладатель Народная асвета

з рэкамендацыямі Канферэнцыі, пераход да ўстойлівага развіцця патрабуе ад сусветнага супольніцтва рашэння трох стратэгічных задач: абмежаванне росту вытворчасці і спажывання ў прамыслова развітых краінах; абмежаванне росту насельніцтва, асабліва ў краінах, якія развіваюцца; пераадоленне эканамічнай няроўнасці паміж развітымі краінамі і тымі, якія развіваюцца.

Прынцыпы ўстойлівага развіцця былі падтрыманы многімі дзяржавамі свету, што азнаменавалася фактам падпісання ў 2000 г. *Дэкларацыі тысячагоддзя*. У гэтым дакуменце дзяржавы — члены ААН узялі абавязацельства да 2015 г. дасягнуць наступных мэт: ліквідацыі голаду і галечы; забеспячэння ўсеагульнай пачатковай адукацыі; ліквідацыі дыскрымінацыі жанчын; скарачэння дзіцячай смяротнасці; паляпшэння аховы мацярынства; папярэджання распаўсюджання небяспечных хвароб; забеспячэння экалагічнай устойлівасці; фарміравання сістэмы глабальнага партнёрства.

! Растлумачце, як узаемазвязаны паміж сабой задачы аховы навакольнага асяроддзя і забеспячэння ўстойлівага развіцця чалавецтва.

**5.** М. М. Маісееў (1917—2000 гг.), акадэмік Расійскай акадэміі навук, пісаў:

«Навука — гэта інтэлектуальная форма практычнага вопыту, і яна павінна дапамагчы развіццю роду чалавечага. Таму яна і ўзнікла, што, пазнаючы законы навакольнага свету, яна павінна і здольна аблегчыць магчымасці выкарыстання ўсяго таго, што можа даць Прырода для развіцця грамадства. Але не менш важна зберагчы людзей ад магчымых небяспек і ілюзій. Таму звышзадача навукі — вызначыць тую забаронную мяжу ў дзейнасці чалавека, якую ён не павінен пераступаць ні пры якіх абставінах, папярэдзіць грамадства, цывілізацыю аб небяспеках, якіх належыць пазбягаць.

Сёння экалагічны крызіс, які насоўваецца, неадпаведнасць магчымасцей цяперашняй планеты прэтэнзіям зямлян выкарыстоўваць яе даброты перастае быць нейкай абстрактнай ідэяй. Крызіс рэальны, яго дыханне мы ўжо адчуваем. Невыпадкова нават палітыкі пачалі абмяркоўваць яго пытанні. Чалавецтва ўпершыню стаіць перад праблемай выжывання. Не асобныя плямёны і нават народы, а чалавецтва

ў цэлым! У гэтых умовах навука можа і павінна адыграць сваю рашаючую ролю. Ёй давядзецца вывучыць новыя ўмовы ва ўзаемаадносінах чалавека і прыроды. Не яе задача весці людзей «да светлай будучыні», але ўказаць межы дапушчальнага яна абавязана і здольна. Апошняе асабліва важна.

Чалавецтву трэба будзе адмовіцца ад ілюзіі бязмежных магчымасцей. Гэта, можа быць, самая цяжкая задача, з якой чалавецтва калі-небудзь сустракалася: асэнсаваць сваё месца ў біясферы. І ў гэтых умовах навуцы давядзецца вытрымаць груз адказнасці — адказнасці перад грамадствам».

**?**

1. Ці згодны вы з думкай вучонага аб ролі навукі ў сучасным грамадстве? Як бы вы сфармулявалі задачы навукі ў рашэнні экалагічных праблем?
2. Дзе, на вашу думку, праходзіць «тая забаронная мяжа ў дзейнасці чалавека, якую ён не павінен пераступаць ні пры якіх абставінах»?

**6.** Акадэмік НАН Беларусі Я. М. Бабосаў у ліку фактараў, якія, па яго меркаванні, паскараюць працэс глабалізацыі сучаснага свету, вылучыў наступныя:

камп'ютарная рэвалюцыя, развіццё камунікацыйных тэхналогій і магутных інфармацыйных патокаў;

глабальная пераарыентацыя культуры; распаўсюджанне паняццяў «сусветная культура», «глабальная культура», за якімі часта скрываюцца прэтэнзіі на стварэнне культуры, арыентаванай на фарміраванне амерыканападобнага асяроддзя ў сусветным маштабе для бізнесу і прадуктаў масавай культуры, што тыражуецца мільёнамі і мільярдамі копій пры дапамозе кінематографу, тэлебачання, Інтэрнэту;

нарастаючая пагроза сусветнаму навакольнаму асяроддзю, абумоўленая ўсё больш маштабным і разбуральным уздзеяннем тэхналагічных сродкаў на біясферу Зямлі.

**?!**

1. Растлумачце, якім чынам названыя вышэй працэсы звязаны з глабалізацыяй сучаснага свету. Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі.
2. Якія, на ваш погляд, задачы развіцця беларускай культуры ва ўмовах глабалізацыі?

**7.** Усю разнастайнасць тэхнічных дасягненняў, вядомых у гісторыі цывілізацыі, сучасны амерыканскі сацыёлаг А. Тофлер уяўляе ў выглядзе трох тэхналагічных хваль,


Правообладатель Народная асвета

якія радыкальна паўплывалі не толькі на аблічча эканомікі, але і на культуру грамадства, яго каштоўнасці.

Першая хваля была звязана з узнікненнем аграрнай гаспадаркі. Аграрнае грамадства выкарыстоўвала прымітыўныя тэхналогіі, заснаваныя на звычайным вопыце, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне. Дамінуючым у іх было выкарыстанне ручной працы. Гаспадарчая дзейнасць людзей уключала земляробства, жывёлагадоўлю, рыбалоўства, прымітыўнае рамяство.

Другая хваля — гэта комплекс тэхналогій, якія забяспечваюць масавую, стандартную вытворчасць, характэрную для індустрыяльнага свету, які падобны вялізнай машыне. Для яго, на думку А. Тофлера, характэрны цэнтралізм, гігантызм, аднастайнасць у працы і жыцці, масавая культура, нізкі ўзровень духоўных каштоўнасцей, прыгнечанне людзей, разбурэнне прыроды.

Трэцяя хваля звязана, перш за ўсё, са стварэннем інфармацыйнага грамадства. Распаўсюджванне трэцяй хвалі мяняе характар працы. Руцінная, манатонная, дэгуманізаваная праца адыходзіць у мінулае. Такую працу лепш за чалавека можа зрабіць узброеная камп’ютарам сучасная тэхніка. З’яўляецца магчымасць адысці ад канвеера з яго раздзяленнем працы на асобныя прасцейшыя аперацыі. Сёння адзін чалавек можа вырабіць канечны прадукт, прычым не ў стандартным, а ў індывідуальным выкананні ў адпаведнасці з заказам спажыўца. Замест жорсткага рэжыму працы з’яўляецца магчымасць мець рухомы яе графік. Рэзка ўзрастае значнасць малых прадпрыемстваў. Многія віды працы аказваецца магчымым рабіць дома.

«Драматызуючы адрозненні, мы павінны сказаць, — піша А. Тофлер, — што ў старой, масавай прамысловай вытворчасці галоўным былі мускулы. У развітых разбуйненых галінах галоўнымі з’яўляюцца інфармацыя і творчасць».

Для таго каб чалавек задавальняў новым патрабаванням, неабходна перабудаваць усю сістэму адукацыі. Навучанне, якое павінна забяспечыць цалкам новы спосаб жыцця людзей, будзе, як лічыць А. Тофлер, адной з самых буйных галін трэцяй хвалі. Яно далей стане важнай экспартнай галіной.

Адукацыя павінна быць фундаментальнай і разам з тым разнастайнай. Яе неабходна максімальна індывідуалізаваць; неабходна рэзка павялічыць магчымасці навучання, самаадукацыі

Правообладатель Народная асвета

кацыі, дамашняй адукацыі, актыўна далучаючы да гэтага працэсу бацькоў. Гэтага можна дасягнуць, канешне, толькі на аснове сучасных інтэнсіўных тэхналогій навучання з выкарыстаннем відэаабсталявання і камп'ютара.

Новая эканоміка патрабуе не толькі ўмення лагічна разважаць, лёгка аперыраваць абстракцыямі, але і быць свабодным у свеце вобразаў і сімвалаў. Яна прывядзе да павышэння статуса шырока адукаваных і культурных людзей, якія будуць пастаянна ўзнаўляць і памнажаць культурныя каштоўнасці.

Як адзначае А. Тофлер, мы ўступаем у перыяд, калі культура мае значэнне большае, чым калі-небудзь. Культура не з'яўляецца нечым акамянелым у бурштыне, гэта тое, што мы ствараем нанава кожны дзень.

Новае грамадства, абапіраючыся на высокапрадукцыйную працу, зможа, нарэшце, сфакусіраваць сваю ўвагу на праблемах выхавання дзяцей, здароўя людзей, іх адукацыі. Старасць і адзінота стануць прадметам асаблівага яго клопату. Гэта будзе, на думку А. Тофлера, грамадства сапраўднай свабоды асобы, у якім чалавек стане гарманічна ўзаемадзейнічаць з прыродай.

?

1. Якія, на думку А. Тофлера, прынцыповыя адрозненні грамадства «трэцяй хвалі» ад папярэдніх этапаў развіцця чалавецтва?
2. Якія патрабаванні прад'яўляе да чалавека эканамічная сістэма трэцяй хвалі? Якімі ў сувязі з гэтым павінны быць задачы сучаснай школы?
3. Ці згодны вы з аптымістычнымі меркаваннямі А. Тофлера наконт інфармацыйнага грамадства? Якія праблемы грамадства «трэцяй хвалі» вядомы вам?

**8.** На думку беларускага вучонага, доктара эканамічных навук У. М. Шымава, структурныя пераўтварэнні і мадэрнізацыя вытворчасці ў сучаснай беларускай прамысловасці прадугледжваюць рашэнне двух блокаў задач. Першы звязаны з лёсам і перспектывамі развіцця комплексу вытворчасцей, якія складаюць сёння аснову эканомікі і прамысловасці краіны, фарміруюць яе экспартны патэнцыял і бюджэт, але, як правіла, не маюць належнай уласнай (нацыянальнай) рэсурснай базы і засноўваюцца на застарэлых тэхналогіях індустрыяльнага грамадства. У першую чаргу


Правообладатель Народная асвета

гэта тычыцца нафтаперапрацоўкі і нафтахіміі, аўтамабіле- і трактарабудавання, сельскагаспадарчага машынабудавання, вытворчасці некаторых тавараў народнага спажывання працяглага карыстання.

Другі блок задач — вызначэнне перспектыўных напрамкаў развіцця прамысловасці, заснаваных на сучасных (постіндустрыяльных) тэхналогіях, якія маюць у краіне неабходную базу для стратэгічнага эфектыўнага функцыянавання.

Рашэнне задач першага блоку вучоны бачыць у актывізацыі прыцягнення знешніх рэсурсаў, але не крэдытных, а акцыянерных, г. зн. праз фондавы рынак; у фарміраванні на базе шэрагу нашых прадпрыемстваў міждзяржаўных і транснацыянальных карпарацый, асноўным стымулам для якіх будзе эканамічная зацікаўленасць партнёраў — прадстаўнікоў тых краін, з якіх пастаўляецца сыравіна і якія імпартуюць прадукцыю беларускай прамысловасці.

У ліку фактараў, якія будуць садзейнічаць паспяховаму прасоўванню Беларусі па шляху постіндустрыяльнага грамадства, У. М. Шымаў называе:

фарміраванне нацыянальнай інавацыйнай прасторы на аснове сістэмнага падыходу, які выключае падмену інавацыйнага развіцця, што разумеецца ва ўсім свеце як укараненне прынцыпова новых тэхнікі і тэхналогій, ноу-хау, некаторым касметычным удасканальваннем застарэлых тэхналогій;

далейшае развіццё нацыянальнай сістэмы дзяржаўнага прагназіравання і праграміравання сацыяльна-эканамічнага развіцця;

заахвочванне на дзяржаўным узроўні інтэграцыйных працэсаў нацыянальных суб’ектаў гаспадарання па ўваходжанні ў кааператыўныя і карпаратыўныя міжнародныя альянсы па вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі;

стварэнне на нацыянальным узроўні карпаратыўнай структуры, якая адказвае за развіццё нанатэхналогій;

заахвочванне развіцця навукі ў вышэйшых навучальных установах краіны, матывацыя падрастаючага пакалення на заняткі навукова-даследчай дзейнасцю.

?! 1. Канкрэтызуйце прыкладамі сцверджанне: «У Беларусі ёсць аснова для развіцця сучасных (постіндустрыяльных) тэхналогій».

Правообладатель Народная асвета

2. Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне аб развіцці прамысловага комплексу Беларусі на сучасным этапе. Якія меры прымаюцца ў Рэспубліцы Беларусь для паспяховай інтэграцыі айчыннай эканомікі ў сусветную гаспадарку?

**9.** Член-карэспандэнт НАН Беларусі А. М. Данілаў, аналізуючы матэрыялы Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі і развіцці, вылучыў шэраг істотных палажэнняў, неабходных, на яго думку, для адэкватнага разумення асаблівасцей «устойлівага развіцця». Сярод іх:

трансфармацыя сістэмы каштоўнасцей значных сацыяльных груп насельніцтва як у развітых, так і ў слабаразвітых краінах і тых, якія развіваюцца, са зрушэннем шкалы каштоўнасцей грамадства і асобы на карысць духоўных састаўляючых;

усталяванне сістэмы крытэрыяў і патрабаванняў для ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі па захаванні навакольнага асяроддзя;

забеспячэнне эфектыўнай «кіруемасці» прыродаахоўнай дзейнасці як у нацыянальным, так і міждзяржаўным маштабе.

? Як вы лічыце, чаму «зрушэнне шкалы каштоўнасцей грамадства і асобы на карысць духоўных састаўляючых» А. М. Данілаў вылучыў у якасці першачарговай умовы «ўстойлівага развіцця»?

**10.** Выдатны расійскі вучоны і грамадскі дзеяч А. Д. Сахараў (1921—1989) пісаў:

«Паводле амаль усеагульнага меркавання, з ліку фактараў, якія вызначаць аблічча свету ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі, бяспрэчнымі і безумоўнымі з'яўляюцца: рост насельніцтва (да 2024 года будзе больш як 7 мільярдаў чалавек на планеце); вычарпанне прыродных рэсурсаў — нафты, прыроднай урадлівасці глебы, чыстай вады і да т. п.; сур'ёзнае парушэнне прыроднай раўнавагі і асяроддзя пражывання чалавека.

Гэтыя тры бясспрэчныя фактары ствараюць засмучальны фон для любых прагнозаў. Але гэтак жа бясспрэчны і важкі яшчэ адзін фактар — навукова-тэхнічны прагрэс, які назапашваў «разбег» на працягу тысячагоддзя развіцця цыві-


Правообладатель Народная асвета

лізацыі і толькі цяпер пачынае цалкам выяўляць свае бліскучыя магчымасці.

Я глыбока перакананы, аднак, што вялічэзныя матэрыяльныя перспектывы, якія змешчаны ў навукова-тэхнічным прагрэсе, пры ўсёй іх выключнай важнасці і неабходнасці, не рашаюць усё ж лёс чалавецтва самі па сабе. Навукова-тэхнічны прагрэс не прынясе шчасця, калі не будзе дапаўняцца надзвычай глыбокімі зменамі ў сацыяльным, маральным і культурным жыцці чалавецтва. Унутранае духоўнае жыццё людзей, унутраныя імпульсы іх актыўнасці цяжэй за ўсё прагназаваць, але менавіта ад гэтага залежыць у канчатковым выніку і гібель, і выратаванне цывілізацыі».

?

1. Якія фактары, на думку А. Д. Сахарава, вызначаць у найбліжэйшым будучым аблічча свету? Ці згодны вы з яго меркаваннем, што менавіта гэтыя фактары «ствараюць засмучальны фон для любых прагнозаў»?
2. Як вы думаеце, што меў на ўвазе А. Д. Сахараў, кажучы аб тым, што навукова-тэхнічны прагрэс толькі цяпер пачынае цалкам выяўляць свае бліскучыя магчымасці?
3. Якімі зменамі ў сацыяльным, маральным, культурным жыцці грамадства павінен суправаджацца навукова-тэхнічны прагрэс?

**11.** Акадэмік НАН Беларусі А. М. Рубінаў характарызуючы напрамкі рэарганізацыі навукі ў Беларусі, вылучыў у першую чаргу наступныя:

«Перш за ўсё, гэта ўмацаванне фірменнай навукі, узмацненне яе кадрамі высокай і вышэйшай кваліфікацыі, кандыдатамі навук. Такія кадры павінны рыхтавацца ВНУ ў цесным узаемадзеянні з прадпрыемствамі, для якіх яны разлічаны. Сёння прадпрыемствы не заўсёды зацікаўлены прымаць гатовых кандыдатаў навук, паколькі не бачаць для іх адэкватнага прымянення. Аднак без насычэння вядучых прамысловых прадпрыемстваў кадрамі вышэйшай кваліфікацыі цяжка разлічваць на эфектыўнае развіццё там навейшай тэхнікі і тэхналогій.

Далей на базе ўстаноў Нацыянальнай акадэміі навук неабходна стварыць шэраг навукова-тэхнічных цэнтраў. Сэнс заключаецца ў тым, каб наблізіць навуковыя даследаванні да рашэння практычных задач, падпарадкаваўшы іх гэтым задачам. Па сутнасці, у такім цэнтры навуковыя даследа-

Правообладатель Народная асвета

ванні інтэгруюцца з вытворчасцю і іх вынікам з'яўляюцца ўжо не проста навуковыя артыкулы і дысертацыі, а новыя віды прадукцыі, новыя тэхналогіі і да т. п., якія распрацоўваюцца не ў адрыве ад вытворчасці, а падпарадкоўваючыся канчатковай мэце — стварэнню канкурэнтаздольнага рыначнага прадукту.

Навукова-тэхнічныя цэнтры могуць таксама ствараць для навукова-інфармацыйнага забеспячэння кіравання народнай гаспадаркай, г. зн. для распрацоўкі праблем, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне. Да такіх праблем можна аднесці распрацоўку нетраў, энергетыку, інфармацыйныя тэхналогіі, экалагічны маніторынг, касмічныя тэхналогіі і інш.

...Сёння трэба дакладна падпарадкаваць дзейнасць навуковай супольнасці рашэнню канкрэтных задач, актуальных для дзяржавы. Пры гэтым трэба аддзяліць прыкладныя даследаванні ад фундаментальных. Фундаментальныя трэба лакалізаваць у ВНУ... Прыкладныя даследаванні і распрацоўкі трэба развіваць, перш за ўсё, на прадпрыемствах і ў фірмах, падпарадкаваўшы іх непасрэдным інавацыйным задачам прадпрыемства...».

1. Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, ахарактарызуйце ролю беларускай навукі ў рашэнні задач інавацыйнага развіцця краіны.
2. Карыстаючыся матэрыяламі мясцовага перыядычнага друку, інфармацыяй, атрыманай у час экскурсій на прамысловыя прадпрыемствы, падрыхтуйце паведамленне аб ролі навукі ў забеспячэнні інавацыйнага развіцця вашага рэгіёна.

## Урок абагульнення

1. Дайце азначэнні паняццяў: *геапалітыка, нацыянальная бяспека, глабальныя праблемы, інфармацыйнае грамадства, глабалізацыя.*

2. Раскрыйце сутнасць паняццяў: *нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы беларускай дзяржавы, нацыянальна-эканамічныя інтарэсы беларускай дзяржавы, экалагічная бяспека, інфармацыйная бяспека, тэхналагічны ўклад, антыглабалізм.*


Правообладатель Народная асвета

3. У чым праяўляецца разнастайнасць сучаснага свету? Чым яна абумоўлена?

4. Ахарактарызуйце:

а) геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь;

б) месца і ролю Рэспублікі Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін;

в) пазіцыю Рэспублікі Беларусь адносна працэсаў глабалізацыі;

г) месца і ролю Беларусі ў цывілізацыйным працэсе;

5. Назавіце глабальныя праблемы сучаснасці. Ахарактарызуйце іх прычыны, праяўленні, наступствы, магчымыя шляхі рашэння.

6. Сістэматызуйце свае веды аб прыметах інфармацыйнага грамадства. Запоўніце табліцу.

| | Эканамічная сфера | Палітычная сфера | Сацыяльная сфера | Духоўная сфера |
|---|---|---|---|---|
| Прыметы інфармацыйнага грамадства | | | | |

7. Вызначце станоўчыя і адмоўныя наступствы глабалізацыі ў розных сферах грамадскага жыцця. Запоўніце табліцу.

| Сферы грамадскага жыцця | Наступствы глабалізацыі | |
|---|---|---|
| | станоўчыя | адмоўныя |
| Эканамічная | | |
| Палітычная | | |
| Сацыяльная | | |
| Духоўная | | |

8. Ахарактарызуйце дасягненні суверэннай Беларусі. Назавіце фактары, якія іх абумовілі.

Правообладатель Народная асвета

## Заключэнне

Трэцяя частка курса «Грамадазнаўства», вывучэнне якой вы завяршаеце, ахапіла найбольш важныя пытанні, якія раскрываюць сучаснае жыццё беларускай дзяржавы і грамадства. Гэтыя пытанні так ці інакш закранаюць кожнага з нас. Ад таго, як яны будуць рашацца, залежаць і перспектывы краіны ў цэлым, і магчымасці ажыццяўлення вашых асабістых планаў, а таксама ўмовы, у якіх вы будзеце вучыцца і працаваць у найбліжэйшым і далёкім будучым.

Падагульняючы вывучанае, давайце яшчэ раз вызначым ключавыя моманты, вылучым тое, што патрабуе асаблівай увагі. Прапануем паразважаць на тэму: «Я і мая краіна на парозе будучага».

Кожнага чалавека клапоціць тое, у якім напрамку адбываюцца змяненні сацыяльнай рэчаіснасці, ці маюць яны пераважна пазітыўны, стваральны характар або, наадварот, нясуць з сабой разбурэнне, страту каштоўнасцей і арыенціраў, дэградацыю гуманістычных асноў жыцця і ўзрастаючую пагрозу самому нашаму існаванню. А вы што думаеце аб гэтым? На што вы ўскладваеце асаблівыя надзеі, угледваючыся ў будучыню?

Сучасны свет ахоплены працэсамі глабалізацыі. У чым заключаецца сутнасць гэтых працэсаў? Якія іх пазітыўныя і негатыўныя бакі? Якімі вам бачацца перспектывы Беларусі ў свеце, які глабалізуецца? Якой павінна быць палітыка нашай дзяржавы ў гэтых новых умовах?

За апошнія гады сфарміравалася беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Якія яе асноўныя рысы? Чым яны абумоўлены? Як яны звязаны з нашым папярэднім развіццём, з менталітэтам беларускага народа? А што было б, калі б усталявалася зусім іншая мадэль? Да якіх сацыяльна-эканамічных і палітычных наступстваў гэта магло б прывесці? І далей: ці з'яўляецца беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця ўнікальнай або многія яе рысы ўжо правераны гістарычным вопытам іншых краін, народаў? Прывядзіце адпаведныя прыклады.

Жыццё кожнай дзяржавы рэгулюецца дзеючымі ў ёй законамі. Сярод іх асаблівую ролю адыгрывае Асноўны Закон — Канстытуцыя краіны. Якія найважнейшыя прынцыпы сцвярджае Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь? Як харак-


Правообладатель Народная асвета

тарызуецца ў ёй беларуская дзяржава? Якія найважнейшыя правы, свабоды і абавязкі грамадзян замацоўвае наша Канстытуцыя? Што азначае ў нашы дні дзяржаўны суверэнітэт? Вяршэнства права?

Якія галіны права вам вядомы? Якія грамадскія адносіны яны рэгулююць? Як адлюстраваны ў гэтых галінах правы моладзі? Якую ролю, на ваш погляд, адыгрывае прававая сістэма Рэспублікі Беларусь у забеспячэнні ўстойлівага развіцця краіны?

І, нарэшце, як суадносяцца вашы асабістыя задачы, якія ўзнікаюць на парозе самастойнага, дарослага жыцця, з задачамі, якія вырашаюцца сёння ўсёй нашай краінай, усім беларускім народам?

Напэўна, адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні будуць не зусім канчатковымі, вычарпальнымі. Вы будзеце неаднаразова вяртацца да іх, удакладняць ваша светаразуменне, вашу сістэму каштоўнасцей і жыццёвых арыенціраў. Аўтары вучэбнага дапаможніка шчыра жадаюць вам поспехаў і спадзяюцца, што веды, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства», дапамогуць вам годна ісці па жыццёвым шляху.

Правообладатель Народная асвета

# Слоўнік

**Адміністрацыйнае права** — галіна права, якая рэгулюе грамадскія адносіны, што ўзнікаюць у працэсе арганізацыі і ажыццяўлення дзяржаўнага кіравання.

**Антыглабалізм** — палітыка і ідэалогія, накіраваная супраць існуючай мадэлі глабалізацыі, якая прыносіць, галоўным чынам, прыбытак транснацыянальным карпарацыям з найбагацейшых краін свету, насельніцтва якіх называюць «залатым мільярдам».

**Ахова здароўя** — сістэма дзяржаўных, грамадскіх і медыцынскіх мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне і ўмацаванне здароўя людзей, прафілактыку і лячэнне захворванняў, а таксама сістэма спецыяльных устаноў і арганізацый, якія іх ажыццяўляюць.

**Выбарчая сістэма** — сукупнасць норм, правіл і прыёмаў, якія вызначаюць парадак правядзення выбараў і выбрання прадстаўнічых органаў улады.

**Геапалітыка** — тэорыя, якая сцвярджае залежнасць палітыкі дзяржавы ад геаграфічных фактараў (клімат, прыродныя рэсурсы, тэрыторыя, насельніцтва і інш.), або вучэнне аб геаграфічнай абумоўленасці палітычных з'яў.

**Гендэрная палітыка** — сістэма мер, накіраваных на дасягненне рэальнай роўнасці палоў (мужчын і жанчын), устанаўленне гендэрнага балансу ва ўсіх сферах жыцця грамадства.

**Глабалізацыя** — працэс усебаковага збліжэння розных краін і станаўлення адзінай глабальнай сістэмы тэхналагічных, фінансавых, эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных сувязей на аснове навейшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

**Глабальныя праблемы сучаснасці** — жыццёва важныя праблемы планетарнага характару, для рашэння якіх неабходна аб'яднанне намаганняў усіх дзяржаў, а іх нявырашанасць уяўляе рэальную пагрозу для будучыні чалавецтва.

**Грамадзянскае грамадства —** сістэма эканамічных, палітычных, прававых, культурных сувязей паміж людзьмі, якія ўстанаўліваюцца імі без умяшання з боку дзяржавы. Грамадзянскае грамадства заснавана на добраахвотна сфарміраваных самакіравальных групах людзей.

**Грамадзянскае права** — галіна права, якая рэгулюе маёмасныя і асабістыя немаёмасныя адносіны, што ўзнікаюць паміж рознымі арганізацыямі (юрыдычнымі асобамі) і грамадзянамі, а таксама паміж асобнымі грамадзянамі.

**Грамадзянская дзеяздольнасць** — здольнасць чалавека сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць грамадзянскія правы, а таксама выконваць грамадзянскія абавязкі.

**Грамадзянская праваздольнасць** — здольнасць чалавека быць носьбітам дазволеных законам суб'ектыўных правоў і абавязкаў.

 Правообладатель Народная асвета

**Грамадзянства Рэспублікі Беларусь** — устойлівая прававая сувязь чалавека з Рэспублікай Беларусь, якая выяўляецца ў сукупнасці іх узаемных правоў, абавязкаў і адказнасці, заснаваная на прызнанні і павазе годнасці, асноўных правоў і свабод чалавека.

**Дзяржаўная маладзёжная палітыка** — сістэма сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных, прававых і іншых мер, накіраваных на падтрымку маладых грамадзян Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 14 да 31 года.

**Дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты** — пэўны ўзровень сацыяльнай абароны грамадзян, які гарантуецца дзяржавай.

**Дэмаграфічная бяспека** — стан абароненасці сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы і грамадства ад дэмаграфічных пагроз. Дэмаграфічная бяспека забяспечвае развіццё краіны ў адпаведнасці з яе нацыянальнымі дэмаграфічнымі інтарэсамі.

**Дэмаграфічная палітыка** — сістэма мер, якія ажыццяўляюцца дзяржавай у адносінах да пэўнай групы грамадства з мэтай рэгулявання дэмаграфічных працэсаў — нараджальнасці, смяротнасці, міграцыі.

**Дэмаграфічныя пагрозы** — дэмаграфічныя з'явы і тэндэнцыі, сацыяльна-эканамічныя наступствы якіх аказваюць адмоўнае ўздзеянне на ўстойлівае развіццё краіны.

**Здаровы спосаб жыцця** — спосаб жыцця, у аснове якога ляжаць свядомыя адносіны чалавека да свайго здароўя як каштоўнасці.

**Знешняя палітыка дзяржавы** — агульны курс дзяржавы за межамі яе тэрыторыі, накіраваны на рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў.

**Інавацыі** — новаўвядзенні, накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці чалавечай дзейнасці.

**Інтэнсіўны рост** — развіццё эканомікі за кошт якаснага ўдасканальвання фактараў вытворчасці, выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Інфармацыйнае грамадства** — грамадства, у якім інфармацыя прызнаецца найбольш значным рэсурсам, вытворчасць і спажыванне інфармацыі з'яўляецца найважнейшым відам дзейнасці, інфармацыйныя і тэлекамунікацыйныя тэхналогіі ўкараняюцца ва ўсе сферы жыцця людзей, а інфармацыйнае асяроддзе, поруч з сацыяльным і экалагічным, выступае найважнейшым асяроддзем пражывання чалавека.

**Канстытуцыя** — Асноўны Закон дзяржавы, «закон законаў».

**Канфесійная палітыка** — палітыка шматканфесійных дзяржаў па рэгуляванні адносін паміж рознымі канфесіямі.

**Крымінальнае права** — сукупнасць юрыдычных норм, якія вызначаюць злачыннасць і караемасць учынкаў, небяспечных для існуючай сістэмы грамадскіх адносін.

Правообладатель Народная асвета

**Міжнародныя адносіны** — сукупнасць палітычных, эканамічных, ідэалагічных, прававых, дыпламатычных, ваенных, культурных і іншых сувязей паміж дзяржавамі, арганізацыямі, народамі і асобнымі асобамі.

**Мінімальная заработная плата** — заканадаўча ўстаноўленая мяжа аплаты працы, ніжэй за якую не можа выплачваць ні адзін наймальнік, пры ўмове выканання наёмнымі работнікамі норм рабочага часу і аб'ёмаў работ.

**Нацыянальная бяспека** — стан абароненасці жыццёва важных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз.

**Нацыянальная палітыка** — палітыка шматнацыянальных дзяржаў у адносінах да нацыянальных, этнічных груп, якія ў іх пражываюць.

**Парламент** — прадстаўнічы і заканадаўчы орган дзяржавы.

**Плюралізм** — свабоднае суіснаванне ў грамадстве розных палітычных поглядаў, школ, ідэалогій, палітычных партый і арганізацый са сваімі мэтамі і праграмамі, калі яны не супярэчаць Канстытуцыі краіны.

**Пракуратура Рэспублікі Беларусь** — адзіная і цэнтралізаваная сістэма органаў, якія ажыццяўляюць ад імя дзяржавы нагляд за дакладным і аднолькавым выкананнем нарматыўных прававых актаў (законаў, дэкрэтаў, указаў) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Працоўнае права** — галіна права, якая рэгулюе працоўныя адносіны паміж наймальнікамі і работнікамі, устанаўлівае дзяржаўныя гарантыі працоўных правоў і свабод грамадзян, абараняе правы і інтарэсы работнікаў і наймальнікаў.

**Прэзідэнт** — кіраўнік дзяржавы, якая мае рэспубліканскую форму кіравання.

**Рэгіянальная палітыка дзяржавы** — мэтанакіраваная дзейнасць органаў дзяржаўнай улады па забеспячэнні аптымальнага развіцця рэгіёнаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

**Рэферэндум** — асобая форма галасавання выбаршчыкаў, у ходзе якога яны выбіраюць той ці іншы варыянт адказу на пастаўленае пытанне дзяржаўнага або грамадскага жыцця.

**Сацыяльная абарона** — сукупнасць мер, якія рэалізуе дзяржава, каб абараніць чалавека ў найбольш цяжкія моманты яго жыцця (страта працы, хвароба, страта карміцеля, стыхійныя бедствы, старасць, інваліднасць і інш.).

**Сацыяльная дзяржава** — дзяржава, якая імкнецца забяспечыць належныя ўмовы жыцця для ўсіх слаёў насельніцтва і асабліва клапоціцца аб грамадзянах у тых выпадках, калі яны не ў стане паклапаціцца пра сябе самі.

**Сацыяльная палітыка** — сукупнасць мерапрыемстваў, якія праводзіць дзяржава па развіцці сацыяльнай сферы грамадства.


Правообладатель Народная асвета

**Сродкі масавай інфармацыі** (СМІ) — сукупнасць сродкаў распаўсюджвання інфармацыі на масавыя аўдыторыі з выкарыстаннем якога-небудзь матэрыяльнага носьбіта.

**Суверэнітэт** — вяршэнства ўлады дзяржавы ў межах яе тэрыторыі і незалежнасць дзяржавы ў міжнародных адносінах.

**Судовая ўлада** — самастойная і незалежная галіна ўлады, якая ажыццяўляе правасуддзе, г. зн. разглядае і вырашае крымінальныя, грамадзянскія, адміністрацыйныя, гаспадарчыя і канстытуцыйныя справы ў парадку, устаноўленым законам.

**Сямейнае права** — галіна права, нормы якой рэгулююць асабістыя немаёмасныя і маёмасныя адносіны, што ўзнікаюць пры заключэнні і скасаванні шлюбу, а таксама ў працэсе сямейнага жыцця грамадзян.

**Урад** — орган выканаўчай улады ў дзяржаве.

**Устойлівае развіццё** — канцэпцыя, якая сцвярджае, што развіццё грамадства павінна быць арыентавана на рост вытворчасці і спажывання з улікам стану прыроды, яе рэсурсаў і інтарэсаў наступных пакаленняў людзей.

**Футуралогія** — сукупнасць розных даследаванняў будучыні Зямлі і чалавецтва. Яна ахоплівае таксама сферу навуковых ведаў аб перспектывах сацыяльных працэсаў, г. зн. сацыяльнае прагназаванне.

**Эканамічны рост** — станоўчая дынаміка развіцця эканомікі ў выніку колькасных і якасных змяненняў, якія ў ёй адбываюцца.

**Экстэнсіўны рост** — колькаснае павелічэнне эканамічных паказчыкаў за кошт прыцягнення дадатковых рэсурсаў.

**Эфектыўнасць вытворчасці** — суадносіны затрат, якія панёс вытворца ў працэсе вытворчасці, і вынікаў, якія ён атрымаў у выглядзе пэўнага даходу.

**Юрыдычная асоба** — прызнаная дзяржавай у якасці суб'екта права арганізацыя, якая валодае адасобленай маёмасцю, самастойна адказвае гэтай маёмасцю па сваіх абавязацельствах, ад свайго імя выступае ў судзе, набывае і ажыццяўляе правы, выконвае абавязкі.

Правообладатель Народная асвета

## Літаратура

1. Беларусь — страна твоего будущего. Книга для выпускника / авт.-сост. Н. Г. Ванина, Н. Н. Ганущенко, В. И. Ивченков. Минск, 2010.

2. Дзяржава для народа: дакументы і матэрыялы трэцяга Усебеларускага народнага сходу (2—3 сакавіка 2006 г.) / рэд.: А. М. Рубінаў [і інш.]. Мінск, 2006.

3. Идеология и молодежь Беларуси: пособие/Л. С. Аверин, Т. И. Адуло, Н. Б. Антонова [и др.]; под ред. Л. Е. Землякова, С. Д. Лаптенка, Минск, 2005.

4. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.). Мінск, 2006.

5. Мельник В. А. Основы идеологии белорусского государства: пособие / В. А. Мельник. Минск, 2010.

6. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. Мінск, 2004.

7. Обществознание: Глобальный мир в XXI в.: учебник для 11-го класса общеобразоват. учреждений / под ред. Л. В. Полякова. М., 2008.

8. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / Г. А. Василевич [и др.]; под общ. ред. Г. А. Василевича, Я. С. Яскевич. Минск, 2004.

9. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие для высших учебных заведений / под общ. ред. С. Н. Князева и С. В. Решетникова. Минск, 2004.

10. Основы права Республики Беларусь: понятия и схемы / под ред. В. А. Круглова, Е. В. Шейпак. Минск, 2003.

11. Першы з’езд вучоных Рэспублікі Беларусь (Мінск, 1—2 лістапада 2007): зборнік матэрыялаў / рэдкалегія: А. М. Касінец [і інш.]. Мінск, 2007.

12. Права человека: учеб. пособие / А. Д. Гусев [и др.]; под общ. ред. А. Д. Гусева и Я. С. Яскевич. Минск, 2002.

13. Человек и общество: справ. пособие для абитуриентов и школьников / под ред. С. В. Решетникова, Я. С. Яскевич. Минск, 2001.

14. Чалавек. Грамадства. Дзяржава: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання: У 4 кн. Кн. 3. Свет сацыяльнага дзеяння / А. В. Бяляева, Р. А. Васілевіч, Н. М. Ганушчанка і інш.; пад рэд. Ю. А. Харына. Мінск, 2001.

15. Чалавек. Грамадства. Дзяржава: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання: У 4 кн. Кн. 4. Чалавек у свеце культуры / Т. М. Алпеева, А. В. Бяляева, Р. А. Васілевіч, Н. М. Ганушчанка і інш.; пад рэд. Ю. А. Харына. Мінск, 2002.

 Правообладатель Народная асвета

16. Человечество. XXI век. Энциклопедия для детей. Дополнительный том. М., 2003.

17. Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. У 2 ч. / Я. А. Юхо. Мінск, 2003.

**Інфармацыйныя рэсурсы сеткі Інтэрнэт:**

Афіцыйны Інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (http://www.president.gov.by)

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (www.sovrep.gov.by)

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (www.house.gov.by)

Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал (www.pravo.by)

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (http://www.minedu.unibel.by)

«Моладзь Беларусі» (www.brsm.by)

Расійскі адукацыйны партал (школьная адукацыя) (http://www.school.edu.ru)

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (http://www.nlb.by)

Электронны каталог Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (www.catalog.nlb.by)

Калекцыя web-сайт энцыклапедый (http://www.encyclopedia.ru)

Калекцыя web-сайт слоўнікаў (http://www.rubrikon.com).

Правообладатель Народная асвета

# Змест

Уводзіны . . . . . . . . . . 3

**Тэма 1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь**

§ 1. Асноўны Закон дзяржавы . . . . . . . . . . 7
§ 2. Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . 13
§ 3. Выбары і рэферэндумы . . . . . . . . . . 20
§ 4. Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . 25
§ 5. Канстытуцыйныя правы і абавязкі грамадзян . . . . . . . . . . 32
Практыкум «... Грамадзянінам быць абавязаны» . . . . . . . . . . 38
Дакументы і матэрыялы . . . . . . . . . . 43
Урок абагульнення . . . . . . . . . . 55

**Тэма 2. Асноўныя галіны права**

§ 6. Асновы грамадзянскага права . . . . . . . . . . 56
§ 7. Асновы працоўнага права . . . . . . . . . . 62
§ 8. Асновы сямейнага права . . . . . . . . . . 70
§ 9. Асновы адміністрацыйнага права . . . . . . . . . . 75
§ 10. Асновы крымінальнага права . . . . . . . . . . 80
§ 11. Праваахоўныя органы Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . 87
Практыкум«Моладзь і права» . . . . . . . . . . 93
Дакументы і матэрыялы . . . . . . . . . . 99
Урок абагульнення . . . . . . . . . . 112

**Тэма 3. Палітыка беларускай дзяржавы**

§ 12. Сацыяльны партрэт Беларусі . . . . . . . . . . 114
§ 13. Беларуская сацыяльна-эканамічная мадэль . . . . . . . . . . 122
§ 14. Інавацыйнае развіццё краіны . . . . . . . . . . 130
§ 15. Рэгіянальная і аграрная палітыка . . . . . . . . . . 138
§ 16. Нацыянальная і канфесійная палітыка . . . . . . . . . . 145
§ 17. Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі . . . . . . . . . . 152
§ 18. Маладзёжная палітыка . . . . . . . . . . 159
Практыкум «Роля моладзі ў станаўленні моцнай і квітнеючай Беларусі . . . . . . . . . . 167
Дакументы і матэрыялы . . . . . . . . . . 172
Урок абагульнення . . . . . . . . . . 184

**Тэма 4. Беларусь у сучасным свеце**

§ 19. Аблічча сучаснага свету . . . . . . . . . . 186
§ 20. Сістэма міжнародных адносін . . . . . . . . . . 193
§ 21. Глабальныя праблемы сучаснасці . . . . . . . . . . 201
§ 22. Гарызонты інфармацыйнага грамадства . . . . . . . . . . 209
§ 23. Праблемы суіснавання і ўзаемадзеяння краін і народаў . . . . . . . . . . 216
§ 24. Будучыня чалавецтва . . . . . . . . . . 222
Практыкум«Стратэгічныя напрамкі развіцця Рэспублікі Беларусь у XXI стагоддзі» . . . . . . . . . . 230
Дакументы і матэрыялы . . . . . . . . . . 240
Урок абагульнення . . . . . . . . . . 252
Заключэнне . . . . . . . . . . 254
Слоўнік . . . . . . . . . . 256
Літаратура . . . . . . . . . . 260


Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Вішнеўскі** Міхаіл Іванавіч
**Гінчук** Валянціна Васільеўна
**Гірына** Валянціна Мікалаеўна і інш.

**ГРАМАДАЗНАЎСТВА**

Вучэбны дапаможнік для 11 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *В. В. Зань*. Афармленне *В. Я. Нога*. Мастацкія рэдактары *А. М. Хількевіч, Л. І. Мялоў*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская*. Камп'ютарная вёрстка *Т. В. Свірыдзенка, А. Ю. Гурчонак*. Карэктары *Г. В. Алешка, В. С. Бабеня, З. М. Грышэлі, Т. М. Вядзярнікава*.

Падпісана ў друк 26.08.2010. Фармат $60 \times 90\,^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 16,5. Ул.-выд. арк. 15. Тыраж 21 700 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009.
Вул. Чырвоная, 23, 220600, Мінск.

Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Народная асвета